ГАРАДЗЕНСКІЯ ЗАПІСЫ

(Старонкі гісторыі і культуры)

ВЫПУСК І



ГАРОДНЯ, 1993

ГАРАДЗЕНСКІЯ ЗАПІСЫ

(Старонкі гісторыі і культуры)

ВЫПУСК І

ГАРОДНЯ, 1993

ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ
ФАКУЛЬТЭТ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ І КУЛЬТУРЫ
ГРОДЗЕНСКАЯ СУПОЛКА БЕЛАРУСКАГА ФОНДУ КУЛЬТУРЫ

Рэдакцыйная калегія: Павел Сцяцко (галоўны радактар)
Сяргей Габрусевіч
Ігар Жук
Аляксей Пяткевіч
Генадзь Семянчук (адказны сакратар)
Яўгенія Таюрская

ЗМЕСТ

ГАБРУСЕВІЧ СЯРГЕЙ. Родная зямля.

І. ДАСЛЕДАВАННІ

З гісторыі Гародні

МАЛІНОЎСКАЯ ТАЦЯНА З гісторыі пабудовы і дзейнасці Гродзенскага кляштару дамініканаў.

МІЛІНКЕВІЧ АЛЯКСАНДР Гродзенская Каралеўская медычная акадэмія.

ГАРДЗЕЕЎ ЮРАСЬ З гісторыі помніка Антонію Тызенгаўзу ў Гродзенскім фарным (паезуіцкім) касцёле.

ПЛЕШАВЕНЯ АЛЯКСАНДР Музей прыроды ў Гародні (старонкі гісторыі).

На зямлі Гарадзенскай

КВЯТКОЎСКАЯ АЛА Даследаванні каменнага могільніку каля в. Вензаўшчына Шчучынскага раёна.

ШАБЛЮК ВАЛЕРЫ У пошуках мінулага (гісторыка-археалагічны нарыс вёскі Навасёлкі на Зэльвеншчыне).

ЦЫХУН АПАНАС Тапанімія і гідранімія басейна ракі Свіслач.

СЦЯЦКО ПАВЕЛ З лексічнай спадчыны жыхароў Зэльвеншчыны.

ПЯТКЕВІЧ АЛЯКСЕЙ Старажытныя евангеллі з Гарадзеншчыны.

ТРУСАЎ ІГАР Кніжная калекцыя з Шчорсаў.

КАРНІЛАВА ЛЮДМІЛА Цудатворныя абразы Гарадзеншчыны. Абраз Маці Божай Жыровіцкай.

ТРАЦЯК ЯНКА Роля беларускіх святароў у адраджэнні роднай мовы.

СНОП СЯРГЕЙ Аб «феноменах» сацыялістычнага права.

Лёсы людскія

ШВЕД ВЯЧАСЛАЎ «Трымаць пад арыштам у кляштары...»

ТОКЦЬ СЯРГЕЙ «Мураўёў-вешальнік» і палітыка расійскага самаўладства на Беларусі ў сярэдзіне XIX стагоддзя.

ЯРОМЕНКА КАЦЯРЫНА Спадчына вучонага.

ДРОЗД СЯРГЕЙ Нашы гістарычныя карані: па слядах К. Каліноўскага.

САЧОК МАРЫЯ Пра бацьку Максіма (да 130-годдзя з дня нараджэння А. Я. Багдановіча).

МІКУЛА ЯЎГЕН Аркадзь Смоліч на Гарадзеншчыне.

II. КРЫНІЦЫ

Дынаміка колькасці езуітаў Гродзенскай калегіі за 1623/24 — 1773/74.— Склала і падрыхтавала да друку Блінова Тамара.

Асабовы склад Гродзенскай езуіцкай калегіі ў 1727/28 — 1730/31.— Пераклала з латыні і падрыхтавала да друку Блінова Тамара.

Тытунёвая фабрыка ў Гародні. — Падрыхтавала да друку Батракова Карына.

Трацяк Янка. Палетку нашага араты...

З жыцця і дзейнасці кс. В. Гадлеўскага. Аўтабіяграфічны нарыс.

Пратакол Беларускага Сялянскага з ´езду ў Гародні.

Імем Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. — Падрыхтаваў да друку Трацяк Янка.

III. ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ

Каляндар памятных датаў культуры Гарадзеншчыны на 1993 г.— Складальнікі Пяткевіч Аляксей і Трацяк Янка.

Сяргей Габрусевіч
(Гродна)

РОДНАЯ ЗЯМЛЯ

«...люди, игде зародилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имаюць».
Ф. Скарына

Пачуццё роднага кута, любоў да яго чалавек набывае з малаком маці. Таму такія дарагія нам родная хата, родная вёска, родная вуліца.

З цягам часу, сталеючы, набываючы жыццёвы вопыт, пашыраючы свае веды, знаёмячыся з новымі людзьмі, родны кут вырастае да памераў Краю. Але гэта не значыць, што зменшылася або прытупілася пачуццё роднага кута. Не. Яно становіцца яшчэ больш глыбокім і вострым. Бо толькі з гадамі чалавеку ва ўсёй паўнаце адчыняецца прыгажосць і жыватворная моц роднага кута. Тут і сонца свеціць ярчэй, і дрэвы зелянейшыя, і вада самая смачная ў свеце. Для чалавека, які нарадзіўся і вырас у вёсцы, «родны кут» — гэта не толькі хата, надворак, садок, абмежак агарода, але і велічна-рамантычныя далягляды палёў і пералескаў.

Прыязджаючы ў родную вёску Верхаўляны ці няхай думаючы толькі аб ёй, заўсёды адчуваю светлабалючую роднасць, арганічную еднасць з крынічкай, што бурліціць ля падножжа гарадзішча і родзіць маленькую раку Шэпша, якая тужыцца з усёй моцы, прабіваючы сабе шлях праз карэнне магутных вольхаў, зараснікі вербалозу і калокавіны дзеля таго, каб падтрымаць знясіленую меліяратарамі Верацейку. Адчуваю роднасць з лужком, што кожны год у пачатку травеня за адзін ранак паспявае выткаць жоўты малачаевы дыван,— з драўлянымі кладкамі і масткамі, са сцяжынкамі цераз поле і луг, што быццам бы для цябе і пакладзены, пад твой крок і рух пратаптаныя. Мабыць, таму, для спасціжэння роднага кута чалавеку непатрэбны памочнікі.

Іншая справа спасціжэнне Айчыны ці яе часткі — роднага краю. Такога спасціжэння не можа быць без ведання яго прыроды, гісторыі, культуры, без прыналежнасці да сённяшніх і заўтрашніх клопатаў тваіх землякоў.

Наш край мае два найменні. Гістарычнае — Гродзеншчына, Гродзенская зямля і геаграфічнае — Прынямонне.

Гістарычнае імя даў горад Гродна — адзін з самых старажытных гарадоў на Беларусі. Упершыню згадваецца ён у Іпацьеўскім Летапісе. Летапісец паведамляе, што ў 1128 годзе гродзенскія дружыны на чале з князем Усеваладам Валынскім (нашчадкам славутага кіеўскага князя Яраслава Мудрага і зяцем Уладзіміра Манамаха) рушылі пад Полацк.

1128 год лічыцца афіцыйнай датай заснавання Гродна. Аднак у гістарычнай літаратуры неаднаразова выказваліся меркаванні, што Гродна ўзнік у 10 — пачатку 11 стагоддзя. Аўтар «Гродзенскай старыны» Я. Арлоўскі

лічыў, што Гродна мог быць заснаваны ў час паходу кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча ў 983 годзе на яцвягаў ці ў час паходу Яраслава Мудрага ў 1038 годзе. Гэта думка заслугоўвае ўвагі хоць бы таму, што ўжо ў другой палове 12 стагоддзя Гродна быў значным цэнтрам культуры. Тут складалася адметная школа дойлідства, красамоўны помнік якой Барысаглебская (Каложская) царква і сёння дае эстэтычную асалоду гараджанам і шматлікім турыстам.

З другой паловы XII стагоддзя Гродна становіцца цэнтрам удзельнага княства, пра што сведчыць славуты помнік усходнеславянскай літаратуры «Слова пра паход Ігаравы».

Гродзенскае ўдзельнае княства праіснавала да 1241 года, калі горад зведаў напад татарскіх полчышчаў. У гэты час ў Гродне княжыў 71-гадовы князь Юры Глебавіч. Яму належаў як сам горад, так і навакольныя землі. Нягледзячы на мужную і адчайную абарону, горад быў захоплены, гарнізон на чале з князем згінуў у баі. Гродна быў ператвораны ў руіны, а насельніцтва перабіта.

З гэтага часу Гродна на многія стагоддзі пазбаўляецца ролі адміністрацыйнага цэнтра. Але нязменна застаецца гістарычным, культурным асяродкам гродзенскай зямлі.

У яе сучасных межах Гродзеншчына фармуецца з канца 18 стагоддзя. У выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795 г.) уся яе тэрыторыя ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі і была ўключана ў Слонімскую і Віленскую губерні, якія пазней аб ´яднаны ў Літоўскую губерню.

1 студзеня 1802 года створана Літоўска-Гродзенская губерня, якая падзялялася на 8 паветаў: Гродзенскі, Лідскі, Навагрудскі, Ваўкавыскі, Слонімскі, Брэсцкі, Пружанскі, Кобрынскі. Такая назва губерні праіснавала да 1840 года, калі выйшаў імператарскі ўказ аб перайменаванні Літоўска-Гродзенскай губерні ў Гродзенскую.

Канчаткова межы Гродзеншчыны склаліся пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 1944 годзе створана Гродзенская вобласць Беларускай ССР.

Пазней да Гродзенскай вобласці было далучана некалькі раёнаў былых Баранавіцкай і Маладзечанскай вобласцяў.

Для сучаснай Гродзеншчыны характэрна амаль абсалютнае супадзенне адміністрацыйных, геаграфічных і культурных межаў. На захадзе, уздоўж мяжы з Рэспублікай Польшча, тэрыторыя вобласці абрамляецца ўзгоркамі Гродзенскага і Ваўкавыскага узвышшаў. На паўднёвым усходзе, на ўзмежжы з Брэсцкай і Мінскай вобласцямі, ляжыць Навагрудскае ўзвышша, а на паўночным усходзе — Ашмянскае.

Іх найвышэйшыя пункты — Замкавая гара ў Навагрудку і Мілавідаўская ў раёне Крэва — утвараюць вялізныя вароты, у якія коціць свае воды Нёман, яшчэ немнагаводны, спакойны, але ўжо з відавочнай размашыстасцю і напорыстасцю вялікай ракі. І цяпер усе рэкі Гродзеншчыны непасрэдна ці кружным шляхам, як Вілія і Ашмянка, цягнуцца да бацькі-Нёмана. Калі глядзіш на дзівосную вязь Нёманавых завілінаў, яго вялікіх і малых прытокаў, на гэтае мноства блакітных прожылаў, якія пераразаюць цёмную жаўцізну ўзвышшаў і ізумрудную зеляніну долаў, міжвольна параўноўваеш іх з крывянымі артэрыямі роднага краю.

Уся Гродзенская зямля сплятаецца ў адзіны жывы арганізм Нёманам і дзесяткамі яго вялікіх і малых прытокаў. А таму Прынямонне — геаграфічнае імя нашага краю. Імя больш быліннае, паэтычнае, як і сам Нёман.

Рака наша слаўная Нёман
Чысцейшая чэрвеньскіх рос,
Хто мар не ўплятаў у твой гоман,
Табе хто кахання не нёс.

Так пяецца ў народнай песні пра Нёман. І спяваць так можна толькі пра Нёман, бо менавіта ён з найбольшай глыбінёй адлюстроўвае характар беларусаў, як Волга рускіх, Дняпро ўкраінцаў, Влтава чэхаў.

Дарэчы, быліннасць і паэтычнасць уласцівая нават маленькім рэчкам Гродзеншчыны. На шчасце, большасць з іх захавалася амаль некранутымі дзякуючы вялікім лясным масівам, што спрадвек называюцца пушчамі.

У нашай свядомасці гэта перадусім Белавежская пушча. Бо яна — унікальны помнік не толькі прыроды Беларусі, але ўсяе Усходняй Еўропы. Але прыгажосць нашай зямлі немажліва без Гродзенскай, Ліпічанскай, Налібоцкай пушчаў, без Аўгустоўскіх лясоў і тысячы безыменных пералескаў.

Ландшафт Гродзеншчыны, яе прырода на дзіва багатая на такія мясціны, пра якія Канстанцін Паўстоўскі казаў, што яны добратворныя, супакойлівыя і што ў іх ёсць штосьці свяшчэннае. Гэтыя мясціны настолькі пранізліва адлюстроўваюць прыгажосць роднай зямлі, што да іх нельга не паставіцца, як да святыні.

Мноства такіх мясцінаў у запаведных лясах Белавежскай пушчы на берагах спакойнага, нібы соннага Нарава. Усе пароды дрэў у гэтых лясах, нават вольха, так цягнуцца да святла, да сонца, што, здаецца, адчуваеш напругу іх ствалоў, падобную напрузе мускулаў штангіста, які імкнецца «ўзяць» рэкордную вагу.

У такім лесе адчуваеш сябе, як у гатычным храме: тая ж імклівасць ліній, тая ж цішыня і прахалода. Неба і сонца амаль не відаць. Калі зірнеш у вышыню, бачыш толькі, як раз за разам апісваюць кругі верхавіны дрэў. Але варта выйсці на ўзгорак, і ў твар ударыць рэзкае святло, мяккая цеплыня няяркага беларускага сонца. І адкрыецца неба, на дзіва высокае і далёкае, нібы глядзіш у яго з глыбокай студні.

Нямала ў прыродзе Гродзеншчыны і велічных мясцінаў. Мы амаль не бачым іх. Часткова з прычыны таго, што з-за жыццёвай мітусні рэдка ўзіраемся ў аблічча роднай зямлі, часткова таму, што велічнасць іх, як правіла, някідкая, затоеная.

Адна з такіх мясцінаў — Замкавая гара ў Навагрудку. Першае, што адчуваеш на Замкавай гары,— гэта глыбокая пашана перад далёкімі прашчурамі, што заснавалі амаль тысячагоддзе назад умацаванне, а пазней Новагародак, цяперашні Навагрудак. І прыходзіць яна ад усведамлення таго, як глыбока і тонка адчувалі яны прыгажосць роднай зямлі, як умелі адкрыць яе для сябе і нашчадкаў.

З Замкавай гары бачыш ўвесь Навагрудак. Здаецца, што цэрквы, касцёлы, дамы сплываюць з яе стромкіх плячэй у прасторы палёў і пералескаў. Іх нясе разводдзе садоў, састарэлых ад часу, магутных ліпаў і клёнаў. Сярод гэтага мора зеляніны раптам зазіхаціць цынкавым азярком дах дома — музея Адама Міцкевіча, успыхне чарапічнай чырванню паляна даху фарнага касцёлу, нібы дзяўчаткі-гарэзы, пырснуць сінню вежы Барысаглебскай царквы.

Адсюль на дзесяткі кіламетраў адкрываецца такая прастора, такая ясная далячынь абсягаў, што аж дых зойме, а цела поўніцца лёгкасцю і прагай

палёту. І ўзнікае адчуванне, што варта прыўстаць толькі на дыбачкі, узмахнуць рукамі — і паплывеш у разлітай да самага неба сіні над далёкімі палямі і ўзлескамі, над дарогамі, што знікаюць за ўзгоркамі па якім, быццам у нямым кіно, бягуць машыны.

Гродзеншчына багатая на мясціны, што нясуць на сабе водбліск славы вялікіх людзей і падзеяў. Гэта вёска Лаша, радзіма акадэміка Я. Ф. Карскага. Гэта возера Свіцязь, вёска Шчорсы, Навагрудскі замак, апетыя Адамам Міцкевічам з такой глыбінёй паэтычнасці, дакладнасці дэталяў і рамантычнасці, што нават ніколі не пабачыўшы іх, нельга не прасякнуцца трапяткой любоўю да іх. Гэта Кушляны і Залессе на Смаргоншчыне, мясціны, звязаныя з імёнамі Ф. Багушэвіча і М. Агінскага, дзе і сёння паветра адваложана паэзіяй і музыкай роднай зямлі. А за дзесяць кіламетраў ад іх руіны Крэўскага замка, сівое каменне якога было сведкам падзей, што пакінулі свой след у шматвяковай гісторыі народаў.

Ёсць на Гродзеншчыне святыя мясціны, такія святыя для беларускага і суседніх народаў, як і поле Кулікова для Расіі. Вось што зазначае пра адну з іх «Жывапісная Расія». «Незлічоныя полчышчы іх (манголаў), якія вёў Балкалай, рушылі на паўночна-заходнюю Русь і на Літву. Іх запрашалі нават зайздросныя ворагі Міндоўгавы, Данііл і Васілька, князі Галіцкія. Міндоўг ведаў пра гэта, ён збіраў свае дружыны, паклікаў падуладных яму князёў і з магутнаю раццю пайшоў на страшэннага ворага. Яны сустрэліся на шырокай раўніне ля ваколіцаў Ліды (45 вёрст на паўночны захад). Манголы былі разбітыя ўшчэнт. Мясціна і цяпер называецца Шайбак-поле, бо правадыром манголаў быў Шайбак, родзіч Батыя. Гэта адбылося ў 1242 годзе».

Аднак сапраўдную сутнасць і прыгажосць нашага краю вызначаюць мясціны, на першы погляд нічым не выдатныя, тыповыя.

Яны ніяк не адзначаны. Яны не апісваюцца ў турысцкіх даведніках. Мажліва таму, што іх незлічонае мноства, а можа таму, што мы няўважлівыя і абыякавыя, таму што ў кожнага з нас яны свае, непаўторныя. У кагосьці гэта агляды вёскі Загор ´е, што на Карэліччыне, у некага ўтульнасць вёскі Харошкі на Дзятлаўшчыне... Асабіста для мяне такая мясціна — Луцкаўлянскі перавал на шашы Гродна — Бераставіца.

Перавал стварае града ўзгоркаў Гродзенскага ўзвышша, якая, нібы серп, цягнецца ад мяжы Рэспублікі Польшча. Мясцовыя жыхары называюць яе Магілянскімі гарамі, відаць, ад назвы вёскі Магіляны Бераставіцкага раёна. Прыгажосць Луцкаўлянскага перавалу нечаканая і хуткабежная, бо да апошняга імгнення ніштo не прадвызначае сустрэчу з ёй. Калі едзеш у бок Бераставіцы, за вёскай Пракопавічы дарога рэзка скіроўвае ўправа і па самым краі перасякае Луцкаўляны. Злева застаецца пакінуты млын, жорны якога яшчэ гадоў трыццаць таму круціліся вадою ракі Індуркі; гандлёвы цэнтр, аўтобусны прыпынак, справа — Палац культуры. Адразу ж за вёскаю пачынаецца працяглы пад ´ём. Ён канчаецца нечакана. І перад вамі — шырачэзны абсяг роднай зямлі, цудоўны пры любым надвор ´і і ў любы час году — як непаўторны ў дзівосах твар маці.

Тысячы гадоў на гэтай адданай і дзівоснай зямлі жывуць людзі, працавітасцю і талентам якіх стварыўся гістарычны ландшафт Гродзеншчыны і ансамбль нацыянальнага пейзажу. Мноства пакаленняў, абжываючы зямлю, стварылі гэты ансамбль, прасякнуты адзіным духам і сэнсам. Усеагульны характар і сэнс цэлага на працягу стагоддзяў захаваўся ў сістэме размежавання прасторы рассялення, у абрысе гарадоў і вёсак, у спосабах і прыёмах размяшчэння збудаванняў дойлідства — храмаў, дамоў, крэпасцяў. Вясковае

і гарадское, штучнае і прыроднае складалі адзінства і гармонію. І ўсё, пачынаючы ад горада і храма і канчаючы прасёлкам, што прабіраецца полем ад жылля, або сіратлівым дрэвам сярод узаранага поля, літаральна ўсё мела свой мастацкі сэнс.

Прырода была храмам, а не майстэрняй. Гэта праяўлялася не толькі ў тым, што будавалі там, дзе можна было будаваць, аралі акурат там, дзе трэба было араць, сеялі грэчку і каноплі, а не кукурузу, але і ў тым, што прыроду ўспрымалі як працяг свайго жытла.

Я памятаю, як у пасляваенныя гады вёска рыхтавалася да Вялікадня. Пачыналі з таго, што чысцілі коміны, замазвалі шчыліны і трэшчыны у гліняных падлогах. Пасля гэтага бялілі сцены і столь хаты. На гэты час з дому выносілі на двор мэблю і ўсю хатнюю маёмасць. Усё гэта прасушвалася пад промнямі красавіцкага сонца, праветрывалася пругкім вясновым ветрам. Затым прыбіралі дварышча. Прыдзірліва выграбалася мінулагодняя трава і смецце, што набралася за зіму, рамантавалася агароджа. Падразалі і бялілі дрэвы і кусты. Безумоўна ўсё гэта рабілася без усякіх пастаноў і суботнікаў, а толькі таму, што чалавек уключаў прыроду ў сферу сваёй культуры і духоўнасці. Прыкладаў, якія пацвярджаюць гэта, незлічонае мноства. Яны перад намі ў купінках цэрквяў і шпілях касцёлаў, пабудаваных у суладанні з ландшафтам і рэльефам мясцовасці, гучаць у нашых сэрцах паэтычнымі назвамі вёсак і ўрочышчаў: Зарыца, Гожа, Крынічнае...

Апошнімі дзесяцігоддзямі ландшаф Гродзеншчыны быў пад прыгнётам сацыяльнага утылітарызму. Прырода ўсведамлялася майстэрняй, а не храмам, у чым непасрэдна выражалася ідэя тэхнічнай улады над ёю. На прыроду глядзелі індустрыялізатарскімі позіркамі урбанізму. Нездарма неабходнасць пераходу ад вёскі да гораду была назойлівай ідэяй некалькіх дзесяцігоддзяў. Прыроду імкнуліся эксплуатаваць па законах машыннай тэхналогіі, яе разглядалі як частку прамысловай вытворчасці.

У выніку вынішчаны тысячы хутароў, прыйшлі да заняпаду сотні «неперспектыўных» вёсак. Жывое цела зямлі да гэтага часу крамсаюць падзёншчыкі-меліяратары, узброеныя моцнай землярыйнай тэхнікай.

На шчасце, пейзаж Гродзеншчыны, яе прырода паспытала намнога меншую страту, чым іншыя рэгіёны краіны. Сёння яшчэ можна яе адрадзіць.

Вядома, адраджэнне роднай зямлі запатрабуе ад нас напружанай працы, вялікіх матэрыяльных і грашовых выдаткаў. Усё гэта мы адолеем толькі ў тым выпадку, калі знойдзем і ўмацуем сваё, нацыянальнае, калі кожны з нас усвядоміць, што ён не частка насельніцтва, а гаспадар гэтай цудоўнай зямлі.

ДАСЛЕДАВАННІ

Тацяна Маліноўская
(Гродна)

З ГІСТОРЫІ ПАБУДОВЫ І ДЗЕЙНАСЦІ ГРОДЗЕНСКАГА КЛЯШТАРУ ДАМІНІКАНАЎ

Муры кляштару дамініканаў у Гродне мясціліся па вуліцы Віленскай. Да сённяшняга дня захаваліся толькі два кляшторныя будынкі па вуліцы Савецкай 6-8, якія даюць нам рэальную магчымасць уявіць багатую культурную і грамадскую мінуўшчыну айцоў дамініканаў у Гродне.

22 снежня 1216 года папа Ганоры III зацвердзіў закон св. Дамініка — ордэн братоў-прапаведнікаў. Амаль праз сто гадоў, у 1317 годзе, белыя расы дамініканаў з ´явіліся ў Вялікім княстве Літоўскім. А яшчэ праз трыста гадоў, у 1644 годзе, у Рыме была заснавана літоўская кангрэгацыя ў імя Анела Захавальніка, да якой быў далучаны і гродзенкі канвент дамініканаў.

Вядомы даследчык гісторыі дамініканаў Вялікага княства Літоўскага Валыняк[1] лічыць, што касцёл дамініканаў у Гродне быў заснаваны на падставе прывілея Жыгімонта III у 1632 годзе, а ў 1633 годзе быў ужо пабудаваны на фундацыю Фрэдэрыка і Хрысціны з Пацаў Сапегаў[2]. Валыняк, які працаваў з архіўнымі дакументамі ў Кракаве, а значыць меў доступ да найбольш захаваных архіваў, адзначыў, што пра дзейнасць гродзенскіх дамініканаў у XVII стагоддзі нічога невядома.

У 1737 годзе прыёрам гродзенскіх дамініканаў стаў Томаш Ганусевіч, які пачаў «мураваць новы кляштар»[3]. Асобна ў тэксце адзначана, што кляштар пачалі мураваць. Гэта дае падставу меркаваць, што дагэтуль існаваў драўляны кляштар пры мураваным касцёле, які асвяцілі ў імя Прасвятой Дзевы Марыі Ружанцовай.

Нам цяжка меркаваць пра выгляд гэтага касцёла, бо ён не захаваўся да нашых дзён. Ёсць толькі фотаздымак другой паловы XIX стагоддзя, на якім відаць галоўны фасад касцёла. Аблічча касцёла дапамагае ўявіць «інвентар Гродзенскага касцёла і кляштара дамініканаў 1830 года» (захоўваецца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ў Вільні)[4]. Інвентары звычайна абапіраліся ў даціроўках на папярэднія запісы альбо на вусную традыцыю. Менавіта ў гэтым інвентары адзначана, што касцёл пабудаваны ў 1708 годзе. Хутчэй за ўсё — гэта дата адной з найбольш значных рэканструкцый, якая была зафіксавана ў нейкім папярэднім дакуменце. Манах запісаў у інвентары, што «касцёл у фігуры прамавугольны з закругленнем ля Вялікага алтара, з двума вежамі і фацыятай паміж іх, з бабінцам... і двума падоўжнымі капліцамі. Касцёл накрыты дахоўкай. Капліцы, якія дасягаюць вышыні паловы касцёла, накрытыя: адна — дахоўкай, другая — гонтам»[5]. Улічваючы дадзены інвентар, фотаздымак, а таксама захаваныя планы касцёла, можна ўявіць гэты помнік архітэктуры як бяскупальнае трохнефнае з апсідай збудаванне, у якім

вышыня апсіды аднолькавая з вышынёю цэнтральнага нефа. Апсіда аддзяляецца ад нефа толькі падпружнай аркай, маючы агульны з асноўным аб ´ёмам дах. Трох ´ярусная з дзвюма вежамі кампазіцыя галоўнага фасада была ўпрыгожана жалезнымі крыжамі на вежах і атыку.

Хоры для манахаў мясціліся за галоўным алтаром і былі драўляныя, а над бабінцам знаходзіліся вымураваныя з цэглы музычныя хоры, аздобленыя драўлянай разьбой.

Пад касцёлам меліся падвалы, куды вялі драўляныя лесвіцы і дзе знаходзілася крыпта, але ў гэтай якасці падвал не выкарыстоўваўся ўжо ў XIX стагоддзі.

Да кляшторнага будынку былі далучаны сакрысція з печчу і скарбніца. Абодва памяшканні мелі скляпенні. Дзверы касцёла, зробленыя з магутных дошкаў, аздабляла жалезная акоўка. Будынак быў атынкаваны звонку і ўнутры. Як адзначыў інвентар, у 1830 годзе будынак быў моцным і надзейным.

Інтэр ´ер касцёла ўпрыгожвалі 11 алтароў з абразамі, выкананымі жывапісам. Тут жа знаходзіліся старадаўнія (магчыма, з XVII стагоддзя) партрэты фундатараў касцёла — Сапегаў. У касцёле падчас літургіі выкарыстоўвалі багата каштоўных рэчаў: больш як 100 сярэбраных манстранцыяў, пушак і келіхаў, больш за 200 падсвечнікаў, кандзілябраў і лямпаў, зробленых са шкла, металу і керамікі. Цікавым элементам інтэр ´ера скарбніцы і сакрыстыі былі дзевяць маляваных шафаў, якія, на жаль, да нашых дзён не захаваліся нават у музейных фондах Беларусі.

Дамініканскі касцёл быў адным з самых прыгожых у Гродне, пра што падчас свайго побыту ў Гродне напісаў Ю. У. Нямцэвіч[6].

Калі вярнуцца да кляшторнага будынку, вымураванага ў 1737 годзе, то ўяўленне аб ім можа даць чарцёж фасада шляхетнага пансіёну, які захоўваецца ў Вільні[7]. На гэтым чарцяжы даецца праект перабудовы будынку дамініканскай школы пад пансіён, выкананы ў 1836 годзе. Праект пададзены на фасадзе старога будынку, які існаваў да здзяйснення новага праекту. Гледзячы на гэты фасад старой дамініканскай школы, можна адзначыць, што яна была будынкам, складзеным з дзвюх частак. Правая, якая далучалася да касцёла, адрозніваецца ад левай часткі не толькі выразнасцю кампазіцыі фасада, але і вышынёю даху. Відаць, гэтая правая частка і ёсць пабудаваны ў 1737 годзе «мураваны новы кляштар».

Прыбудова левай часткі будынку была зроблена ў 60-я гады XVIII стагоддзя. Валыняк піша, што ў 60-я гады прыёрам гродзенскіх дамініканаў быў айцец Людзвіг Рыбінскі, які ахвяраваў на новы кляштар 5000 злотых і зрэалізаваў дабудову. Памёр а. Рыбінскі ў 1770 годзе ў Нясвіжы[8]. Невялікія грошы, якія ахвяраваў а. Рыбінскі, вызначылі памер і лаканічнасць дабудовы, якая выконвала ролю пашырэння плошчы памяшканняў пад класы і пабудову бровару, што адзначана на планах кожнага паверху, далучаных да праекту перабудовы дамініканскай школы.

Старадаўні фасад вырашаны вельмі лаканічна. Рытмічная вертыкаль галоўнага фасада адзначана вокнамі і лапаткамі паміж імі. Левая частка не мае вызначанай кампазіцыі, што звязана з вытворчай функцыяй памяшканняў гэтай часткі будынку.

Этапы пабудовы гэтай часткі кляшторнага комплексу можна прасачыць і на планах горада Гродна. Так, на плане горада Гродна 1753 года[9] дамініканскі комплекс адзначаны двума мураванымі будынкамі — касцёлам

і далучаным да яго кляштарам, які выцягнуўся ўздоўж вуліцы Віленскай (сёння Савецкай) з паваротам на дзядзінец. Далей па Віленскай ішлі мяшчанскія дамы на дамініканскім пляцы з тарцовай арыентацыяй фасадаў. На плане горада Гродна 1795 года[10] фасад ужо падоўжваецца за кошт прыбудовы на месцы старых жылых дамоў.

Важкім элементам у планоўцы комплексу дамініканскага кляштару з ′яўляецца будынак, які выцягнуўся ўздоўж вуліцы Дамініканскай. Будынак быў вымураваны ў 80-я гады XVIII стагоддзя.

На плане Гродна 1753 года гэты будынак адзначаны як драўляны і меў падоўжную форму з невялікай прыбудовай з боку дзядзінца. А на плане 1795 года будынак ужо мае іншую канфігурацыю і без прыбудовы.

Растлумачыць змену ў характары і планіроўцы будынку нам дапаможа ліст П. Пірамовіча — сакратара Ізабэлы Браніцкай у Беластоку, да сакратара ў Варшаве. Ліст датаваны 5 мая 1782 года, у ім чытаем: «Днямі горад Гродна вельмі гарэў уначы ад агню, які ўзнік у жыдоўскім доме. Цэлая вуліца Замкавая з палацамі пагарэла, усяго дамоў, якія загінулі ў вогнішчы,— 300. Касцёл фарны мураваны з усім, што ў ім было, пагарэў, дамініканскі апаліўся, але захаваўся, толькі ўнутраныя будынкі яго ўсе пагарэлі»[11]. Такім чынам, у 1782 годзе ў выніку пажару драўляны будынак, пазначаны на плане 1753 года, згарэў.

Улічваючы гэты факт і тое, што ў XVIII стагоддзі вырасла патрэба ў адукаваных людзях, а дамініканы сталі вядучым ордэнам у галіне адукацыі пасля касацыі ў 1773 годзе ордэна езуітаў, — пачалося будаўніцтва новага мураванага будынку на месцы драўлянага.

Мураваўся гэты будынак пры прыёры Людзвіку Грынцэвічу, які быў вядомым архітэктарам. Пасля вучобы ў Італіі Грынцэвіч вяртаецца на Беларусь і стварае шэраг праектаў фасадаў і алтароў у Забелах, Друі, Нясвіжы і іншых мясцінах. Мы не маем прамых доказаў таго, што Грынцэвіч — бацька беларускага барока, — аўтар праекта фасада мураванага будынку дамініканскага кляштара, які быў пабудаваны ў 80-я гады XVIII стагоддзя. Але ж будучы прыёрам гродзенскіх дамініканаў, ён не мог ухіліцца спакусы стварыць адзін з галоўных фасадаў новага кляшторнага будынку на падначаленай яму тэрыторыі.

Такім чынам, разам з пабудовай у 80-я гады мураванага будынку па вуліцы Дамініканскай было завершана тым самым будаўніцтва дамініканскага кляштару ў Гродне.

На пачатку XIX стагоддзя пры дамініканскім кляштары дзейнічалі: Студыум вышэйшы, гімназія, школы павятовая і парафіяльная. У гэтых установах вучылася 336 вучняў, якіх навучалі 18 настаўнікаў[12]. Шырокую вядомасць у краі мела цудоўная бібліятэка гродзенскіх дамініканаў, а таксама фізічная лабараторыя.

Ад 1803 года на працягу некалькіх гадоў у гродзенскай дамініканскай школе выкладаў фізіку і матэматыку славуты навуковец дамініканец Фелікс Цяцерскі, які надрукаваў і выдаў у Гродне сваю дысертацыю па эксперыментальнай фізіцы[13].

У 1840 годзе адбылася касацыя гродзенскага дамініканскага кляштару. У былых дамініканскіх мурах была адчынена мужчынская гімназія, а касцёл былога кляштару, пазбаўлены парафіі, дзейнічаў як студэнцкі (гімназіяльны) касцёл.

Гімназісты гродзенскай гімназіі прынялі актыўны ўдзел у паўстанні 1863 года, таму расейскія ўлады, адзначыўшы ўплыў каталіцкага духавенства на ўдзельнікаў паўстання, забаранілі дзейнасць касцёла пры гімназіі і размясцілі ў ім царкву Ямбургскага ўланскага палку[14]. Але ў такой якасці касцёл праіснаваў няшмат і ў 1875 годзе «во избежание соблазна в местном населении» старадаўні касцёл дамініканскага кляштару, упрыгожванне горада,

быў знішчаны «за исключением одного крыла, примыкающего к гимназиальному зданию»[15], якое меркавалася выкарыстоўваць пад бібліятэку і падрыхтоўчы клас.

Ад XIX стагоддзя будынак па вуліцы Дамініканскай выкарыстоўваўся магістратам ´пад розныя службы і невялікія крамкі. Будынак кляштара па Віленскай, які мясціў гімназію, упершыню перабудоўваўся ў 1836 годзе. Аб плане перабудовы сведчыць чарцёж, які мы ўжо нагадвалі[16]. Гэтыя чарцяжы сцвярджаюць аб значнай перабудове, калі павялічылася агульная шырыня будынку за кошт вуліцы, зменена вышыня і выява даху. Кампазіцыя галоўнага фасада падчас перабудовы страціла баракальныя рысы і набыла рысы класіцызму: сіметрычнасць, цэнтр якой выдзяляўся шасцю пілястрамі, цэнтральным уваходам і ўпрыгожваўся прыступкавым атыкам. Бакавыя часткі фасаду былі вырашаны сіметрычным аздабленнем вокнаў, атыкамі і рустоўкай. На гэтую першую рэканструкцыю ўрад выдзяліў у 1833 годзе 63 171 рубель[17].

У 60-я гады XIX стагоддзя зноў быў праведзены рамонт, падчас якога на фасадзе зніклі цэнтральныя пілястры, але яны з ´явіліся ў бакавых частках, па шэсць з кожнага боку. Замест атыка цэнтр фасада ўпрыгожыў франтон[18].

Чарговы рамонт васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя зноў змяніў фасад гімназіі. Аўтарам новага праекта стаў архітэктар Санкт-Пецярбургскага страхавога (ад агню) таварыства К. Гейне[19]. Дзякуючы яго праекту на фасадзе з ´явілася ляпніна, на франтоне распластаўся агромісты арол, профілі франтона былі заменены сандрыкамі.

І далей гэты будынак значна змяніў свой вонкавы выгляд і планоўку толькі пасля Другой сусветнай вайны, калі ўнутраныя памяшканні былі перабудаваныя пад кватэры.

Знік у мінулым стагоддзі касцёл дамініканаў, зменены падчас шматлікіх рамонтаў выгляд былой дамініканскай школы, і ўжо цяжка пазнаць у гэтым будынку былыя баракальныя дамініканскія муры. Толькі будынак па вуліцы Дамініканскай нагадвае сваю славутую даўніну.

1 Wiadomosci o dominikanach prowincyi Litewskiej zebral Wolyniak, cz I, Krakow. 1917
2 Тамсама, S. 92;
3 Wolyniak.— S. 95;
4 ЦДГА Літвы, Вільнюс, ф. 604, в. 1, адз. зах. 7500, арк. 1;
5 Тамсама.
6 Niemcewicz I. U. Podroze historyczne.— Paryz; Petersburg, 1858.S. 358;
7 ЦДГА Літвы, Вільнюс, ф. 567, в. 27, адз. зах. 92;
8 Wolyniak.— S. 95;
9 Instytut sztuki PAN. пед. № 51122;
10 ЦДВГА СССР, ВУ-21873;
11 Archiwum wojewodzki w Bialymstoku, teka 316, S. 52;
12 ЦДГА Літвы, Вільнюс, ф. 604, в. 1, адз. зах. 2679, арк. 2;
13 Wolyniak.— S. 35;
14 ЦДГА Літвы, ф. 694, в. 5, адз. зах 840, арк. 6;
15 ЦДГА Беларусі, Гродна, ф. 8, в. 1, адз. зах. 1640, арк. 1—2;
16 ЦДГА Літвы, Вільнюс, ф. 567, в. 27, адз. зах. 4;
17 ЦДГА Беларусі, Гродна, ф. 8, в. 1, адз. зах. 152, арк. 5;
18 ЦДГА Літвы, Вільнюс, ф. 567, в. 27 адз. зах. 4;
19 Тамсама.

Аляксандр Мілінкевіч
(Гродна)

ГРОДЗЕНСКАЯ КАРАЛЕЎСКАЯ МЕДЫЧНАЯ АКАДЭМІЯ

Рэч Паспалітая ў XVIII ст. перажывала вельмі складаны перыяд сваёй гісторыі. З аднаго боку, глыбокае разбэшчванне ўсяго дзяржаўнага арганізму, анархія палітычнага жыцця, заняпад гарадоў і вёсак прывялі да падзелу гэтай дзяржавы агрэсіўнымі суседзямі — Расіяй, Прусіяй і Аўстра-Венгрыяй і да яе знікнення з палітычнай карты Еўропы ў 1795 годзе. З другога боку, у другой палове гэтага стагоддзя ў Рэчы Паспалітай набіраюць сілу працэсы ўнутранага адраджэння, на арэну грамадскага жыцця выходзіць шэраг прагрэсіўных рэфарматараў, якія робяць сур ́ёзныя захады ў драматычным змаганні з усемагутнай цемрай і духоўным варварствам. Ідэі і думкі Асветы былі асноўнай зброяй разбурэння сістэмы паняццяў і законаў, што стаялі на варце «залатой вольнасці» магнатаў і шляхты, феадальнай раздробленасці і невуцтва. У 1773 годзе ў Рэчы Паспалітай ствараецца першае ў Еўропе міністэрства адукацыі — Адукацыйная камісія, якая надала школьнаму выхаванню свецкі характар. У гэты час у Кракаўскім і Віленскім універсітэтах схаластычную філасофію выціскаюць прыродазнаўчыя навукі, у краіне паяўляецца сетка мануфактур, нарастае разняволенне сялян, ажыўляецца гандаль, праводзяцца рэформы па ўмацаванні цэнтралізаванай улады.

Аднак трагічны канец гэтых працэсаў быў вызначаны тым, што хуткасць разбэшчвання старога ладу не адпавядала тэмпам развіцця новых сілаў, якія прыйшлі б на замену іх, паачышчалі б дзяржаву ад таго, што згніло, абудзілі б яе ад летаргічнага сну. Прыхільнікі рэформаў на чале з каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім складалі мізэрную меншасць сярод шматлікай шляхты і магнатэрыі, якія бачылі ў гэтых спробах замах на свае палітычныя прывілеі і незалежнасць. Адзінкі «новых людзей», што не абапіраліся ні на якія сур ́ёзныя грамадскія сілы, змагаліся ў пустаце і саступалі кансерватыўным колам, адвучаным ад самастойнага мыслення.

Адным з найбольш вядомых і таленавітых паплечнікаў караля ў змаганні за адраджэнне краіны быў гродзенскі староста граф Антоні Тызенгаўз (1733—1784), чалавек моцнай волі і надзвычайнай энергіі, які ператварыў Гродна, разбураны войнамі XVII і пачатку XVIII стст., у «кветку-Галандыю». Абраўшы за галоўнае месца сваёй дзейнасці Гарадніцу* пад Гроднам, ён стварае тут культурна-прамысловы і навучальны цэнтр, які быў найбуйнейшым на Беларусі. Нават сціплы пералік зробленага гродзенскім старастам на

* Раён сённяшніх плошчы Леніна і вуліцы Ажэшкі.

працягу 15 гадоў уражвае і здзіўляе. Дзеля развіцця рамёстваў Тызенгаўз заснаваў цэлы шэраг мануфактураў: суконную, палатняную, шаўкаткацкую, залататкацкую, панчошную, паркаленабіўную, свечачную, фарбавальную, капялюшную, гульнёвых картаў, карункавую, металічных вырабаў, зброі, гарбарную, іголкавую і шпількавую, алейную. Для навучання мясцовых прыпісных казённых сялянаў, што працавалі на гэтых фабрыках, былі запрошаны выдатныя майстры з Германіі, Галандыі, Францыі і Швейцарыі, для іх будуецца сваё пасяленне ўздоўж вуліцы Раскоша. У Гродне адчыняецца гандлёвы дом са значным замежным крэдытам. Для паляпшэння камунікацыяў пракладваюцца новыя дарогі, паўстаюць масты, каналы, у прыватнасці Днепра-Бужскі. Вялікі аматар і мецэнат мастацтва, Тызенгаўз у сваім палацы на Гарадніцы сабраў выдатную калекцыю карцінаў, з яго ініцыятывы паўсталі і плённа працавалі капэла, аркестр, балет і тэатр. У гродзенскай друкарні выдавалася газета, календары, кнігі. Як прыхільнік ідэяў еўрапейскай Асветы, Тызенгаўз стварае ў Гродне школы гандлю, будаўніцтва, музычную, балетную, бухгалтарскую, каморніцкую, акушэрскую і кадэцкі корпус. Але найвялікшую славу і гонар гродзенскаму старасту прынесла Каралеўская медычная акадэмія.

Факт стварэння гэтай навучальнай установы ў II палове XVIII ст. у Гродне мае асаблівае значэнне ў гісторыі медыцыны Беларусі; у той час на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай па сутнасці не было ніводнага факультэта, які б рыхтаваў урачоў для краіны. У Кракаўскім універсітэце ад 1775 года медычныя навукі ўвогуле не выкладаліся, а ў Вільні яшчэ толькі планавалася стварэнне медычнага факультэта. Юнакі, што мелі намер грунтоўна вывучаць медыцыну, ад ´язджалі за мяжу, а ў шпіталях працавалі пераважна іншаземцы.

Калі ініцыятыва адкрыцця на Гарадніцы Медычнай акадэміі належыць Антонію Тызенгаўзу, то яе стварэнне — заслуга выдатнага французскага вучонага-натураліста Жана Эманюэля Жылібэра.

Гэты прафесар медыцыны з Ліёна быў запрошаны ў Гродна блізкім супрацоўнікам Тызенгаўза, рэчыцкім харунжым Тадэвушам Даўнаровічам, якога той у 1773 г. накіраваў на два гады ў Заходнюю Еўропу дзеля пошуку прыдатных для працы на Гарадніцы людзей, азнаямлення з «воднымі машынамі», сельскай і рыбнай гаспадаркамі. У час свайго падарожжа пасланнік наведаў Ганновер, Амстардам, Гамбург, Лондан, Манчэстар, Бардо, Парыж, Ліён і Луку ў Італіі. 25 красавіка 1775 г. у сваім лісце з Ліёну ў Гродна ён піша: «Знаходжу тут канавальскую школу, якой не бачыў ні ў якой краіне, з анатоміяй усіх жывёлін, лепшымі медыкамі або прафесарамі папулярнай медыцыны заложаную». Даўнаровіч спачатку шукаў для Гарадніцы «студэнта» з гэтай школы, які мог бы лячыць жывёлін, але ўрэшце знайшоў нават «прафесара папулярнай медыцыны». Нягледзячы на тое, што апошні патрабаваў 120 луідораў у год, Даўнаровіч раіць яго ангажыраваць, бо той можа зарганізаваць школу не толькі ветэрынарную, але і медычную.

З біяграфіі Ж. Э. Жылібэра да нас дайшлі наступныя звесткі. Нарадзіўся ён 21 чэрвеня 1741 года ў в. Карэт (Carette), што ў Даліне дэ Сан-Клэр (Vallon de Saint-Clair) каля Ліёну ў сям ´і Клаўдзія і Агаты з дому Джаміньяні. Сваё дзяцінства маленькі Жан правёў у роднай вёсцы. Ягоныя бацькі, небагатыя і заўсёды занятыя цяжкай сялянскай працай, не мелі часу для выхавання хлопчыка, і яго навукай займаўся брат бацькі яго маці ксёндз Джаміньяні. Магчыма, што пад уплывам гэтага вядомага і ўсімі паважанага настаўніка, паэта і аўтара вядомай у той час кнігі «Паэзія аб Святым Пісанні і аб многіх іншых тэмах набожнасці», малады Жылібэр быў прызначаны да

духоўнай кар ´еры. У 7 гадоў Жылібэр пераехаў у горад і пачаў вучыцца ў школе. Сухая сістэма навучання, якая там панавала, прыгнятала энергічнага хлопца і не надта заахвочвала да старанных заняткаў. Ад самага маленства яго глыбока цікавілі багацце і прыгажосць навакольнай прыроды. Ужо ў 12 гадоў ён марыў аддаць сваё жыццё вывучэнню натуральнай гісторыі; і як ён сам пазней адзначаў: «Схільнасць, якую я заўсёды меў да навукі, складала шчасце майго жыцця, прыносіла чароўныя моманты поспехаў, ратавала ад роспачы ў бядзе».

Пасля заканчэння школы ў 1757 годзе Жылібэр цэлы год вывучаў філасофію пад кіраўніцтвам выдатнага настаўніка, пра якога вельмі цёпла пісаў у сваіх успамінах.

У 1760 годзе* ад ´язджае да Манпелье на поўдні Францыі, дзе вывучае медыцыну ў мясцовым універсітэце. Батаніку і прыроду выкладалі тут выдатныя прафесары Саваж і Гуан. Гэта быў бліскучы перыяд у гісторыі існага з XIII ст. медычнага факультэта універсітэта ў Манпелье, дзе студэнты атрымлівалі не толькі грунтоўныя веды, але і навыкі навукова-даследчай працы. У жніўні 1763 года пасля абароны дыплома «De natura medicatrice» Жылібэр вяртаецца ў Ліён, дзе займаецца медычнай практыкай і гербарызуе. У гэты час ён знаёміцца з прыродазнаўцамі Вілерсам, Ля Турэтам і Раз ´ерам, сяброўства з якімі падтрымлівае праз трыццаць гадоў. З ліпеня 1766 года Жылібэр стала жыве на вёсцы, бо паводле закону таго часу універсітэцкі дыплом прызнаецца толькі пасля двухгадовай практыкі на вёсцы.

У час побыту ў Ліёне ў 1768 годзе выдатнага філосафа Жана Жака Русо Жылібэр блізка з ім знаёміцца, праводзіць доўгі час у размовах і дыскусіях, падарожнічае разам з ім па ваколіцах. (Магчыма, што менавіта гэтае знаёмства і рэкамендацыі Жылібэра дазволілі А. Тызенгаўзу ў час побыту ў Парыжы ў 1778 г. угаварыць Ж. Ж. Русо пераехаць жыць у Гродна на Гарадніцу. Для працы ў адзіноце «парыжскаму пустынніку» быў запрапанаваны дом у Белавежскай пушчы, «неабмежаваная вольнасць», любыя паслугі, якіх бы жадаў сабе. На жаль, гэтую ўмову Тызенгаўз не паспеў зрэалізаваць).

У 1768 годзе Жылібэра выбіраюць на пасаду прафесара анатоміі, хірургіі і натуральнай гісторыі Медычнага каледжа ў Ліёне, дзе акрамя яго выкладалі яшчэ два прафесары — Жалі і Віле. 27 лістапада таго ж года раз ´юшаны натоўп, абвінавачваючы каледж, як месца «дзе анатамуюць жывых дзяцей», знішчыў яго абсталяванне, мэблю, творы мастацтва, батанічныя, анатамічныя і мінералагічныя калекцыі і ў рэшце падпаліў будынак. Толькі праз 300 ахвяраў прыбыўшае войска здолела разагнаць людзей.

Пасля адбудавання каледжа Жылібэр закладае за свой кошт батанічны сад, маючы падтрымку каралеўскага інтэнданта і абяцанне міністра, што сродкі на гэтую мэту будуць выдаткаваны. Па-ранейшаму Жылібэр шмат часу аддае гербарызаванню: 1769 — Гранд-Шартроз, 1772 — Гранобль, Альпы. У 1773 годзе наведвае музеі і сады Парыжа, знаёміцца з вучонымі Бернарам і Жазэфам дэ Жус ´ё. У гэты час Жылібэра напаткаў жудасны лёс: у выніку непаразумення сродкі, прызначаныя на закладанне батанічнага саду, не былі выплачаны, і прафесар, які выдаў іх работнікам і прадпрымальнікам з уласнай кішэні, канчаткова дайшоў да галечы. Пакрыўджаны, Жылібэр да таго ж яшчэ зусім сапсаваў свае адносіны з мясцовымі медыкамі пасля публікацыі свайго артыкула «Лекавая анархія», дзе ён востра крытыкаваў някемнасць і малаадукаванасць урачоў, сістэму навучання медыцыне ва ўніверсітэтах. У яго нараджаецца думка пакінуць радзіму, ён звярнуўся па параду да вядомага швейцарскага медыка, фізіёлага і батаніка Альбэрта Халера з Берна, з якім падтрымліваў карэспандэнцыю. Менавіта ў гэты час Жылібэр атрымаў

Па іншых звестках у 1759 г.

прапанову ад Даўнаровіча, бо той, як пазней сам пісаў: «...як прыватны пасланнік польскага караля шукаў урача, які б прыроду Вялікага княства Літоўскага мог бы апрацаваць, сад батанічны закласці і школу медычную стварыць». (Ва ўспамінах Ж. Э. Жылібэра і ў адным з лістоў караля чытаем, што ён быў заангажываны ў Гродне ў чэрвені 1774 г. Аднак гэта хутчэй за ўсё непаразуменне, бо Даўнаровіч трапіў ў Ліён толькі ў 1775 г. (Ужо 1 жніўня 1775 года пакідае свой родны Ліён і кіруецца ў яму невядомы горад Гродна, забяспечаны багатым гербарыем з 3000 раслінаў і бібліятэкай. У час свайго падарожжа Жылібэр знаёміцца з Банэ ў Жаневе, Халерам у Бэрне, Жаснерам у Цурыху, Жакенам у Вене. Усюды яго прымаюць шчыра, дапамагаюць радамі, падтрымліваюць. Жакэн нават ахвяраваў насенне экзатычных раслінаў, якія пазней будуць выкарыстаны для гродзенскага батанічнага саду. 9 кастрычніка Даўнаровіч разам з Жылібэрам былі ў Варшаве. У канцы таго ж года Жылібэр прыехаў у Гродна. Пасля азнаямлення з сітуацыяй на месцы была складзена дамова паміж Яснавяльможным панам Графам Тызенгаўзам, Падскарбіем надворным Вялікага княства Літоўскага і Жылібэрам, заслужаным Прафесарам Медыцыны ў Каралеўскім Ліёнскім Каледжы і доктарам Факультэта медыцыны ў Акадэміі ў Манпелье:

«Я, Жан Эмануэль Жылібэр, бяру на сябе наступныя абавязкі:

На працягу ўсіх дзесяці гадоў аддаваць сваю працу і стараннасць маю Каралю і Рэчы Паспалітай у закладанні Школ медычных і Ветэрынарных і да выканання абавязацельстваў, што карысць грамадскую маюць, і Яснавяльможным графам на мяне ўскладзеныя.

Вучняў здольных вучыць буду абодвум медыцынам і зраблю іх прыдатнымі і карыснымі ўрачамі.

Закладу сад, неабходны для Школы Медычнай,

Музэй для навучання Гісторыі натуральнай,

Гісторыю натуральную Княства Літоўскага буду падаваць у часопісе Акадэміі Гарадніцкай, што мае быць створана».

Яснавяльможны Граф Тызенгаўз для Доктара Жылібэра вызначыў наступныя пункты:

«1. Ад дня жніўня 1775 (даты ад ´езду з Ліёна) за кожны год працы Публічнай выплачана будзе сума 125 злотых па Рахунку Французскаму (Луідор), што складае паводле курсу манеты гэтага народу 280 злотых, вышэй найменаванаму прафесару выплачаны пунктуальна будуць.

2. Скарб эканамічны каралеўскі да прыватнага ўжытку Прафесара прызначае адпаведна да пасады Чалавека на Функцыі Публічнай жыццё, кватэру, апал, свечкі, а таксама іншыя неабходныя рэчы. Для жонкі названага Доктара і для двух асоб іх службы прызначаецца натуральная аплата паводле прыкладнага спецыяльнага пераліку.

3. Для выгоды і выкарыстання названага прафесара ў стайнях падскарбія будзе за кошт публічны пара коней.

Мы, ніжэй падпісаныя, усе пералічаныя вышэй умовы прымаем і пячаткай нашай сцвярджаем. У Гродне дня 9 месяца мая г. 1776».

Перш за ўсё Жылібэр пачаў ствараць батанічны сад, які праз некалькі гадоў будзе залічаны разам з Лонданскім і Пецярбургскім да найлепшых у Еўропе і атрымае пачэсную назву «Каралеўскі». Прафесар збірае са сваімі вучнямі ў ваколіцах Гродна, Беластока, Варшавы, Нясвіжа, Навагародка, Вільні, Шчорсаў разнастайныя расліны, робіць гербарыі. З розных гарадоў на Гарадніцу прыходзяць скрынкі з насеннем, якія спецыяльны садоўнік старанна

высаджваў і гадаваў. У 1778 г. сад меў 1500 відаў экзатычных раслінаў, сярод іх былі вельмі далікатныя экзэмпляры з Паўднёвай Амерыкі. Аб гэтым успамінаюць у сваіх дзённіках англійскі падарожнік У. Кокс і выдатны швайцарскі вучоны Ё. Бернулі, што наведвалі Гродна.

Сам Жылібэр у кніжцы «Аўтакрацыя Прыроды» так апісвае стан і арганізацыю навукі ў Гродзенскай каралеўскай медычнай акадэміі: «Каралеўская аптэка была пад маёй дырэкцыяй, службоўцы шпіталя залежалі ад мяне; ... вучні, утрымліваныя за кошт Караля, слепа падпарадкоўваліся мне; кожны з іх абслугоўваў некалькі хворых у шпіталі на 60 ложкаў; залы былі дастаткова прасторныя і лёгка праветрываліся вентылятарамі... Я меў каадзьютарам пана Хінсельмана, вучня знакамітага Юнкера, добрага хіміка і вялікага практыка. Пан Вір ´ё, французскі хірург, былы прафесар анатоміі з Нансі, і доктар медыцыны з Страсбурга, малады чалавек, вельмі адукаваны, былі адказнымі за хірургічную частку: тут панавала вялікая гармонія...» Вядома, што ў акадэміі выкладалі таксама Мюнц і Мэнар.

Кабінет Натуральнай Гісторыі меў выдатную калекцыю на 10 000 мінералаў, мноства гербарыяў, фізічных прыбораў, розныя шкілеты жывёлін і людзей. Акадэмія магла ганарыцца сваёй багатай бібліятэкай, дзе былі ўсе неабходныя для навукі кніжкі, «парыжская энцыклапедыя і мноства найноўшых прац, выдадзеных у Францыі і Германіі ў галіне медыцыны і натуральнай гісторыі». Тут знаходзіліся і 300 гравюр раслінаў на медзі. А над уваходам у анатамічны тэатр і кабінет па даручэнні караля праўдзіва быў зроблены надпіс: «Тут сама смерць на карысць чалавецтву абарачаецца». Пры акадэміі працавалі два паляўнічыя, два птушкаловы і рыбак. Была закладзена школа акушэркаў, дзе выкладала акушэрка з Парыжа. У сваіх успамінах Жылібэр напіша, што Тызенгаўз даў «магчымасць зрабіць за 4 гады тое, чаго ў Францыі і за 20 не здолеў бы».

Спецыяльна для акадэміі на вялікай эфектнай плошчы Гарадніцы быў пабудаваны прыгожы будынак у стылі барока, які меў сіметрычную кампазіцыю з калідорнай планоўкай. Цэнтральная трохпавярховая частка была накрыта вальмавым дахам. Галоўны фасад раскрапаваны па вуглах дзвюма вялікімі гранёнымі эркерамі з самкнутымі ўвагнутымі купаламі. Фасады былі аздоблены пілястрамі вялікага ордэра і пластыкай. Па баках да асноўнага аб ´ёму прылягалі аднапавярховыя флігелі з трохсхільнымі дахамі. (Гэты помнік архітэктуры XVIII ст. захаваўся па вул. Ажэшкі, 20, але знаходзіцца пад пагрозай знішчэння: пасля засыпкі рэчышча Гараднічанкі пры пабудове новай пл. Леніна грунтавыя воды падняліся і затапляюць падвалы былой акадэміі аж па самыя скляпенні, у выніку цэгла падмуркаў рассыпаецца, а грыбок распаўсюдзіўся да другога паверху).

Нястомны Жылібэр плануе арганізацыю сельскагаспадарчай і ветэрынарнай школаў, а думкі Тызенгаўза ідуць яшчэ далей: ён ставіць мэту стварыць у Гродне Акадэмію навук. На вялікі жаль, стваральнік і натхняльнік Гарадніцы Антоні Тызенгаўз у выніку інтрыгаў і зайздрасці ў 1780 г. быў зволены з пасады гродзенскага старасты і Жылібэр, страціўшы свайго мецэната, быў вымушаны ў 1781 г. пераехаць разам са сваімі вучнямі ў Вільню, дзе пры падтрымцы Марціна Пачабута і Яўхіма Храптовіча стварае на базе гродзенскай акадэміі факультэт медыцыны ў мясцовым універсітэце. Жылібэр узначальвае кафедру натуральнай гісторыі і батанікі і вывозіць з Гродна выдатную калекцыю на 10 000 мінералаў, бібліятэку з 3000 тамоў, у тым ліку 500 рэдкіх, хірургічныя інструменты, астранамічныя і фізічныя прыборы, большасць каштоўных раслінаў батанічнага саду.

У Вільні Жылібэр закладвае батанічны сад, стварае заалагічны кабінет, працягвае навуковую працу. Выходзяць у свет ягоныя кніжкі, у тым ліку «Флора Літвы» на 5 тамоў (3 першыя выдадзены яшчэ ў Гродне). Ксёндз Юндзіл пісаў пра гэтага выдатнага вучонага: «Прафесар гэты навуцы сваёй цалкам аддадзены, аб поспехах вучняў і карысці краіны нястомна клапоціцца...»

Умовы працы былі нялёгкія. Адносіны натураліста Жылібэра, асабліва з езуітамі, склаліся напружаныя, што не прыносіла задавальнення работаю. Ды і ў асабістым жыцці адбыўся канфлікт: зямляк Жылібэра Шавалье дэ Бярлюк, якому той даў прытулак, паспрабаваў адбіць ягоную жонку, дзеля чаго хацеў атруціць прафесара. На шчасце, любімы вучань Жылібэра Ануфры Арлоўскі здолеў выратаваць яго. На пачатку 1783 г. ён нечакана для многіх выехаў у Варшаву, а адтуль у Францыю «вывозячы з гэтага пабыту больш дасведчання, чым грошай».

Асабліва засмучаны з гэтай нагоды быў кароль, якога з Жылібэрам звязвалі блізкія сяброўскія адносіны. Ён увесь час цікавіўся навуковаю працаю прафесара, праводзіў з ім доўгія гадзіны ў Гродне, дыскутаваў па фізіцы, натуральнай гісторыі, запрашаў да сябе на абеды. Па яго заказу быў зроблены мармуровы бюст вучонага і адбіты два медалі ў ягоны гонар. Кароль быў нават хросным бацькам сына Жылібэра, што нарадзіўся ў Гродне ў 1780 г. і атрымаў у яго гонар імя Станіслаў-Аўгуст Яўхім...

У сваім родным Ліёне Жылібэр працуе эпідэміёлагам у шпіталі Хастэль-Дзьё, прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыі. У 1792 г. ён займае пасаду прафесара натуральнай гісторыі інстытута навук і карысных мастэрстваў. У наступным годзе яго абіраюць мэрам Ліёна, бо як пісаў аб ім «Журнал лэ Ліён», гэта: «Надзвычайны патрыёт, гарачы сябра рэвалюцыі, энтузіяст свабоды». Але ў выніку ілжывага даносу ён трапляе ў турму, потым вызваляецца, становіцца старшынёй Народнай рэспубліканскай Камісіі Рона і Луары. У час тэрору знаходзіўся на поўдні Францыі, дзе працягвае навуковыя доследы. Пасля пакарання смерцю Рабесп´ера і ліквідацыі рэвалюцыйнага праўлення вяртаецца Жылібэр у Ліён, дзе меў бездакорны аўтарытэт, дзякуючы сваёй барацьбе ў абарону закона, роўнасці, справядлівасці, ладу і парадку. Разачараваны ў палітыцы, ён цалкам аддаецца навуковай працы, узначальвае таварыства медыкаў, здароўя, выкладае ў цэнтральнай школе, стварае Ліёнскі батанічны сад, перапісваецца з найбольш славутымі вучонымі Еўропы. Ягоныя навуковыя заслугі былі прызнаны вынаходствам новага віду расліны з назвай Жылібэрцыя. Памёр Жан Эманюэль Жылібэр 2 верасня 1814 г. у Ліёне.

Калі коратка, такі жыццёвы шлях першага даследчыка флоры і фаўны Беларусі, стваральніка першай медычнай навучальнай установы ва Усходняй Еўропе, аб якім «філосаф на троне» кароль Станіслаў Аўгуст сказаў: «... пачцівы без грымасаў, непасрэдны без грубасці, красамоўны без падрыхтоўкі і вучоны без фанабэрыстасці». На жаль, яшчэ многія старонкі дзейнасці Жылібэра ў Гродне застаюцца невядомымі: не даследаваны былыя архівы А. Тызенгаўза ў Паставах і графа А. Храптовіча, не вывучаны працы Жылібэра па арганізацыі лекарскай справы і грамадска-палітычных адносінах у Рэчы Паспалітай, а таксама ягоныя гродзенскія і віленскія гербарыі, якія ў 1841 г. былі вывезены ў Кіеўскі універсітэт.

* Раён сённяшніх плошчы Леніна і вуліцы Ажэшкі.

* Па іншых звестках у 1759 г.

Юрась Гардзееў
(Гродна)

З ГІСТОРЫІ ПОМНІКА АНТОНІЮ ТЫЗЕНГАЎЗУ Ў ГРОДЗЕНСКІМ ФАРНЫМ (ПАЕЗУІЦКІМ) КАСЦЁЛЕ

Імя і дзейнасць Антонія Тызенгаўза не патрабуе ніякай рэкламы. Пачаўшы сваю кар´еру як дзеяч грамадска-палітычны, А. Тызенгаўз праславіўся значна больш як рэфарматар гаспадаркі, мецэнат навукі і мастацтва. Грандыёзныя рэформы падскарбія надворнага Літоўскага і гродзенскага старасты былі самай вялічэзнай інвестыцыяй кароля Станіслава Аўгуста Панятоўскага[1] і мелі на мэце будаўніцтва «буйнага прамысловага цэнтра»[2], удасканаленне формаў і метадаў сельскагаспадарчай вытворчасці, рэформы ў галіне сацыяльнай і вытворчай інфраструктуры, культурнага жыцця. Як і многія іншыя прадпрыемствы прагрэсіўных магнацкіх колаў, справа А. Тызенгаўза пацярпела крах з прычыны палітыка-эканамічнай прыроды Рэчы Паспалітай.

Род Тызенгаўзаў старадаўні. Прынамсі, першыя звесткі аб ім вядуць у XII ст.[3]. Трохі блытаным застаецца пытанне паходжання роду Тызенгаўзаў. С. Касцялкоўскі, які 35 гадоў працаваў над манаграфіяй, прысвечанай жыццю і дзейнасці падскарбія надворнага Літоўскага А. Тызенгаўза, адзначаў, што род гэты паходзіць з Гальштэйна з дому Сегабарг[4]. Пошукі 1820—1848 гг., якія праводзіліся з мэтай выяўлення паходжання роду графаў Тызенгаўзаў, прывялі да высновы: род бярэ свае пачаткі з Брабанта і Галандыі*[5].у У XII ст., а дакладней у 1196 г., продкі славутага падскарбія, якія «мелі месцазнаходжанне сваё ў г. Любаку, дзе валодалі цэлаю вуліцаю дамоў», прыбылі ў вусце Дзвіны, у інфлянты[6]. Любак жа — гэта горад зямлі Гальштэйн, якая знаходзілася недалёка, на паўночны ўсход ад Бранта і Галандыі. Усе гэтыя тэрыторыі у XII ст. уваходзілі ў склад Свяшчэннай Рымскай імперыі[7], і таму месцазнаходжанне роду фактычна не змяняецца, а толькі пашыраецца ягоны сямейны арыял. У XII ст. некаторыя прадстаўнікі з роду Тызенгаўзаў, пакінуўшы даволі значны маёнтак ў інфлянтах, перасяліліся на тэрыторыю сучаснай Літвы і Беларусі[8], дзе паланізаваліся на працягу XVII — XVIII стст. Для часоў панавання кароля Станіслава Аўгуста асоба, на якую звярталася шмат увагі, быў Антоні Тызенгаўз. У пачатку XIX ст. ксёндз Францішак Ксаверны Богуш, які суправаджаў падскарбія ў падарожжы 1777—1778 гг. у Германію, Галандыю, Францыю, Англію[9], з 1773 г. быў прэфектам шляхецкага канвекта[10], пакінуў пасля сябе спадчыну — мемуары. Менавіта ў мемуарах блізкага да А. Тызенгаўза К. Богуша, знаходзілася прапанова ўвекавечыць

* Цяпер гэта ў асноўным частка тэрыторыі Нідэрландаў, за выключэннем паўднёвага Брабанта (Бельгія).

і ўважыць імя гродзенскага старасты ўзвядзеннем яму каля маста на гарадніцы помніка[11]. Гэта прапанова, як вядома, так і засталася на паперы. Адначасова з незаўважанай думкай К. Богуша, у першай палове стагоддзя, сваяк А. Тызенгаўза граф Канстанцін Тызенгаўз вырашыў узвесці ў Гродзенскім фарным касцёле помнік свайму продку. Так нарадзілася ідэя пабудовы помніка ў сценах Гродзенскага паезуіцкага касцёла. У 1855 г. К. Тызенгаўз памёр, так і не выканаўшы свой маральны абавязак. У сваім духоўным тастамэнце ён «усклаў на сына графа Райнольда Тызенгаўза абавязак узвесці помнік свайму дзеду Антону Тызенгаўзу...». Не паспеў зрабіць гэтага і Райнольд, бо таксама памёр[12]. Па загадзе ягонай сястры графіні Марыі Пжаздзецкай вядомы разьбар з Львова Томаш Дыкас* у 1886—1887 гг. падчас сваёй мастацкай вандроўкі ў Варшаве выканаў помнік, частка якога, а менавіта постаць жанчыны з гіпсу, была пададзена ў 1887 г. у Таварыстве аматараў дыстынктоўных мастацтваў у Вільні[13]. Помнік быў зроблены з шэрага мармуру. Пасярэдзіне яго масяжны медальён с рэльефным бюстам графа Антонія Тызенгаўза; на прыступцы помніку жаночая постаць з дзвюма пальмавымі галінамі, постаць выяўляе алегорыю «Гораплачу»[14]. На табліцы помніка надпіс: «Antoni hr. Tyzenhauz, starosta grodhienzki, podskarbi W. KꝛL. ur. 1733—1785. Marja z hr. Tusenhauzow Aleksandrowa hr Przezdziecka, spzlenia, jac Wole ojca i brata, pomnik ten Wzniosla»[15].

Магчыма, гэты надпіс даў падставы Я. Арлоўскаму сцвярджаць, што помнік быў узведзены ў гродзенскім фарным касцёле Марыяй Пжаздзецкай[16]. Арлоўскі памыляўся, бо каля 1990 г. (а менавіта гэтую дату ўзнясення ён падае) графіні ўжо не было сярод жывых. Яна памерла дзесьці паміж 1886 і 1893 гг., бо каля 1886 г. графіня загадала пабудаваць (а не ўзнесці, як гэта напісана на табліцы помніка) помнік[17], а ў 1893 г. яе сын граф Канстанцін Пжаздзецкі ў «прашэнні на імя гродзенскага губернатара пісаў, што маці памерла і што ён мае намер «давесці да канца выкананне запавету свайго дзеда»[18]. Граф выканаў свой сямейны абавязак і акрамя таго зрабіў тое, што не прадугледзела яго маці. У верасні 1894 г. граф звярнуўся ў Віленскую рымска-каталіцкую кансісторыю з просьбаю дазволіць узвядзенне раней зробленага ў 1886—1887 гг. помніка і сутыкнуўся з наступнай праблемай. Для ўстаноўкі помніка спатрэбілася паменшыць алтар капліцы Св. Міхаіла. Кансісторыя дала такі дазвол, адначасова патрабуючы таго ж ад грамадзянскіх уладаў[19]. Згодна з апошняю датаю можна зрабіць пэўную здагадку і вызначыць храналагічныя рамкі працы над памяншэннем памераў алтара капліцы і ўзнясеннем помніка ў ёй графу Антонію Тызенгаўзу. Я. Арлоўскі адзначаў, што помнік быў узнесены каля 1900 г.[20] Цяжка не згадзіцца з Арлоўскім, улічваючы факт таго, што з 1895 г. пачаліся працы з мэтаю паменшыць памеры алтара капліцы Св. Міхаіла, якія, магчыма, цягнуліся некалькі гадоў і завяршыліся ўзнясеннем помніка падскарбію надворнаму літоўскаму Антонію Тызенгаўзу.

[1] Zarys historii Polsk; — W, Piw, 1979. S. 336.

[2] Воблый К. Г. Очерки по истории польской фабричной промышленности. Т. I.— Киев, 1909. С. 56.

[3] ЛДГА Ф. 391 воп. 1. с. 1080 ар. 53.

* Тамаш Дыкан — разьбар, аўтар помнікаў А. Міцкевічу ў Тарнаполю, Пшэмыслю, Злачове, праектаў-помнікаў у Кракаве і Варшаве і г. д.

[4] Koscialkowski S. Antoni Tyzenhauz, podskarbi nadwovny litewski. London, 1970. T. I. S. 29.
[5] ЛДГА Ф. 391 воп. 1 с. 1080 ар. 1
[6] Там жа ар. 53.
[7] История средних веков. М., 1990. Т. I. С. 302.
[8] Koscialkowski S. Antoni Tyzenhaus. T. 1. S. 30.
[9] Jadkowski J. Grodno. Wilno, 1923. S. 38; Koscialkowski S. Antoni Tysenhaus... London, 1971. T. S. 342—343.
[10] Jadkavski J. Grodno. S. 87.
[11] Ks. Bohusz X. Spominka o Antonim Tyzenhauze // Tygodnik Wilenski, т. IX. — Wilno, 1820. № 161. S. 255.
[12] ЦДГА Рэспублікі Беларусь у г. Гродна. Ф. I. воп. 9 с. 148 ар. 3.
[13] Slownik artystow polskich i obcych u Polsce dzialaja, cych. Wroclaw, 1975. T. 2 S. 137.
[14] ЦДГА Рэспублікі Беларусь у г. Гродна Ф. I. воп. 9 с. 148 ар. 3.
[15] Jodkowski J. Grodno. S. 94.
[16] Орловский Е. Гродненская старина. Ч. I.— Гродно, 1910. — С. 181.
[17] Slownik artystow polskieh, т. 2. S. 137.
[18] ЦДГА Рэспублікі Беларусь у г. Гродна ф. 1 воп. 9 с. 148 ар. 3.
[19] ЛДГА Ф. 604 воп. 4 с. 4996, ар. 1, 4—5.
[20] Орловский Е. Гродненская старина. С. 181.

Аляксандр Плешавеня
(Гродна)

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ Ў ГРОДНЕ
(старонкі гісторыі)

Сярод першых актаў ворганаў савецкай улады ўлетку 1920 г. у Гродне быў і акт аб стварэнні музея прыроды. Адразу пачаўся збор экспанатаў. Але ў хуткім часе горад быў захоплены войскамі Польшчы і праца па стварэнні музея спынілася. Аднак і цяпер адзначае Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей гэту дату як пачатак свайго заснавання[1]. У 1990 годзе ён адзначыў сваё 70-годдзе — прайшла добра наладжаная творчая канферэнцыя.

І ўсё-такі першы музей у Гродне быў адчынены 9 снежня 1922 г. Яго заснавальнікам і кіраўніком многія гады быў вядомы гісторык Юзаф Ядкоўскі. У справаздачы музея за 1923 год, Ядкоўскі пісаў, што «...удалося ўвесці ў жыццё першы дзяржаўны музей на паўночна-усходніх граніцах Рэчы Паспалітай»[2].

Але ў міжваенныя гады быў адчынены яшчэ адзін музей у Гродне — музей прыроды, аб якім і пойдзе наша гаворка. Яго заснавальнікам быў жыхар Гродна Станіслаў Жыўна*, вялікі аматар і пазнавальнік прыроды. Цікавая гісторыя стварэння музея.

Пятнаццацігадовы юнак Станіслаў Жыўна ў пошуку месца ў жыцці і работы паехаў у 1908 годзе ў Амерыку. Змяніўшы некалькі прафесій, ён уладкаваўся ва універсітэт у штаце Канекцікут на пасаду прарэктара. Асвойваючы гэту прафесію пад кіраўніцтвам прафесара Воада, Жыўна пазнаваў таямніцы жывёльнага і расліннага свету, стаў заўзятым аматарам прыроды. Неўзабаве і сам пачаў калекцыянаваць экспанаты, рабіць кансервацыю, прэпараванне і апісанне. За некалькі гадоў ён стварыў багатую калекцыю — пераважна па энтамалогіі (насякомыя)**, мінералогіі, кахналогіі (ракавіны)*** і іншых кірунках.

У 1924 годзе Станіслаў Жыўна вярнуўся ў Гродна. Прывёз з сабою калекцыю. Яна зацікавіла мясцовых аматараў прыроды. Даведаліся пра яе і ў гарадской радзе. Яна стварыла спецыяльную камісію, якая прызнала калекцыю вельмі каштоўнай. У прынятай радай пастанове 24 ліпеня таго ж года гаварылася, што Станіслаў Жыўна бязвыплатна дорыць гораду Гродна

---

* Жыўна Станіслаў, нарадзіўся ў 1893 годзе ў Гродне, жыў па Завіленскім завулку, 23, а ў 1931 годзе — па вуліцы Цагельнай, 2. Памёр у 1940 годзе, пахаваны ў Гродне.

** Навука аб насякомых.

*** Падзел заалогіі па вывучэнню ракавін.

сваю калекцыю, што на яе аснове ствараецца гарадскі музей прыроды, а нядаўні гаспадар калекцыі пажыццёва назначаецца яго кіраўніком (ахоўнікам).

Часова калекцыю размясцілі ў двух пакоях аховы. С. Жыўна ўзяўся за сістэматызацыю экспанатаў, падрыхтоўку экспазіцыі музея[3].

Адчынены музей быў 21 лістапада 1926 года. Па тым часе ў ім было шмат экспанатаў, пераважна заморскіх: млекакормячых — 17 відаў, птушак — 340, матылькоў — 774, марскіх істотаў — 749, майскіх жукоў і аваднёў — 402, птушыных яек — 290, гнёздаў — 17, мінералаў — 355. Усяго — 2933[4].

Быў прыняты статут музея. Згодна з ім асноўнай задачай была актывізацыя навукі аб прыродзе і выхаванне ў людзей беражлівых адносін да яе. На чале музея стаяў камітэт з дванаццаці чалавек: два члены гарадской рады, адзін прадстаўнік магістрата, па адным прадстаўніку ад сярэдніх і пачатковых школ, ад дырэкцыі дзяржаўных лясоў, ад дзяржаўнага музея, ад таварыства аматараў прыроды, павятовай аховы прыроды, ад грамадскасці і кіраўнік музея прыроды. Нязменным старшынёй камітэта з ´яўляўся Ян Якімовіч, павятовы ўрач. Камітэт працаваў энергічна, разглядаў шмат арганізацыйных і навуковых пытанняў.

Колькасць экспанатаў пастаянна павялічвалася. Найпершая ўвага звярталася на мясцовую флору і фаўну. У 1929 годзе мясцовыя экспанаты ўжо складалі большасць, а агульная іх колькасць дасягнула амаль чатырох тысяч[5].

Значная частка экспанатаў была ад аматараў-калекцыянераў. Так, Марыя Венжык-Відоўская перадала музею сабраныя яе мужам дзвесце мінералаў Урала і Сібіры, сто дзесяць экспанатаў іншых горных парод, а таксама косці пазваночніка маманта, шмат іншых археалагічных знаходак.

Арнітолаг інжынер Адам Дзержаноўскі, жыхар Гродна, ахвяраваў сто шэсць экспанатаў водных птушак з розных краін свету. Перадаў ён і навуковыя працы па арніталогіі і свае работы па апісанні калекцыі. Яны паклалі пачатак бібліятэкі музея. Ян Каханоўскі, заснавальнік заапарку ў Гродне, перадаў музею 44 экспанаты, з іх 38 — птушкі мясцовай фаўны[6].

2 ліпеня 1927 года рыбакі злавілі ў Нёмане каля Гродна асятра. С. Жыўна ў справаздачы пра работу музея шкадаваў, што не ўдалося атрымаць шкуру для такога каштоўнага экспаната, засталося толькі фота рыбіны.

Каб аддзячыць прыхільнікам музея, была заведзена ганаровая кніга ахвяраванняў. Першым у ёй значыцца імя С. Жыўна, далей ідуць М. Венжык-Відоўская, А. Дзержаноўскі... А. Дзержаноўскаму быў пажыццёва нададзены тытул прарэктара музея[7].

Сам С. Жыўна наладзіў сувязі з лесаахоўнымі службамі, аматарамі прыроды, выязджаў у творчыя экспедыцыі. У чэрвені 1933 года ён пабыў у лясах каля Барова Лідскага павету. У справаздачы пісаў: «Я асабіста збіраў усё, што мне трапляла пад руку, не перастаючы радавацца, калі кожны дзень былі новыя віды з сямейства насякомых — конікі, даўганосікі і многае іншае, што не сустракалася ў ваколіцах Гродна»[8].

А ў ліпені таго года ён накіраваўся ў экспедыцыю ў Свянтакшыцкія горы па малахіты. (Сабраў каля ста дробных малахітаў). Сустрэўся з калекцыянерам Залескім, у якога было больш як тры тысячы камянёў. Ён прадаў музею 22 рэдкія мінералы. Наведаў С. Жыўна музей прыроды ў Кальцах, захавальнікам якога быў 91-гадовы Влошак, удзельнік паўстання 1863 года. Папаўняўся Гродзенскі музей прыроды за кошт памену з музеямі Львова, Катавіц, Варшавы і іншымі[9].

У дакументах архіўнага фонду «Гродзенскі гарадскі музей прыроды» (захоўваецца ў нашым архіве) ёсць звесткі пра вельмі каштоўныя і рэдкія археалагічныя знаходкі ў Гродне і ваколіцах, якія трапілі ў музей. У 1932 годзе пры пракладцы каналізацыі па цяперашняй вуліцы Тэлеграфнай была знойдзена на глыбіні 5,5 метра косць левай галёнкі маманта. У тым жа годзе каля вёскі Гожа вылавілі косць удава мамула[10].

У справаздачы музея за другі квартал 1938 года чытаем, што ў час будаўніцтва дарогі ў Румлёва (цяпер жылы раён Гродна) наткнуліся на паклады выкапнёвых чацвярцёвага перыяду. У справаздачы запісана: «Вялікія рэшткі расліннасці і жывёл пацвярджаюць, што калісьці, у старажытныя часы, тут быў водны басейн, верагодна возера ці рака, вада якой зносіла трупы затанулых жывёл і хавала іх у гэтым месцы. Сярод мноства рэштак выкапнёвых найважнейшым было адкрыццё касцей маманта і валасатага насарога. Многія экспанаты, знойдзеныя ў Румлёва, у выніку своечасовай іх кансервацыі былі выратаваны і неўзабаве выстаўлены ў вітрынах музея»[11].

З дакументаў фонда «Музей прыроды ў Гродне» мы даведваемся, што ў верасні 1937 года ў Румлёве праводзіў археалагічныя капанні Варшаўскі дзяржаўны геалагічны інстытут, у выніку якіх было знойдзена вялікая колькасць археалагічных матэрыялаў.

Даведаўшыся аб новых знаходках у Румлёве, Варшаўскі інстытут запатрабаваў спыніць капанні, а знойдзеныя экспанаты перадаць яму на той падставе, што яны з ´яўляюцца сткай яго ранейшай калекцыі.

Станіслаў Жыўна не хацеў аддаваць у Варшаву знойдзеныя ім экспанаты, хаця новыя пошукі былі спынены. Хвалюючыся аб лёсе знаходак у Румлёве, Станіслаў Жыўна пісаў, што прысланыя інстытутам людзі «ні маюць ніякага ўяўлення аб кансервацыі археалагічных выкапняў»[12]. Чым скончыліся спрэчкі пра знаходкі ў Румлёве, дакументы адказу не даюць.

Першага студзеня 1937 года музей меў 7288 экспанатаў. Ён быў адчынены штодзень, акрамя святаў, з 9 да 18, а ў нядзелю з 12 да 18 гадзін. Наведвалі музей у асноўным вучні і салдаты. У 1932 годзе яго наведалі 6934 чалавекі. Няшмат, але грошы патрабаваліся на зарплату толькі двум чалавека. Утрымліваўся музей за кошт бюджэту горада, фінансаванне яго ўвесь час пагаршалася. Калі ў 1930 годзе было выдзелена 15 600 злотых, то ў 1937 — толькі 7 641 злоты.

Пасля ўз´яднання Заходняй Беларусі з БССР музей працаваў плённа. Колькасць экспанатаў павялічылася да дзесяці тысяч. На пачатку вайны музей быў зачынены. Першы памочнік захавальніка Аўгусцін Звяржэвіч прыклаў шмат намаганняў, каб захаваць экспанаты: сачыў за іх станам, прыбіраў памяшканне, дзверы ў пакой замыкаў і застаўляў старой шафай. У 1953 годзе мясцком музея, выдаючы А. Звяржэвічу дакументы для афармлення пенсіі, запісаў у пратаколе: «Асаблівай заслугай перад вобласцю і рэспублікай з ´яўляецца самаадданая праца Звяржэвіча ў цяжкія гады часовай акупацыі Гродна, калі ён, не атрымліваючы зарплаты, адзін здолеў захаваць ад разграбавання багатыя калекцыі...»[13].

А. Звяржэвіч пасля вайны быў адным з галоўных супрацоўнікаў музея. Затым музей прыроды ператварылі ў філіял Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. З цягам часу і экспанаты з вуліцы Батанічнай былі перавезены на Замкавую. Там з імі і цяпер можна пазнаёміцца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі.

Далейшы лёс заснавальніка музея прыроды ў Гродне Станіслава Жыўны доўгі час быў невядомы. Супрацоўнікі музея таксама не ведалі пра яго. Але вось працуючы з дакументамі фонду «Гродзенскі Гарвыканкам», нечакана спаткаўся дакумент, у якім гаварылася аб лёсе Жыўны і яго сям ´і. Гэта рашэнне гарвыканкама № 282 ад 9 чэрвеня 1945 г.[14] З яго мы даведаліся, што Станіслаў Жыўна пасля уз ´яднання Заходняй Беларусі з БССР, працягваў працаваць у музеі прыроды ў якасці навуковага супрацоўніка. Аднак яго наспаткала хвароба і ў 1940 г. ён памёр. Паводле хадайніцтва дырэктара Гродзенскага музея Васілевіча за заслугі Станіслава Жыўны па стварэнні ў Гродне музея прыроды, яго жонцы — Разалі Вінсчэнтаўне была зацверджана персанальная пенсія 150 рублёў у месяц, а яго сыну Мечыславу — 50 рублёў у месяц да паўналецця.

Лічым, што імёны Жыўны Станіслава і Звяржэвіча Аўгусціна павінны знайсці адлюстраванне ў экспазіцыях раздзела прыроды ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі.

[1] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ), ф. № 689, воп. 1.

[2] Тамсама інв. № 2365 «Музей у Гродне».

[3] ДАГВ, ф. 104, воп. 1, справа 1, л. 20. Справаздача музея за 1927—29 гг., с. 2—7, Гродна, 1931 г.

[4] Тамсама.

[5] ДАГВ, інв. № 2303 «Nieman» (Часопіс), Гст. 14. Гродна, 1935 г.

[6] Тамсама, ф. 46, воп. 1, спр. 3, ст. 60.

[7] Тамсама, ст. 60—61.

[8] ДАГВ, ф. 104, воп. 1, спр. 9, ст. 2.

[9] Тамсама, спр. 9,10 і інш.

[10] Дагв, інв. № 2303 «Nieman» (Часопіс), падзел «Хроніка», Гродна, 1935.

[11] Тамсама, ф. 104, воп. 1, спр. 14, ст. 19.

[12] Тамсама, інв. № 2303, ст. 14, ф. 104, воп. 1, спр. 13, л. 35.

[13] ДАГВ, ф. 1269, воп. 1, спр. 62, л. 2.

[14] ДАГВ, ф. 484, воп. 1, спр. 124, л. 333; ф. 1171, воп. 1, спр. 36, л. 50.

НА ЗЯМЛІ ГАРАДЗЕНСКАЙ

Ала Квяткоўская
(Менск)

ДАСЛЕДАВАННІ КАМЕННАГА МОГІЛЬНІКУ КАЛЯ в. ВЕНЗАЎШЧЫНА ШЧУЧЫНСКАГА РАЁНА

Каменны могільнік знаходзіцца прыкладна за 80 м на паўднёвы захад ад вёскі, на ўскрайку выцягнутай марэннай грады вышынёй да 8—10 м, каля дарогі з в. Ванзаўшчына ў в. Матылі. Як паказалі даследаванні, магілы размешчаны не толькі на пляцоўцы ўзвышша, але і на яго схілах, не дасягаючы падножжа. У размяшчэнні магіл назіраецца сістэма — цягнуцца яны няроўнымі радамі ў напрамку з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. У гэтых няроўных радках магілы складаюцца групамі — па 2—4. Сярод мясцовых жыхароў могільнік гэты існуе пад назвай «Барок». Прычым, жыхары сцвярджаюць, што «тут пахаваны» воіны.

На працягу 1986* — 1989 гг. аўтарам закладзены 18 раскопаў агульнай плошчай 824 кв. м (даследаваннямі ахоплена амаль уся пляцоўка помніка, глядзі мал. 1). Ускрыты 133 пахаванні з трупапакладам, адно пахаванне па абраду трупаспалення і адно пахаванне названа так умоўна. 131 пахаванне па палавой прыкмеце размяркоўваецца наступным чынам. Дакладна вызначаны 56 мужчынскіх + 3 пад пытальнікам, 23 жаночыя + 2 пад пытальнікам, 36 дзіцячых пахаванняў. З-за дрэннай захаванасці чарапоў і адсутнасці костак шкілетаў не вызначаны па палавой прыкмеце 13 пахаваных.

Памеры каменных надмагільных кладак вагаюцца ў межах ад 1,8х1,2х0,2 м да 3,0х1,40х0,2 м, а ў асноўным 2,1х1,0 м, ці 2,6х2,1х0,25 м. Форма кладак розная: круглая, амаль круглая, авальная, выцягнуты авал, прамавугольная. Па спосабах збудавання (канструктыўных асаблівасцях) кладкі можна падзяліць на 3 тыпы. Тып 1. Кладка выканана наступным чынам: па краях ляжалі камяні вялікіх ці сярэдніх памераў, як абрамленне, а цэнтр збудаваны з камянёў меншых памераў, пакладзеных бессістэмна, шчыльна. У выніку краі былі вышэйшыя за цэнтр (30%). Тып II. Кладка зроблена спосабам чаргавання вялікіх ці сярэдніх і малых камянёў, пакладзеных як і ў першым выпадку, бессістэмна, шчыльна (45%). Тып III. Сюды адносяцца кладкі, збудаваныя з камянёў амаль аднолькавых памераў, пакладзеных бессістэмна, шчыльна (25%). Усе кладкі — аднаслойныя.

У галаве некаторых пахаванняў адзначаны камяні значна большых памераў, чым ужытыя ў кладках, а ў нагах — крыху меншыя, чым у галавах, ці

* Вынікі даследаванняў 1986 г. надрукаваныя. Гл.: А. В. Квятковская. Исследования каменного могильника у д. Вензовщина // КСИА. М., 1989, вып. 198, с. 90—95.

адзначаліся вялікія камяні ў галаве і ў нагах пахаванняў. Гэтыя камяні звычайна акруглай ці прамавугольнай формы ўверсе, без слядоў штучнай апрацоўкі.

Пахавальны абрад у магіле з трупаспаленнем (р. 4, м. 6) выглядаў наступным чынам. Надмагільная кладка амаль круглай формы, па спосабе ўтварэння адносіцца да 1-га тыпу. Магільная яма памерамі 2,0х1,5 м глыбінёй 1,4 м арыентавана ў кірунку поўнач-поўдзень. Запаўненне магілы: пад кладкай у слаі гумусу адзначаны вуглі, ніжэй — пясок таксама з вуглямі таўшчынёй 0,08—0,1 м, пясок — 0,51 м, праслойка попелу — 0,2 м, моцны слой вугалю таўшчынёй 0,3 м. На глыбіні 0,88 м — 1 м ад дзённай паверхні, сярод вугалю знайшлі кавалкі лепленага ад рукі керамічнага посуду: венчыкі — 3, сценкі — 41, донцы — 4 і 1 венчык ганчарнага гаршчка. Усе фрагменты керамікі знойдзены ў паўночнай частцы магілы. На адным з венчыкаў звонку ёсць пальцавыя ўмяціны, а пад шыйкай па плечыку — штампаваны арнамент. Такі ж самы венчык, але без штампаванага арнаменту знойдзены ў запаўненні м. 3 (р. 5). Цэлыя гаршкі з падобным арнаментам сустрэты ў пахаваннях могільніку на р. Сара (паўночна-усходняя Літва)[1]. Лепленая кераміка са штампаваным арнаментам выяўлена пры раскопках Гродна, у слаях IX — X ст. Ранняя ганчарная кераміка са штампаваным арнаментам ёсць у Навагрудку ў слаях X — XI ст.[2], а таксама на паселішчах Мазовіі X — пач. XI ст.[3] Лепленая кераміка з пальцавымі ўмяцінамі знойдзена ў кургане на поўдзень ад Лукомскага гарадзішча (VIII — IX ст.)[4], а ганчарная — у Полацку, у слаях XI — XII ст.[5] Венчык ганчарнага гаршка невысокі, моцна адагнуты назад. Аналагічныя венчыкі гаршкоў знойдзены ў Наваградку, у слаях X — першай паловы XI ст.[6]

Пахавальны абрад у магілах з трупапакладам выглядаў наступным чынам. У выкапаную чатырохвугольную з закругленымі вугламі яму (якая звужаецца ў доннай частцы) клалі нябожчыка у выцягнутым стане, на спіне. Становішча чэрапа — рознае: прама (зрэдку), а часцей — нахілены да правага ці левага пляча. Становішча рук — рознае. Зыходзячы з аналізу становішча рук у нябожчыкаў відаць, што часцей сустракаецца становішча абедзвюх ці адной рукі на плячы (28 выпадкаў) і ў 21 выпадку — рукі складзены на жываце. Трэба таксама адзначыць, што ў 65 пахаваных рукі не захаваліся (пагнілі). Амаль заўсёды ногі выпрастаныя.

Акрамя вышэй разгледжаных пахаванняў, дзе нябожчыкі пакладзеныя на спіну, у выцягнутым стане, намі зафіксаваны некалькі пахаванняў, дзе нябожчыкі былі пакладзены на левы ці правы бок. Першыя даследчыкі гэтага тыпу помнікаў В. А. Шукевіч і Э. А. Вальтэр таксама ў час раскопаў сустракалі пахаванні, дзе нябожчыкі былі пакладзены на бок, і была зроблена выснова, згодна з якой, разам з абрадам пакладу на спіне існаваў асобны абрад пахавання на баку. Памылковасць гэтай высновы паходзіць ад недакладнай методыкі даследаванняў гэтых помнікаў. Як вядома, В. А. Шукевіч і Э. А. Вальтэр вывучалі кожнае пахаванне паасобку, не ўлічваючы такой важнай умовы жыцця старажытнага насельніцтва, як пражыванне сем´ямі і родам. Адпаведна павінен быў быць складзены сямейны абрад пахавання, які можна прасачыць, калі вывучаць не толькі кожнае пахаванне ў сувязі з іншымі, а і прамежкі паміж магіламі. Гэта значыць, што гэтыя помнікі трэба вывучаць суцэльнай плошчай. Зыходзячы з гэтай методыкі даследаванняў, аўтар прасачыла сямейны звычай пахавання не толькі на гэтым, але і на іншых помніках падобнага тыпу (напрыклад, могільнікі каля в. Куклі Воранаўскага

р-на, в. Клепачы воз. Бяздоннае Зэльвенскага р-на, в. Мінеўшчына Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобласці, а таксама на могільніках каля вв. Ваўча Докшыцкага р-на, Перавоз Глыбоцкага р-на Віцебскай вобласці і інш.). На разглядаемым могільніку ў пяці выпадках сустрэты пахаванні нябожчыкаў на левым ці правым баку, але, заўважце, толькі ў магілах з падхаваннямі. Напрыклад, р. 4, м. 3: дзяўчынка пахавана на левым баку, на глыбіні 1 м. У 20 см на захад ад гэтай магілы размяшчаецца магіла № 5, дзе пахаваны разам мужчына — на спіне ў выцягнутым стане, і хлопчык справа ад дарослага на левым баку, на глыбіні 0.92 м. Прычым, магіла № 5 пасунута «уверх» у адносінах да магілы № 3. У р. 8, м. 8 — пахаванне хлопчыка на правым баку на глыбіні 0,94 м. Гэтае пахаванне мае агульную сценку з пахаваннем № 5 (мужчынскае, нябожчык ляжаў на спіне), якое зроблена на глыбіні 1 м. Прычым, дзіцячае пахаванне пасунута «ўніз» у адносінах да магілы № 5. У р. № 16, магіла № 3 жанчына пахавана на левым баку, з падагнутымі каленямі, на глыбіні 1 м. З левага боку ад яе ў 10 см размяшчаецца магіла № 4 (пахаванне мужчынскае на спіне), зробленае на глыбіні 0,76 м. У адносінах да магілы № 4, пахаванне № 3 пасунута «ўверх». Усе гэтыя пахаванні, як бачым, размяшчаюцца побач. А вось у м. 8 (р. 6) назіралі іншую карціну. На глыбіні 0,6 м знаходзілася жаночае пахаванне, прычым у магіле адразу за чэрапам ляжаў камень 0,2 м у дыяметры. Ніжэй, на глыбіні 0,8 м знайшлі яшчэ зусім разбуранае мужчынскае пахаванне (відаць, яго разбурылі, калі хавалі жанчыну). Абодва нябожчыкі ляжалі на спіне, у выцягнутым стане. Але ў адносінах да мужчынскага, жаночае пахаванне знаходзіцца на ўзроўні грудзей першага, г. зн. пасунута «ўніз». Такім чынам, ва ўсіх разгледжаных выпадках мы бачым наступны малюнак: а) падхаванне да сваякоў; б) выкананы асноўнае пахаванне і падхаванне на рознай глыбіні; в) па адносінах да асноўнага, падхаванне, як было заўважана, абавязкова пасунута ў той ці іншы бок, але ніколі не размяшчаецца побач. Такая асаблівасць пахавальнага абраду тлумачыцца народным павер'ем, згодна з якім «калі хаваць сваякоў роўнымі радамі, дык роўнымі ж радамі паляжа ўвесь род» (г. зн. перамруць — А. К.).

Арыентаваны шкілеты галавой на паўднёвы захад ці поўдзень, зрэдку — на захад.

Амаль кожны нябожчык быў абстаўлены дошкамі з усіх бакоў, не замацаванымі паміж сабой. Толькі ў адным пахаванні (р. 1, м. 2) знойдзена драўляная заклёпка. Відаць, у некаторых асобных выпадках дошкі мацавалі з іх дапамогай. Парахня ў магілах прасочана на вышыню 0,3 м. У м. 1 (р. 7) і м. 3 (р. 18) замест парахні сустрэты кавалкі галінак, на якія паклалі нябожчыкаў. У адзінкавых пахаваннях — м. 5, 6 (р. 14), м. 1, 2 (р. 16) парахня не знойдзена ўвогуле. У пераважаючай большасці выпадкаў нябожчыка апускалі на дно магільнай ямы прама на мацярык. І толькі ў м. 7 (р. 16) пад парахнёй выяўлены вуголлі і попел. Відаць, перад пахаваннем, у магіле распалілі вогнішча і месца для нябожчыка «ачысцілі».

У асобных магілах за межамі парахні, па перыметры магільнай ямы выкладзены камяні — 10—15 см у дыяметры (р. 4, м. 3; р. 5, м. 5; р. 6, м. 6, 17; р. 16, м. 3, 4, 5). У запаўненні магілы № 17 (р. 6) над чэрапам ляжаў камень, а над нагамі — 2 камяні; у магіле № 8 (р. 6) камень ляжаў у магіле за чэрапам. У м. 3 (р. 4) за камянямі — вуглі шырынёй 1,5—2 см, а ў магіле 4 (р. 4) вуглі — за межамі парахні.

Захаванасць шкілетаў у вывучаных магілах у большасці выпадкаў вельмі дрэнная. У некаторых пахаваннях знойдзены толькі чэрапы ці чэрапы і рэшткі

ног і рук. У м. 5 (р. 1) знойдзены 2 чэрапы, костак шкілетаў не было. Разам з тым, адзначана, што нябожчыкаў ніколі не хавалі ў дробным сыпкім пяску (напрыклад, большая частка р. 13; увесь р. № 15, дзе не было аніводнага пахавання. Тое ж самае назіралі ў час раскопкаў могільніку каля в. Куклі Воранаўскага р-на Гродзенскай вобласці.

Пасля таго як нябожчыка клалі ў магілу, яго крыху засыпалі грунтам, а потым насыпалі ў магілу вугаль. Прычым гэтыя праслойкі — над усім шкілетам, не даходзячы да чэрапу, ці над чэрапам і нагамі, ці толькі над чэрапам і толькі над нагамі. Таўшчыня гэтых праслойкаў вагаецца ад 0,05 да 25—30 см. У большасці выпадкаў вуглі бралі з вогнішчаў, якія былі побач з магіламі ля ўзгалоўя (справа ці злева) ці побач з магіламі. Памеры вогнішчаў вагаюцца ад 0,4х0,4 глыбінёй 0,25 м, да 1,0х0,45 м глыбінёй 0,3 м. У некаторых выпадках, як паказалі даследаванні, вогнішчы распальвалі ў магілах над чэрапам і нагамі, а потым вуголлі рассыпалі над усім шкілетам. У м. 5 (р. 6) каля чэрапу ў магіле знойдзены вуглі і кавалкі перапаленых костак. У м. 16 (р. 6) зафіксавана вугальная праслойка таўшчынёй 0,35 м, якая складаецца з двух вугальных праслойкаў паміж якімі — пясок таўшчынёй 0,08 м. Побач з магілай № 4 (р. 7) — вогнішча памерамі 1,0х0,82 м таўшчынёй 0,35 м і складалася з мноства дробных асобных вогнішчаў дыяметрам ад 8 да 10 см. У м. 4 (р. 8) вакол шкілета размяшчаліся невялікія (15—17 см у дыяметры) вогнішчы каля галавы: па 1-м ля плячэй, каля локцяў, каля правага і левага калена, 1 — каля ступеняў ног. У м. 6 (р. 8) каля правага калена, звонку адзначана вогнішча 0,15—0,2 м у дыяметры, таўшчынёй 0,15—0, 2 м. У асобных магілах адзінкавыя вуглі сустракаліся ў запаўненні, сярод грунту. Наяўнасць вугалю і вогнішчаў у магілах трэба разглядаць, верагодней усяго, як адлюстраванне абраду трупаспалення, які панаваў на гэтай тэрыторыі раней. Зараз у сувязі з пераходам да абраду трупапакладу, замест нябожчыка палілі галінкі, а вуглі насыпалі ў пахаванні (і ў наш час сімвалічным адлюстраваннем абраду трупаспалення з ´яўляецца свечка, якую запальваюць, калі памірае чалавек).

Пасля таго, як вуглі насыпалі ў магілы, пахаванні канчаткова засыпалі, а на паверхні зноў палілі галінкі (аб гэтым сведчаць вуглі, якія знойдзены ў слаі гумуса, пад каменнымі кладкамі) і білі керамічны посуд, а кавалкі клалі ля ўзгалоўя. Выкарыстанне керамічнага посуду ў пахавальных абрадах вядома яшчэ з часоў старажытнай Грэцыі, дзе на магілы дзяўчат ставілі сасуды для амавенняў. У часы панавання абраду трупаспалення ў гаршкі ссыпалі рэшткі спаленых костак. З пераходам да абраду трупапакладу нярэдка гаршкі з ежай ставілі ў магілы каля галавы ці ног нябожчыкаў. Кавалкі бітых гаршкоў у нашым выпадку трэба разглядаць, на нашу думку, як адлюстраванне павер ´я, згодна з якім цэлы гаршчок выступаў як сімвал жыцця, і калі чалавек паміраў, гаршчок разбівалі. У двух выпадках кавалкі керамікі зафіксаваны ў запаўненні магілаў над верхняй часткай шкілетаў.

Скончваўся абрад пахавання збудаваннем каменных кладкаў.

Па наяўнасці ці адсутнасці пахавальнага інвентара магілы размяркоўваюцца наступным чынам: 85 — з інвентаром і 49 — безінвентарныя.

Размяшчэнне і склад інвентару ў некаторых жаночых пахаваннях выглядаў наступным чынам. У м. 2 (р. 1) на чэрапе сляды галаўнога ўбора (8 бляшак), на грудзях ляжала бронзавая падковападобная фібула са спіралепадобнымі канцамі. На безыменным пальцы правай рукі — сярэбраны пярсцёнак. Пад локцем левай рукі — нож з касцяной арнаментава-

най ручкай: пад ім — фрагменты яшчэ аднаго невялікага нажа. З левага боку каля пляча знайшлі драўляную заклёпку ад дамавіны. У м. 4 (р. 4) на сярэднім пальцы левай рукі — бронзавы пярсцёнак. У м. 3 (р. 7) на безыменным пальцы правай рукі — пярсцёнак, на сярэднім пальцы левай рукі — пярсцёнак, каля левага бядра — жалезная іголка. У м. 1 (р. 8) злева каля чэрапу — скроневае колца з трыма падвескамі стрыжнямі з бронзы і жалеза, з правага боку — 2 круглыя бронзавыя колцы, зробленыя з дроту і звязаныя кавалкам скуры, крыху вышэй ад каленаў, у цэнтры — жалезная спражка. У м. 4 (р. 9) на месцы шыі — каралі з сініх, белых, зялёных і чорных пацеркаў, сярод іх кавалкі вялікай бразготкі і 3 меншыя па памерах бразготкі, а таксама фрагменты ракавіны кауры. На чэрапе медныя бляшкі ад галаўнога ўбора, на сярэднім пальцы правай рукі — бронзавы плецены з дроцікаў пярсцёнак. У м. 5 (р. 9) на нагах нябожчыцы ляжаў камень — 20—25 см у дыяметры. На чэрапе выявілі бляшкі ад галаўнога ўбору чатырохвугольнай формы, з правага і левага боку чэрапа — па 1 бронзавым шматбусінным скроневым колцы, з правага боку каля бядра — жалезны нож, на грудзях — бронзавы пярсцёнак. Пад чэрапам — кавалак скуры ад шапкі.

У мужчынскіх пахаваннях знойдзены разнастайны пахавальны інвентар. Склад і размяшчэнне яго ў адносінах да нябожчыка ў некаторых магілах выглядаў наступным чынам. У м. 3 (р. 1) каля правага і левага бядра — па адным жалезным паясным колцы, паміж імі на тазавых костках — жалезная спражка, на правым калене — сякера, побач, бліжэй да левага калена, — фрагмент жалезнага нажа. У м. 2 (р. 4) справа пад чэрапам знайшлі бронзавую падковападобную фібулу з канцамі ў выглядзе мордаў драконаў і кавалак тканіны ад галаўнога ўбору, на сярэднім пальцы правай руі — віты бронзавы пярсцёнак, каля левага бядра нож у скураных аздобленых похвах, пад ім фрагменты яшчэ аднаго нажа, на левай назе — шпору і фрагмент стрэмя. У м. 5 (р. 4) каля левага бядра — крэсіва з крэмнем, фрагменты нажа і тачыльны брусок. У м. 3 (р. 5) з правага боку, вышэй ад калена на 15—16 см ляжала жалезная спражка, на ступнях ног — жалезная сякера, каля правага бядра — нож, тачыльны брусок, крэсіва з крэмнем. У м. 5 (р. 5) на ступнях ног ляжала сякера, справа на тазавых касцях — жалезная спражка, крыху ніжэй — нож, крэсіва з крэмнем. У м. 6 (р. 5) каля левага бядра — маленькая жалезная сякера, нож, на тазавых касцях у цэнтры — бронзавая спражка і кавалкі дзягі, пад імі шасціпромневая акоўка на мяшэчак з кавалкам скуры, тачыльны брусок, крэсіва і жалезная спражка. У м. 4 (р. 12) у цэнтры на грудзях — пражскі грош (Каралеўства Чэхія, Вацлаў IV, 1378—1419 гг.), 2 бронзавыя фігурныя накладкі, фрагменты скураной дзягі, каля левага бядра — пярсцёнак, фрагмент паяснога жалезнага колца, крэсіва з крэмнем, крыху ніжэй бядра — нож, на ступнях ног сякера з жалезным клінам. У м. 6 (р. 16) злева каля бядровай косткі — нож, ля правага калена — сякера з жалезным клінам, пад ёй — дзіда.

У пахаваннях зусім маленькіх дзяцей пахавальнага інвентару не было. У магілах хлопчыкаў 10—12 гадоў выяўлены зрэдку нажы, паясныя жалезныя колцы. У магілах дзяўчынак, прыкладна ад 7 да 10 гадоў таксама знойдзены рэчы. У м. 3 (р. 4) па абодва бакі чэрапу знойдзена па 1 шматбусінным скроневым колцы. У м. 6 (р. 8) на грудзях знайшлі 2 бронзавыя гузікі, па-абапал чэрапа завушніцы ў форме пытальніка. У м. 1 (р. 13) на чэрапе знайшлі фрагменты скуранога галаўнога ўбора, а на ім медныя пласцінкавыя ромбападобнай формы ўпрыгожанні з трапецападобнымі прывескамі. Гэтыя

ромбы былі нанізаны на бронзавую спіраль, на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго. На месцы шыі знайшлі некалькі фрагментаў сярэбраных з пазалотай бляшак ад налобнага аздаблення; на сярэднім пальцы левай рукі — 2 пярсцёнкі, на правай руцэ — 1 пярсцёнак. Пад левай далонню ляжалі некалькі дробных чорных пацерак, накшталт бісеру (аналагічны бісер знойдзены ў налобных упрыгожаннях у жаночых пахаваннях могільніка каля в. Куклі Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці).

Храналогія пахавальнага інвентару. Падковападобная фібула са спіралепадобнымі канцамі (р. 1, м. 2)[7] і падковападобная фібула з зааморфнымі канцамі ў выглядзе мордаў драконаў[8] (р. 4, м. 2), шматбусінныя скроневыя колцы[9], палутараабаротныя пярсцёнкападобныя скроневыя колцы[10], зробленыя з дроту скроневыя колцы, адзін канец якіх адагнуты назад[11], бляшкі ад галаўнога ўбору трох-, чатырох- і пяцівугольнай формы[12], упрыгожанні з медных пласцінаў ромбападобнай формы з трыма маленькімі трапецападобнымі прывескамі кожная, былі надзеты на бронзавую аднарадковую спіральку і ўсё гэта было прышыта да скураной шапкі[13], зонныя пацеркі жоўтага, сіняга і зялёнага шкла[14], бронзавыя бразготкі з двух палавінак без прарэзяў і грушападобнай формы з крыжападобнымі проразямі[15–16], ракавіны кауры[17] — усе гэтыя рэчы датуюцца X — XIV ст. Завушніцы: а) з трыма прывескамі-стрыжнямі[18], б) у форме пытальніка[19], в) з бронзавага дроту, сагнутага ў кальцо і перавітага на адным канцы другім бронзавым дроцікам[20]. Усе гэтыя прадметы датуюцца XIV — XVII ст. Пярсцёнкі: а) сярэбраны з ажурнай рашэткай-навершам, з паглыбленнем для каменя, б) рубчатыя (датуюцца XI — XIV ст.)[21], в) вузкапласцінкавыя з трыма барознамі[22], г) вітыя[23] (датуюцца XI — XV ст.), д) плеценыя з 4-х дроцікаў XII — XIV[24] ст.; е) пласцінкавыя шырокасярэдзінныя — сяр. XI — сяр. XIV ст.[25], ж) пласцінкавыя з авальнымі ці ромбападобнымі шчыткамі — к. XII — сяр. XV ст.[26], з) шырокасерадзінныя з незамкнутымі канцамі XI — XIII ст.[27], і) пласцінкавыя, аплецены зверху некалькімі тонкімі дроцікамі XI — XIII ст.[28], к) вузкапласцінкавыя к. X—к. XIII ст.[29]. Бронзавыя гузікі XI — XV ст.[30]. Паясныя наборы ўключалі ў сябе: дзягу (у некаторых выпадках упрыгожаны бронзавымі заклёпкамі), спражку, паясныя жалезныя колцы, скураны мяшэчак. Спражкі: а) ліравападобнай формы (XI — к. XII ст.[31], б) круглай формы X — XI ст.[32], в) паўкруглыя XI — XIV ст.[33], г) авальнай формы з перамычкай у цэнтры X — XIV ст.[34], д) прамавугольныя з перамычкай у цэнтры X—XIV ст.[34], д) прамавугольныя з перамычкай у цэнтры XIII — XV ст.[35], е) прамавугольныя X — XIV ст.[36]. Паясныя жалезныя колцы сяр. X — XVII ст.[37]. Некаторыя мяшэчкі былі ўпрыгожаны бронзавымі акоўкамі XII — XIV ст.[38] Крэсівы: калачападобныя — XI — XIII ст.[39], двухлязовыя XI — XIV ст.[40]. Тачыльныя брускі V — XIV ст.[41] Нажы X — XVII ст.[42–43]. Знойдзены похвы з арнаментам. Нажніцы шарнірныя X — XIII ст.[44–45] Шырокалязовыя праушныя сякеры X — XIII ст.[46–47] Шпора з акруглым шыпам X — XI ст.[48] Знойдзены таксама кавалак скуранога абутку з бронзавым упрыгожаннем — накладкай, іголкі, манеты XIV ст.

Знойдзеныя пад каменнымі кладкамі кавалкі керамічнага посуду мы разглядаем як пазамагільны інвентар. Увесь знойдзены керамічны посуд можна падзяліць на 2 асноўныя групы: леплены ад рукі і зроблены на ганчарным коле. Прычым, ганчарная кераміка складае прыкладна 60% ад усёй знойдзенай. Знойдзеная лепленая ад рукі кераміка мае аналогіі ў помніках сярэдняй і заходняй Беларусі[49]. Датуецца апошняй чвэрцю 1 тыс.

н. э. У р. 12 сабралі шмат кавалкаў ад аднаго гаршка, які ўдалося аднавіць. Па плечыку і тулаве гаршка — па адной паралельнай лініі, паміж якімі ўпісаны трохвугольнікі. Венчык высокі, крыху адагнуты назад. Датуецца X — XII ст.[50] Ганчарная кераміка амаль уся арнаментаваная: хвалісты, лінейны, спалучэнне хвалістага і лінейнага арнаментаў, шматрадная хваля, адзін кавалак гаршка з рыфленнем па тулаве. Ганчарная кераміка прадстаўлена сценкамі, донцамі (адно з кляймом) і двума венчыкамі накрывак. З сабраных кавалкаў удалося аднавіць 3 гаршкі. Першы (р. 3) мае форму слоіка, выпуклы, венчык слаба прафіляваны, адагнуты назад. Пад венчыкам па плечыку нанесены арнамент — неглыбокая перарыўная хваля. Другі гаршчок (р. 4) падоўжанай формы, звужаецца каля донца. Венчык крыху адагнуты назад, а паверху зроблены неглыбокі жолаб. Пад венчыкам хвалісты арнамент, а па тулаве — лінейны. Трэці гаршчок (р. 13) па плечыку ўпрыгожаны хвалістым і лінейным арнаментам. Датуюцца такія гаршкі X— XIII ст.[51] Аналагічныя знойдзены на паселішчах Мазовіі ў слаях IX—X ст.[52]

Аналіз канструкцыяў каменных кладак, пахавальнага абраду, пахавальнага і пазамагільнага інвентару дазваляе датаваць помнік рубяжом X—XIV ст. Пры вызначэнні этнічнай прыналежнасці насельніцтва, якое пакінула гэты помнік, былі ўлічаны наступныя вельмі важныя асаблівасці яго: 1. Ужыванне камянёў пры збудаванні пахаванняў. 2. Звычай абкладваць нябожчыка дошкамі з усіх бакоў ці хаваць у дамавінах. 3. Наяўнасць вугальных праслойкаў у магілах і вогнішчаў каля іх. 4. Звычай класці ў магілы зброю. 5. Традыцыя ўпрыгожваць касцюм металічнымі вырабамі. Гэта: фібулы, пласцінкі на дзяжках, бляшкі ад галаўнога убору, акоўкі на кашальках і мяшэчках і інш. 6. Фрагменты керамічнага посуду пад кладкамі. Усе гэтыя асаблівасці, як вядома, з ´яўляюцца адлюстраваннем балцкіх пахавальных традыцыяў і таму ў этнічных адносінах пахаванае ў могільніку насельніцтва трэба разглядаць як балцкае. Былі гэта яцвягі, дайнава ці іншае з балцкіх плямёнаў? Дакладна вызначыць гэта дапамогуць далейшыя даследаванні помнікаў гэтага тыпу.

ЛІТАРАТУРА:

[1] Lietuvos archeologija. Vilnius, 1979, t. 1, s. 87, pav. 18:1.

[2] Воронин Н. Н. Древнее Гродно // МИА. М., 1954, № 41; с. 41; рис. 15:11; Малевская М. В. Некоторые исторические связи Новогрудка в X в. По материалам керамики // КСИА. М., 1972. Вып. 129, с. 15, рис. 5:1, 2, 5.

[3] Materialy wczesnosredniowieczne. Warszawa, 1956, t. 4, s. 38, tabl. VI:6; VII:1.

[4] Штыхов Г. В. Раскопки в Лукомле в 1966—1968 гг. //Древности Белоруссии. Минск, 1969, с. 348, рис. 27:5.

[5] Штыхов Г. В. Древний Полоцк. Минск, 1975, с. 30, рис. 16; 22—26.

[6] Малевская М. В. О датировке нижнего горизонта Новогрудка // КСИА, М., 1965. Вып. 104, с. 88, тип. 1.

[7] Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли. Минск, 1978, рис. 20:3; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Минск, 1979, рис. 78:6, 116:3—5, 7—13; Малевская М. В. О датировке.., рис. 33:1; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск. Минск, 1975. Рис. 11:4, 7, 9; Воронин Н. Н. Древнее Гродно.., рис. 16:9; Лысенко П. Ф. Берестье. Минск, 1985, рис. 177; Lietuvos archeologija. Vilnius, 1979, t. 1, s. 60, pav. 19:1. Седова М. В.; Ювелирные изделия древнего Новгорода X—XV вв. М., 1981, рис. 31:2.

[8] Седова М. В. Ювелирные изделия.., рис. 30:2.

[9] Szukiewicz W. Niekture zabytki przednistoryczne w pow. Lidzkim // Ksenga pamiatkowa na uzoczystosc setnej rocznicy urodzin Adama Mickiewicza (1798—1898). Wazszawa, 1898, t. 2, s. 226, № 10; Коробушкина Т. Н. Курганные древности XI—XIII вв. в Белорусском побужье // Древнерусское государство и славяне. Минск, 1983, рис. 10; 6; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 90, pav. 21:1; 2; Svetikas E. XIV—XVII A. Alytaus kapinynas. t. 1, s. 40, карта № 2; Седова М. В. Ювелирные изделия.., рис. 2:10; Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX—XIII вв. Минск, 1989, с. 108, рис. 61:13.

[10] Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок. Ленинград, 1981, с. 103, рис. 79:1, 2; Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX—XIII вв., с. 35, рис. 14:2—3, 6—12; Rocznik Bialystocki. Bialystok. t. 3, 1962, s. 351, tabl. X: 22—23.

Седова М. В. Ювелирные изделия.., с. 15, рис. 3:7; Svetikas E. XIV—XVII A. Alutaus Kapinynas t. 1, s. 44, № 40—10.

[12] Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX—XIII вв., с. 108, рис. 61:1, 2, 5—8—9—12; Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, С. 87, рис. 66:7; Lietuvos archeologija. t. 1, s. 90, p. 21:4, 7; t. 6, s. 40, p. 65:2, 4, 13, 18, 19; p. 66:7; Седова М. В. Ювелирные изделия.., с. 154, рис 60:3, 5—6.

[13] Lietuvos azcheologija, t. 6, Vilnius, 1988, s. 28, pav. 37:11; Финно-угры и балты в эпоху средневековья. М., 1987, с. 424, 425:19.

[14] Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, с. 64, рис. 49:3, 4; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, с. 75, рис. 27:10—12; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 120, рис. 79:1,3.

[15] Мальм В. А., Фехнер М. В. Привески-бубенчики. Труды ГИМ, вып. 43, М., 1967, с. 33.

[16] Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, с. 42, рис. 13:20; Он же. Верхнее Понеманье в IX—XIII ст., с. 28, рис. 9:9; Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, с. 42, рис. 30:15, с. 87, рис. 66:19; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 91, pav. 22:4; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 119, рис. 78:13, с. 147, рис. 96.

[17] Lietuvos azcheologija, t. 1, s. 138, pav. 16:2; s. 140, pav. 18:1; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, с. 61, рис. 21:10.

[18] Lietuvos archeologija, t. 1, s. 135, pav. 13:7; Svelikas E. XIV—XVII A. Alytaus kapinynas, t. 1, s. 42, карта № 4.

[19] Lietuvos archeologija, t. 1, s. 90, pav. 21:10—13; Svetikas E. XIV—XVII A. Alytaus kapinynas, t. 1, s. 43, карта № 5; Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, с. 11, рис. 4; Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 15, рис. 3:1, 2, 9.

[20] Svetikas E. XIV—XVII A. Alutaus kapinynas, t. 1, s. 46, № 37—59.

[21] Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 123, рис. 45:6; Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX—XIII вв., с. 72, рис. 40:11; с. 105, рис. 59:3, с. 108, рис. 61:3—4; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 127, рис. 81. 81:10, с. 165, рис. 112; Lietuvos archeologija, t. 1. s. 90, pav. 21:19; t. 6, s. 25, pav. 32:12.

[22] Lietuvos archeologija, t. 1, s. 90, pav. 21:15—16; s. 135, pav. 13:3—6; S. 137, pav. 15:13—14; s. 141, pav. 19:3—4; s. 147, pav. 22:42.

[23] Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 123, рис. 45:12; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 90, pav. 21:20, s. 135, pav. 13:2; s. 147, pav. 22:14; t. 6, s. 25, pav. 32:14; s. 44, pav. 77:13.

[24] Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с 123, рис. 45:17; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 136, pav. 14:6; s. 137, pav. 15:8—10; t. 6, s. 44, pav. 77:12; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, с. 42, рис. 13:41.

[25] Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 122, рис. 45:18; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 90, pav. 21:18; s. 136, pav. 14:14; s. 137, pav. 15:5—7; s. 138, pav. 16:9—11.

[26] Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 128, рис. 49:9, 11; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 147, pav. 22:18—20.

[27] Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 129; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 147, pav. 22:6—10; 21—24, 26—33, 35.

[28] Lietuvos archeologija, t. 6, c. 23, pav. 26:3.

[29] Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 131; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 147, pav. 22:41.

[30] Lietuvos arheologija, t. 1, s. 104, pav. 3:5; s. 137, pav. 15:12; Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 154, рис. 61:7.

[31] Lietuvos archeologija, t. 1, s. 55, pav. 14:5, Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, с. 144.

[32] Зверуго Я. Г. Некоторые итоги раскопок Волковыска // Древности Белоруссии. Минск, 1966, с. 285, рис. 1:3.

[33] Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, рис. 55:12, Зверуго Я. Г. Некоторые итоги, рис. 1:5, 7; Лысенко П. Ф. Берестье. Минск, 1985, рис. 163:19; Lietuvos archeologija, t. 1, pav. 12:5.

[34] Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, рис. 31:27; Колчич Б. А. Железообрабатывающее ремесло Новгорода Великого // МИА, М., 1959, № 65, рис. 96:12; Lietuvos archeologija, t. 6, s. 50, pav. 87:2.

[35] Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 140, рис. 90:6.

[36] Lietuvos archeologija, t. 1, s. 85, pav. 16:13; t. 6, s. 51, pav. 89:5; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, с. 36, рис. 11:22; Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX — XIII вв., с. 29, рис. 10:18; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 140, рис. 90:4.

[37] Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, рис. 122:16—22; Lietuvos archeologija, t. 1, pav. 13:3; 14:4; 15:4; Седова М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода, рис. 59:13—13—14.

[38] Lietuvos archeologija, t. 1, s. 108, pav. 6:4; s. 85, pav. 15:8; t. 6, s. 50, pav. 86:6; s. 51, pav. 89:6; s. 56, pav. 99:5.

[39] Штыхов Г. В. Древний Полоцк, с. 60, 62; Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, рис. 12:10; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, рис. 9:11; Лысенко П. Ф. Берестье, рис. 160:2; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, рис. 105:8, 9; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 85, pav. 15:5; t. 6, s. 38, pav. 60:2.

[40] Штыхов Г. В. Древний Полоцк, рис. 18:12; Ён жа. Города Полоцкой земли, рис. 17:22; Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, рис. 54:8; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, рис. 9:15; Лысенко П. Ф. Берестье, рис. 160:3; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 103, pav. 2:7; s. 104, pav. 3:10; t. 6, s. 25, pav. 32:1,2.

[41] Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, с. 59, рис. 20:6—7, 14, 28, 31, 42; Ён жа. Верхнее Понеманье в IX — XIII вв., с. 49, рис. 22:1, 3, 5, 6, 8; с. 73, рис. 41:10—14,17; Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, с. 49, рис. 34:11, 13; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 139, рис. 89:1, 2; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 83, pav. 12:9; s. 85, pav. 16:11, 12; t. 6, s. 52, pav. 91:1.

[42] Урбанавичене С. Одежда жемайтов в XV — XVI вв. (по данным археологии) // Древности Литвы и Белоруссии. Вильнюс, 1988, с. 166.

[43] Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок, с. 30; рис. 19:1, 2, с. 56, рис. 41:1, 10; Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX — XIII вв., с. 73, рис. 41:2—4; с. 90,

рис. 50:7—10; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 118, рис. 77:3; с. 138, рис. 88:3—5, 7; с. 157, рис. 105:1—3; Lietuvos archeologija, t. 1, s. 54, pav. 12; s. 84, pav. 13; s. 115, pav. 3:7, 8; s. 131, pav. 10:1—6; t. 6, s. 25, pav. 32:8—9.

[44] Лысенко П. Ф. Города Туровской земли. Минск, 1974, с. 152, рис. 48:7; Зверуго Я. Г. Верхнее Понеманье в IX — XIII вв., с. 70, рис. 38:19; Штыхов Г. В. Древний Полоцк, с. 35, рис. 18:9; Lietuvos archeologija, t. 6, s. 52, pav. 91:3.

[45] Lietuvos archeologija, t. 1, s. 54, pav. 13:4; s. 83, pav. 12:1; s. 88, pav. 19:4; t. 6, s. 50, pav. 86:1; Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, с. 156, рис. 104:1, 2.

[46] Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, рис. 83:1; Lietuvos archeologija, t. 1, pav. 11:7, 8; Колчин Б. А. Железообрабатывающее ремесло, рис. 9:2.

[47] Урбанавичене С. Одежда жемаитов, с. 166.

[48] Лысенко П. Ф. Берестье, рис. 151:2, 6.

[49] Митрофанов А. Г. Железный век средней Белоруссии, рис. 39:18, 22, 24.

[50] Rocznik Bijlostocki. Bialystok, 1962, t. III, s. 339, tabl. IX:1.

[51] Поболь Л. Д. Древности Белоруссии в музеях Польши, рис. 130:1, 2; 131:1; Малевская М. В. О датировке.., рис. 34:2—4; Она же. Некоторые исторические связи.., рис. 1, 2, 5; Зверуго Я. Г. Древний Волковыск, рис. 22 (тип ПА); Lietuvos archeologija, t. 1, s. 87, pav. 18:1—3; s. 91, pav. 22:8; t. 6, s. 21, pav. 22.

Валеры Шаблюк
(Мінск)

У ПОШУКАХ МІНУЛАГА

(гісторыка-археалагічны нарыс вёскі Навасёлкі на Зэльвеншчыне)

Пры першым знаёмстве здавалася, што гэта самая звычайная беларуская вёска, адна з многіх тысяч на нашай зямлі. Драўляныя хаты, густы вішняк уздоўж плоту, краскі пад вокнамі. Хіба што студня незвычайная. Яна была выкладзена са шчыльна прагнаных валуноў і так далёка паглыблялася ў зямлю, што здавалася бяздоннай. Вёска мела ўсяго дзесятак двароў. Некаторыя з іх ужо пустыя. Зразумела, што і месца на сучаснай карце для яе не знайшлося. Ды і найменне ніяк нельга было назваць рэдкім — Навасёлкі. Праўда, сама гэта назва ўжо выклікала пытанне: а дзе ж было ранейшае паселішча? Дзеля адказу звяртаемся да мясцовых настаўнікаў — Лабовіча Георгія Сцяпанавіча і ягонай жонкі Таісы Іванаўны. Яны доўга распавядаюць нам пра свае родныя мясціны, і паступова мы даведваемся, што гэтая маленькая вёска мае сваю багатую гісторыю, карані якой трэба шукаць у глыбіні тысячагоддзяў. На мясцовых могілках мы заўважаем насыпны курган, старажытныя каменныя магілы. Вясковую ваколіцу, што выходзіць на правы бераг Зальвянкі, мясцовыя жыхары здаўна называюць «за садам» і расказваюць, што раней тут стаяла карчма. Далейшыя археалагічныя даследванні і пошукі ў архівах дазволілі расхінуць заслону часу і зазірнуць у мінулае Навасёлкаў.

Высветлілі, што «прашчуры» сучасных вяскоўцаў з ´явіліся ў гэтых мясцінах каля 5 тысяч гадоў назад, у часы неаліту. Недалёка ад вёскі на мысе ракі археолаг М. М. Чарняўскі знайшоў стаянку так званай нёманскай культуры з керамікай і крамянёвымі прыладамі працы. Тут былі выяўлены і сляды старажытнарускага паселішча з фрагментамі глінянага посуду і рэшткамі глінабітных печак. Далейшыя пошукі паказалі, што і ў урочышчы «за садам» існавала старадаўняе паселішча. Даследванне яго працягвалася чатыры палявыя сезоны[1]. Па меры правядзення археалагічных раскопак стала выяўляцца гісторыя паселішча. Яно ўзнікла недзе ў XIV ст. і на працягу двух наступных стагоддзяў выяўляла сабой невялікую вёску. Жылі сяляне ў драўляных зрубах, пад ніжнія вянцы іх падкладваліся камяні. На селішчы выяўлены рэшткі дзвюх печак. Адна з іх — глінабітная, памерамі, прыкладна, 2х1-м і датуецца XIV ст. Другая была выкладзена з так званых гаршковых кафляў, і па іх асаблівасцях можа быць аднесена да XV — 1-й паловы XVI ст. У канцы XVI ст. ці ў пач. XVII ст. паселішча было перанесена, прыблізна, на месца сучаснай вёскі, а на пакінутым селішчы быў заснаваны феадальны двор (фальварак). Такое яго размяшчэнне дыктавалася геаграфічнымі і прыроднымі ўмовамі: узбоч пушчы, з даволі ўрадлівымі глебамі і мажлівасцямі сплаву лясных дарункаў і збожжа па Зальвянцы.

Забудова фальварка ў XVII ст. складалася з комплексу жылых і гаспасдарчых пабудоў. Пры раскопках знойдзены рэшткі дзвюх жылых

драўляных пабудоў на каменных падмурках. У сярэдзіне будынкаў — кафляныя печкі, якія датуюцца XVII — XVIII стст. Знойдзены таксама рэшткі пабудовы з каменным ачагом. Мяркуючы па этнаграфічным матэрыяле, гэта магла быць варыўня, якая абагравалася печкай-каменкай ці жарам. Побач знаходзіўся паглыблены на 1,2 м у мацярык склеп памерамі 3х2,5 м. За 40 м на ўсход ад цэнтральнай часткі селішча, на штучным насыпе, быў запрудны млын. Па знаходках керамікі і манеты яго існаванне адносіцца да XVII ст. Памеры будынку складалі каля 6х4 м. Культурны слой моцна насычаны вугалём. Гэта дае падставу меркаваць, што млын быў знішчаны пажарам.

Комплекс археалагічных знаходак на селішчы аказаўся надзвычай разнастайным. Тут, напрыклад, выяўлена каля 15 тыс. фрагментаў бытавой керамікі (гаршкі, міскі, макотры, талеркі і г. д.). Большасць посуду зроблена з мясцовай, брунатнага колеру гліны, хоць трапляюцца і фрагменты прывезенай, белагліняной пасудзіны. Частка вырабаў аздаблялася звонку арнаментам (у выглядзе ліній, «хвалі», альбо пры дапамозе штампу). Некаторыя экзэмпляры пакрываліся знутры паліваю жоўта-брунатнага ці зялёнага колераў. На селішчы атрымана вялікая колькасць кафлі. Яе асартымент таксама вельмі багаты—ад самай простай, гаршковай і таракотавай — да больш дарагой, зялёнапаліванай і паліхромнай (шматколернай). Найбольшую цікаўнасць у мясцовых школьнікаў, якія ўдзельнічалі ў раскопках, выклікалі малюнкі на кафлях. Часцей за ўсё сустракаліся пласціны з відарысам розных раслінаў і кветак, а таксама з «дывановым» арнаментам, пры якім асобныя кафлі складаюць на паверхні печкі адзіны ўзор. У XVII ст. кафлі часта аздабляліся і геральдычнымі сюжэтамі. На селішчы, напрыклад, знойдзены пласціны з выявай двухгаловага арла, з гербам «Булат» (меч з двума паўмесяцамі). Вялікую цікавасць выклікае кафля, на якой змешчана манаграма Хрыста (IXS), цярновы вянок і страла. Гэта сюжэт трэба разумець як сімвал вялікіх пакутаў Хрыста.

У побыце жыхароў паселішча выкарыстоўваўся і шкляны посуд (стопкі, бутэлькі, шкляніцы, штофы і г. д.). Аконнае шкло мела форму круглых, тонкіх пласцінаў дыяметрам 10—12 см, якія ўстаўляліся ў драўляныя ці алавяныя рамы.

Пра заняткі сельскай гаспадаркай, рамёствамі і промысламі сведчаць знаходкі сярпоў, нажоў, зубіла, разца, праселкаў, рыбалоўных кручкоў, грузілаў. Да рэчаў хатняга ўжытку адносяцца ключы, замок, іголкі, напарстак, падсвечнік, люлькі для курэння і г. д.

З дэталяў адзення былі пасавыя спражкі, металічныя і касцяныя гузікі, шпількі для ўмацавання жаночага галаўнога ўбору, абутковыя падкоўкі.

Сярод рэчаў упрыгожвання вылучаюцца бронзавыя завушніцы, якія датуюцца XIV — XV стст. Знойдзены таксама бронзавыя пярсцёнкі.

У час раскопак было выяўлена каля 30 манетаў. Найбольш шматлікія з іх — медныя соліды («бараціпкі»). Яна II Казіміра (1648—1668). Акрамя іх — паўгрош Вялікага княства Літоўскага часоў Аляксандра Ягялончыка (1492—1506), рыжскія соліды Густава II Адольфа Вазы (1621—1632) і Крысціны Аўгусты Вазы (1632—1654), білонавыя паўтары грошаў з Прусіі (1621) і манета вартасцю «I эрэ» з Швецыі (1696).

Важным дапаўненнем да археалагічных раскопкаў з'явіліся звесткі пісьмовых крыніцаў пра Навасёлкі. Упершыню на старонкі старажытных актаў паселішча трапляе з сярэдзіны XVII ст. як адна з вёсак маёнтку Івашкавічы, што належаў Шэметам[2]. Вядома, што ў 60-я гг. XVII ст. ваколіцы Навасёлкаў былі спустошаны рускімі войскамі. Напрыклад, суседняя вёска Лаўрыновічы цалкам спалена непрыяцелем. Пра лёс Навасёлкаў у гэты час у нас пакуль што

няма паведамленняў. Але, не выключна, што і яны не ўхіліліся разбурэння. Магчыма, спалены пракладна ў тыя гады млын і з ´яўляецца доказам.

Найбольш падрабязнае апісанне (інвентар) фальварка Навасёлкі адносіцца да 1752 г.[3] У гэты час яго ўласнікам быў лоўчы Вялікага княства Літоўскага Міхаіл Сапега. Галоўнае месца ў забудове двара займаў жылы дом. Ён знаходзіўся на самым беразе Зальвянкі і складаўся з сямі пакояў з сенямі. Вонкавы выгляд і інтэр ´ер будынку былі даволі сціплымі. Нават страха, адметна ў большасці іншых фальваркаў, была саламяная. Як вынікае з тэксту дакумента, дом як усяродку, так і звонку, патрабаваў аднаўлення. Верагодна, што ён быў пабудаваны ў XVII ст. і менавіта яго сляды былі выяўлены намі ў адным з раскопаў на селішчы. Насупраць гэтага дома стаяў двухпавярховы спіхлер (пабудова для захавання збожжа, сельскагаспадарчых прадуктаў, адзення, прыладаў працы) з «піўніцай» (склеп). Сярод астатніх гаспадарчых пабудоў у дакументе называюцца варыўня (тут прыгадаем рэшткі пабудовы за ачагом), перароблена ў бровар вазоўня, сырнік, млечнік, гумно і два хлявы. На тэрыторыі маёнтку існаваў і сад (прыгадаем мясцовую назву селішча). У садзе знаходзілася 15 вулляў для пчолаў, раслі яблыні, слівы, парэчкі, агрэст, былі два агароды. Пры выездзе з двара стаяла невялікая карчма, Спраўдзіўся яшчэ адзін людскі погалас. Сама вёска ў 1752 г. складалася з шасці двароў. На феадала сяляне адраблялі тры дні паншчыны ў тыдзень і адзін дзень павінны былі працаваць на гвалтах (тэрміновыя сельскагаспадарчыя альбо іншыя дадатковыя работы ў панскай гаспадарцы). У 1777 г. на пяць сялянскіх двароў у Навасёлках прыходзілася 9 валоў, 5 кароў, 3 кані, 4 быкі, 2 бычкі, 3 цялят[4]. Такім чынам, тагачасных жыхароў нельга было назваць беднымі. Дакументы XVIII ст. данеслі да нас прозвішчы мясцовых сялян (Атарык, Лабовіч, Наумец, Міско, Пучок). Як бачым, Георгі Сцяпанавіч Лабовіч нездарма так добра ведае сваю вёску. Менавіта тут трэба шукаць карані яго роду.

Удакладніць некаторыя моманты гісторыі Навасёлкаў дапамагла карта 1797 г., якая захоўваецца ў адным з маскоўскіх архіваў. На ёй адзначана вёска з васьмі дварамі і карчма пры дарозе на Лаўрыновічы — Бярэжкі. А вось фальварку на карце ўжо няма. Гэта дае падставу сцвярджаць, што ў перыяд паміж 1752 г. (дата складання інвентару) і 1797 г. фальварак Навасёлкі перастаў існаваць. Дарэчы, і карчма недзе ў канцы XVIII ці ў пач. XIX стст. перастала дзейнічаць. Аб гэтым сведчыць люстрацыя (рэвізія) маёнтку Дзярэчын за 1795 г., дзе выкладаецца неабходнасць пераносу карчмы з Навасёлкаў у Лаўрыновічы, якія маюць больш зручнае размяшчэнне (на былым Слонімскім шляху)[5]. Нягледзячы на гэтыя абставіны, амаль 200 гадоў сярод жыхароў Навасёлкаў захоўваецца памяць пра карчму на ўскраіне вёскі. На працягу мінулага і цяперашняга стагоддзяў Навасёлкі заставаліся маленькай вёскай, дзе жылі, у асноўным, нашчадкі яе першых пасяленцаў.

Пасля нашых раскопкаў ля Навасёлкаў прайшло некалькі гадоў. Але краявід яе наваколля змяніўся да непазнавальнага. Хвалі Зэльвенскага вадасховішча падступаюць цяпер пад самыя хаты. Многія жыхары пакінулі свае абжытыя стагоддзямі сялібы і пераехалі ў іншыя мясціны. Пра старыя могілкі нагадваюць толькі векавыя хвоі. Знікла пад водамі і старадаўняе селішча. Але хочацца верыць, што не знікне памяць людская пра сваю родную вёску, пра сваіх продкаў, пра сваё мінулае.

[1] Шаблюк В. У. Феадальныя пасяленні XVI — XVIII стст. на р. Зальвянцы // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1984. № 1. С. 76—78.

[2] ЦДГА РБ (г. Мінск), ф. 1752, воп. 1, спр. 8, арк. 329.

[3] ЦДГА РБ (г. Мінск), ф. 1928, воп. 1, спр. 179.

[4] Рук. адз. бібл. Віленскага ун-ту, ф. 4, спр. А-1231, арк. 6.

[5] Рук. адз. бібл. Віленскага ун-ту, ф. 4, спр. А-1410, арк. 12-ад.

Апанас Цыхун
(Гродна)

ТАПАНІМІЯ І ГІДРАНІМІЯ БАСЕЙНА РАКІ СВІСЛАЧЫ

Рака Свіслач, левы прыток Нёмана, пачынаецца на паўднёва-заходніх схілах Ваўкавыскага ўзвышша, каля вёскі Занкі ў Свіслацкім раёне. Выток яе — невялічкая крынічка ў вёсцы Занкі. За гэтаю вёскаю як невялікі ручай цячэ праз урочышча Кавалёўшчыну, затым каля вёскі Грыцкі праз урочышча Крывое балота. За гарадскім пасёлкам Свіслач рака цячэ праз вёску Ранявічы, затым вёску Пацуі, Яскалды, Клепачы, Краснае, Каласы.

Далей Свіслач нясе свае воды каля паселішчаў і ўрочышчаў Дзіневічы, Гінюшы, Лішкі, Муравана, Малыя Эйсманты, Пухоўчыцы, Пачобуты, Падбагонікі, Макараўцы, Курчоўцы, Сарасекі, Водла, Канюхі, Казлы, урочышча Сукавічы, хутар Знайдзіна, вёскі Грайна, Ярмолічы, былы Ярмоліцкі вадзяны млын, вёскі Жукевічы, Вялікія Ёдкавічы, Балічы, Лугавая, урочышча Вайтаўшчына, вёскі Ланявічы, Станявічы, Занявічы, Сухая даліна, урочышча Гурная Свіслач, вёскі Літвінкі, Фэрма, урочышча Янкяляў хутар, урочышча Кароза-Ёшчык, вёску Карозічы, Гаркоўскіх вадзяны млын, вёску Сцяцкі, саўгас «Свіслач», урочышча Дзерачынак, цагельню «Дзекалавічы», вёску Дзекалавічы.

Правыя прытокі ракі Свіслачы: Рудаўка, Бераставічанка, Уснарка, Струга, Цішаўка, Верацейка, Пякелка; левыя прытокі: Знайдзінскі роў, Лашанскі роў, Нятупа, Водла, Індурка, Струга, Лашанка, Перабітка, Чартарыя або Квасоўка.

Далей разгледзім тапонімы і гідронімы басейна ракі Свіслач у Свіслацкім, Бераставіцкім і Гродзенскім раёнах.

Караняўское балото — урочышча на левым беразе ракі Свіслач, сенажаць сялян вёскі Караневічы Капцёўскага сельсавета Гродзенскага раёна.

Лашанскі роў — ручай, які выцякае з балота недалёка ад вёскі Магіляны ў Канюхоўскім сельсавеце і каля вёскі Грайна ўпадае ў раку Свіслач.

Папова яма — самае глыбокае месца на рацэ Свіслачы недалёка ад вёскі Грайна ў Канюхоўскім сельсавеце Бераставіцкага раёна.

Блізцы — урочышча каля ракі на поўдзень ад хутара Знайдзіна ў Канюхоўскім сельсавеце Бераставіцкага раёна.

Знайдзінскі роў — ручай, які выцякае з Канюшскага балота ў Бераставіцкім раёне і каля вёскі Канюхі ўпадае ў раку Свіслач.

Таццяцкі брод — брод праз раку Свіслач за хутарам Знайдзіна.

Скрынішча — урочышча, лука каля ракі Свіслач побач з вёскай Канюхі.

Заменны роў — ручай з вадой, канава ў канцы знайдзінскага поля недалёка ад хутара Знайдзіна ў Канюхоўскім сельсавеце, упадае ў раку Свіслач.

Гольняўскае балото — урочышча, сенажаць, на правым беразе ракі Свіслач каля вёскі Канюхі, належала сялянам вёскі Гольні Алекшыцкага сельсавета Бераставіцкага раёна..

Буслава яма — самая глыбокая ўпадзіна на рацэ Свіслач на поўдзень ад хутара Знайдзіна ў канюхоўскім сельсавеце.

Слоўшчына — урочышча, сенажаць на правым беразе ракі Свіслач на паўднёвы ўсход ад вёскі Канюхі.

Бохчын роў — роў, канава, напоўненая вадой, выцякае з багны каля вёскі Падбагонікі, цячэ аж да вёскі Алекшыцы ў Бераставіцкім раёне.

Падбагоніцкі выган — урочышча, выган каля ракі Свіслачы недалёка ад вёскі Падбагонікі.

Шляхецкае балото — урочышча, сенажаць над ракой Свіслаччу недалёка ад вёскі Канюхі.

Каменная лука — урочышча, лука на Шляхецкім балоце, на якой расло грудавое сена, рутка і дзяцеліна.

Агароднікава лука — урочышча, сенажаць на Шляхецкім балоце над Свіслаччу каля вёскі Канюхі.

Клябаншчына — урочышча, сенажаць каля вёскі Канюхі.

Пруты — урочышча, сенажаць недалёка ад вёскі Канюхі на левым беразе ракі Свіслач.

Круглянская лука — урочышча, сенажаць каля ракі Свіслач за вёскай Канюхамі — у Пруцкім балоце.

Старая Одля, Старая Водля — урочышча, сенажаць на левым беразе ракі Свіслач на поўнач ад вёскі Канюхі.

Баброніцкае балото — урочышча, сенажаць над ракой Свіслач у Канюхоўскім сельсавеце, належала сялянам вёскі Бабройнікі ў Індурскім сельсавеце, недалёка ад вёскі Канюхі.

Вялікае балото — урочышча, сенажаць каля ракі Свіслач на ўсход ад вёскі Пачобуты ў Макараўскім сельсавеце Бераставіцкага раёна.

Новая Одла, Новая Водла — сенажаць над ракой Водлай, недалёка ад вёскі Водлы ў Канюхоўскім сельсавеце.

Адлянскі брод — брод, пераезд праз раку Водлы пры самым яе ўпадзенні ў раку Свіслач.

Кунцаўская Одла, Кунцаўская Водла — сенажаць на левым беразе Свіслачы недалёка ад вёскі Водлы ў Канюхоўскім сельсавеце, належала сялянам вёскі Кунцаўшчына Індурскага сельсавета Гродзенскага раёна.

Сухадоўская Одла, Сухадалінская Водла — сенажаць недалёка ад вёскі Водла ў Канюхоўскім сельсавеце, належала сялянам вёскі Сухая Даліна Індурскага сельсавета.

Чарнёнскае, Схадоўскае балото — урочышча, сенажаць над ракой Свіслач на поўдзень ад урочышча Сукавічы, былога шляхецкага засценка ў Канюхоўскім сельсавеце, якое належала сялянам вёскі Сухая Даліна Індурскага сельсавета.

Мыгово — урочышча каля Свіслачы на ўсход ад вёскі Канюхі ў Канюхоўскім сельсавеце.

Каўшово — урочышча, сенажаць каля ракі Свіслачы недалёка ад вёскі Канюхі.

Папово балото — урочышча, сенажаць на ўсход ад вёскі Канюхі, было ўласнасцю папа.

Водленскі брод — брод на рацэ Свіслач недалёка ад вёскі Водла ў Канюхоўскім сельсавеце.

Трацяцка перабітка — старое рэчышча Свіслачы недалёка ад хутара Знайдзіна, былога маёнтку ў Канюхоўскім сельсавеце.

Клемасава перабітка — старое рэчышча ракі Свіслачы на Шляхецкім балоце каля вёскі Канюхі.

Шляхецка перабітка — старое рэчышча на Шляхецкім балоце недалёка ад вёскі Канюхі.

Вішняўскі вір — глыбокая яміна з віроўнаю вадой, глыбінёй да 5 метраў, на рацэ Свіслачы каля Трацяцкага броду на поўдзень ад хутара Знайдзіна.

Завоня вір — глыбокая яміна з віроўнаю вадой на рацэ Свіслач у канцы Знайдзінскага поля ў Каменнай луцэ каля хутара Знайдзіна.

Бабскі брод — брод на рацэ Свіслач на ўсход ад вёскі Канюхі.

Верацейка — рака, якая бярэ свой пачатак з Ваўкавыскага ўзвышша за вёскай Вярэйкі ў Ваўкавыскім сельсавеце (Ваўкавыскага раёна) і каля хутара Шум у Канюхоўскім сельсавеце ўпадае ў раку Свіслач.

Грайна — урочышча каля ракі Свіслач на паўночны захад ад вёскі Ярмолічы ў Эйсмантаўскім сельсавеце Бераставіцкага раёна.

Ярмоліцкае балота — выган сялян вёскі Ярмолічы на поўнач ад яе ў Эйсмантаўскім сельсавеце над ракой Свіслач.

Князявіцко балото — сенажаць сялян вёскі Баброўнікі Індурскага сельсавета ў былым маёнтку Князявічы (цяпер вёска ў Алекшыцкім сельсавеце Бераставіцкага раёна).

Ярмоліцкі млын — Ярмоліцкі млын вадзяны і мост праз раку Свіслач, праз яго праходзіць дарога з Гродна на Ваўкавыск у Бераставіцкім раёне.

Глыбока яма — самае глыбокае месца на рацэ Свіслач ў ставе былога Ярмоліцкага вадзянога млына ў Бераставіцкім раёне.

Індурка — рэчка, якая бярэ свой пачатак недалёка ад вёскі Старая Дубавая ў Адэльскім сельсавеце Гродзенскага раёна і каля хутароў вёскі Балічы ў Індурскім сельсавеце ўпадае ў раку Свіслач.

Вайтаўшчына — урочышча, месца, дзе быў вадзяны млын недалёка ад вёскі Балічы ў Індурскім сельсавеце.

Мост — драўляны мост праз раку Свіслач на поўдзень ад урочышча Вайтаўшчына ў Індурскім сельсавеце Гродзенскага раёна.

Выспа — востраў на рацэ Свіслач на поўнач ад вёскі Балічы ў Індурскім сельсавеце.

Кавалёўка — ручай, які выцякае недалёка ад вёскі Вялікія Ёдкавічы ў Эйсмантоўскім сельсавеце Бераставіцкага раёна і каля вёскі Балічы ў Індурскім сельсавеце ўпадае ў раку Свіслач.

Струга — ручай, які бярэ пачатак з урочышча Шніпчын бераг і каля вёскі Балічы ў Індурскім сельсавеце ўпадае ў раку Свіслач.

Дзве выспы — два вялікія паўвостравы на рацэ Свіслачы каля ўрочышча Вайтаўшчына ў Індурскім сельсавеце.

Вайтаўскае балото — урочышча, сенажаць каля былога вадзянога млына сялян вёскі Баброўнікі ў Індурскім сельсавеце Гродзенскага раёна.

Пякелка — рэчка, правы прыток ракі Свіслач, бярэ свой пачатак каля вёскі Семярэнкі ў Мастоўскім раёне і каля вёскі Занявічы ў Індурскім сельсавеце ўпадае ў раку Свіслач.

Брод проці Антановіча — брод праз раку Свіслач каля вёскі Занявічы ў Індурскім сельсавеце.

Жыдава лука — урочышча, выган і сенажаць каля ракі Свіслач на захад ад вёскі Занявічы ў Індурскім сельсавеце, належала сялянам вёскі Кунцаўшчына.

Берагульчын бераг — высокі бераг над ракой Свіслаччу на захад ад вёскі Занявічы ў Індурскім сельсавеце. (Берагульчын бераг, бо ў тым беразе ў норках берагулькі выводзіліся, ластаўкі такія).

Шумялёвы плёс — поплаў каля ракі Свіслач недалёка ад вёскі Занявічы ў Індурскім сельсавеце.

Занявіцкі брод — брод праз раку Свіслач на захад ад вёскі Занявічы ў Індурскім сельсавеце.

Лука — сенажаць на левым беразе ракі Свіслач ў Індурскім сельсавеце, належала сялянам вёскі Кунцаўшчына.

Схадоўскія лукі, Сухадалянскія лукі — сенажаць на левым беразе ракі Свіслач, належала сялянам вёскі Сухая Даліна ў Індурскім сельсавеце.

Лашанка — рака, левы прыток ракі Свіслач, бярэ свой пачатак каля вёскі Струбка ў Каробчыцкім сельсавеце Гродзенскага раёна і каля вёскі Сухая Даліна ў Індурскім сельсавеце ўпадае ў раку Свіслач.

Дубішча — урочышча на правым беразе ракі Свіслач у Індурскім сельсавеце на поўнач ад вёскі Сухая Даліна, там часта вымывае вадой затопленыя дубы. Старыя людзі казалі, што на Дубішчы некалі адны дубы раслі, а цяпер адна лаза расце.

Перабітка — ручай, які выцякае недалёка ад вёскі Рудавіца ў Квасоўскім сельсавеце і каля ўрочышча Ёшчык-Кароза ўпадае ў раку Свіслач.

Фэрманско балото — сенажаць сялян вёскі Фэрма над ракой Свіслаччу ў Квасоўскім сельсавеце.

Гаркоўскага млын — вадзяны млын, які быў уласнасцю Гаркоўскіх.

Равэ — глыбокія і працяглыя яры над ракою Свіслаччу на поўдзень ад вёскі Свіслач у Квасоўскім сельсавеце (над імі ўзвышаецца чатырохпавярховы палац былой графіні Свіслацкага маёнтка Красінскай у Квасоўскім сельсавеце Гродзенскага раёна).

Копаніца — штучны вадаём на правым беразе ракі Свіслач каля былога палаца графіні Красінскай у Квасоўскім сельсавеце.

Адвой — самае глыбокае месца на рацэ Свіслач каля былога палаца графіні Красінскай.

Мост — драўляны мост праз раку Свіслач (праз яго праходзіць дарога з Гродна на Лунну побач з саўгасам «Свіслач»).

Брод проці двара — брод на рацэ Свіслач каля Бровара.

Хаміцкая рэчка — старое рэчышча ракі Свіслач каля вёскі Хамякі ў Квасоўскім сельсавеце.

Глушыца — старое рэчышча ракі Свіслач на поўночны захад ад вёскі Свіслач у Квасоўскім сельсавеце.

Чартарыя, або Квасоўка — ручай, які выцякае з крыніц урочышча Сарасек на ўсход ад вёскі Квасоўка і ля ўрочышча Свіслацкае балота ўпадае ў раку Свіслач.

Рака Свіслач бярэ свой пачатак каля населенага пункта Свіслач у Свіслацкім раёне і ўпадае ў Нёман за населеным пунктам Свіслач у Гродзенскім раёне. Свіслач — рака не суднаходная. Па ёй толькі на асобных участках сплаўлялі невялікія плыты. Толькі ў той час вясновых паводак параход з Нёмана заходзіў у раку Свіслач, даплываў да вёскі Свіслач, былога маёнтка, набіраў збожжа і вёз да Гродна.

Сюды, у вёску Свіслач, з Гродна часта прыязджала параходам польская пісьменніца Эліза Ажэшка. У сваім пісьме ад 5-га чэрвеня 1879 года яна пісала свайму знаёмаму: «Тут, у Свіслачы, над ракой ёсць такі палац, якога вы не знойдзеце ў іншых краінах свету, спадчына часу, людзей, даўнейшых звычаяў, стары, не заплямаваны ні адной капляй тынкоўкі, ні фарбай, з высокім востраканечным дахам, на які сплываюць галінкі клёнаў і каштанаў».

Вадзяныя млыны і плацiны, якія некалі былі на рацэ Свіслач: Пацуйскі млын у вёсцы Пацуі; Мастаўлянскі млын (млын бацькі Кастуся Каліноўскага) у вёсцы Мастаўляны; Баброўніцкі млын у вёсцы Баброўнікі (у РП); Галынкаўскі млын у вёсцы Галынка; Бераставіцкі млын у пасёлку Бераставіца; Ярмоліцкі млын у вёсцы Ярмолічы; Вайтаўшчына — млын у вёсцы Балічы; Гаркоўскі млын (уласнікі Гаркоўскія) у вёсцы Карозічы.

Павел Сцяцко
(Гродна)

З ЛЕКСІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ЖЫХАРОЎ ЗЭЛЬВЕНШЧЫНЫ

Сучасная народна-дыялектная мова Зэльвеншчыны захавала шмат даўнейшых старажытных слоў, а таксама словаўтваральных фармантаў і мадэляў. Сваё пэўнае адлюстраванне яны знайшлі ў ранейшых маіх кнігах[1]. Але і сёння моўная спадчына роднага кута вабіць, кліча да сябе. Прымушае вярнуцца да гэтай гаючай роднай крыніцы, каб не толькі наталіць смагу, а і жыць, радавацца натуральнасці, трапнасці і выразнасці народнага слова.

Рэаліі і паняцці штодзённага жыцця трывала замацоўваюцца ў свядомасці чалавека дзякуючы слову. Рэаліі з часам могуць адыходзіць у нябыт, знікаць, а словы яшчэ доўга бытуюць у мове, хоць бы і ў пасіўных яе засеках. Нярэдка лексічныя адзінкі застаюцца адзінымі скарбамі матэрыяльнай культуры мінулага побыту, жыцця нашых дзядоў і прадзедаў.

На Зэльвеншчыне ў мове старых людзей мною зафіксавана нямала слоў рэгіянальных, якія актыўна выкарыстоўваліся ў мінулым як найменні адпаведных рэаліяў, што бытавалі на гэтых абшарах Гродзеншчыны. Пазначым тут асобныя тэматычныя гурты гэтай лексікі.

Найменні даўнейшых прыладаў працы: **гака** — назва матыкі, **драпач** — ручная прылада ў выглядзе планкі з трыма зубамі, якою капалі бульбу (з выараных барознаў), рыхлілі глебу, акучвалі агародніну; **зацёрыч** — прылада выразаць пазы ў клёпках для дна ў пасудзіне; **кломля** — сак лавіць рыбу; **кнупяль** — прыстасаванне (невялікі кіёчак) для моцнага сціскання снопа перавяслам; **памяльнік** — памяло з хваёвых ці ялінкавых галінкаў, якім падмяталі под печы перад тым, як садзіць хлеб; **сноўніца** — прыстасаванне снаваць кросны; **спружыноўка** — конны культыватар з спружынным рэгулятарам паглыблення зубоў у глебу, яна з ´явілася ў сялянаў недзе ў пачатку 30-х гадоў XX ст.

Найменні хатняга рыштунку, посуду і іх дэталяў: **абячэйко** — вечка (накрыўка) у драўлянай пасудзіне, а таксама абадок у веку дзяжы, кубла, ражкі; **аплятанік** — збанок ці гліняны гаршчок, аплецены дротам для засцярогі, звычайна трэснуты; **арха** — ручная машына ачышчаць зерне ад мякіны і смецця; **баса** — вялікага памеру кадушка на зерне ці мякіну, сечку; **валянка** — драўляная пасудзіна (авальнае формы), у якой трымалі муку; **кручок** — маленькая шкляная пасудзіна (на 250 г) на вадкасць, у кручках за польскім часам прадавалі гарэлку; **козуб** — кубачак з кары асіны, у які збіралі ягады; **ладышка** — збанок без вушка, у якім трымалі малако; **пітушка** — малы гаршчочак; **ражачка** — драўляная пасудзіна для цеста на бліны; **ражка** —

невысокая авальнай формы пасудзіна з векам і вушкамі на сала, мяса; паверх века ў вушкі закладваўся тоўсты прут, каб века не падымалася і можна было ражку пераносіць (летам — у халоднае памяшканне, зімою — у цяплейшае); **саган** — чыгун з дзвюма ручкамі; **саганік** — маленькі чыгун з адною ручкаю, у ім рабілі адвар для піцця; **слой** — паліваны збан на масла (для працяглага захоўвання); **селядоўка** — бочка невялікага памеру, якую выкарыстоўвалі з рознаю мэтаю.

Найменні гаспадарчых збудаванняў, частак жылога памяшкання і яго аздобаў: **газа** — лямпа-газоўка; калі яна была без шкла, яе называлі **кураўка**; **градка** (і **градачка**) — насценная шафа без дзверцаў, дзе ставілі посуд штодзённага карыстання (міскі, кубкі, лыжкі, відэльцы, сподачкі); **данічка** — гаршчок (драўляны) для вазонаў; **ладыш** — цымантовы шырокі круг (труба), што ўстаўляецца ў калодзежную яму (глыбокія калодзежы мелі да дваццаці і болей ладышаў); **майдан** — прыбудоўка да хлява, без дзвярэй, своеасаблівы ганак; **пацёс** — назва столі ў хаце, свіране; **прымасткі** — часовыя палаці; **прыморак** — выступ збоку печы, дзе сушылі мокрыя анучы, панчохі; **чапільня** — страха на слупах, пад якою складалі сена; **шопа** — назва павеці, а таксама таго самага збудавання, што **чапільня**; **штаба** — жалезная планка запіраць аканіцы; замацоўвалася прутамі з сярэдзіны хаты.

Найменні адзення, абутку, пасцельных прыладаў, іх дэталяў і аздобаў: **антуляжы** — карункі, **апосталы** — непахвальна пра абутак, звычайна не зусім прыдатны для нашэння; **валянт** — вясельны ўбор маладое; **вятроўкі** — летні абутак, басаножкі; **галька** — сподняя жаночая кашуля з карункамі, якія вытыркаліся з-пад ніжняй часткі спадніцы (і гэта лічылася модным); **ганавіцы і нагавіцы** — штаны; форма *ганавіцы* ўзнікла шляхам перастаноўкі гукаў Н і Г. Дарэчы тут будзе адзначыць, што натуральнае даўнейшае славянскае слова **нагавіцы**, утворанае паводле той самай мадэлі, што і рукавіцы, пашырана ў беларускай народнай мове, але чамусьці ігнараванае нашымі лексікографамі і адціснутае ў закутак гатарковых, хоць яно больш натуральнае, чымся пазычанае праз расейскае прастамоўе, немілагучнае *штаны;* **капота** — плашч з даматканага сукна, валенага, звычайна меў капюшон (башлык) і выкарыстоўваўся не толькі ад дажджу, але і для цяпла; апраналі капоту паверх кажуха, як ехалі ў далёкую дарогу: зімою — па сена, дровы, на кірмаш; **плаценко** — самаробнае палатно з кужэльных і суконных ніткаў; плаценкам называлі таксама кужэльнае палатно больш высокага гатунку (за звычайнае); **коц** — суконная коўдра (з крамы); **радно** — падвойная коўдра з тоўстай грубай льняной пражы; ім накрываліся, калі было холадна пад радзюжкаю; **радзюжка** (і **радзюжачка**, ласк.) — адзінарная коўдра з тоўстай грубай льняной пражы; **радняніца** — пража і палатно з ніцяў, якія прадуць з адыходаў пры трапанні льну; **самаходы** — пра абутак (у выглядзе лапцяў, з вушкамі і аборамі), які рабілі з пакрышкі аўтамабіля, у самаходах хадзілі ў час вайны 1941—1945 гг.; **снягоўцы** — жаночыя гумовыя боцікі (насілі за польскім часам); **супольніца** — суцэльная доўгая дзіцячая сарочка з саматканага палатна; насілі супольніцу не толькі дзяўчынкі, але і хлопчыкі да пяцігадовага веку; **хадакі** (**хадаке**, адз. **хадак**) — скураны і гумовы абутак у выглядзе лапцяў, меў вушкі і зашнуроўваўся аборамі; у хадаках хадзілі сяляне яшчэ ў трыццатых гадах, за польскім часам; **ясёнка** — лёгкае жаночае паліто, якое насілі ўвосень і ўвесну; **ясік (ясяк)** — маленькая падушачка, звычайна служыла дзеля ўпрыгожання пасцелі, ложка (клалася наверх большых падушкаў, мела свае аздобы).

Найменні транспартных сродкаў і іх дэталяў: **ровар** — веласіпед, яго мелі ўжо ў пачатку трыццатых гадоў (за польскім часам); **матароўка** — матацыкал, ён быў ужо ў сялянаў у першай палове трыццатых гадоў, але маглі купіць яго толькі заможныя людзі, а ровар каштаваў столькі, што і карова; **баляноўка** — веласіпед (ровар) з шырокімі шынамі, ім добра было ездзіць па пясчаным грунце, селавой дарозе (а па асфальтаванай дарозе ездзілі на «высціговых раварах» (з тонкімі шынамі); **гнаянкі** — дошкі, якія ўстаўляліся замест драбінаў пры перавозках гною; так называлі і саму павозку для гэтае мэты; **драба** — сялянскія калёсы, драбіны; **зобка** (і **зобачка**, памянш. -ласк.) — аброчная торба, з якое кармілі каня ў час выездаў; **крывулі** — спецыяльная павозка для вывазу бярвення з лесу: расцягнутыя па даўжыні бервяна перадок і задок воза, з крывымі палкамі (крывулямі) паабапал задка, якія замацоўвалі бервяно; **люшня** — падпорка пад ручку (пад кожную з чатырох) ад восі; люшня засцерагала ручку ад злому пры перавозках цяжкіх грузаў (бярвёнаў, дроў, снапоў, гною); люшні мелі такія павозкі, як *драбы, гнаянкі, крывулі;* **сучка** — дапаможныя малыя сані для перавозкі доўгага бервяна; **пярэдніца** — вераўчаная пятля, якая трымае пярэднюю частку жэрдкі пры ўціскванні воза з снапамі, сенам; калі воз быў невысокі, то рабілі малую пярэдніцу, калі высокі — доўгую; пярэдніца была з той самай вяроўкі, якою ўмацоўвалі ўсю жэрдку («рубель»).

Найменні страў і «сыравіны» для яе прыгатавання: **абмачанка** — тварог, расцёрты з смятанаю і малаком, у які абмачалі бліны; **адваронкі** — звараная нячышчанаю («у мундзірах») бульба, якую лупілі перад ядою і елі звычайна з кіслым малаком ці селядцамі; **аполяц** — вялікі кавалак сала, звычайна адна з чатырох часткаў тушы парсюка; **асмалёнкі** — печаная ў прыску бульба, абгарэлая, якую чысцілі, добра абскрабаючы прыгаркі; звычайна асмалёнкі пяклі ў полі пастухі ці жанцы; былі асмалёнкі і печаныя ў чыгунах, зверху пакладзеныя, якія асмальваліся агнём; **ацоўклае малако** — малако, якое пачало кіснуць; яго не ядуць, бо нястраўнае; **малако з-пад каровы** — толькі што надоенае, яшчэ неастылае; **бондачка** — спечаная ў хатніх умовах (у печы) невялікая булачка пшанічнага хлеба (пірага); гэтым гукавым спалучэннем — **бондачка** — называлі таксама закваску ў дзяжы, бо яна мела выгляд булачкі (бондачкі); **гармушка** — накрышаны ў пасоленую ваду (у час посту) ці малако хлеб (мякіш яго) як страва; **дрыгва** — халоднае, квашаніна; словы **дрыгва** і **квашаніна** выкарыстоўваліся паралельна, хоць **квашаніна** лічылася больш прэстыжнае; **драмак** — жартоўная назва хваста парсюка, зваранага і выкарыстанага як страва; была такая прымаўка: еш драмака, каб не драмала прадучы кудзелю; **каляда і каляднік** — так называлі парсюка, адкормленага і заколатага на Коляды (прызначанага на гэты час); **кунады** — так называлі асобныя жыхары бульбу («картоплі»), і гэта былі «амерыканцы» (тыя, хто ездзіў у Амерыку на заробкі, напрыклад, жыхар вёскі Грабава Стасевіч Іван («Клемас», як яго звалі ў вёсцы); слова, відаць, нагадвае, адкуль бульба з ´явілася ў нас, у Еўропе; **ламанцы** — печыва з пшанічнае мукі, спечанае ў печы на скаварадзе, мела выгляд падзеленай на квадрацікі масы, якая добра ламалася на часткі (адсюль назва *ламанцы*); **паламянка** — спечаны перад полымем на скаварадзе хлеб; мае форму (выгляд) блінца; палямянкі пяклі тады, калі напальвалі печ на хлеб і з таго самага цеста, што і боханы хлеба; **падчаровак** (паччаровак) — сала, саланіна з падчарэўя; звычайна падчаровак варылі, тады ён быў смачнейшы, асабліва з свінні; **скабы** — звараныя рабрынкі як ежа; **шчалачонкі** і **шчолакі** — бульбяны суп

без іншых кампанентаў; **шчолак** — рэдкая страва ў супе, капусце, баршчы, бацвінні; поліўка; **юшка** — суп з свіной крыві і перацёртае мукі; юшку варылі ў той дзень, як калолі парсюка («паршука»), калі кроў («юшка») была яшчэ свежая, цёплая.

Іншыя рэгіянальныя найменні. **Вопорадка** — прыстасаванне далёка кідаць каменьчыкі ў час «спаборніцтва» між хлапчукамі; рабілася вопорадка з тонкае вяровачкі: пасярэдзіне яе была сетка з гэтай самай вяровачкі, на яе клаўся каменьчык і моцна раскручвалася (гэтая штука) вакол галавы з паднятаю рукою, і потым адзін канец вяровачкі адпускаўся, камень ляцеў далёка — метраў за 50—70. **Бурка** — дзіцячая забаўка: праколатая костачка з вяровачкаю, канцы яе расцягвалі ў руках, і яна, круцячыся, бурчала. **Вужоўка** — кручаная (каб не ламалася) галінка бярозы ці лазы, якою звязвалі колле ў загарадзе. **Выдзірак** — першы раз апрацаванае поле пасля таго, як раней тут быў дзёран (расла трава, канюшына); на выдзірку быў добры ўраджай. **Велькалён** — лён-даўгунец, яго шмат сеяў селянін, бо трэба было нямала ткаць для апраткі. **Гіба** — мера асновы, палатна па даўжыні сцяны хаты, звычайна да трох-чатырох метраў; кросны ставілі на 5—6 гібаў. **Вэнгрын** — так называлі чалавека, які кастраваў жарабцоў, парсюкоў. Лічылі, што гэтую працу выконвалі асобы з Венгрыі. **Паклэдыч** і **пакладач** — чалавек, які «пакладаў» — кастраваў парсюкоў (часам і жарабцоў). Гэтую працу звычайна выконвалі гуртам суседзі. **Клёк** — гульня дзяцей накшталт гарадкоў, толькі ставілася адна цурка, і яе збівалі доўгім кіем; сама цурка таксама называлася **клёк**. **Кудзяльніцы** — вячоркі, дзе дзяўчаты пралі кудзелі, спявалі песні, а хлопцы заляцаліся да іх; кудзяльніцы праводзіліся ў вялікіх, свабодных хатах, нярэдка да глыбокай ночы. Адна ўдзельніца гэтых вячоркаў называлася **кудзельніца**, а больш — **кудзельніцы**. **Пасядзёнкі** — вячоркі моладзі, а часам і старога веку людзей. **Перарочка** — яблыня, груша, якія пладаносілі толькі праз год («рок»). **Пярэзвы** — пачастунак у бацькоў маладой праз тыдзень пасля вяселля; сюды прыязджалі маладыя і бацькі маладое. **Пятнастоўка** — так называлі (звычайна іранічна) немаладую дзяўчыну ці жанчыну, якая паводзіла сябе як 15-гадовая дзяўчына. **Рачанец** або **ракавое свято** — свята адзін раз на год («рок») — Ян, Пятра і Паўла. Мікола не была ракавым святам, бо іх было два: адзін — халодны (увосень), другі — галодны (увесну). **Шуганка** — звязаныя галіны суседніх бярозаў, на якіх «шугаліся» (гушкаліся) дзеці.

Словаўтваральныя тыпы і мадэлі, уласцівыя гаворкам Зэльвеншчыны. У зэльвенскіх гаворках збераглося шмат даўнейшых, старажытных словаўтваральных тыпаў і мадэляў, якія ў літаратурнай беларускай мове або зусім не захаваліся, або маюць адзінкавыя ўтварэнні. Вытворныя назоўнікі, якія бытуюць у беларускай народна-дыялектнай мове, прааналізаваныя мною ў дзвюх манаграфіях — «Народная лексіка і словаўтварэнне» і «Беларускае народнае словаўтварэнне»[2], а таксама ў шматлікіх артыкулах. Тут пазначым толькі тыя рэгіянальныя, што ўласцівыя зэльвенскім гаворкам. Разгляд іх зробім з улікам словаўтваральных сродкаў (фармантаў).

-авенё(-енё). Утварэнні з гэтымі фармантамі называюць сцябло агародніх культураў і бульбы: брушкавенё, гарбузенё, гуркавенё, картапленё, маркавенё, цыбуленё.

-авідло(-ідло). Словы з гэтым фармантам называюць прылады працы або ручку іх: прасавідло «прас, жалязка», матавідло «матавіла», касідло «кассё».

-ай. Утварэнні называюць асобу па негатыўнай працэсуальнай прымеце: валачыцца — *валачай,* папіхаць — *папіхай,* ляжаць — *ляжай, негаджай.*

-эй(-ей). Утвараюцца словы, якія называюць асобу па дзеянні, нярэдка непахвальна: варажыць — *варажэй,* целяпацца — *целяпей,* а таксама характарызуюць чалавека па адпаведнай прымеце (утварэнні ад прыметнікаў): кашчавы — *кашчэй* (пра надта худога) , *трыбухлей* (пра трыбухатага) (з нарошчанаю асновою: трыбухл-ей). З дапамогаю *-ей* утвараюцца таксама т. зв. маскулінатывы — словы з значэннем асобы мужчынскага полу (ад назваў асобы жаночага полу): скупяндзя — *скупяндзей,* лупся — *лупсей, слепяндзей.*

-ель(-эль,-аль). Утвараюцца назвы асобы паводле яе адмоўных рысаў: круціць — *круцель,* смэргаць («смэркаць») — смаргель, роўгаць — *раўгель,* шчарбаты — *шчарбель,* зубаты — *зубель,* гарбаты — *гарбель,* мурзаты — *мурзель,* доўгі — *даўгель.*

-іна(-ына). Утвараюцца назоўнікі з зборным значэннем (лесу, зарасніку): асіна, грабіна, альшына, бярэзіна, яліна, хваіна, ляшчына. Ад слоў з значэннем аднаго дрэва гэтай пароды вытворныя адрозніваюцца націскам: у зборных назоўніках націск прыпадае на канцавы склад, а ў іншых — не на канцавы, параўн.: хваіна — «хвоя» і хваіна — «хвойнік».

-іско(-ыско). Утвараюцца: а) ад прыметнікавае асновы — назвы поля, дзе расла пэўная культура, збажына: аўсяніско, грачаніско, канапляніско, картапляніско, ржыско («ржышча»); б) ад назоўнікавых асноваў — назвы ручкі ў прыладах працы: грабліско, тапарыско, пугавіско; ад назваў адушаўлёных прадметаў — вытворныя словы маюць узмацняльна-непахвальнае значэнне: гультаіско, бугаіско, каніско, хлапчыска, дзяціско, сям´іска.

-ля. Утвараюцца назвы асобы жаночага полу паводле яе прафесійнага дзеяння: ткаць — *ткаля,* прасці — *праля,* або паводле негатыўнай рысы: піскаць — *піскля,* здыхаць — *здыхля.*

-ня. Утвараюцца назвы асобы ці прадмета паводле працэсуальнай прыметы: малоць (меле) — *мяльня* «пустамеля», сяўня, шаткоўня, стайня, а таксама назвы саміх працэсаў (дзеяння, стану): лежня, калатня, траскатня.

-айка. Утварае назоўнікі з значэннем стану: пячы — *пячайка* «пякотка».

-ман. Словы з гэтым суфіксам даюць характарыстыку асобы паводле яе знадворнай адзнакі: глухі — *глушман,* рыжы — *рыжман.*

-ча. Утвараюцца: а) ад дзеяслоўных асноваў — назвы працэсаў: купляць — купча, расці — *росча,* есці — *еча,* тупаць — *тупча; б) ад назоўнікавых асноваў — назвы жонкі таго, хто абазначаны ўтваральнаю асновою: Платонча,* Антосьча, Міхасьча, Бляхарча. Ад агульных назоўнікаў з значэннем занятку асобы мужчынскага полу — назвы асобы жаночага полу: аграном — *аграномча,* брыгадзірча, камісарча, маёрча, чытарча, пісарча.

У гаворках Зэльвеншчыны пэўнае месца займаюць і іншамоўныя словы, пазычаныя мясцовымі жыхарамі ад прыезджых купцоў і гандляроў, якія збіраліся на Зэльвенскі кірмаш, заснаваны ў пачатку XVIII стагоддзя продкамі А. Сапегі. У другой палове гэтага стагоддзя ён лічыўся найважнейшым пасля Лейпцыгскага як сваім абаротам, так і колькасцю купцоў і гандляроў, што прыязджалі сюды з розных краінаў Еўропы і з Расіі. Кірмаш дзейнічаў штогадова на працягу месяца — *з 25 ліпеня да 25 жніўня.*

Падрабязны аналіз лексічнага складу зэльвенскіх гаворак у гэтых адносінах даецца ў маёй ранейшай працы[4], таму тут спынімся толькі на агульнай характарыстыцы пазычаных слоў. Сярод пазычанняў найбольш

германізмаў — слоў нямецкага паходжання. Гэта тлумачыцца і тым, што на Гродзеншчыне доўгі час жылі немцы, асабліва на паўночных яе землях. Так, з нямецкае мовы прыйшлі ў гаворкі словы *апсац* (літаратурнае *абцас*), *шопа і шоф, шына, штаба, хвартух, цукар* і іншыя. Другое месца займаюць у гаворках паланізмы — словы польскага паходжання: *тарка, палмісак, гузік, стэпцы* «сходы», *тлусты, прэнт, мэнка* і шмат іншых. Ёсць тут і літуанізмы — словы з літоўскае мовы: *свіран, рэзгіны;* з рускае мовы: *адзіяло, часы* і з іншых.

[1] Сцяцко П. У. Дыялектны слоўнік: З гаворак Зэльвеншчыны. Мн., 1970; Народная лексіка. Мн., 1970; Народная лексіка і словаўтварэнне. Мн., 1972; Беларускае народнае словаўтварэнне. Мн., 1977.

[2] Сцяцко П. У. Народная лексіка і словаўтварэнне. Мн., 1972; Беларускае народнае словаўтварэнне. Мн., 1977.

[3] Материалы для географии и статистики России: Гродненская губерния. (Составил П. Бобровский, СПб, 1863. Ч. 11. С. 429—430.

[4] Стецко П. В. Предметно-бытовая лексика зельвенских говоров. Мн., 1962. (А таксама кандыдацкая дысертацыя па гэтай тэме).

Аляксей Пяткевіч
(Гродна)

СТАРАЖЫТНЫЯ ЕВАНГЕЛЛІ З ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ

Рукапісная кніга займае вельмі значнае месца ў беларускай культуры даўніх часоў. Кніга была паводле зместу часцей за ўсё рэлігійнаю і, такім чынам, спрыяла распаўсюджанню хрысціянства, развіццю асветы, мастацтва, пашырэнню ведаў. У сваю чаргу патрэба ў кнізе дыктавалася высокім узроўнем духоўнай культуры грамадства і ў Полацкім княстве, і ў Вялікім княстве Літоўскім. Надта беражліва ставіліся пісцы да рэлігійных тэкстаў, часта перакладаючы іх на родную мову, рэдагуючы, складаючы зборнікі. З асабліваю адказнасцю выконваліся спісы евангелля: гэты твор хрысціянскай рэлігіі, карыстаючыся папулярнасцю ў шырокіх колах чытачоў, быў разам з тым важным прадметам царкоўнай літургіі, розных літургічных абрадаў. Кожная царква старалася займець сваё евангелле. Спісаная для пэўнага храма і «нададзеная» яму пісцом ці заказчыкам пісца, такая кніга станавілася своеасаблівай візітнай карткай храма. Таму евангелляў пісалася шмат (як і шмат будавалася цэркваў), і захоўваліся яны ў віхуры гістарычных бураў лепш, чым іншыя рукапісныя кнігі. Таму старонкі евангелля выкарыстоўваліся для рэгістрацыі тых ці іншых юрыдычных актаў, а ў больш познія часы — і грамадскіх ці нават бытавых падзеяў.

Самыя раннія рукапісныя помнікі гэтага жанру, што дайшлі да нас,— гэта Тураўскае евангелле (XI ст.), Аршанскае (XII — XIII ст.), Полацкае (XIII ст.).

Найбольш даўняе з тэрыторыі сучаснай Гродзеншчыны — Лаўрышаўскае евангелле, якое датуюць 1329 годам (П. Уладзіміраў[1], Я. Карскі[2] і інш.). Некаторыя даследчыкі лічаць, што час напісання кнігі менш пэўны — першая палова XIX ст., XIV ст. і нават пазней за канец XIV ст.[3]. Евангелле створана ў Лаўрышаўскім кляштары (цяпер Наваградскі р-н), заснаваным наваградскім князем Войшалкам у 1262 г. Кляштар быў значным асяродкам грамадскага і культурнага жыцця свайго часу. Знаходзячыся паблізу Наваградка, які ў канцы XII ст. стаў цэнтрам Кіеўскай мітраполіі. Лаўрышаўскі кляштар умацоўваў мясцовую уладу, падтрымліваў сілу і аўтарытэт наваградскіх земляў. Навукоўцы (У. Пашута[4], М. Ермаловіч[5]) звязваюць з гэтым асяродкам грамадскай думкі і асветы пачаткі беларускага летапісання. У XIV — XV стагоддзях вялікія князі спецыяльнымі граматамі, пісанымі ў Лаўрышаве, надаюць кляштару зямельныя ўладанні. Пра ўклады ў Лаўрышаўскі кляштар рухомай і нерухомай маёмасці (дваровых людзей, земляў, збожжа, грошай) сведчаць запісы, зробленыя ў XIV — XVI стст. у тэксце евангелля. Вось, напрыклад, запіс пра ўклад 1429 г. кіеўскага князя: «Се і аз князь Олександро

Володимировичъ и своию княгинею московъкою и своими детьми далъ есмь десятину святе богородици у лаврошев монастырь ис турця[6] у веки»[7]. Яшчэ запіс пазнейшага часу: «Се азъ Панко Обуховичъ Тивуна Негневицкого[8] сынъ погадавши есми съ своею братиею съ Тивуном Негневицкымъ гринемъ а съ братомъ своимъ Михаиломъ и съ детьми своими съ Семеномъ а съ Панкомъ записалъ есми сеножати две около нивы нашея»[9]... І яшчэ запіс 1486 г.: «Се я пан Іван Олександровичь Стретовичь Подскарбий Господаря Великого Короля Казимира записалъ есми с своего именья с березовця[10] тридцать копъ жита»[11].

Укладныя запісы перамяжоўваюцца ўстаўкамі на старабеларускай мове і маюць сціслыя каментарыі XVI — XVII стст. на беларускай і польскай мовах. Тэкст евангелля (на стараславянскай мове), размешчаны ў 2 калонкі, налічаве 374 нумараваныя старонкі.

Лаўрышаўскае евангелле складаецца з 4-х кананічных частак і дастасаванае да царкоўнай службы (апракас).

Яно выдатна афармлена. Змяшчае застаўкі і ініцыялы ў тэраталагічным стылі і 19 мініяцюраў і малюнкаў, сярод якіх — складаныя шматфігурныя кампазіцыі, сем — на ўсю плошчу старонкі. Аналізуючы іх, Г. Шматаў кажа пра «рэалістычныя тэндэнцыі жывапісу Лаўрышаўскага евангелля»[12]. Дошкі пераплёту абцягнуты аксамітам. На верхняй вокладцы — 4 накутнікі з бірузою. Краі іх, звернуты да цэнтра, аздоблены суцэльным карункавым арнаментам. У сярэдніку — выява святога з дзідаю і шчытом увасабляе вобраз князя Войшалка. На ніжняй вокладцы — пазалочаны крыж-распяцце.

Лаўрышаўскае евангелле было рэстаўравана ў 1887 г. і зберагаецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве.

Да XIV ст. адносіцца і Жухавіцкае евагелле, якое знаходзілася да першай сусветнай вайны ў царкве ў вёсцы Вялікія Жухавічы (Карэліцкі р-н), затым — у Беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў Вільні[13]. У евангеллі ёсць мініяцюры ўсіх 4-х евангелістаў і застаўкі, якімі пачынаецца кожная частка кнігі.

Шырокі размах набыло наша кнігапісанне ў XV — XVI стст., што звязана з агульным уздымам культурнага жыцця і з інтэнсіўнай духоўнай дзейнасцю розных канфесіяў той эпохі.

Сярод евангелляў XV ст., прыпісаных да храмаў Гродзеншчыны, вылучаецца кананічнасцю тэксту і багаццем мастацкай аздобы Жыровіцкае. Захоўвалася яно ў мясцовым Успенскім саборы, пабудаваным у 1650-м годзе як храм Жыровіцкага базыльянскага кляштару. Сам кляштар вядзе ўласную гісторыю, як мяркуецца, з 1470 г. (па іншых звестках — з XVI ст.). Заснаваны быў праваслаўнымі Солтанамі і перададзены ў 1613 г. базылянам. Пабудаваны спачатку з дрэва, ён згарэў у сярэдзіне XVII ст. і аднаўляўся як складаны і маляўнічы архітэктурны комплекс. Тут дзейнічала школа, друкарня і быў багаты кнігазбор, які стаў з цягам часу адным з самых буйных на тэрыторыі Беларусі. У XVII — XVIII стст. у кляштары зберагаліся кнігі на стараславянскай, лацінскай, беларускай, французскай, нямецкай, італьянскай, польскай мовах. Пазней царызм ліквідаваў бібліятэку Жыровіцкага уніяцкага кляштара. Кнігі былі часткова спаленыя, часткова вывезены ў Вільню, у многія гарады Расіі.

З Жыровіцкіх рукапісаў XV ст. большасць адносілася да жыційна-павучальнай літаратуры, адрасавалася шырокаму колу чытачоў і цесна спалучала ў мове стараславянскія і старабеларускія асаблівасці. Гэта такія

творы, як «Словы Грыгорыя Багаслова», «Павучанні Ісаака Сірына», «Павучанні Кірылы Ерусалімскага», «Тварэнні Сімяона новага Багаслова», «Зборнік жыціяў святых», «Казанні пра лацінаў» і інш. Разам з тым шмат было ў Жыровічах і літургічных твораў.

Евангелле (напрастольнае) спісвалася, як лічыць Ф. Дабранскі[14], з вельмі старажытнага арыгіналу. Пісана буйным, правільным, вельмі прыгожым уставам на 404 аркушах. Абклад — дошкі, абцягнутыя малінавым аксамітам і акаваныя па кутах. Мініяцюры ўсіх чатырох евангелістаў, кампазіцыйна складаныя, багатыя зместам, жывапісна дакладныя, змешчаны ў залочаных рамках. Шчодрасцю фарбаў, пазалоты вызначаюцца ініцыялы і застаўкі. У кнізе ёсць укладны запіс 1616 г. канцлера Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі, які перадаваў на карысць Успенскай царквы «шмат земли» ў Жыровічах. Яшчэ адзін запіс (1620 г.) пацвярджае перадачу Жыровіцкаму кляштару маёнтка. Тэкст 1763 г. інфармуе аб прыналежнасці евангелля да Жыровіцкай царквы.

У XIX ст. кніга была перададзена ў Вільню, у бібліятэку духоўнай семінарыі, затым у публічную бібліятэку. Цяпер яна ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы.

У спісе XV ст. вядомае Ваўкавыскае евангелле. Хаця ёсць меркаванне, што трэба яго адносіць да больш ранняга часу[15]. Лёс яго, як і многіх іншых пісьмовых помнікаў, быў нялёгкі. У 80-я гады XIX ст. кніга знаходзілася ў Віленскай публічнай бібліятэцы[16], куды трапіла з-пад Віцебска, з Троіцкага кляштара. Пачатковыя і апошнія яго аркушы не зберагліся. Пераплёт быў зроблены новы. Складалася з 648 старонак, па 18 радкоў на старонцы. У евангеллі выкарыстаны застаўкі і арыгінальныя багаццем каляровай гамы і пазалоты ініцыялы. Сустракаюцца тут і рэдкія ў рукапісах дэкаратыўныя малюнкі на палях. На некалькіх старонках у ніжняй іх частцы зроблены запіс: «Року 1751 месяца мая 10 дня посвящен есьм в Струню от преосвященного архиепископа метрополита всея России Флориана Гребницкого, архиепископа Полоцкого, за панованье короля его милости Августа I за ктитора его милости пана Казимера Корсака, судьи гродского Новогродского. Отец Иоанн Савич, презвитер церкви Волковицкой, имея в том часе лет 30»[17]. Гэты запіс ваўкавыскага святара пра важную ў яго лёсе падзею і дае падставу адносіць евангелле да мясцовай царквы, дзе яно, відаць, захоўвалася.

Гродзенскае евангелле XV ст., якое змяшчае тэксты чатырох евангельскіх кніг Новага Запавету ўвайшло ў зборнік з 388 старонак, пісаных у два слупкі па 25 радкоў. У кнізе ёсць запіс на беларускай і польскай мовах «гродзенскага пратапопа» Яна Сашкі пра незвычайныя сігналы на небе, якія з ´явіліся 12 жніўня 1654 г. Зазначаецца, што тады Ян Мілашэўскі арандаваў землі Горніцкай царквы. І яшчэ — прыпіска пазнейшага часу: «Въ месте Индуры дня 27 месяца чэрвеня года (два апошнія словы — на лацінскай мове — А. П.) 1655, помени господи душу раба своего Стефана Буваевича умарлого въ Минску»[18]. Нават калі гэтыя прыпіскі зроблены ўсяго толькі ўладальнікам кнігі (што вельмі верагодна), то і ў такім выпадку высвятляецца яе рэгіянальная аснова: вёска Горніца і мястэчка Індура знаходзяцца ў Гродзенскім р-не.

Да канца XV — пачатку XVI ст. адносіцца Малажухавіцкае евангелле, якое паходзіць з царквы ў вёсцы Малыя Жухавічы (Карэліцкі р-н). Пісалася паўуставам, стараславянскаю моваю з многімі беларускімі асаблівасцямі. Ёсць у кнізе чатыры мініяцюрныя выявы евангелістаў, застаўкі і ініцыялы, выкананыя ў золаце, загалоўкі, пісаныя кінаварам.

У XVII ст. евангелле знаходзілася ў Жыровіцкім кляштары, з пачатку 1920-х гадоў — у Беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў Вільні.

Скупыя звесткі засталіся пра Маламажэйкаўскае евангелле, створанае, напэўна, у XVI ст. Затое багата фактаў пра гісторыю царквы ў Малым Мажэйкаве (Шчучынскі р-н), якая будавалася, відаць, паміж 1516 і 1542 гг. і для якой спісвалася згаданае евангелле. Арыгінальныя, маляўнічыя і велічныя архітэктурныя формы гэтага храма-крэпасці здаўна прыцягвалі да яго асаблівую ўвагу, выклікалі пашану і свецкіх, і духоўных асобаў. Дакументы XVI — XVII стст. сведчаць, што царкву ў знак павагі надзялялі рознай маёмасцю. Вось красамоўная пастанова, складзеная заснавальнікам храма віленскім падканюшным Мацкевічам: «Во имя Божіе станьсе. Я Шимко Мацкевіч ознаймую всему поспольству теперешнему и на потом будущему, кому то ведати належало, иж надаю на церковь Божую Мурованую, в повете Лидском лежачую Маломожейковскую, с именія моего Можейкова Великаго збожа моего дворнаго от жита, ячменя и пшеницы дзесятую копу записываю, тож с будынками, с полем и сеножатью, которое поле на пять бочек, и тоже поле Нечиковщина, котораго поля на три бочки, который кольвек в той церкви священник будет, повинен за мое здоровье и за моих прирожоных в четверг молебен Св. Николаю пети, ни в чем ни выступаючи с того моего постановенья, а священник, который коли кольвек будет у тое церкви, мает мети с тое десятины ко службе на тые дни ладон и просфоры. А по смерти моей, жена моя и дети мои, если их мети буду, так теж и ближние мои и хтож кольвек в предыдущий век тое имение мое Можейков великий держати будет, с того постановенья моего ни в чем не выступаючи, мают вечне тую десятину на тое церкви давать, так тож и жена моя и дети мои мают дати человека на службу Андрейца Василькевича с детьми его на тую церков вышереченную. А хто бы порушил той мой запись, што я записал ко пречистой Божіей Матери, той со мною разсудится на суде пред Богом. Писан в Можейкове, лета от воплощенія сына Божія 1542 года»[19].

Прыхільныя адносіны да храму многіх людзей стымулявалі і творчую працу пісцоў. У Малым Мажэйкаве было шмат пісьмовай літаратуры. Евангелле ж вылучалася старажытнасцю, багаццем афармлення, выкананага ў золаце і срэбры. На вокладцы зялёнага колеру было 5 срэбных і залачоных мініяцюр па краях. На старонках кнігі шмат інфармацыі пра царкву і яе зямельныя ўладанні. Дакумент 1660 года[20] пацвярджае знаходжанне евангелля ў гэтай царкве. У 1864 г. кніга трапіла на вочы галоўнаму карніку Беларусі графу М. Мураўёву, і след евангелля згубіўся.

Не засталося звестак пра Шчорсаўскае евангелле 1545 года, якое згадваецца В. Сямёнавым[21]. Кніга зберагалася ў царкве святога Дзмітрыя ў вёсцы Шчорсы (Навагрудскі р-н) не так і даўно, відаць, на пачатку XX ст.

Да «гродзенскіх» рукапісных помнікаў трэба, пэўна, аднесці і Галынкаўскае («Голынское») евангелле XVI ст. на 516 старонках. Пераплёт зроблены пазней. На верхняй вокладцы па малінавым эксаміце — срэбраная дошка з распяццем і срэбраныя накутнікі з выразанымі фігурамі евангелістаў. У тэксце ёсць запіс 1713 года, які сведчыць, што кніга «оправлена коштом побожного человека именем Григория Конецкого до церкви Голынское...»[22]. Вёсак з назваю «Галынка» ў Гродзенскай вобласці налічваецца 8, некалькі такіх назваў — за межамі Гродзеншчыны. Але найбольш верагодна, што евангелле належала Вялікай Галынцы Зэльвенскага р-на, дзе была старажытная царква, разбураная ўжо ў наш час, у 70-я гады.

Ёсць падстава лічыць наваградскім евангелле з 4-х часткаў, пісанае паўуставам у 2-й палове XVI ст. У канцы яго скорапісам зроблена лаканічная прыпіска: «Новагородка Литовского»[23].

Гэткі ж скупы аргумент на карысць прыналежнасці евангелля 1558—1569 гг. да Гродна. В. Ластоўскі сцвярджае, што кніга належала жыхару Гродна Безюку[24].

У XVI ст. манах Арсені, «родом... сынъ пана Волковыскаго», «Лукачов сынъ»[25], перапісаў паміж 1539 і 1568 гг. на Украіне, у Дубненскім кляштары евангелле (302 аркушы). Гэтаму кляштару ён «прыдаў» яшчэ 2 евангеллі, а ўсяго 14 кніг. Творчы подзвіг гэтага пісца, які палічыў магчымым прыгадаць на старонках святой кнігі сваё паходжанне, таксама не можа застацца ў баку ад кніжнай культуры нашага краю.

У XVII ст. рукапісная творчасць становіцца вельмі разнастайнай, з ´яўляецца многа зборнікаў, змешаных паводле зместу. Тым не менш евангелле не траціць для кнігапісцаў свае актуальнасці, хаця колькасна такіх рукапісаў становіцца менш. Захаваліся звесткі пра два евангеллі гэтага часу з гродзенскага рэгіёну — Карэліцкае і Жухавіцкае (з вёскі Вялікія Жухавічы Карэліцкага р-на).

У Карэліцкім евангеллі ёсць два скупыя пабочныя запісы, якія дазваляюць і датаваць яго, і вызначыць пэўны яго адрас. У канцы 4-й часткі евангелля прыпісана: «Іоан Грыгоровіч Сажка Пресбитер церкви корелицкое рукою своею» — і далей на польскай мове — «у годзе тысяча шэсцьсот сорак сёмым»[26]. А ніжэй яшчэ адзін запіс па-польску, які сведчыць, што руку сваю прыклаў «Юзаф Плаўскі прасвітар царквы Карэліцкай... у годзе 1696»[27].

Значыць, кніга ўзнікла не пазней за 1647 год, пісаная, пэўна, у Карэлічах, і «Іоан Грыгоровіч Сажка» — хутчэй за ўсё перапісчык евангелля. Хаця ён мог быць і ўладальнікам. Не выключана, што ён проста пакінуў свой аўтограф на старонцы кнігі, якой карыстаўся. Апошнія меркаванні, праўда, больш могуць датычыць аўтара другога запісу.

У кнізе каля 300 аркушаў. Пісана паўуставам у адзін слупок, па 21 радку на старонцы. Ёсць 4 застаўкі балканскага стылю, адметныя шырокім дыяпазонам колераў, кінаварныя ініцыялы. Пераплёт з дошак, на верхняй — у сярэдніку абраз, выкананы ў срэбры, дзве мініяцюры евангелістаў па кутах.

Жухавіцкае евангелле (захоўвалася ў Беларускім музеі імя І. Луцкевіча), пісанае выразным паўуставам, цікавае сваім пасляслоўем у канцы кнігі. Дакладней, пасляслоўе тут у двух варыянтах. Першы, на беларуска мове, досыць традыцыйны ў рукапісах гэтай эпохі і ўвасабляе пажаданне чытачу папраўляць пісца, не дакараць строга за магчымыя памылкі. Другі варыянт, на польскай мове, разгорнуты, рэдкі ў рукапісных помніках тым, што пісец не цураецца гаворкі пра звычайныя справы, пра сябе і такім чынам непасрэдна кантактуе з чытачом, што было вынікам уплыву ідэі свайго часу, уздзеяння і тагачаснай літаратуры. Вось пасляслоўе ў перакладзе з польскай мовы: «Пачаў гэтую кнігу пісаць сакавіка 5 спачатку на такой паперы, якую меў, бо адчуваў у гэтым вялікую патрэбу, бо ў гэтай Жухавіцкай царкве, апрача Трыодзі каляровай, ніякіх кніг не было, мусеў пісаць Апостал, Шастаднеўнік, Трафалой, і то большай часткаю памянёныя кнігі пісаў пры лучыне ноччу, леваю рукою свецячы, а праваю пішучы, г. зн. у левай руцэ трымаючы лучыну, а ў правай пяро, і то тады, калі меў паперу і які грош з заробку, каб было за што яе купіць, дабрадзея ніякага не маючы, які б мог мне ў гэтым дапамагчы, сам шмат старанняў прыкладаў, сваімі рукамі зарабляючы сякія-такія сродкі

на гэтыя кнігі, напісаўшы Апостал, Шастаднеўнік, Трафалой, напісаў і гэтую святую кнігу Евангелле, няхай усё гэта будзе на гонар і хвалу Богу ў тройцы адзінаму і найсвяцейшай панне арыі і ўсім святым. Амінь. А хто б гэтыя памянёныя кнігі наважваўся якім-небудзь спосабам забраць у гэтай святой царквы Жухавіцкай і на свой пажытак выкарыстаць або паводле сваёй волі іншай царкве перадаць, няхай яго спасцігне анафема, г. зн. праклятце навек, і са мною павінен будзе мець справу ў страшны дзень суду божага і з тымі, хто прычыніўся да аправы гэтага святога Евангелля і імёны чые запісаны ў кнігах жыцця і тут ніжэй абазначаны для дабра іншых.

Нягодны Лукаш Прасвітар царквы Жухавіцкай рукою сваёю 1668 месяца красавіка 13 дня»[28].

Маналог гэты каштоўны не толькі канкрэтнай інфармацыяй, якая датычыць часу, месца стварэння рукапісу, яго аўтарства. Перад намі, па сутнасці, мастацкі твор, у якім вытрыманы спецыфічныя для гэтага жанру літаратурныя формулы, што адпавядалі этыцы такога высокага акту, як перадача гатовай ужо кнігі царкве і адносінаў да такой кнігі нашчадкаў. Кнігапісанне станавілася справаю ўсё болей творчаю, аўтарскаю.

[1] Владимиров П. В. Обзор южно-русских и западно-русских памятников письменности от XI до XVII ст. Киев, 1890. С. 16.

[2] Карский Е. Ф. К вопросу о разработке старого западно-русского наречия. Вильна, 1893. С. 26.

[3] Щапов Я. Н. Восточнославянские и южнославянские рукописные книги в собраниях Польской Народной Республики. Ч. I. М., 1976. С. 78—79.

[4] Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. М., 1959. С. 38—42.

[5] Ермаловіч М. Беларускія летапісы і іх лёс // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1970, № 4. С. 33.

[6] Мястэчка Турэц цяпер у Карэліцкім р-не.

[7] Востоков А. Описание русских и словенских рукописей Румянцовского музеума. СПб, 1842. С. 126.

[8] Вёска Нягневічы цяпер у Наваградскім р-не.

[9] Востоков А. Указ. соч. С. 126.

[10] Вёска Бярозавец цяпер у Наваградскім р-не.

[11] Востоков А. Указ. соч. С. 126.

[12] Гісторыя беларускага мастацтва. Т. I. Мн., 1987. С. 234.

[13] Гадавік беларускага навуковага Таварыства. Кн. I. Вільня, 1933. С. 32.

[14] Добрянский Ф. Описание рукописей Виленской публичной библиотеки, церковно-славянских и русских. Вильна, 1882. С. 44.

[15] Гильтебрандт П. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки. Выпуск I. Вильна, 1871. С. 13.

[16] Добрянский Ф. Путеводитель по Виленской публичной библиотеке. Вильна, 1880. С. 22.

[17] Гильтебрандт П. Указ. соч. С. 13.

[18] Тамсама. С. 35.

[19] Литовскія Епархіальныя Ведомости, 1873, № 33. С. 299.

[20] Литовскія Епархіальныя Ведомости, 1873, № 34. С.307.

[21] Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Т. 9. СПБ, 1905. С. 430.

[22] Гильтебрандт П. Указ. соч. С. 37.

[23] Петретц В. Н. Рукописи библиотеки Московского университета, Самарских библиотеки и музея и Минских собраний. Л., 1934. С. 177.

[24] Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна, 1926. С. 406.

[25] Никольский Н. К. Рукописная книжность древнерусских библиотек. Вып. I. СПб, 1915. С. 77.

[26] Минская старина. Труды Минского церковного историко-археологического комитета. Вып. 2. Мн., 1911. С. 202.

[27] Тамсама.

[28] Ластоўскі В. Згад. твор. С. 578.

Ігар Трусаў
(Гродна)

КНІЖНАЯ КАЛЕКЦЫЯ З ШЧОРСАЎ

Жыццё Іяхіма-Літавора Храптовіча было наўдзіў разнастайнае, ягоныя інтарэсы выяўляліся практычна ва ўсіх галінах палітыкі, культуры і навукі Рэчы Паспалітай канца XVIII стагоддзя. Храптовіч без сумнення меў талент гістарычнага празорцы. Гэтая яго рыса, а таксама разнастайная і глыбокая адукаванасць дачыніліся да асноўнай ідэі ягонага выступлення на Сойме ў Варшаве ў 1773 годзе. Ён прапанаваў адчыніць Адукацыйную камісію — па сутнасці, першае Міністэрства народнай асветы ў Еўропе. Матэрыяльнаю базаю для навучання Храптовіч прапанаваў маёмасць скасаванага ў той жа час ордэна езуітаў. Высокія пасады — спачатку падканцлера, а потым канцлера Вялікага княства Літоўскага — далі яму магчымасць актыўна ўздзейнічаць на палітыку Адукацыйнай камісіі, у якой Храптовіч фармальна займаў пасаду кіраўніка дэпартамента акадэміі і школаў. Але ж калі старшыня камісіі князь Масальскі і сябра камісіі князь Сулкоўскі з маёмасці езуітаў напаўнялі свае кішэні, то Храптовіч «выкарыстаў» свой службовы стан дзеля нашчадкаў. Ён зрабіў усё мажлівае, каб большасць нелітургічных кнігаў з паезуіцкіх бібліятэкаў трапілі ў акадэмію (Універсітэт) і школы. Менавіта такім чынам частка кнігаў гродзенскіх езуітаў перайшла ў дамініканскую гімназію, потым у мужчынскую гімназію, пазней у гродзенскі музей. Гэтыя паезуіцкія кніжкі, мабыць, найбольш цікавыя і рэдкія ў калекцыі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, бо паходзяць яны з так званых «шафаў заказаных кніг»[1], якіх у гродзенскіх езуітаў было тры. Безумоўна, што частка кнігаў з езуіцкіх бібліятэк трапіла і ў прыватную калекцыю Храптовіча. Значны прыбытак ад выдатна пастаўленай гаспадаркі з шматлікіх фальваркаў даваў магчымасць Храптовічу праводзіць комплексную і шырокую праграму камплектацыі шчорсаўскіх збораў. Ён мэтанакіравана купляў старадрукі, новыя кніжкі і перыядычныя выданні не толькі з абшару Рэчы Паспалітай, але і з усёй Еўропы. Блізкасць да каралеўскага двара, пасада канцлера Вялікага княства Літоўскага, адчынілі Храптовічу доступ да дзяржаўных архіваў — Кароннай і Літоўскай Мэтрыкаў, да іншых каштоўных крыніцаў, якія ён наказаў закапаваць для сваёй бібліятэкі[2]. Таксама па яго загадах былі перапісаны некаторыя паперы з Галоўнага Трыбунала Вялікага княства Літоўскага[3]. У канцы XVIII стагоддзя менавіта карыстаючыся гэтымі крыніцамі, Храптовіч напісаў «Памятнік роду Літавораў-Храптовічаў». Гэты рукапіс захоўваецца ў рукапісным аддзеле бібліятэкі Акадэміі Навук Украіны ў Кіеве[4]. Аўтар — Іяхім-Літавор Храптовіч — быў, на жаль, вельмі сціплым у адносінах да сваёй асобы, бо адвёў сабе толькі з дзесятак радкоў.

І.-Л. Храптовічу ўдалося набыць частку аднаго з найбольш вядомых і рэдкіх збораў кніжак і рукапісаў Заходняй Еўропы — бібліятэкі кардынала Джузепа Імперыямі ў Рыме. Справа набыцця гэтых кніжак даволі таямнічая — пасля смерці Імперыялі, згодна з тэстамэнтам 1737 года, ягоная бібліятэка павінна была выкарыстоўвацца як публічная і кніжкі не падлягалі продажу. Таямніча выглядае і справа набыцця кніг з бібліятэкі Залускага. Спачатку, як вядома, паводле рэферэндара Залускага ў Калугу, Тадэвуш Чацкі і Храптовіч купілі без яго ведама частку калекцыі[5]. Але якім чынам ўдалося забраць Храптовічу вялікую колькасць кніжак пры перавозцы канфіскаванай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбург праз Гродна (у гэтым горадзе, мабыць, адбылася гэтая «аперацыя») да сённяшняга дня невядома. Вялікая заслуга належыць Храптовічу і ў выратаванні для нашчадкаў кніг з бібліятэкаў кляштараў закрытых у Галіцыі з нагоды імператара Іосіфа II. У той час фактычна задарма І. Храптовіч і Т. Чацкі набылі сотні каштоўных выданняў і рукапісаў, у тым ліку інкунабулы і палеатыпы[6].

Кнігі і рукапісы пасля смерці І. Храптовіча — 8000 тамоў — перавезлі з Варшавы ў Шчорсы. Згодна тастамэнту, складзенаму Храптовічам перад смерцю, бібліятэка цалкам прызначана была універсітэту ў Вільні ў момант яго стварэння. Але ягоныя нашчадкі — сыны Адам і Ірынеўш Храптовічы выкарысталі адсутнасць у фармальным тэксце тастамэнта слова «дар», прапанавалі універсітэту купіць кніжны збор. Кіраўніцтва універсітэту не мела грошай, і бібліятэка засталася ў Шчорсах.

Старэйшы сын Храптовіча Адам, філантроп і мецэнат, старшыня Віленскага дабрачыннага таварыства, віцэ-старшыня Друкарскага таварыства, візітатар публічных школаў, сумесна з братам Восіпам, павялічылі кніжны збор да 15 000 тамоў. Менавіта ў гэты час бібліятэка і архіў у Шчорсах атрымалі шырокую вядомасць у літаратурных і навуковых колах. Таму польска-беларускі паэт Уладіслаў Сыракомля ў сваёй вандроўцы па Нёмане, адведаўшы Шчорсы, як адзін з галоўных аб'ектаў падарожжа, ацаніў толькі польскамоўную частку кніжнай калекцыі ў 10 000 тамоў[7]. Галоўны даследчык шчорсаўскай бібліятэкі і архіву — Станіслаў Пташыцкі пацвердзіў прыблізную лічбу вядомага краязнаўцы А. Ельскага: у канцы XIX стагоддзя шчорсаўскі збор кніг і рукапісаў налічваў каля 20 000 назваў.

У 1914 годзе, пад час наступлення германскай арміі, тагачасны ўладальнік Шчорсаў Апалінары Буцянёў-Храптовіч выконваючы «загад» І.-Л. Храптовіча, перадаў у дэпазыт Кіеўскаму універсітэту больш за 45 000 тамоў польскамоўных выданняў, але з умовай «...пасля аднаўлення польскага універсітэту ў Вільні вярнуць у яго дэпазыт»[8]. Сабе Буцянёў-Храптовіч пакінуў частку кніг (заходняеўрапейскія і рускамоўныя выданні) — каля 3 000 тамоў. Засталіся ў яго архіў, калекцыя мапаў і гравюраў і каштоўныя палотны[9]. Даследчыкі гісторыі Шчорсаў вельмі мала ўвагі надавалі жывапісным і іншым скарбам музейнага характэра, якія захоўваліся ў фальварку. Аднак А. Ельскі адзначае ў 1880 годзе больш за 100 абразоў, якія былі ў палацы[10]. Ён асобна вызначыў партрэты Храптовічаў і іх сваякоў, караля Сігізмунда-Аўгуста, каралевы Альжбеты, маркізы дэ Пампадур. Пры гэтым трэба адразу зазначыць, што калісьці Храптовіч падараваў для шчорсаўскай уніяцкай царквы два абразы пэндзэля Бачыярэлі: «Св. Ізідар» і «Благаслаўляючы дзетак Ісус»[11]. Усе гэтыя скарбы трапілі ў Музей Вытанчаных Мастацтваў у Маскве. Пасля рэвалюцыі ўся гэтая маёмасць была нацыяналізавана, каштоўныя абразы і гравюры аселі дзесьці ў музейных сховішчах Масквы і Пецярбурга, невядома дакладна месцазнаходжанне калекцыі мапаў (у бібліятэцы АН Украіны ў Кіеве нам удалося знайсці толькі чатыры мапы з Шчорсаў, якія, напэўна, трапілі ў Кіеў выпадкова). Архіў з Шчорсаў захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Публічнай Бібліятэкі імя Салтыкова-Шчэдрына ў Пецярбурзе.

Асобна трэба зазначыць каштоўнасць рукапіснай часткі бібліятэкі Храптовічаў, найбольш ацалелай. Яна захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Акадэміі Навук Украіны ў Кіеве. Нам давялося працаваць з гэтай

калекцыяй у пачатку 1991 года. Параўнальны аналіз наяўнасці рукапісаў з выданым у 1899 годзе каталогам С. А. Пташыцкага[12] паказаў адносна невялікія страты (у залежнасці ад методыкі ад 15 да 30 адзінак). Калі не ўспамінаць пра вельмі каштоўныя канвалюты, якія змешчваюць у сабе арыгіналы і копіі лістоў розных вядомых асоб, вершаваныя панегрыкі, дзённікі і ўспаміны, п ´есы, інтэрмедыі, вершы і г. д., — дык можна бачыць вялікую каштоўнасць матэрыялаў да мапы Вялікага княства Літоўскага, якую меў намер выканаць у сярэдзіне 80-х гадоў XVIII ст. каралеўскі картограф Кароль Пяртэс. Фактычна гэтыя падрабязныя вопісы ўсіх (!— І. Т.) даканатаў Вялікага княства зробленыя па парафіях — скарб інфармацыі для гісторыка, краязнаўцы, філолага — да гэтага часу не выкарыстоўваецца беларускімі даследчыкамі. Дарэчы, ягоныя ўласныя накіды тапаграфіі розных парафіяў Каралеўства Польскага, па якіх пазней была зроблена вялікая мапа, захоўваюцца тамсама. Праца ў Кіеве праводзілася намі сумесна з гісторыкам з Польшчы доктарам Юзафам Марошкам. Незалежны аналіз складу рукапіснага збору Храптовічаў, які мы зрабілі кожны паасобна, сведчыць, што ў рукапісную частку бібліятэкі Храптовічаў з самага пачатку траплялі амаль толькі літаратурныя творы, лісты розных асобаў і г. д. Гістарычныя крыніцы ў вузкім сэнсе разумення — арыгіналы і копіі архіўных дакументаў — павінны былі асядаць у Шчорсаўскім архіве. Прыкладам рознага падыходу да камплектавання бібліятэкі і архіву можа быць толькі факт: пры перапісванні вопісаў парафіяў (прыгаданых вышэй) дзеля бібліятэкі, былі прапушчаны матэрыялы пра Нягневіцкую парафію Наваградскага даканата, відаць, таму што гэты вопіс меў «архіўнае» значэнне для маёмасці Шчорсаў. На нашу думку, у далейшых даследаваннях спадчыны Храптовічаў абавязкова трэба звярнуць больш увагі менавіта на поўнае адшукванне і навуковую апрацоўку «Архіва Храптовічаў».

Лёс разнастайнай спадчыны Храптовічаў з ´яўляецца толькі часткай, але даволі значнай, агульнай справы — праблемы культурнай спадчыны беларускага народа за межамі Беларусі. Пошукі, навуковая апрацоўка, выкарыстанне і, магчыма, у далейшым часе вяртанне на бацькаўшчыну скарбаў з Шчорсаў — справа гонару беларускай грамадскасці.

[1] Гл. нашу тлумачальную нататку да «Каталогу краязнаўчай кнігі ГрДГАМ»— аддзел рэдкай кнігі ГрДГАМ, чытальная зала.

[2] Гл. арт.: «Гняздо старажытнага роду», інтэрв ´ю з І. Трусавым //Гродненская правда.— 1991. 25 мая.

[3] Гл. наш рукапіс: Трусов И. Г. Отчет о работе для комитета «Память А. Мицкевича» за 1991 г.» Архив областного отделения Польского общества.

[4] РА БАН Украіны, Кіеў, 1-6014.

[5] Aftanazy R. Materialy do dziejow rezydencji. W-wa, 1986. I. II a. S. 451.

[6] Там сама. С. 450.

[7] Syrokomla Wl. Monografia rz. Niemna odjegc zrodel do Kowna. Wilno, 1861. S. 30.

[8] Архіў Міністэрства Культуры і мастацтва Рэспублікі Польшча, аддзел «Рэвіндыкацыі культурнай спадчыны з Савецкай Расіі», IIIa, 1-345, д. 12/К. 45.

[9] Так сама.

[10] Jelski A. Z guberni miniskiey we wrzesniu r. 1880 (Gazeta, Warszawska. NN 208, 210.

[11] Трусов И. Г. Комплексные историко-архивные и библиографические изыскания. О2/02 КНИ. Б. Дворец в Щорсах. 1991. Архив ОМП «ГРОДНО-ПРОЕКТРЕСТАВРАЦИЯ».

[12] Пташицкий С. А. Щорсовская библиотека графа Литавора Хрептовича. Т. I. Короткие сведения о собрании рукописей.— М.-1899.

Людміла Карнілава
(Гродна)

ЦУДАТВОРНЫЯ АБРАЗЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ: АБРАЗ МАЦІ БОЖАЙ ЖЫРОВІЦКАЙ

Кожная зямля, кожны народ маюць свае святыні. Асаблівае месца сярод іх у хрысціянскім свеце займаюць цудоўныя абразы Маці Божай. На беларускіх землях культ цудоўных абразоў быў звязаны з дзейнасцю праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай царквы (пратэстанцкая царква адмаўляла культ Багародзіцы). Шматлікія святы, прысвечаныя нябеснай маці-апякунцы, якая падавала прыклад веры, надзеі, любові і пакорнасці, паломніцтвы да месцаў, дзе знаходзіліся цудоўныя абразы, былі значнай часткай грамадскага жыцця. Культ цудоўных абразоў Маці Божай быў той невычарпальнай крыніцай, якая на працягу многіх стагоддзяў натхняла паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў. Пашана адных абразоў мела мясцовы характар, другіх — стала ўсенароднай. Аднак падзеі другой паловы XIX-XX ст. прывялі да таго, што шматлікія асяродкі жывога культу Дзевы Марыі страцілі сваё былое значэнне, а доля шмат якіх абразоў і да сённяшняга дня застаецца невядомай.

На Гродзеншчыне асабліва шанаваліся абразы: праваслаўныя — Наваградскі (замкавы), Каложскі (Гародня), абраз Уладзімірскай Маці Божай (Гародня); каталіцкія — Кангрэгацкі альбо Студэнцкі (Гародня), Наваградскі, Лідскі, Васілішкаўскі, Гудагайскі, а таксама абразы ў Суботніках, Вялікіх Эйсмантах, Асаве, Міждэўрыччы; уніяцкі — у Барунах.

Сярод Марыйных асяродкаў Гродзеншчыны вылучыўся адзін, які аднолькава шанаваўся праваслаўнымі, уніятамі і католікамі. Гэтым асяродкам былі Жыровічы, куды ішлі паломнікі з усіх земляў Рэчы Паспалітай.

Паданне кажа, што ў 1470 годзе ва ўладаннях Аляксандра Солтана — скарбніка Вялікага княства Літоўскага пастушкі знайшлі на дзікай грушы маленькі абраз з выявай Маці Божай з немаўлём-Хрыстом і аддалі свайму гаспадару. Дата з ´яўлення абраза спрэчная. Бо вядома, што ў гэты перыяд Жыровічы належалі Гойцавічам. І толькі ў 1493 годзе мястэчка перайшло ва ўладанне Солтанаў.

У канцы XV ст. каля грушы, на якой знойдзены абраз, быў пабудаваны драўляны храм. У 1520 г. гэты храм згарэў падчас пажару, які знішчыў амаль усё мястэчка. Паданне апавядае, што падчас пажару абраз знік з алтара. Але праз некаторы час дзеці, адпачываючы пасля заняткаў у школе, прыйшлі на суседнюю горку, дзе і ўбачылі Маці Божую, якая сядзела на вялікім камені. У руках Дзева Марыя трымала абраз, які знік падчас пажару. Дзеці расказалі пра ўбачанае святару і бацькам якія потым прыйшлі да каменя і ўбачылі на ім сваю святыню. З гэтага месца з урачыстай пацэсіяй абраз быў перанесены ў часовую драўляную каплічку. У сярэдзіне XVI ст. Ян Солтан пачаў

будаўніцтва каменнага храма. А ягоная жонка Марыя пасля смерці мужа, як мяркуюць, стала фундатарам праваслаўнага манастыра. Аднак будаўніцтва неўзабаве было спынена ў сувязі з перадачай Жыровічаў пад заклад кобрынскаму жыду Іцхаку Міхалевічу і пераходам нашчадкаў рода Солтанаў у пратэстантызм. У 1605 годзе гаспадаром Жыровічаў стаў мсціслаўскі кашталян Іван Мялешка. Менавіта ён з сваёй жонкай Аннай і Леў Сапега — стараста слонімскі, гетман і канцлер Вялікага княства Літоўскага сталі фундатарамі кляштара ўніяцкага ордэна св. Базыля. Першым ігуменам базылянскага мужчынскага Жыровіцкага кляштара стаў Іасафат Кунцэвіч, пазней архіепіскап полацкі. Кляштар неўзабаве атрымаў шырокую вядомасць дзякуючы цудоўнаму абразу Маці Божай. У 1622 г. жыровіцкім манахам Феадосіем была напісана на старабеларускай мове «Гистория або повесть людей розных, веры годных о образе чудовном пренасвятейшое девы Марии Жировицкой в Повете Слонимском, вовсём згодливая, коротко выписаная И з немалою працою и старанем собраная през много грешного отца Феодосия». «Гисторыя» была першым пісьмовым пераказам легенды аб жыровіцкім абразе.

У тым жа 1622 г. у Вільні была выдадзена кніга Т. Баравіка «Гісторыя, або апавяданне людзей, годных даверу аб цудоўным абразе прычыстай Дзевы Марыі Жыровіцкай» (Borowik G. Historija, abo powiesc zgodliwa przez pewne podanie ludzi wiary godnych o obrazie przeczystej Panny Mariej Zyrowickieje cudotwornym.— Wilno, 1622) Кніга перавыдавалася ў Вільні ў 1625, 1628 гг., у Супраслі ў 1629, 1653, 1714 г. г. У 1639 г. выдана «Гісторыя аб цудоўным абразе Жыровіцкай Дзевы Марыі» (Historya o cudownym obrazie zyrowickim panny Maryi (S. l./1639).

У 1644 годзе два дні ў студзені ў Жыровічах правёў кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV разам з сваёй жонкай Цацыліяй Рэнатай. У гэтым годзе была выдадзена і новая кніга аб жыровіцкім абразе — А. Дубовіча «Сувязь зямных планет», Вільня, 1644 (Dubowiez A. Coniunetia planet ziemskich.— Wilno, 1644). У 1651 г. А. Дубовіч выдаў другую кнігу — «Залатая гадзіна» (Dubowicz A. Zlota godzina...— Wilno, 1651).

У 1655 годзе Жыровічы і ягоныя ваколіцы былі апустошаны войскамі цара Аляксея Міхайлавіча. Частка ўніяцкіх манахаў загінула ад рук непрыяцеля, частка вымушана была пакінуць мястэчка, ратуючы сваё жыццё. Мястэчка і кляштар узялі пад сваю ўладу слонімскія бернардзінцы. Жыровічы былі вызвалены ў 1660 годзе, а перамога войск гетмана літоўскага Паўла Сапегі і Стэфана Чарніцкага пад Палонкай 27 чэрвеня 1660 года была прыпісана цудоўнай апецы Маці Божай, якая асабліва шанавалася ў Жыровічах.

У 1661 годзе сойм назаўсёды звольніў мястэчка ад жаўнерскіх пастояў і на 4 гады ад падаткаў. У 1667 г. Жыровічы яшчэ на 4 гады былі звольнены ад падаткаў. Базыльяне адбудавалі кляштар, які 27 сакавіка 1688 г. наведаў кароль Ян Сабескі разам са сваім сынам Якубам. Старая жыровіцкая песня захавала сведчанне аб наведванні цудоўнага абраза Маці Божай знакамітымі асобамі.

Polubinscy i Oginscy
I zacni Sapiehowie,
I Koreccy i Czarnieccy,
Bitni Chodkiewiczowie
Tu przyznali, ze doznali
Zyrowickiej pomocy,
Chociaz wmali rozplaszali
Nieprzyjacielskie moce...
Jan Sobieski, krol nasz Lechski
Wotum swoje oddaje,
Ze to nowa Czestochowa,
Obrazowi przyznaje...

Сярод шматлікіх выяваў цудоўнага жыровіцкага абраза асабліва вылучаюцца два — малюнак невядомага французскага (1666 г.) і гравюра вядомага гравёра — Лявонція Тарасевіча, выкананая ім у 1682 годзе. На малюнку французскага акрамя выявы ў натуральны памер абраза, змешчаны яшчэ 10 сюжэтаў, звязаных з гісторыяй абраза. На гравюры Л. Тарасевіча, выкананай па малюнку П. Бацэвіча, у цэнтры змешчана выява абраза Маці Божай. Выяву з двух бакоў падтрымліваюць апосталы Пётр і Павел і два пуцці. Уверсе выява Навазапаветнай Троіцы. Па акружнасці выявы абраза тэкст на 2-х мовах: «Честнейшую херувим исславнейшую воистину серафим безистления Бога слово» (гэта скарочаны тэкст песні «Честнейшую херувим, и славнейшую без сравнения серафим, без истления слова рождшую сущую Богородицу, тя величаем» (і «Panna przed porodzeniem, Panna przy porodzeniu, Panna po porodzeniu») («Дзева да нараджэння, Дзева ў нараджэнні, Дзева пасля нараджэння». Некаторыя познія аўтары (сярод іх і Грыгорый Лужніцкі, складальнік «Словніка чудотворних Богородичных ікон Украіни» у зборніку «Intrepido Pastori», Рым, 1984) памылкова думалі, што тэкст песні знаходзіцца па акружнасці арыгінала. На самой жа справе гэтага тэксту няма, а практыка яго змяшчэння на малюнках, карцінах і гравюрах сягае ў сярэдневечча.

У XVIII ст. слава Жыровіцкага абраза Маці Божай значна ўзрасла ў сувязі з адкрыццём у Рыме копіі абраза. У 1718 г. па даручэнню пракуратара ордэна базыльянаў Бенедыкта Трулевіча ў рымскай базыльянскай рэзідэнцыі пачаўся рамонт, у час якога ў закрысціі была выкрыта напісаная на сцяне копія Жыровіцкага абраза. Восенню 1719 года з закрысціі копія была перанесена ў бакавы алтар св. Іасафата Кунцэвіча храма Сергія і Вакха. У гэтым жа годзе ў Рыме была выдадзена на італьянскай мове кніга, прысвечаная абразу «Прысвятая Дзева Жыровіцкая» ксяндза Ігнація Валодзькі (Wolodzko I. Della Madonna Santissima delle del Pascolo. Romae, 1719.— «Пасколо»— так на італьянскай мове гучыць слова «жыр» (авечы). Праз два гады ў 1712 г. у Рыме таксама на італьянскай мове выйшла кніга каноніка Ізідора Нардзі «Гістарычныя звесткі аб цнатлівай Дзеве Жыровіцкай» (Nardi I. Relazione della immagine d. Madonna del Pascolo. Romae, 1721).

У 1726 годзе рымскі папа Бенядыкт XIII даў дазвол на каранацыю цудоўнага абраза Маці Божай, які знаходзіўся ў базыльянскім кляштары ў мястэчку Жыровічы Слонімскага павету. Пачатак традыцыі каранавання абразоў у каталіцкай царкве пачынаецца ў VIII ст. Першы абраз быў каранаваны ў 725 годзе папам Рыгорам III. Але ў практыку каталіцкай царквы гэты звычай актыўна ўвайшоў у XVIII ст. пасля таго, як у 1630 г. Аляксандр Сфорца — дэкан Ватыканскага капітула св. Пятра ахвяраваў вялікія сродкі на каранаванне цудоўных абразоў у Папскай (Царкоўнай) вобласці. У Рэчы Паспалітай першыя абразы былі каранаваныя ў 1718 г. (Трокскі — 4 верасня), 1718 г. (Чанстахоўскі — 8 верасня), 1723 г. (Кодзенскі), 1724 г. (Сакольскі), 1727 г. (Падкаменскі). Датай каранавання Жыровіцкага абраза было прызначана 19 верасня 1730 года.

Напярэдадні каранацыі абраза ў Супраслаўскай базыльянскай друкарні на польскай мове была перадрукавана кніга каноніка І. Нардзі «Гістарычныя паведамленні аб з'яўленні Жыровіцкай Дзевы.», выдадзеная на італьянскай мове. Цяпер перакладзеная на польскую І. Кульчынскім» (Nardi I. Relacja historyczna o zjawieniu panny Zyrowickiej... po wlosku wydane. Teraz przetlumaczone przez I. Kulczynskiego. Suprasl, 1728). Кніга перавыдавалася ў Вільні — 1738 г., у Супраслі — 1747, 1755 гг.).

Перад святам каранавання ў Жыровічы прыйшлі тры працэсіі паломнікаў з Вільні, Менска і Міру. У працэсіі з Міру прымаў удзел полк янычараў, які належаў Радзівілу. У межах Слоніма па дарозе, якая вяла ў Жыровічы, былі збудаваны 6 трыумфальных брамаў. Яны пабудаваны і аздоблены на сродкі: 1) базыльянаў і жыхароў Слонімскага павета; 2) мітрапаліта Афанасія Шаптыцкага; 3) Людвіга Пацея — ваяводы віленскага, гетмана літоўскага; 4) Радзівілаў — Іераніма і Мікалая. А іх маці Анна Катажына з Сангушкаў Радзівіл — удава Караля I Станіслава Радзівіла — канцлера, падкаморыя і стольніка літоўскага выдзеліла сродкі на ўпрыгожванне карон каштоўнымі камянямі і на правядзенне каранавання); 5) Міхаіла Сервацыя Вішнявецкага — канцлера і вялікага гетмана літоўскага; 6) Сапегаў.

На працягу тыдня, які папярэднічаў каранацыі, апоўдня і ўвечары на працягу паловы гадзіны званілі званы, а ў штодзённых набажэнствах прымалі ўдзел і каталіцкія святары: Бернард Кжывец (бенедыктынец), Раймонд Вайнікевіч, Міхаіл Пашкевіч, Казімір Раманоўскі (францысканцы), Аляксандр ад св. Юзафа, Лаўрэнці ад св. Крыжа (кармяліты), Фавст Петрашэўскі, Іосіф Дрэўнінг (дамініканцы), Францыск ад св. Юзафа, Ансельм ад св. Францішка (піяры). Базыльянін Скальскі склаў праслаўляльную абраз песню «Жыровіца любві крыніца» («Zyrowica lask krynica»), радкі з якой былі прыведзены раней у сувязі з каралеўскімі паломніцтвамі.

Каранацыю абраза 19 верасня 1730 г. выконваў уніяцкі мітрапаліт кіеўскі Афанасій Шаптыцкі разам с біскупамі ўладзімірскім — Тэафілам Гадзбскім і пінскім — Ежы Булгакам. У год каранацыі ў Вільні была выдадзена кніга Гераклія Лізаньскага «Вялікі знак...» (Lizanski H. Signum Magnum... Wilno, anno quo Vera Del Mater Virgo CoronatVr zyro VVICIIs, czyli po odpowiedniem ugrupowaniu liter-cyfr: MDCCVVVVVIIIII-1730).

У тым жа годзе і чародныя за ім у Рыме і Супраслі выйшлі чатыры працы кс. Ігнація Кульчынскага «Вялікі знак...» (Kulczynski I. Signum magnum... Romae, 1730) «Малітва абразу блаславёнай Дзевы Марыі Жыровіцкай» (Kulszynski I. Oratio de beatissimae Vizginis Mariae imagine Zyrovicensis. Romae, 1732). «Diaspro Pzodigioso» (Kylczynski I. II Diaspro Prodigioso. Romae, 1732), «Цудоўны яспіс» (Kulczynski. I Iaspis cydownu. Suprasl, 1738).

Праз 14 гадоў пасля каранавання ў 1744 г. Жыровічы наведаў кароль Аугуст III. Другая палова XVIII ст. папоўніла спіс выданняў, прысвечаных Жыровіцкаму цудоўнаму абразу двума новымі — I. Дзявульскага — «Апісанне цудаў прасвятой Дзевы Марыі ў абразе Жыровіцкім» (Dziewulski I. Opisanie cudow naiswiestszej Maryi panny w obrazie zyrowickim — Wilno, 1751) і «Гісторыя пра паходжанне цудоўнага абраза Дзевы Марыі Жыровіцкай у Літве» (Dziewulski I. Historya o poczotkach obrazu... panny Maryi zyrowickiej w Litwie.— Wilno, 1773).

У 1784 г. каля цудоўнага Жыровіцкага абраза маліўся апошні кароль Рэчы Паспалітай — Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Слава Жыровічаў не згасла і пасля таго, як у 1839 годзе кляштар стаў праваслаўным. Сведчаннем таму шматлікая літаратура, песнапенні, што праслаўлялі цуды Дзевы Марыі ў Жыровічах.

Шмат стагоддзяў як ізвесны
Абраз твой сьвяты нябесны
Зблізка, здаля народ горне
Пакланяюцца пакорна
Ты як маці ўсіх прымаеш,

Чыстых сэрцам усіх знаеш
.....
Сьляпы, храмы і гарбаты
Вернецца здароў да хаты
Беларусь Цябе ўся знае
Абаронцай называе.

Манастыр у Жыровічах функцыянаваў і ў 60—70-я гады XX ст., калі вялася барацьба з рэлігійным светаўспрыманнем. Шмат храмаў, кляштараў, манастыроў у гэтыя часы былі зачынены, але лёс быў спагадлівы да Жыровічаў. І сёння, кожны год 20 мая, ідуць у манастыр на свята Жыровіцкага абраза Маці Божай шматлікія паломнікі.

Цяпер ікона знаходзіцца ў галоўным манастырскім храме-саборы Спакаення Багародзіцы каля іканастаса, з левага паўночнага боку Царскай брамы.

Сярод цудоўных абразоў Маці Божай Жыровіцкі абраз ці амаль не самы малы. На камяні (дапушчальна яшме) памерам 5,6х4,4 см у плоскім рэльефе выява Маці Божай, якая нахілілася над дзіцём-Хрыстом, які сядзіць на яе правай руцэ. Хрыстос прытуліўся да шчакі Багародзіцы. Левая рука Маці Божай прыціснута да грудзей. Вакол галоў рэльефныя німбы. Абраз адносіцца да іканаграфічнага тыпу абразоў — Элеўса (Замілаванне), малюнак якога склаўся ў коптскім мастацтве Егіпта. Менавіта гэты тып абразоў перадае незвычайна цёплыя мацярынскія пачуцці і выяўляе адносіны, якія злучаюць маці і сына ў справе адкуплення чалавека.

Па стылістычных прыкметах Жыровіцкі абраз належыць да апошняй трэці XV ст. Абраз змешчаны ў цэнтры вялікага багатага кіёта і закрыты крышталём (што не дае магчымасці для дэталёвага яго вывучэння).

За пяць стагоддзяў шмат паданняў, вершаў, песняў было прысвечана цудоўнаму абразу ў Жыровічах. І адзін з вершаў нашага часу належыць вядомай беларускай паэтцы — Ларысе Геніюш. У ім ёсць такія радкі:

Жыровіцы, славутая мясціна,
здаўна праложаны для нас
дзядамі шлях,
Малітвы боль у нялёгкую хвіліну
мы на тваіх складаем алтарах.
Хай будзе мір ды згода ўсюды будзе.
Усё ж калі грозьбой азарыцца сінь.
нашай зямлі, дастойнай Тваіх цудаў,
у сваёй апецы, Божа, не пакінь.

Янка Трацяк
(Гродна)

РОЛЯ БЕЛАРУСКІХ СВЯТАРОЎ У АДРАДЖЭННІ РОДНАЙ МОВЫ

З усіх духоўных і прыродных чалавечых вартасцей родная мова ёсць самая галоўная вартасць, самая галоўная рыса нацыянальнай самасвядомасці народу. Гэта — найвышэйшы Божы Дар, і народ, калі ён хоча «людзьмі звацца», павінен звяртацца да Бога ў той мове, якую яму даў Усявышні, бо бясспрэчным з ´яўляецца той факт, што малітвы ў чужой мове, падчас незразумелай, ёсць не што іншае, як машынальны паўтор слоў да канца неасэнсаваных і непрадуманых. Малітвы павінны быць ад усяго сэрца, ад усёй душы. А такія малітвы могуць быць толькі на роднай мове.

Вось часу Хрыстос даў апосталам дар гаварыць рознымі мовамі і загадаў прапаведаваць евангелле ўсім народам.

І каталіцкі касцёл неаднойчы звяртаў увагу на вывучэнне малітваў і казанняў на мове роднай таму ці іншаму народу.

«Дзеля гэтага патрэбна вучыць кожнага так, каб уцяміў духова: гіспанца ў гіспанскай, індыйца ў індыйскай... ды нават лепш, калі адмаўляе і адказвае на пытаньні ў матчынай мове...» (з пастановы кангрэсу ў Ліме (Перу) у 1582 годзе)[1].

«Агульны Сабор Трыдзенскі, які адбыўся ў 16 ст. пастанавіў, каб духавенства па касцёлах гаварыла навуку ў роднай мове»[2].

Ды толькі на Беларусі існуе здаўна праблема ўжывання роднай мовы ў святынях. Менавіта з таго моманту, калі край трапіў пад уплыў польска-каталіцкага касцёла і маскоўска-праваслаўнай царквы, чужая мова ў боскіх храмах стала не столькі сродкам рэлігійнай місіі, колькі прапаведнікам палітыкі суседніх дзяржаваў. Калі страта эканамічнай незалежнасці Вялікага княства Літоўскага дала магчымасць ужыцца падобным праявам, то яны, апошнія, прыводзяць да страты духоўнай самастойнасці народу, а гэта значыць, да гібем нацыі.

Вось чаму з ростам духоўнага адраджэння беларускага народа, з абуджэннем яго нацыянальнай свядомасці і незалежнасці ва ўсіх сферах жыцця, у тым ліку і рэлігійнага, заўсёды востра ўзнікала пытанне наконт роднай мовы ў святынях.

Родная мова жыла ў касцёлах, нягледзячы на шматвяковую забарону яе ўжывання ў грамадскім жыцці. Яна перадавалася, як святая рэліквія з храма ў храм, з пакалення ў пакаленне і дайшла да нашых дзён. Дайшла, дзякуючы сваёй неўміручасці як святыні, дзякуючы бессмяротнаму духу народа, яго лепшых прадстаўнікоў, святароў-беларусаў, якія, рызыкуючы і ахвяруючы сваім жыццём, неслі свайму люду беларускаму Слова Божае ў роднай мове.

Такія казанні мелі вялікае значэнне не толькі ў разуменні бога,— яны дапамагалі вернікам адчуць сябе, хоць на невялікі момант прыходу, самастойным і незалежным ад чужых моў і чужых парадкаў, яны абуджалі нацыянальную свядомасць людзей. Магчыма беларускае слова ксяндза Магнушэўскага, які быў пробашчам у Крошыне і меў школку, у якой вучыўся Паўлюк Багрым, зрабіла Паўлюка Багрыма адным з першых беларускамоўных паэтаў.

Варта нагадаць яшчэ і прафесара Віленскага універсітэта, пробашча прыходу ў Шэрашаве кс. М. Баброўскага (памёр у 1848 г.), С. Данісевіча, біскупа-суфрагана Магілёўскай Дуэцэзіі, якія гаварылі казанні на беларускай мове, кс. Фр. Будзьку (памёр у 1920 г.), беларускасць якога настолькі была вялікай, што з гэтай прычыны польскія каталіцкія ўлады не хацелі свянціць яго на ксяндза.

На Гродзеншчыне адзін з першых, хто распачаў беларускую працу, быў ксёндз Франук Грынкевіч (1884—1933). Нарадзіўся ён у в. Новы Двор, Сакольскага павета. Вучыўся ў гімназіі ў Гародні, у Віленскай духоўнай семінарыі (1901—1905), Каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбурзе (1905—1907), Інсбруку (1907—1908), Мюнхене (1908—1909). У 1907 годзе быў пасвечаны на ксяндза. З 1909 года стаў працаваць у Гародні законавучыцелем у гімназіі. Тут, у Гародні, ён і ўзначаліў гурток беларускай моладзі пад назвай «Хатка». Да працы «Хаткі» належылі штотыднёвыя лекцыі і дыскусіі на тэмы беларускасці, чыталі і разбіралі творы беларускіх пісьменнікаў, вывучалі гісторыю і геаграфію Беларусі, была беларуская дыктоўка, ставілі спектаклі, ладзілі беларускія вечарынкі. Так, напрыклад, праграма беларускай вечарынкі ад 19.10.1910 г. зложана з трох часцей: уступнае слова, рэферат «Беларусы і іх нацыянальнае адраджэнне», беларускія песні, п ´еса «Да рэвізіі», дэкламацыя беларускіх вершаў. «Хатка» мела сваю пячатку, архіў і бібліятэку.

У 1913 годзе «Хатка» выдала свой часопіс «Колас нашай нівы». У прадмове да часопіса чытаем: «... каб і гэты гарадзенскі «Колас» выдаў хоць маленькі, найменшы каласочак з параю зярнятак каханьня Бацькаўшчыны і братоў родных»[3].

Апроч гэтай працы Франук Грынкевіч гаварыў казанні на роднай мове і пераклаў «Часіны да прэчыстай дзявіцы».

Як заўважае Адам Станкевіч: «Асоба Фр. Грынкевіча на працягу 5—6 гадоў (1909—1914) была асобай цэнтральнай і адзінай, якая будзіла там і арганізавала беларускі рух»[4]. Вялікае значэнне надае гэтай працы Адам Станкевіч. «На беларускіх землях Гарадзеншчыны ў часе поўнага заняпаду беларускай нацыянальнай думкі, ён першы павёў адраджэнскую культурную працу. Праца была нялёгкай. Страшэннымі перашкодамі былі цемната нашага народа і варожасьць расейскай імперыі... Беларуская нацыянальная ідэя як самастойная вартасьць падтрыманьне ў польскай інтэлігенцыі, за малымі выняткамі, ня мела»[5].

Варта сказаць і тое, што беларуская дзейнасць кс. Франука Грынкевіча пакінула значны след у свядомасці гарадзенцаў. Так, напрыклад, адзін з самых актыўных дзеячаў «Хаткі» Адам Бычкоўскі пазней стаў загадчыкам Беларускага навукова-літаратурнага гуртка ў Пецярбурзе (1912 г.), рэдактарам часопіса беларускіх студэнтаў «Раніца» (Пецярбург, 1914 г.).

Вялікі ўплыў кс. Франук Грынкевіч аказаў на ксяндза Уладыслава Талочку (1887—1942), які, інакш кажучы, пераняў эстафету беларускасці ад свайго старэйшага сябры і стаў адным з самых дзейных рупліўцаў на беларускай ніве.

Нарадзіўся Уладыслаў Талочка ў Гародні ў сям'і ўрадаўца. Вучыўся ў Гародні, Беластоку, Вільні, Інсбруку. Як ксёндз працаваў у Ваўкавыску, Гародні, у Вільні пры касцёлах св. Яна, св. Стэфана і пры Бернардынах. Беларускую працу распачаў у 1907 годзе першымі артыкуламі ў беларускім друку, затым перадавіцы ў палітычных друкаваных органах 1919—1920-ых гадоў. Дарэчы, ён быў працаўніком амаль усіх беларускіх выданняў, друкаваў артыкулы на тэмы беларускай культуры, рэлігіі, гісторыі. Друкаваўся пад сваім прозвішчам і пад псеўданімам А. S. (Адам Саладух). Вялікую работу праводзіў кс. Уладыслаў Талочка па арганізацыі беларускіх прытулкаў і беларускіх школ. Вёў карэспандэнцыю з Інстытутам Усходняй Еўропы ў Рыме, прадстаўнікамі Апостальскай сталіцы з просьбай аб патрэбах беларускага народа ў касцельным жыцці. «Агулам трэба сказаць,— піша Адам Станкевіч,— што ў гэтым часе Уладыслаў Талочка быў кіраўніком, галавой, будзіцелем беларускага каталіцкага руху як такога. Усё, што тады рабілася беларускае, каталіцкае,— гэта была яго справа»[6].

«Кс. Уладыслаў Талочка быў чалавекам глыбокай эўрапейскай культуры і, працуючы амаль цэлае жыццё пяром, пакінуў па сабе духовую спадчыну, пранікнутаю наскрозь дзіўным павевам глыбокае гуманнасьці і маральнае чысьціні...»[7].

З сумам прыходзіцца зазначыць, што спадчына гэта не то, што не даследавана, але і невядома навукоўцам. Наогул, уся літаратурная і навуковая спадчына беларускіх святароў і па-сённяшні дзень з'яўляецца вялікай загадкай. Кнігі іх на тэмы рэлігіі, гісторыі, геаграфіі Беларусі, так як і дзейнасць саміх святароў на карысць абуджэння беларускага народа заўсёды былі ў нямілаці ад існуючых улад. Ва ўсе часы нялёгкай была праца беларускіх святароў. Варта зазначыць, што дарога і лёс беларускіх палітыкаў, дзеячаў культуры, паэтаў і пісьменнікаў была вельмі цяжкай і трагічнай. Дарога і лёс беларускіх святароў былі яшчэ больш трагічнымі і цяжэйшымі. Гэта яны былі няўгоднымі і каталіцкаму (польскаму) касцёлу, бо там, «дзе расла беларускасць,— гінула польскасць», і праваслаўнай (маскоўскай) царкве, бо імкнуліся выйсці з яе падпарадкавання. Былі яны ворагамі і для Беларускай ССР толькі за тое, што былі святарамі і тым больш нацыянальна свядомымі.

Часам прыходзілася ім сутыкацца не толькі з прадстаўнікамі ўлад, але і з абманутымі вернікамі, якім стагоддзямі прапаведвалі, што «jenzvk-polski — jenzvk boski», а мова родная, беларуская — мова «хлопская» або «мужыцкая». Але, дзякуючы руплівай працы беларускіх святароў, людзі з часам усведамлялі, што і да Бога трэба звяртацца на то мове, у якой вядзецца гаворка ў штодзённасці, г. зн. гаворка з роднымі, блізкімі, знаёмымі, і людзі пераконваліся, што Слова Божае ў роднай мове ў перакладзе святароў-беларусаў гучала не горш, а то нават і лепш і больш зразумела, чым на мове чужой. Як сведка гэтаму шматлікія народныя выступленні ў тых прыходах, у якіх польскія ўлады праводзілі мэтанакіраваную антыбеларускую палітыку, дзеянні якой зводзіліся да забароны ўжывання беларускай мовы ў касцёлах і пераводу ксяндзоў-беларусаў у не беларускія парахвіі (Польшу, Харбін — чым далей ад Беларусі), а на месца выбыўшых беларускіх святароў назначаліся ксяндзы-палякі. Вернікі патрабавалі або вяртання свайго ксяндза, або назначэння ксяндза-беларуса. Такія выступленні прайшлі паўсюль, адкуль былі выселены беларускія святары. Так, напрыклад, было ў Клюшчанах (былы Свянцянскі, цяпер Астравецкі р-н), дзе працаваў шмат гадоў ксёндз

Канстанцін Стэповіч (Казімір Сваяк). Дзейнасць яго на беларускай ніве была шматграннай і плённай. У 1914 годзе ён у Клюшчанах арганізаваў касцельны хор (каля 40 чалавек). Спявалі рэлігійныя і беларускія песні. У 1915 годзе ён стварыў беларускія курсы, на якіх асаблівая ўвага была звернута на вывучэнне роднай мовы, гісторыі і геаграфіі Беларусі. У 1916 годзе ён залажыў 7 беларускіх школ, арганізаваў суполку «Хаўрус Сваякоў», якая ладзіла аматарскія канцэрты з характэрнай нацыянальнай праграмай, выступала з рэфератамі на тэмы беларускасці. Апроч гэтага варта ўлічыць і тую вялікую працу Казіміра Сваяка па прапагандзе і распаўсюджванні роднага слова, якое ён нёс людзям не толькі ў сваіх казаннях і малітвах, але і ў сваіх творах, якія былі даступнымі і зразумелымі простаму люду. Гэта зборнік вершаў «Мая ліра» (1924 г.), кніжка для набажэнства «Голас душы) (1926 г.), кніжка разважанняў паэта, святара, чалавека «Дзея маёй мыслі, сэрца і волі» (1932 г.). Але кніжкі былі пазней, а ў 1916 годзе польскія ўлады перавялі кс. К. Стэповіча ў Карыцын на Беласточчыну. На просьбы, скаргі і выступленні парафіян супраць такога перамяшчэння ўлады не адрэагавалі.

Так было і ў Жодзішках (Смаргонскі р-н). Пасля шматразовых папярэджванняў наконт ужывання роднай мовы ў касцёле польскім уладам нічога не заставалася як толькі зняволіць непакорнага ксяндза-беларуса Выцэнта Гадлеўскага. Тут не абышлося без арыштаў местачкоўцаў і паліцыі, да якой прыбеглі ўлады, каб успакоіць абураны такімі дзеяннямі народ.

З Барадзенішчаў (Браслаўскі павет) быў пераведзены спярша ў Ліду, а затым у Трысцене за Беласток кс. Віктар Шутовіч, які ўсё жыццё пакутаваў за сваю беларускую працу і не адмовіўся ад гэтае працы. «Гэта праца яго,— піша «Хрысціянская Думка»,— была сапраўды вялікай для беларускага народу. Беларускія казаньні, беларускія школы, беларускія песьні,— вось у некалькі словах тое, чаму ў Барадзенішчы, апрача беспасрэдных розных пастырскіх абавязкаў, кс. В. Шутовіч аддаваўся і пасьвячаўся»[8]. Адарваўшыся ад Бацькаўшчыны Віктар Шутовіч у 1929 годзе накіроўваецца амерыку, «шукаючы супакою для сваёй душы». Але сум па Беларусі не даюць супакою. «Думкі ў далёкай Амерыцы аб Беларусі» — пад такой назвай друкуюцца яго публіцыстычныя творы ў «Хрысьціянскай Думцы»[9]. У 1932 годзе ён вярнуўся назад і быў назначаны на вікара і школьнага прэфекта ў Харошчы, што за Беластокам. Аб жыцці ў Харошчы ксяндза-беларуса і адносінах да яго польскіх улад можна даведацца з ліста Віктара Шутовіча да Уладыслава Талочкі. Вось некалькі вытрымкаў:

«(...) То раз тут (на плебаніі) быў стараста і напаў на мяне, што я не паляк. Гэта было ўсё вельмі (...), але я перанёс з гонарам. Злосьць і шавінізм не маюць у людзей граніц.

(...) Праз гэта яны проста гавораць мне: кідай беларускае і рабіся паляком, тады будзе табе магчымасьць у нас працаваць і жыць, а інакш мы табе не дадзім жыцьця. Гэта вельмі перашкаджае ў працы...»[10]

Такія ж, поўныя смутку і духоўнага болю за сваё прыніжанае становішча і такое ж становішча беларусаў, лісты са Стаўбцоў Уладыславу Талочку святара-уніята Льва Гарошкі.

«(...) Дзе бы я не павярнуўся, усюды ўбачаць на мне цэлую кучу антыпанствовасьці. (...) У чым тут мая віна? Хіба ў тым, што я адмовіўся гаварыць пропаведзі па-польску. Калі тут праваслаўны спрацівіўся гэтаму і гаворыць па-беларуску. Упрост дзіўна і страшана, сьвет вернецца дагары нагамі: палітыку называюць рэлігіяю, а рэлігійна-каталіцкае становішча

разгалошваюць, як найгоршую палітыку. Вось і выйдзі шчасьлівы з гэтага палажэньня...»[11]

Так, шчаслівых беларуса-святароў не было і быць не магло там, дзе праявы беларускага нацыянальнага жыцця бязлітасна нішчыліся, тым больш праявы духоўнага жыцця.

Толькі ў эміграцыі Архімандрыт Леў Гарошка змог па-сапраўднаму раскрыць свой вялікі талент тэолага, філосафа, гісторыка, даследчыка беларускай культуры і мовы, літаратара. Яго пяру належаць філасоўска-тэалагічная кніжка «Душа» (1948 г.), гістарычныя кнігі «Сьв. Еўфрасіньня-Прадслава Полацкая. Патронка Беларусі» (1950 г.), «Беларусь у датаў, лічбах, фактах» (1953 г.), мовазнаўчыя кнігі «Своеасаблівасьці беларускае мовы» (1951 г.), прыродазнаўчая «Паходжаньне чалавека ў сьвятле сучасных фактаў» (1948 г.) і г. д. Напісаў вялікія гістарычныя працы «Пад знакам «русскае» і «польскае» веры» (1954—55), «Прычыны паланізацыі на Беларусі» (1955 г.). Ён склаў грэцка-лацінска-царкоўнаславянска-беларускі слоўнік, слоўнік беларускі прыказак ды прымавак. Пад псеўданімам Анатоль жменя ён надрукаваў некалькідзесяткаў апавяданняў.

Недалёка той час, калі кожны чалавек павінен заняць у гісторыі сваё месца, тое месца, якое яму належыць сапраўды, якое ён заслужыў, а не тое, якое яму хацелі зрабіць розныя дзеячы дзеля свайго панавання і ўласных выгод. Пачэснае месца і добрае імя сёння вяртаецца шматлікім беларускім адраджэнцам. З глухога забыцця вяртаецца да нас Адам Станкевіч. У Заходняй беларусі не блыо такога чалавека, які зрабіў для беларускага народу столькі, сколькі зроблена ім. Арганізатар і кіраўнік беларускага хрысціянскага руху, аўтар шматлікіх кніг і артыкулаў на тэмы рэлігіі, гісторыі і культуры Беларусі, рэдактар і выдавец беларускіх выданняў перыядычнага друку («Крыніца», «Беларуская Крыніца», Хрысьціянская Думка», «Зорка» і іншыя), рэдактар і выдавец дзесяткі кніг са сваімі ўступнымі артыкуламі і прадмовамі (кнігі Ал. Астрамовіча, Вінцука Адважнага, Казіміра Сваяка, Ст. Грынкевіча, Аніська Дамініка і іншых беларускіх святароў, паэтаў і пісьменнікаў), уласнік прыватнай друкарні імя Францыска Скарыны, менавіта той друкарні, без якой немагчыма ўявіць беларскае друкаванае слова ў 20-ыя — 30-ыя гады ў Заходняй Беларусі,— кс. Адам Станкевіч быў тым кардынальным, арганізацыйным цэнтрам усяго культурнага жыцця ў міжваенным час, адкуль ішоў жывы імпульс адраджэння нацыянальнай свядомасці народу. «З гэтага агляду відаць,— піша Язэп Найдюк,— як многа ўлажыў Адам Станкевіч энэргіі і працы ў друкаванае беларускае слова, каб яго ўзбагаціць і, каб яго пашырыць. Усё гэта было зроблена з любові да свайго народу, з любові да свае Бацькаўшчыны Беларусі і для яе Адраджэньня. І хоць праца гэта нялёгкая і адказная, але Адам Станкевіч праводзіў яе як і Францыкс Скарына, як і Кастусь Каліноўскі, бо добра ведаў вартасьць друкаванага слова»[12].

Можна шмат гаварыць пра дзейнасць беларускіх святароў, які жыццё сваё палажылі на аўтар служэння Богу і вялікай неўміручай ідэі, ідэі адраджэння роднага краю, свайго народу, яго мовы і культуры. У гэтай святой справе яны не былі адзінокімі. Можна шмат гаварыць пра Адама Лісоўскага і Аляксандра Астрамовіча (Андрэй Зязюля), якія, бадй што, у «нашаніўскую пару» заявілі пра сябе як свядомыя беларусы, па Равала Хоміча і Яна Пазьняка, якія сталі ахвярамі сталінскіх гулагаў, Станіслава Глякоўскага і яго арганізацыі «Хрыстосаўцаў», Вінцэнта Гадлеўскага, аднаго з самых незалежных і гарачых патрыётаў сваёй Бацькаўшчыны, пра дзейнасць Беларускай Хрысьціянскай

Дэмакрацыі, па беларускіх айцоў Марыянаў у м. Друі, пра святароў-уніятаў у Альбертыне і сотні іншых святароў, якія ратавалі нацыю ад смерці духоўнай. Ад той смерці, пасля якой немагчымы ўваскрашэнне.

Праўда з вялікім шкадаваннем прыходзіцца зазначыць тое, што адзіны агеньчык неўміручасці роднай мовы ў святочных данёс да нас з тых часоў кс. Уладыслаў Чарняўскі, які і сёння працуе ў м. Вішнёва, што на Валожыншчыне. І хаця жыў Уладыслаў Чарняўскі ў другі час, але і ён зведаў нямала нямілосці за сваю беларускасць з боку рэлігійных улад. Але нішто не заставіла сапраўднага патрыёта адмовіцца ў часы штучна створанага масавага нацыянальнага нігілізму ад роднага слова. І цяпер яно падхоплена іншымі святарамі і яно жыве, нягледзечы на перашкоы тых жа рэлігійных улад, і яно будзе жыць.

Беларускія святары сёння павінны сказаць сваё слова, каб раз і назаўсёды знікла пагроза духоўнай гібелі беларускага народу. Ім ёсць у каго вучыцца, ім ёсць у каго браць прыклад служэння гэтай святой справе, ім ёсць што сказаць. І прыкладам гэтым для іх павінны быць жыццё і дзейнасць святароў-беларусаў, сапраўдных патрыётаў сваёй Радзімы, імёны якіх з цягам часу стануць для нас такімі ж блізкімі і дарагімі, як і Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны і іншых беларусаў, якімі ганарыцца наш народ.

[1] Ad. Stankiewic. Rodnaja mowa u swiatyniach. Wilnia, 1929 г., с. 31.

[2] Тамсама, с. 32.

[3] ЦБ АН Літвы, ф. 21, сп. 2283.

[4] Адам Станікевіч. Беларускі хрысьціянскі рух. У час «Chryscijanskajo Dumka», 1938 г., № 36.

[5] Тамсама.

[6] «Chryscijanskaja Dumka», 1938 г. № 13.

[7] Беларускі голас. 1942 г., № 39.

[8] «Chryscijanskaja Dumka», 1938 г. № 17.

[9] «Chryscijanskaja Dumka», 1930 г. № 21—22.

[10] ЦБ АН Літвы, ф. 21. Сп. 695.

[11] ЦБ АН Літвы, ф. 21, СП. 69 777.

[12] Bielaruskaja Krynica. 1940 г., № 3.

Сяргей Сноп
(Гродна)

АБ «ФЕНОМЕНАХ» САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ПРАВА

Будынак камунізму разваліўся. У яго рутнях часам цікава пакапацца. Калі камуністычны механізм яшчэ працаваў, некаторыя з ´явы не надта кідаліся ў вочы. Звернем увагу на савецкае права. Здаецца, пра яго так многа ўжо сказана, што нічога новага не дадаць. Але ж не, звычайна разглядаюцца канкрэтныя факты і з ´явы, а філасофскі аналіз сутнасці камуністычнага права не заўсёды знаходзіць належнае асвятленне.

Але разгледзім такое простае пытанне, як крымінальная юрысдыкцыя. Звычайным лічыцца, што да крымінальнае адказнасці можа быць прыцягнуты толькі грамадзянін сваёй краіны (нават калі злачынства ён здзейсніў не на яе тэрыторыі), а таксама грамадзяне іншых краін і асобы без грамадзянства, калі яны парушылі крымінальны закон на тэрыторыі гэтае краіны і не карыстаюцца дыпламатычным імунітэтам. Дзве краіны могуць дамовіцца і аддаваць пад суд на аснове ўзаемнасці грамадзян абедзвюх дзяржаў. Між тым камунізм, які, як мы ведаем, намагаўся перавярнуць увесь свет, не спыніўся перад непахіснасцю агульназнанага права.

26 верасня 1939 года ваенны трыбунал 11-й арміі асудзіў грамадзяніна II Польскай Рэчы Паспалітай, які, жыўшы на яе тэрыторыі, з ´яўляўся агентам польскай дзяржаўнай бяспекі. Як гэта ні дзіўна, але аддадзены пад суд ён быў паводле артыкулу крымінальнага кодэксу, які прадугледжвае адказнасць за здраду савецкай Радзіме[1]. Бо нічога іншага «прышыць» было немагчыма, а судзіць неяк трэба было.

Тут варта нагадаць, што ў адпаведнасці з мірнай Рыжскай дамовай 1921 года паміж РСФСР, УССР і Польшчай тэрыторыя Заходняй Беларусі адыходзіла да Польшчы. Якой бы несправядлівай гэтая змова ні была, але грамадзяне Польшчы жылі па законах польскай дзяржавы і не падпадалі пад юрысдыкцыю СССР і БССР як здраднікі савецкай Радзімы. І тым не менш былі прызнаныя вінаватымі былыя члены КПЗБ у тым, што яны ў 1935 годзе выдалі польскай паліцыі ячэйку ў складзе падпольнага Падароскага райкама, метады падпольнай дзейнасці і праграму КПЗБ, якая ставіла мэтай барацьбу за ўз ´яднанне заходніх абласцей Беларусі ў адзіную савецкую дзяржаву[2]. Паводле падобнага абвінавачвання быў асуджаны яшчэ адзін член партыі, які здрадзіў Азерскую ячэйку КПЗБ яшчэ ў 1927 годзе[3]. Асуджаліся былыя члены грамадскіх арганізацый, існаваўшых легальна ў палітычнай сістэме Польшчы, у тым ліку блізкія па накіраванасці да бальшавікоў, не меўшыя нічога супраць далучэння да БССР і беларускай нацыі.

Вядома ж, што справа была не ў правасуддзі, а ў неабходнасці рэпрэсаваць варожыя і іншыя непрыхільныя элементы. Зрабіць гэта пры дапамозе суда (трыбунала) — не лепшае, што магло прысці ў галаву Берыі ці Цанаву. Такім чынам, можна вывесці першы феномен камуністычнага права: яно распаўсюджваецца на любога чалавека свету, незалежна ад таго, грамадзянінам якой дзяржавы той з ´яўляецца, на тэрыторыі якой краіны ён зрабіў тыя дзеянні, якія яму інкрымінуюцца і незалежна ад таго, караліся падобныя дзеянні законам у момант іх выканання ці не[4].

Другі феномен яшчэ больш цікавы. З часоў сярэдневяковага рэлігійнага цемрашальства агульнапрызнаным з ´яўляецца прынцып, згодна з якім да крымінальнай адказнасці могуць прыцягвацца толькі фізічныя асобы і, адпаведна, пацярпелымі могуць выступаць таксама толькі яны ці юрыдычныя асобы праз сваіх прадстаўнікоў. Савецкае праваўжыванне дапускала крымінальнае пакаранне за непавагу да партрэтаў кіраўнікоў краіны, асабліва да выявы «аднаго з кіраўнікоў». Так, адзін з асуджаных быў пакараны за тое, што кідаў адходы ад слівы ў вісеўшы на муры партрэт «аднаго з кіраўнікоў Савецкай дзяржавы», другі, як запісана ў прыгаворы, «чарніў сімвал дружбы рабочых і сялян «Серп і молат», трэці — «здзекваўся з партрэта аднаго з кіраўнікоў», за што ўсе атрымалі па 10 гадоў пазбаўлення волі. Не трэба быць юрыстам, каб зразумець, што здзекваецца з партрэта немагчыма, таму што партрэт — рэч неадушаўлёная. Спецыялісты з дзяржбяспекі былі вялікімі містыфікатарамі — распрацоўвалі судовыя працэсы па неіснаваўшых падзеях. Іх уяўленню даступна было надзяліць містычнай свядомасцю партрэт «аднаго з кіраўнікоў».

Відаць, партрэты, па ўяўленнях экстрасэнсаў з НКУС СССР, мелі не толькі душу, але і цела. Інакш ці магла абвінавачваная «двойчы згвалціць[5] партрэты правадыроў Савецкага Саюза, якія былі змешчаны ў савецкіх газетах»? Справа тут не толькі ў няўдалых выказах. Трагедыя ў тым, што партрэты сапраўды разглядаліся (што відаць пры вывучэнні крымінальных спраў) практычна як пацярпелыя па гэтых справах. Другі феномен можна сфармуляваць так: камуністычнаму праву дазвалялася выкарыстанне як суб ´ектаў права неадушаўлёных рэчаў. Гэты феномен мае відавочную містычную афарбоўку не толькі ў сувязі з зносінамі операў, следчых і суддзяў з іншымі сусветамі, але таксама ў выніку метафізычнага жаху перад вымаўленнем у негатыўным кантэксце імя той асобы, якая адлюстроўвалася на партрэтах і іншых выявах.

Нарэшце, трэці феномен — прызнанне злачынствам нацыянальнай самасвядомасці. У цывілізаваным свеце, пэўна, з часоў Вялікай французскай рэвалюцыі, лічылася непрыстойным ацэньваць вінаватасць на аснове нацыянальнай прыналежнасці і адпаведнага светапогляду (праўда, у гэты час Расея падзяляла Рэч Паспаліту, чамусьці назваўшы яе Польшчай). Камуністы зыходзілі з таго, што пралетар не мае Айчыны. Асновай іх ідэалогіі было таксама палажэнне аб несумяшчальнасці інтарэсаў эксплуататараў і астатняй часткі чалавецтва. Адсюль шляхам некалькіх простых катэгарычных сілагізмаў вынікала, што нацыянальная, таксама як і класавая, прыналежнасць ёсць фактар контррэвалюцыйны, а таму злачынны.

Адсюль жа мелі месца прысуды за тое, напрыклад, што «набыў у час акупацыі ў Мінску кнігу «Беларуская граматыка» і «Беларускі правапіс» Я. Лёсіка; «чытаў сіянісцкую літаратуру і збіраўся паехаць у Ізраіль»; «выказваў недавер да вынаходства, прыярытэт якога маюць нібыта не савецкія навукоўцы»[6]; «хавала герб старой буржуазнай Польшчы» і г. д.

Трэці феномен камуністычнага права выглядае так: чалавек вінаваты перад уладай ужо фактам свайго нараджэння. Атрымоўваецца, што камуністычнае права ёсць не што іншае, як нармованы генацыд, г. зн. палітыка масавага знішчання людзей з тое прычыны, што іх існаванне пярэчыць мэтам ажыццяўляўшых палітыку суб´ектаў. Фактычна такое разуменне права рабіла вінаватымі ўсё насельніцтва асобна ўзятай камуністамі краіны, бо заўжды можна знайсці стрыечнага дзядзьку цешчынай швагеркі, у якой нешта не так з паходжаннем.

Зразумела, што забаўныя феномены камуністычнага права не вычэрпваюцца названымі трыма. Чытач сам можа нагадаць, напэўна, не меней з уласнага вопыту, бо парадоксы і крыўды ў ім невычарпальная. Ахвяры сацыялістычнай законнасці яшчэ не падлічаныя. Многія з іх яшчэ ўтойваюцца ў звышсакрэтных архівах і нераскопаных Курапатах. Свядомасць катаў яшчэ не пераадолена.

Прызнаючы толькі адзін, класавы, бок права і законнасці, замоўчваючы агульначалавечую іх сутнасць, бальшавікі пазбавілі права падмурку і пераўтварылі яго ў дэкларацыю свавольства. Наконт законнасці ў Расеі заўжды былі праблемы, асабліва ў выкананні права самадзяржаўнай уладай і адэкватнасці прымаемых уладай пастаноў. Рэвалюцыйная, яна ж сацыялістычная, законнасць патрэбна была бальшавікам дзеля абслугоўвання палітыкі, што абапіралася пераважна на насілле ва ўсіх яго формах. Дэфектная, кастраваная законнасць не магла прадухіліць краіну ад тэрору і кіраўніцтва ў форме індустрыяльнай дэспатыі пралетарскіх правадыроў.

Паступова абмяжоўваючы колькасць выпадкаў і з´яў, кола асобаў і іх арганізацыяў, якіх бароніць закон, камуністы выйшлі на сцяжыну, што вяла да пазбаўлення кожнага чалавека краіны Саветаў такога гуманнага, нязменнага і натуральнага прытулку, як права, законнасць і правасуддзе.

[1] Архіў Гродзенскага абласнога суда. Пастанова Прэзідыума Гродзенскага абласнога суда па крымінальнай справе № 4-у-128 за 1990 год.

[2] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, ф. 1106, воп. 1, с. 32, л. 200.

[3] Там жа, с. 39, л. 12.

[4] Судовая практыка сведчыць, што да крымінальнай адказнасці прыцягваліся і асуджаліся жыхары Літвы і Беларусі, незаконна перайшоўшыя дзяржаўную мяжу паміж гэтымі краінамі (што есць злачынства) нават пасля таго, як Літва была ўключана ў склад СССР, а дзяржаўная мяжа ліквідавана. Дарэчы, за гэтае злачынства Крымінальны кодэкс БССР прадугледжваў не больш, як 3 гады пазбаўлення волі, але Асобая нарада пры НКУС СССР магла назначыць і 5, і нават 8 гадоў лагераў. Словам, сацзаконнасць.

[5] У тэксце прыгавору, напісанага на рускай мове, ужыта слова «надругалась».

[6] У гэтым злачынстве быў прызнаны студэнт Гродзенскага педагагічнага інстытута, «буржуазны нацыяналіст» І. В. Клышэвіч.

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

Вячаслаў Швед
(Гродна)

«ТРЫМАЦЬ ПАД АРЫШТАМ У КЛЯШТАРЫ...»

Гродзенскі жаночы кляштар св. Брыгіты, што на рагу вуліц К. Маркса (былая Брыгіцкая) і Маладзёжнай (былая Навікоўсніца), быў заснаваны маршалкам Вялікага княства Літоўскага Кшыштафам Весялоўскім і яго жонкай Аляксандрай — народжанай Сабескай. У 1636 годзе з Любліна прыбылі ў яго першыя восем манашак, паклаўшы пачатак жыццядзейнасці кляштара, які будаваўся да 1642 г. Але сябрамі рэлігійнай суполкі не толькі тыя, хто дабраахвотна даў зарок аскетычнага жыцця, але і тыя, каго прыгаворвалі сюды за антыўрадавую дзейнасць. Пра двух такіх вязняў наша слова.

22 мая 1827 г. цяжкая брама жаночага кляштара св. Брыгіты адчынілася і на двор увайшлі дзве дзяўчыны ў суправаджэнні гродзенскага паліцмайстра. Праз некаторы час ён асцярожна склаў распіску Ігуменіі Барбары Храптовіч, дзе роўным почыркам на польскай мове было напісана, што яна прыняла «дзве панны — Ксаверу і Карнэлію — Рукевічоўны для ўтрымання ў кляштары Брыгітак Гродзенскіх першай — тэрмінам на год, а другой — шесць месяцаў, і мець над імі найстражэйшы нагляд...»[1] Паліцмайстар старанна выканаў даручэнне, і гродзенскі губернатар Міхаіл Трафімавіч Бабяцінскі 26 мая мог паведаміць Мікалаю і аб заняволенні сясцёр Рукевіч у Брыгіцкі кляштар.

Такім чынам, прысуд цара быў выкананы, але як Рукевічы заслужылі яго?

У верасні 1826 г. завяршыліся пасяджэнні ваенна-судовай камісіі па справе аб тайнай дзекабрысцкай арганізацыі «Ваенныя сябры». Гэта таварыства ўзнікла летам 1825 г. па ініцыятыве былога філамата Міхаіла Іванавіча Рукевіча і ставіла мэтай «самаадукацыю, узаемную дапамогу, карысць агульную». Аднак асветніцкія задачы ўтойвалі больш тайнае — «Вольнасць», г. зн. барацьба з прыгонніцтвам і самадзяржаўем. Інакш навошта была строгая канспірацыя: падзел арганізацыі на тры ступені па пяць чалавек у кожнай і зносіны паміж імі толькі праз кіраўнікоў ступеняў? Заснавальнікамі Таварыства ваенных сяброў быў разам з Рукевічам капітан Літоўскага піянернага батальёну Канстанцін Густававіч Ігельстром і яго стрыечны брат паручнік гэтага ж батальёну Аляксандр Іванавіч Вягелін. Прэзідэнтам жа стаў падпаручнік Нясвіжскага карабінернага палку Пётр Іванавіч Гофман.[2]

9 месяцаў працавала ў Беластоцкім палацы Браніцкіх следчая камісія. Больш як 140 чалавек дапытала яна. Рукевіч, Вягелін, Ігельстром былі асуджаны да 10 гадоў катаржных работ у Сібіры і далейшага там пасялення. Шасцімесячны тэрмін у арыштанцкіх ротах Бабруйскай крэпасці адбы-

лі П. І. Гофман, Э. А. Пятроўскі, П. П. Ваяховіч, М. Ф. Вільканец, пяцігадовы тэрмін — А. М. Угрычын-Трабінскі, чатырохмесячны — Ф. Баркоўскі і А. Д. Яневіч. На пяць гадоў катаргі і пасяленне ў Сібіры саслалі А. М. Грынявіцкага, А. І. Вронскага, І. С. Высоцкага, братоў К. Ф. і Ф. В. Ардынскіх.[3] Як бачым, толькі пятнаццаць «ваенных сяброў» былі прысуджаны да больш ці менш суровых пакаранняў, а большасць — да высылкі на месца жыхарства пад наглядам паліцыі. І ў гэтым таксама заслуга Ксаверыі і Карнэліі Рукевіч — родных сясцёр Аляксандра Іванавіча Рукевіча.

Імёнаў сясцёр Рукевіч не было ў спісках членаў Таварыства ваенных сяброў, але Ксаверыю і Карнэлію можна назваць сапраўднымі дзекабрысткамі. Яны заслужылі гэта не менш, чым спадарожніцы дзекабрыстаў у Сібір. У ваенна-судовай справе паручніка Самагіцкага гранадзёрскага палку І. Н. Пац-Памарнацкага ёсць напамінак пра тое, што ў верасні-кастрычніку 1825 г. ён быў у маёнтку Рукевіча — Завыках, бачыў Ігельстрома, Вегеліна, Стракоўскага і трох сясцёр.[4] Відаць, быў нейкі сход таварыства, як бачым, ад Карнэліі і Ксаверыі нічога не ўтойвалі. Карнэлія на следстве паказала, што Ігельстром нічога ад яе не ўтойваў. Больш таго, яна абвясціла, што чула ад брата пра дзве палітычныя партыі ў Пецярбургу і была сведкай размовы аб іх паміж Рукевічам і Ігельстромам. Дамо маленькае ўдакладненне: аб падзеях у Пецярбургу Карнэлія ведала не ад брата, а ад жаніха, які прызнаўся на следстве, што атрымаў ліст ад В. К. Кюхельбекера, які ажыццявіў пасля паўстання на Сенацкай плошчы пабег праз тэрыторыю Беларусі ў Варшаву. Але ўдакладненне не змяняе сутнасці справы — сёстры ведалі аб дзейнасці Таварыства ваенных сяброў.

Рукевічы зрабілі неацэнную паслугу тайнай арганізацыі. Калі Ігельстрома арыштавалі, яго слуга Павел Паршнёў прывёз у Завыкі і аддаў Ксаверыі зялёны куфэрак з паперамі. Следчай камісіі Ксаверыя расказала, што зрабіла пасля свайго першага допыту ў генерала-маёра Пэрэна, прэзуса вайсковага суда: «Вярнуўшыся з Беластоку ў Завыкі ў нядзелю, я знайшла сястру сваю (верагодна, Антаніну — В. Ш.), якая ад ´язджала ў касцёл і паслала з ёй амаль усіх людзей. Сама засталася ў хаце, дачакалася, калі штотыднёвый вартаўнік запаліў печ у маім пакоі. Спачатку паклала ў печ паперы, потым адарвала абцугамі ад куфэрка петлі, кінула ў печ спачатку крышку, а потым куфэрак з замком і жалезам. Петлі кінула ў кладоўку да іншых жалезных рэчаў, а ключык — у раку. Калі сястра вярнулася з касцёла і ўвайшла да мяне, дык у печы яшчэ палілася, але ніякіх прыкмет спалення куфэрка ўжо не было».

Ксаверыя растлумачыла свой учынак страхам перад карай за спаленне масонскіх знакаў і патэнту. Як вядома, у 1822 годзе ўказам Аляксандра I масонскія ложы былі забароненымі і таму, каб схаваць сляды іх знішчэння, яна спаліла ўсе астатнія дакументы і куфэрак. Сенатар Навасільцаў у рапарце цэсаравічу Канстанціну Паўлавічу паводзіны Ксаверыі тлумачыў іншымі матывамі: «яна гэта зрабіла па баязлівасці і дабраце яе да брата, выкліканай мараллю і законамі, таксама і тым, што яна не ведала аб важнасці гэтых папераў...»[6] Так, Ксаверыя любіла брата і свайго жаніха Вягеліна, але не баязлівасць і слабасць прымусілі спаліць паперы з куфэрка, а менавіта разуменне «важнасць гэтых папераў» і ўсведамленне іх антыўрадавай сутнасці. Гледзячы ў агонь печы, Ксаверыя ведала, што сваім учынкам яна ратуе брата, каханага, іншых «ваенных сяброў».

Зялёны куфэрак быў чатыры з паловай вяршкі вышынёй, каля сямі шырынёй і дзесяць даўжынёй (вяршок — 4,4 см). Зусім звычайны куфэрак,

але вось дакументы, якія захоўваліся ў ім, незвычайныя. Мы можам толькі меркаваць, што знаходзілася у куфэрку, які належыў аднаму з арганізатараў тайнага таварыства і выступлення Літоўскага піянернага батальёну. Ці не тут ляжалі: спіс членаў арганізацыі, іх распіскі, Праграма ці Статут, «Маральныя меркаванні» і г. д. Тое, што гэтыя дакументы не трапілі ў рукі следства, дапамагло «ваенным сябрам» назвацца толькі членамі асветніцкай арганізацыі, а не такой, як Паўночнае ці Паўднёвае таварыства дзекабрыстаў. І прысуды беластоцкага ваеннага суда таму больш мяккія ў параўнанні з Пецярбургскім следчым камітэтам.

Ксаверыя трымалася на следстве з годнасцю: «запіралася ў прыняцці іх (г. зн. рэчаў і папераў Ігельстрома — В. Ш.) як роўна і аб усім ёй вядомым не прызнавалася».[7] Яе паводзіны Ігельстром ставіў у прыклад А. М. Угрычычу-Трабінскаму, які парушыў дамову маўчаць і пачаў расказваць пра дзейнасць тайнага таварыства: «Я не кажу пра сябе, мой лёс вырашаны. Але ўспомні, колькі людзей застаецца, якія могуць быць уратаваны, а ты хочаш загубіць іх. Няўжо жанчына, дзяўчына павінна перасягнуць цябе ў цвёрдасці духу?»[8]

Карнелія на следстве давала ілжывыя паказанні. Яна заявіла, што прысутнічала пры спаленні папер і куфэрка, хаця з лістападу 1825 па люты 1826 г. знаходзілася ў Абрамшчызне Гродзенскай губерні ў свайго дзядзькі Баржэнскага. Цераз «зараніна» Ф. Ардынскага Карнелія спрабавала ўстанавіць сувязі з братам, быццам для таго, каб раіцца «наконт гаспадаркі». І ўспомнім яшчэ аб яе паказаннях аб «дзвюх партыях у Пецярбургу».

Як бачым, сёстры Рукевіч сапраўды заслужылі свой прысуд і як дзекабрысткі панеслі кару. Ваенны суд не вызначыў яе, прадстаўляючы на «рассмотрение нынешнего начальства». Былы камандзір Літоўскага асобнага корпуса генерал ад інфантэрыі Ф. Ф. Доврэ лічыў, што Ксаверыя Рукевіч, якая знаходзілася з 29 красавіка 1826 г. пад арыштам у Беластоцкім дзявочым кляштары, ужо гэтым пакарана дастаткова, Карнелію Рукевіч «вытрымаць пад арыштам у кляштары адзін месяц». Цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча, галоўнакамандуючага Літоўскім асобным корпусам, гэта не задавальняла. Ён лічыў, што ўчынкі сясцёр «паводле закону разбураюць дваранскую годнасць, ... выслаць у Сібір на пасяленне». Аднак царская канфірмацыя была мякчэйшая: сясцёр шляхціча Рукевіча Ксаверыю і Карнелію замест вызначынай ім яго высокасцю карай трымаць у клаштары — Ксаверыю — адзін год, а Карнелію — шесць месяцаў».[9]

Заставалася пастанавіць, у які кляштар змясціць дзекабрыстак. Пачалася перапіска паміж кіраўніком Беластоцкай вобласці графам Валовічам і гродзенскім грамадзянскім губернатарам і стацкім саветнікам М. Т. Бабяцінскім. Валовіч пытаўся 19 мая 1827 г.: «Ці не будзе якіх перашкод да зняволення ў якім-небудзь з адзначаных кляштараў Карнеліі і Ксаверыі Рукавічовых? І магу я пасля атрымання ад Вас, міласцівы спадар, паведамлення, адправіць іх для гэтага адразу ў Гродна?» Губернатар адказаў гэтай жа эстафетай 20 мая: у Гродна ёсць тры дзявочыя кляштары, але лепш «девиц Руковичовен» змясціць у Брыгіцкі, «як больш прасторны за два іншыя» (г. зн. у параўнанні з кляштарамі Бернардынак і Базыліянак).[10]

Заснаванне кляштара св. Брыгіты звязана з фактам смерці прыёмнай дачкі Весялоўскіх, жонкі маршала вялікага літоўскага Яна Станіслава Сапегі. Партрэты заснавальнікаў і Грызельды можна паглядзець у альбомах «Жывапіс Беларусі XII—XVIII стагоддзяў» і «Дзяржаўны мастацкі музей БССР». Мастак-эстаўратар А. Б. Брындараў вярнуў іх да жыцця з становішча «клінічнай смерці», у якім яны былі ў момант іх выяўлення ў 1966 г. у склепе кляштара Брыгітак.

Высокія пяцімятровыя каменныя сцены аддзяляюць нас ад брыгіцкага комплексу. У чатырох кутах сценаў манастырскага двара месцяцца шасцізначныя маленькія вежы. У генеральным плане ўвесь комплекс мае ўсе элементы каталіцкага кляштара: квадратны ўнутраны дворык, утвораны будынкамі касцёла і кляштара, фруктовы сад з агародам, двор з гаспадарчымі пабудовамі і самастойным заездам, парадны дворык перад уваходам у касцёл. Будынкі касцёла і кляштара складаюць адзінае цэлае, пабудаваныя з цэглы. Архітэктура простая і лаканічная, у стылі барока. Касцёл — аднанефавы храм з паўкруглай алтарнай часткай: двухвежны галоўны фасад, насычаны пластыкай (пілястрамі, плоскімі нішамі) і завяршаецца моцным антаблямент з ацікам, двух ярусным франтонам адной вышыні з вежамі. Архітэктура кляштарскіх карпусоў аскетычная. Фасады ажыўлены толькі нескладаным карнізам, праёмамі вокнаў і дзвярэй з простымі ліштвамі. Званіца пабудавана пазней і з явілася прадуктам класіцызму канца XVIII—пачатку XIX ст. Знаходзілася па вуліцы К. Маркса і была знішчана ў 1960—1970-ыя гады. За сцяну брыгіцкага комплексу можна было пранікнуць праз тры брамы, акружаныя парталамі.[11]

Праз цэнтральную браму, якая знаходзілася на сучаснай вуліцы К. Маркса, зойдзем з нашымі вязнямі-дзекабрыстамі ў храм. Убачым галоўны алтар і іканастас з вітымі калонамі і вялікай іконай Маці божай, два бакавыя алтары св. Брыгіты і св. Ганны, на балконе правай бакавой сцяны — арган, статую Давіда, які грае на арфе (скульптар — М. Фрыцэ), каля паўночнай сцяны — спецыяльную нішу для музычных хораў. І тут жа — дзверы на хоры і кляштар. Адчынім дзверы і зойдзем у калідор першага паверху кляштара. Тут знаходзіліся: памяшканне для гасцей, вялікая зала, аптэчка, капліца, спавядальная, трапезная. Па лесвіцы падымаемся на другі паверх, дзе былі пакоі манашак (каля 40), бібліятэка, два склады, кладоўка, пральня, архіў.

Вось тут і пражылі свой тэрмін сёстры Рукевіч: Карнелія з 22 мая па пачатак снежня (не раней як 6) 1827 г., Ксаверыя з 22 мая 1827 г. па 3 чэрвеня 1828 г. Першы час пасля вызвалення Карнелія жыла ў маёнтку бацькі свайго жаніха Ігельстрома, а з вызваленнем сястры пасялілася разам з ёю ў сваяка — гродзенскага ўезнага маршала (правадыра дваранства) К. Баржэнцкага. Сёстры падтрымлівалі брата, сасланага ў Сібір, перапісваліся з жонкамі дзекабрыстаў. Ксаверыя пісала лісты жаніху Вягеліну і яго сястры — М. М. Козенс.[12] Карнелія, відаць, збіралася да Ігельстрома ў Сібір. Вось што пісала М. М. Валконская 14 мая 1828 г. генералу Ігельстрому: «Як ні жудасна яго становішча тут, тым не меней ён пакутуе толькі ад усведамлення, што прыносіць столькі гора Вам і прымушае дзяліць сваю нядолю тую, якая для яго рашылася ахвяраваць сабою гэтак велікадушна!.. Дапускаючы, што м-ль Рукевіч яшчэ знаходзіцца ў Вас, я дазваляю сабе пісаць ёй на наступнай старонке з надзеяй, што такім чынам ліст дойдзе да яе паспяхова».[13]

Цікава, што напісала Валконская Карнеліі? Ці не падрабязныя парады, як выехаць у Сібір? Бо для дзекабрысткі «ахвяраваць сабою так велікадушна!», несумненна, значыла паездку ў Сібір. Ключ да адказу можна знайсці ў лісце Валконскай да старэйшай сястры Рукевіча — Антаніны Крамской. Недзе ў чэрвені—ліпені 1826 г. яна пісала: «Здаўшыся свайму лёсу, спадары Вягелін і Ігельстром не губляюць надзеі злучыцца калі-небудзь з тымі, хто ім даражэйшы за жыццё. Вашы сёстры не змаглі б дамагчыся дазволу ў яго вялікасці праехаць сюды да сваіх жаніхоў?..»[14] Ліст быў затрыманы

3-м аддзяленнем і яго не атрымаў адрасат. Сёстры Рукевіч, як вядома, не трапілі ў Сібір, а з канца 1820-х гадоў іх сляды зніклі, і аб іх далейшым жыцці мы нічога не ведаем.

[1] Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (г. Гродна), ф. 1, воп. 2, сп. 1892, л. 11 (далей: ЦДГА РБ).

[2] Літаратуру аб Таварыстве вайсковых сяброў // Декабристы и Белоруссия (К 165-летию восстания декабристов): Библиографический указатель литературы. Гродно, 1990. С. 20—23.

[3] Декабристы: Библиографический справочник. М., 1988. С. 366 (далей: ДБС).

[4] Цэнтральны дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў, (ф. 16229, воп. 1, сп. 429, л. 19 ад.)

[5] Цыт. па: Букчин С. К. К мечтам рванулись наши руки ... Мн., 1978. С. 239.

[6] Цыт. па: Там сама. — С. 245.

[7] ДБС. С. 361.

[8] Цыт. па: Ольшанский П. Н. Новые документы о русско-польских революционных связях // Славянский архив М., 1959. С. 110.

[9] ДБС. С. 364—366.

[10] ЦДГА РБ, ф. 1., воп. 2, сп. 1892, л. 5 об-6.

[11] Кудряшев В. И. Гродно. М., 1960. С. 58; Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии. М., 1954. С. 65; Гродзенскі касцёл і кляштар брыгітак // Архітэктура Беларусі. Мн., 1982. С. 76.

[12] Гл.: Букчин С. К. К мечтам рванулись наши руки... С. 257—258.

[13] Цыт. па: Там сама. — С. 262—263.

[14] Цыт. па: Там сама. — С. 264.

Сяргей Токць

«МУРАЎЁЎ-ВЕШАЛЬНІК» І ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАГА САМАЎЛАДСТВА НА БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX СТАГОДДЗЯ

У жыцці кожнага народу бываюць перыяды, якія вызначальна ўплываюць на працэсы яго развіцця. Для беларускай нацыі адзін з такіх перыядаў — безумоўна, 60-ыя гады XIX стагоддзя. Менавіта ў гэты час беларускі этнас перанёс магутныя знешнія і ўнутраныя ўзрушэнні, выкліканыя паражэннем паўстання 1863 года і пераўтваральнай дзейнасцю «усмирителя края» генерал-губернатара М. Н. Мураўёва. Палітычная і ідэалагічная дактрына царызму, правадніком якой быў Мураўёў, наклала адметны адбітак на нацыянальную свядомасць беларусаў і зрабіла значны ўплыў на развіццё нацыянальных працэсаў.

Генеалагічныя карані гэтай дактрыны вядуць у часы фармавання і ўзмацнення расійскага самаўладства, знешнепалітычным мемарандумам якога стала «Сказанне о князьях Владимирских». Палітыка царызму ў адносінах а Беларусі шмат разоў удакладнялася і змяняла свой знешні выгляд ад палітычных абставінаў. Але яна заўсёды мела ў аснове тры ўзаемазвязаныя прынцыпы: уніфікацыя, бюракратызацыя і русіфікацыя.

Галоўнай стратэгічнай мэтай з ´яўлялася поўнае знішчэнне нацыянальных асаблівасцяў і традыцыяў, як патэнцыяльнай крыніцы супраціўлення імперскай уладзе. Так званая «сістэма Мураўёва» была канцэнтраваным выяўленнем усёй папярэдняй палітыкі царызму, заснаваным на гвалце.

Акрамя таго, Мураўёў быў хросным бацькам дактрыны «западно-руссизма», якая дамінавала ва ўрадавай палітыцы да рэвалюцыі 1905 г.

Асоба творцы нацыянальнага і культурнага генацыду з ´яўляецца цікавым прыкладам трансфармацыі ліберала і вольнадумцы ў зацятага рэакцыянера. У маладосці Мураўёў быў актыўным удзельнікам тайнага афіцэрскага руху і нават з ´яўляўся адным з заснавальнікаў «Союза благоденствия». Пасля снежаньскага паўстання 1825 года ён амаль паўгода прасядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці. Праўда, біёграф Мураўёва Д. А. Кропатаў піша, што ён адышоў ад дзекабрыстаў у 1821 г. Цікава, што светапогляд Мураўёва змяніўся пад уплывам А. М. Бакуніна, які быў мужам яго роднай цёткі і бацькам вядомага рэвалюцыянера і тэарэтыка анархізму М. А. Бакуніна.[1]. А родны брат Мураўёва Аляксандр не здрадзіў ідэалам сваёй маладосці. Ён быў сасланы ў Сібір, але пасля сканчэння тэрміну пакарання, дзякуючы свайму таленту, даслужыўся да пасады ніжнягародскага губернатара. Мікалай I аднойчы прызнаўся, што толькі тры губернатары ў Расіі не бяруць хабар, і сярод іх быў Аляксандр Мураўёў[2].

Вось такі розны лёс атрымаўся ў братоў. Пасля вызвалення з астрогу Міхаіл Мураўёў, дзякуючы пратэкцыі барона Дзібіча, зноў уладкаваўся на службу. А 12 чэрвеня 1827 года быў прызначаны віцэгубернатарам у Віцебск. Цікава, што і тут не абышлося без пратэкцыі міністра фінансаў Е. Ф. Канкрына, сваяка Мураўёва[3]. З сабой у Віцебск Мураўёў узяў кнігу Бантыш-Каменскага «О возникшей в Польше унии». Так пачалася яго беларуская кар'ера. У палове верасня 1828 года Мураўёў быў прызначаны грамадзянскім губернатарам у Магілёў.

У 1830 годзе ў сваёй справаздачы па губерні Мураўёў пісаў: «Край гэты можна без усялякіх цяжкасцей прывесці да аднолькавага з Расіяй стану, і калі да гэтага часу ён яшчэ канчаткова не зліўся з ёю, то толькі таму, што не было патрэбных захадаў, і калі вашай імператарскай вялікасці пажадана будзе загадаць увесці выкладанне ў вучылішчах на расійскай мове, то вельмі хутка край гэты цалкам зблізіцца з Расіяй»[4]. Акрамя таго Мураўёў прапанаваў адмяніць Літоўскі статут. Запіска яго была пададзена Мікалаю I у другой палове снежня 1830 года[5]. А першага студзеня 1831 года было скасавана дзеянне Літоўскага статута ў Магілёўскай і Віцебскай губернях. 22 снежня 1830 года і 29 чэрвеня 1831 года Мураўёў пасылае імператару запіскі з прапановай зачыніць Віленскі універсітэт, духоўныя вучылішчы і рэфармаваць астатнія навучальныя ўстановы. Мураўёў піша, што студэнты атрымліваюць ва універсітэце толькі «нейкі знешні бляск шкоднай паўадукацыі і асновы вальнадумства»[6]. І хаця вышэйшая камісія камітэта па справах заходніх губерняў не пагадзілася з Мураўёвым, Мікалай I у 1832 годзе загадаў зачыніць Віленскі універсітэт. У час паўстання 1831 года Мураўёў быў прызначаны ў штаб камандуючага расійскіх войскаў на Беларусі графа П. А. Талстога для выканання асобых даручэнняў. Так, у маі 1831 года ён пры дапамозе гусарскай дывізіі генерала Каблукова наводзіць «парадак» у Дзісненскім і Лепельскім паветах. Мураўёў заявіў мясцовым жыхарам: «Абвяшчаю ўсім, што суд будзе кароткі, расправа хуткая і прыкладная, я дзейнічаю сам асабіста і сам заўсёды справядлівы»[7]. Мураўёў падзяліў паветы на часткі і прызначыў у кожную паліцэйскага начальніка, які быў там царом і богам. Мясцовыя памешчыкі адказвалі за парадак у сваіх маёнтках уласнай маёмасцю і свабодай. Такім чынам, ужо ў 1831 годзе Мураўёў распрацаваў і прымяніў сістэму паліцэйскага тэрору, якая запрацавала на ўсю моц у 1863 годзе.

9 чэрвеня 1831 года ён быў узнагароджаны ордэнам Святой Ганны. Пасля гэтага Мураўёў адправіўся ў Пецярбург, дзе быў прыняты Мікалаем I. Мураўёў падаў цару запіску «О ходе мятежа в губерниях от Польши возвращённых и заключения о причинах столь быстрого распространения оного»[8], дзе заклікаў манарха праводзіць рашучыя меры па далучэнні і зліцці Беларусі з Расіяй. Ён прапанаваў таксама падначаліць вуніятаў праваслаўнай царкве і зрабіць каталіцкі касцёл незалежным ад Рыма. Па меркаванні Мураўёва, заходнімі губерніямі павінны кіраваць намеснікі, непасрэдна падначаленыя цару і адказныя толькі перад ім. Але Мікалай I палічыў такія дзеянні нясвоечасовымі. Акрамя таго, Мураўёў напісаў асобную запіску аб Гродзенскай губерні, але яна не захавалася. З жніўня 1831 па студзень 1835 года Мураўёў быў гродзенскім губернатарам. Менавіта ў Гародні ён атрымаў прозвішча «Мураўёў-вешальнік».

Пад час паўстання Мураўёў сабраў у горадзе ўсіх губернскіх памешчыкаў і пасадзіў іх пад хатні арышт. Нехта Шыманскі спрабаваў здзейсніць замах на

губернатара, але няўдала. У 1833 годзе павесіў ваўкавыскага шляхціча Міхаіла Валовіча, які вёў антыўрадавую агітацыю ў Слоніме, і разам з ім яшчэ некалькі чалавек[9]. Вельмі жорстка Мураўёў праводзіў рэлігійную палітыку. 9 кастрычніка 1834 года ён загадаў усе іканастасы ва ўніяцкіх цэрквах перарабіць на праваслаўны манер[10]. Такіх цэркваў у Гродзенскай губерні налічвалася 192. Гэта быў страшэнны ўдар па беларускім царкоўным мастацтве. Пасля 1835 года Мураўёў займаў самыя розныя пасады — быў міністрам дзяржаўных маёмасцяў і праславіўся як хабарнік і зацяты вораг вызвалення сялянаў ад прыгону.

Калі ў 1863 годзе ў Польшчы, Беларусі і Літве ўспыхнула паўстанне, то лепшай кандыдатурай на ролю ката, безумоўна, нельга было знайсці. І хоць імператар Аляксандр І вельмі непрыязна ставіўся да Мураўёва, ён прызначыў яго віленскім генерал-губернатарам, даўшы яму дыктатарскія паўнамоцтва. Сваю праграму дзеянняў Мураўёў на сустрэчы з імператарам сфармуляваў так: «Я лічу, што край гэты спрадвечна рускі, мы самы яго апалячылі... І цяпер трэба знішчыць крамолу і адрадзіць рускую народнасць і праваслаўе»[11]. 14 мая 1863 г. Мураўёў прыехаў у Вільню, і ўжо праз некалькі дзён пачаліся смяротныя пакаранні. Апрабаваная ў 1831 годзе, мураўёўская крывавая сістэма дзейнічала бязлітасна. Жорсткасць, з якой Мураўёў ажыццяўляў «умиротворение края», была нязвыклай для досыць гуманнага XIX стагоддзя. «Вешальнік» павучаў сваіх падначаленых: «Не верце таму, што вам будуць казаць пра гуманнасць, недаказанасць віны... Усе яны вінаваты больш ці менш. Таму не бойцеся адказнасці. І дзе ўбачыць дапамогу гэтым злодзеям, загадваю вам усё спаліць і зруйнаваць — вёска гэта ці маёнтак»[12].

Па загадзе Мураўёва былі спалены вёскі: Яваражка пад Беластокам, Ібяны у Ковенскай губерні, Шчукі ў Гродзенскім павеце, шляхецкія ваколіцы Сяргейчыкі, Штукіны, мястэчка Семяцічы[13]. Насельніцтва выслана ў Сібір. Сілы былі вельмі няроўныя, і паўстанне затухала. Але галоўнаю мэтай сваёй дзейнасці Мураўёў лічыў поўную русіфікацыю Беларусі, знішчэнне яе нацыянальных традыцыяў і культуры. Ён разумеў, што на месцы знішчанай мясцовай культуры трэба стварыць новую, пранікнутую «благоговением» да расійскага самаўладства. А раз мясцовая інтэлігенцыя ў большасці сваёй не хацела супрацоўнічаць з віленскім дыктатарам, ён запрашаў сюды расійцаў, прывабліваючы іх высокімі грашыма. Каля трох тысяч такіх «варагаў» прыехала на Беларусь, менавіта яны сталі рухавіком «мураўёўскай» палітыкі.

Добра разумеючы ролю рэлігійнага фактару, Мураўёў моцна ўдарыў па каталіцкай царкве. Было зачынена 27 каталіцкіх манастыроў (з 46), 117 ксяндзоў высланы ў Сібір, у касцёлах была забаронена польская мова[14]. Разам з тым Мураўёў імкнуўся ўзмацніць уплыў праваслаўя. Было падвоена грашовае забеспячэнне праваслаўных святароў. Пачалося шматлікае будаўніцтва праваслаўных цэркваў, але строга забаранялася будаўніцтва і рамонт касцёлаў. Генерал-губернатар заснаваў у кожнай губерні царкоўнабудаўнічыя камітэты. Кожную нядзелю ён выклікаў да сябе архітэктара Чагіна і ўласным подпісам зацвярджаў абраныя праекты. Трэба сказаць, што гэта быў гвалт з дойлідства. Дзеля хуткасці і лёгкасці будаўніцтва Чагін распрацаваў праект жалезнай царквы. Адна такая царква была пабудавана, але праводзіць у ёй службу не было як: летам па з-за незвычайнай спякоты, а зімой — ад такога ж холаду. Мураўёў патрабаваў, каб новыя цэрквы былі падобныя на расійскія не толькі звонку, але і ўнутраным убранствам: «каб іконы ў іканастасе ў адносінах малюнку і фону захоўвалі тыя ўмовы, якія прыняты

старажытным звычаем праваслаўных храмаў»[15]. З той жа мэтай мітрапаліт Сямашка падпісаў: «усе статуі, карціны, крыжы, якія сваім абліччам належаць несумненна рымскай царкве, былі знішчаны...»

Такую ж жорсткую палітыку праводзіў Мураўёў да сістэмы народнай адукацыі. І калі яшчэ ў 1862 годзе папячыцель Віленскай вучэбнай акругі князь Шырынскі-Шыхматаў пісаў: «Узровень грамадскай адукацыі ў заходніх губернях з прычыны гістарычнага развіцця стаіць вышэй за ўзровень ўнутраных губерняў Расіі»[16], то Мураўёў фактычна развалiў сістэму адукацыі. Усе мясцовыя настаўнікі, згодна з указам ад 3 чэрвеня 1864 года (№ 32) былі заменены расійцамі або немцамі. Дыскрымінацыйны закон быў прыняты супраць вучняў каталікоў. Была пахавана ідэя выдання часопіса для народу на беларускай мове. Праўда, Мураўёў вырашыў зноў адчыніць Віленскі універсітэт, для зачынення якога калісьці прыклаў столькі намаганняў. Ён бачыў ва універсітэце ідэйны цэнтр расійскай цывілізацыі, плацдарм для русіфікацыі краю. 7 верасня 1863 года Мураўёў падаў праект стварэння універсітэта. Тут былі такія ўмовы: «Прафесары і выкладчыкі павінны быць расійскага паходжання. З адкрыццём Віленскага універсітэта мясцовым ураджэнцам каталіцкай веры зачыняецца доступ у расійскія універсітэты»[17]. Аднак гэтая ідэя Мураўёва не знайшла падтрымкі. Нават яго бліжэйшы паплечнік Карнілаў пісаў, што «для адкрыцця універсітэта яшчэ не настаў час, для яго тут няма ні расійскага грамадства, расійскія пачаткі яшчэ не вельмі моцныя, не вельмі свядома і глыбока праніклі ў масы»[18]. Мураўёву прышлося адмовіцца ад сваёй ідэі.

Мураўёў і яго каманда праводзілі сваю палітыку пад лозунгам «Пальшчызны тут быць не павінна»[18]. Але пад «пальшчызнай» разумелася ўсё тое, што выходзіць за рамкі афіцыйнай народнасці. Так, Мінскі маршалак Прушынскі напісаў пасланне генерал-губернатару на беларускай мове, у якім ён выказаў упэўненасць у гістарычнай неабходнасці далучэння Беларусі да Расіі, але даказаў ён гэту неабходнасць ідэяй Панславізму. Чыноўнік канцылярыі Мураўёва А. Н. Масолаў пісаў наконт гэтага: «Думка гэта пусціла карані ў Мінскай губерні, бо ў ёй хітрасць палякаў, якія на ўсё згодныя, толькі б не называцца рускімі»[19]. Але царызм баяўся не так паланізму, як адраджэння беларускай нацыянальнай ідэі. Аб гэтым сведчыць наступны факт. У 1864 годзе сярод «мураўёўцаў» узнікла ідэя аднаўлення на Беларусі і Літве праваслаўных брацтваў. Ідэю гэту падтрымаў і сам Мураўёў, які бачыў у брацтвах перадавы атрад супраць каталіцызму. Але ў Пецярбурзе і Маскве спалохаліся, што гэта будзе садзейнічаць росту нацыянальнай самасвядомасці беларусаў настолькі, што Карнілаву прыйшлося супакойваць «цэнтр». У сакавіку 1864 года ён піша ліст Каткову: «Баяцца практычных тэндэнцыяў і сепаратызму на заходняй мяжы проста смешна. Які тут сепаратызм, калі Беларусь, знаходзячыся ў сутыкненні з моцнымі народнасцямі і мяжуючы са згуртаваным польскім грамадствам, можа трымацца, толькі абапіраючыся на Расію. Яна ніколі не будзе настолькі моцная, каб прыйшло ў галаву дамагацца самастойнасці»[20].

Беларусам прыйшло ў галаву дамагацца самастойнасці. Але на шляху да гэтага давялося прайсці праз многія пакуты. І хаця Мураўёў пайшоў у адстаўку ў маі 1865 года, яго імя стала сімвалам той імперскай палітыкі, якую праводзілі пад рознымі лозунгамі і сцягамі, маючы на ўвазе адну мэту — не даць беларускаму народу жыць вольным жыццём. І ўсё ж такі трэба прызнаць, што Мураўёву і да яго яму падобным вельмі дапамагала наша ўласная непавага да сваёй культуры і роднай мовы. І асабліва вінавата ў гэтым інтэлектуальная

эліта, адказная за жыццяздольнасць этнасу. Чаму гэта адбылося, павінны сумесна разабрацца гісторыкі, сацыёлагі, філосафы. Але цяпер, не беручыся за складаны аналіз, мы бачым рэальныя факты і бачым рэальныя вынікі. І хоць Гегель сцвярджаў, што гісторыя ніколі нікога не навучыла, здаецца, што часам яна проста тыкае носам у гістарычную рэальнасць, і не вучыцца той, хто не хоча вучыцца.

[1] Кропотов Д. А. Жизнь графа М. Н. Муравьёва в связи с событиями его времени до назначения губернатором в г. Гродно — СПб, 1874. С. 220.

[2] Эйдельман Н. Я. Революция сверху в России.— М., 1989. С. 117.

[3] Кропотов Д. А. Жизнь графа М. Н. Муравьёва в связи с событиями его времени до назначения губернатором в г. Гродно.— СПб., 1874. С. 246.

[4] Там сама. С. 256.

[5] Там сама. С. 258.

[6] Там сама. С. 270.

[7] Там сама. С. 364.

[8] Там сама. С. 390.

[9] Там сама.

[10] Солоневич Л. Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет её существования.— Гродно, 1901. С. 36.

[11] Муравьёв М. Н. Записки об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нём мятежа // Русская старина.— 1883.— Т. 36. С. 396.

[12] Письма Муравьёва к А. А. Зеленому // Голос минувшего. 1913, № 9, С. 242.

[13] Русская старина. Т. 37. С. 243.

[14] Миловидов А. И. Распоряжения и переписка графа М. Н. Муравьёва относительно римско-католического духовенства в Северо-Западном крае. Вильна, 1910. С. 38.

[15] Миловидов А. И. Церковно-строительное дело в Северо-Западном крае при графе М. Н. Муравьёве. Вильна, 1913. С. 17.

[16] Там. сама. С. 18.

[17] Миловидов А. И. Участие молодежи Северо-Западного края в мятеже 1863 года и вызванная ими реформа местных учебных заведений. Вильна, 1904. С. 37.

[18] Там сама.

[19] Мосолов А. Н. Виленские очерки 1863—1865 гг. СПб., 1898. С. 86.

[20] Корнилов И. П. Русское дело в Северо-Западном крае. СПб. , 1908. С. 71.

Кацярына Яроменка
(Гродна)

СПАДЧЫНА ВУЧОНАГА

З Гродзеншчынай звязана імя І. М. Ястрабцова. Філосаф і педагог, аўтар даследаванняў па фізіялогіі, геалогіі, гісторыі, геаграфіі, эстэтыцы, І. М. Ястрабцоў восем гадоў жыў і працаваў у нашым горадзе.

Давялося ўзяцца за архіўныя звесткі, каб устанавіць асноўныя факты з жыцця і дзейнасці гэтага таленавітага вучонага.

Ён паходзіў з сям ´і святара. Нарадзіўся ў Маскве ў 1797 годзе. Вучыўся ў Славяна-грэка-лацінскай акадэміі (да яе пераўтварэння ў Маскоўскую духоўную акадэмію) (1814 год), а потым у Маскоўскай духоўнай семінарыі. У 1815 годзе выйшаў з духоўнага звання па хваробе і прыйшоў на службу ў канцылярыю Сінода. Праз год паспяхова здаў уступныя экзамены на медыцынскі факультэт Маскоўскага універсітэту, а ў 1820 годзе закончыў яго дактарантам. Пасля абароны дысертацыі засцверджаны ў званні доктара медыцыны.

У наступныя дзесяць гадоў знаходзіўся па-за службовымі абавязкамі. Ён прысвяціў гэты час навукова-літаратурнай дзейнасці. У 1825 годзе выйшла ў Маскве на лацінскай мове яго доктарская дысертацыя, у якой вучоны сцвярджаў, што трэба вярнуць кравяноснай сістэме частку «годнасці, якой валодвае ў фізіялагічным вучэнні нярвовая сістэма».

Ястрабцоў быў членам маскоўскіх навуковых таварыстваў: фізіка-медыцынскага, таварыства натуралістаў. Надрукаваў шэраг даследаванняў у часопісе «Маскоўскі тэлеграф». Пазней многія яго артыкулы былі надрукаваны асобна, у тым ліку вялікі артыкул «Аб разумовым выхаванні чалавека дзіцячага веку» (М. 1831). Яна атрымала добрыя водгукі сярод аўтарытэтных літаратараў П. А. Вяземскага і І. І. Дзмітрыева. Менш чым праз два гады друкуецца значна пашыранае тэарытычнае даследванне па пытаннях дыдактыкі — «Аб сістэме навук». Ніводная іншая кніга Ястрабцова дагэтуль і пасля не выклікала такой аднагалоснай высокай падзякі. Упершыню ў гісторыі педагагічнай думкі Расіі Акадэмія навук прысуджае Дзямідаўскую прэмію аўтару кнігі «Аб сістэме навук».

Напэўна, поспех у галіне тэарэтычнай педагогікі схіліў аўтара да службы па ведамстве народнай асветы. Гэтая служба пачалася ў маі 1834 г. у якасьці пазаштатнага чыноўніка ў канцыляры папечыцеля С-Пецярбургскай вучэбнай акругі, потым працягвалася ў Наўгародскай губернскай гімназіі, дзе ён працаваў інспектарам (чэрвень-верасень 1834 г.).

У гэтым жа годзе ў Гродне адчынілася Гродзенская губернская гімназія — першая свецкая школа на Гродзеншчыне. Прадбачылася вялікая работа, якая патрабавала ведаў і вопыту. Міністр адукацыі С. С. Уваравў добра ведаў папярэднюю службу І. М. Ястрабцова. Ён пераводзіць яго з Наўга-

родскай губернскай гімназіі на пасаду дырэктара вучылішчаў Гродзенскай губерні[1]. Толькі што адчыненая ў Гродне гімназія з павятовым вучылішчам для мяшчанаў пры ёй павінна была абсталяваць ў будынках скасаванай дамініканскай абіцелі. Дырэктар губернскай гімназіі з ´яўляўся адначасова і дырэктарам вучылішчаў Гродзенскай губерні. Указ аб адкрыцці губернскай гімназіі ў Гродне ад 3-га студзеня 1834 года прадугледжваў адчыніць пры ёй шляхетны пансіён.

Цяжкасці, звязаныя з выкананнем указа, прымусілі першага дырэктара вучылішчаў Ф. В. Сазановіча па стане здароўя звольніцца, замест яго і быў прызначаны І. М. Ястрабцоў. Энергічная дзейнасць новага дырэктара вучылішчаў была адзначана пасля агляду гімназіі, шляхетнага пансіёну, павятовага вучылішча. Таварышам міністра адукацыі у лістападзе 1835 года І. М. Ястрабцову за «выдатнае ўсталяванне Гродзенскай гімназіі» быў зроблены запіс у службовы фармуляр[2] (ён знаходзіцца ў ЦДГА ў Гродне) с падзякай міністра асветы С. С. Уварава. У 1836 годзе «за выдатную старанную службу» ён узнагароджаны ордэнам св. Ганны трэцяй ступені.

Набліжаўся 1837 год — год юбілейны. Меркавалася шырока адзначыць 25-годдзе перамогі рускай зброі ў вайне 1812 года. Па губернях збіраліся звесткі для генерал-лейтэнанта сенатара Міхайлоўскага-Данілеўскага для напісання «Гісторыі Айчыннай вайны 1812 г».

У верасні 1836 г. Міністэрства народнай асветы Беларускай вучэбнай акругі звярнулася да Ястрабцова з просьбай скласці «Запіскі для гісторыі аб вайне 1812 г».

«... Маю гонар паведаміць,— адказаў ён,— аб маёй згодзе выкарыстаць вольны ад непасрэднай службы час для заняткаў, да якіх ваша правасхадзіцельства запрашаць мяне зрабілі ласку». Тэрміны былі жорсткія. Вялікая работа «па ўсталяванню» гімназіі займала шмат часу.

Акрамя таго, дырэктар гімназіі Ястрабцоў выбіраецца «правіцелем спраў» зноў заснаванага гродзенскага губернскага стытыстычнага камітэту[3]. Пад яго кіраўніцтвам працавала камісія па рэдагаванні паведамленняў і дакладаў ад членаў-карэспандэнтаў з усіх уездаў губерні. Вырашана было скласці апісанне гарадоў губерні. Гістарычнае апісанне Гродна было прапанавана Ястрабцову. «Але па складанасці абавязкаў» гэтая праца не была скончана. У сувязі з вялікай працай па падрыхтоўцы «Запісак аб вайне 1812 г.» І. М. Ястрабцоў просіць вызваліць аго ад абавязкаў «правіцеля спраў» Гродзенскага статыстычнага камітэта. Просьба яго была задаволена. Пачалася напружаная праца. Ім былі дасканала вывучаны архіўныя дакументы, «якія засталіся ад былога ў 1812 годзе адміністрацыйнага кіравання». Захаваўся сталы спіс друкаваных выданняў, вывучаных Ястрабцовым. Цыркулярам гродзенскага губернатара было даручана гараднічым, уездным прадвадзіцелям дваранства, земскім спраўнікам падаваць звесткі, якія датычацца вайны. Яны вывучаліся, абагульняліся, рэдагаваліся Ястрабцовым. Сустракаўся і гутарыў ён са старажыламі, «якія мелі ў памяці гэтую згубную вайну».

Плёнам напружанай працы вучонага з ´явіліся «Запіскі, якія датычаць гісторыі аб вайне 1812 года»[4]. Яны складаюцца з наступных частак: «Урадавая», «Ваенная», «Харчовая», «Злоўжыванне войска», «Заключэнне». Тут мы знаходзім звесткі аб арганізацыі ўпраўлення на акупаванай тэрыторыі, колькасным складзе рускіх і французскіх войскаў. Фактычным матэрыялам пацвярджаецца, якіх «велізарных намаганняў для губерні каштавала харчаванне войскаў Напалеона». Вось як аб гэтым паведамлялася:

«Французская армія ўжывала надта шмат мяса... Самае вялікае запатрабаванне было 19 лістапада. Напаляон загадаў мець для харчу 8000 быкоў, вагою па 500 фунтаў. Адміністрацыйная камісія згаджалася нават на 16 000 валоў (з пяці двароў па адным)... Гродзенская губерня за пяць месяцаў недалічыла 1/3 часткі сваёй жывёлы.

У летні час у адным Гродне штомесяц выкарыстоўвалася звыш 4500 вазоў дроў на пячэнне хлеба. Для гэтага ў Гродне знарок змуравана 100 печаў, у якіх выпякалася штодзень 100 000 порціях...»[5]

Нельга не прывесці радкі з «Запісак», у якіх расказваецца пра злоўжыванні французскіх войскаў на тэрыторыі Гродзенскай губерні. «Рабаванне (французскага войска) часта спалучаліся з забойствамі. Так, 18 ліпеня з Морачы ў казённую вёску Бершты прыбыў атрад французскага войска. Салдаты паранілі казённых сялянаў, узялі з сабою большую частку іх маёмасці...

8 жніўня ў 12 гадзін раніцы 25 чалавек саксонцаў з вынутымі шаблямі і штыкамі напалі на в. Кобедзічы (ў Ваўкавыскім у.). Саксонцы, абрабаваўшы вёску, узялі з сабою 9 коней і 7 быкоў. Падобнае рабілася і ў іншых паветах Гродзенскім, Навагрудскім, Лідскім і г. д...

26 кастрычніка атрад французаў з 70 чал., праходзячы па дарозе, ў Гродне праз мяст. Каменку, білі шаблямі сялян, стралялі па іх і ранілі 20 чал., пры выхадзе ўзялі з сабою 23 кані...»[6]

Самастойным раздзелам у «Запісках» стаіць раздзел «Надзеі чыста гістарычныя». У ім даюцца звесткі аб руху рускіх і французскіх войскаў, месцах баёў і размяшчэнне штабоў і кватэр Галоўнакамандуючых рускіх і французскіх войскаў, а таксама чалавечых стратах з абодвух бакоў.

Вось як апісваецца бой з французскай арміяй пад гарадамі Кобрыным і Ваўкавыскам. Як вядома, першая перамога ў Айчыннай вайне 1812 года, атрыманая пад Кобрыным, разбіла міф аб пераможнасці арміі Напаляона.

«... 15 ліпеня была бітва паміж рускімі і саксонцамі каля Кобрына. Генерал Клінгель з 4000 салдатаў быў акружаны ген. Тормасавым і выціснуты з замку. Згарэла 348 дамоў, засталося 32...»

Калі ўважліва чытаеш запіскі, дык прыходзіш да высновы, што Ястрабцоў быў далёкі ад простай канстатацыі фактаў: скрозь бачыш жывы ўдзел яго ў падзеях, свая пазіцыя да таго, пра што піша. Напэўна, ёсць і тэндэнцыйнае асвятленне некаторых пытанняў. Але гэта толькі ажыўляе «Запіскі» і дае магчымасць не толькі папоўніць свае веды, але і палемізаваць з ім.

Можна адназначна сказаць, што плён напружанай працы вучонага — гэта крыніца, з якой мы чэрпаем звесткі аб здарэннях тых дзён. Яна і цяпер — прадмет даследванняў нашых сучаснікаў.

У 1842 годзе І. М. Ястрабцоў пакінуў Гродна. Ні былыя заслугі Ястрабцова, ні высокая адзнака яго асобы, працы і службовай дзейнасці міністрам асветы Уваравым не змаглі пахіснуць Мікалая І: Ястрабцоў быў з паніжэннем у пасадзе пераведзяны ў заснаваную гімназію горада Дзвінска ў якасці яе дырэктара. Разам з пераездам з губернскага горада Гродна ва павятовы горад Віцебскай губерні прыпыняецца літаратурна-педагагічная дзейнасць Ястрабцова. Гэта перамяшчэнне было выклікана нездаволенасцю вышэйшага кіраўніцтва. Гродзенскі губернатар у справаздачы аб стане даручанай яго кіраванню губерні пісаў цару ў 1841 годзе: «Не дае задавальнення Гродзенская гімназія». І далей даносіў аб тым, што Ястрабцоў не здольны кіраваць Гродзенскай гімназіяй і шляхетным пансіёнам таму, што ўвесь свой час праводзіць у кабінеце за літаратурнай працай... вельмі мала

займаецца гімназіяй і пансіёнам...» Губернатар накіраваў асобнае данясенне міністру народнай асветы. На рэзалюцыю Мікалая I — «навесці падарак» міністр асветы С. С. Уварaў адказваў імператару: «... на маю думку, наўрад ці змог грамадзянскі губернатар ведаць усе падрабязнасці яго (Ястрабцова) кіравання пры вельмі рэдкіх наведваннях вучылішчаў, у якіх ён быў не больш як адзін або два разы на год».

Сапраўдныя прычыны перамяшчэння Ястрабцова павінны быць яшчэ высветлены даследчыкамі.

На самой справе факты сведчаць пра іншае, і Ястрабцоў многа ўвагі надаваў гімназіі і яе настаўнікам. Так, ён «запрасіў сабе» у міністра казённую камандзіроўку ў С.-Пецярбург і Маскву дзеля агляду шляхетных пансіёнаў з той мэтай, каб запрасіць «адукаваных іншаземцаў» на пасады пакаёвых наглядальнікаў у шляхетныя пансіёны Гродзенкі і Навагрудскі, а таксама дзеля асабістага пагаднення са сталічнымі кнігапрадаўцамі адносна набыцця кніг для бібліятэкаў шляхетных пансіёнаў.

Ястрабцоў ахоўваў настаўнікаў гімназіі ад разнастайных даручэнняў кіраўніцтва. Так, ім даручаліся ўсялякія статыстычныя апісанні, разгляд кніг для цэнзуры і многае іншае. Аднойчы губернатар патрабаваў, каб настаўнікі прагледзелі кнігі, якія прывёз жыхар г. Каменец дзеля продажу. Ясрабцоў зрабіў гэта сам. Аддаючы складзены ім спіс губернатару, ён прасіў вызваліць настаўнікаў гімназіі ад падобнай працы ў час вучобы, «бо паводле распараджэння міністра народнай асветы, ён, дырэктар, не мае права адхіляць настаўнікаў пабочнымі заняткамі ад іх прамых абавязкаў...»

Служба па ведамству народнай асветы Ястрабцова скончылася ў 1858 годзе ў Віцебскай губерні.

[1] Орловский Е. Ф. Исторический очерк Гродненской гимназии. Гродно, 1901. С. 32.

[2] ЦДГА ў Гродне, ф. 38, воп. 3, спр. 2.

[3] Орловский Е. Ф. Гродненская старина. Гродно, 1910. с. 264—265.

[4] ЦДГА ў Гродне, ф. 1, воп. 19, спр. 1141, лл. 121—140.

[5] Там сама, лл. 127—128.

[6] Там сама, лл. 130—131.

Сяржук Дрозд
(Гродна)

НАШЫ ГІСТАРЫЧНЫЯ КАРАНІ; ПА СЛЯДАХ К. КАЛІНОЎСКАГА

Яны былі і застаюцца надзвычай супярэчлівымі, неадназначнымі, залеглымі глыбока ў пластах народнай памяці. Таму, безумоўна, і нацыя, пазбаўленая гістарычных каранёў, ды яшчэ з патухлай памяццю, перастае быць нацыяй, перарастаючы ў нейкі кангламерат насельніцтва. У дні карэннай перабудовы грамадства пераасэнсаванне мінулага ў пэўнай ступені актуалізавалася гарачым імкненнем пазнаць, вывучыць і ацаніць гісторыю, культуру, права, этыку — словам, спадчыну свайго народу.

У гісторыі Беларусі выдатным грамадскім дзеячам стаў Кастусь Каліноўскі — кіраўнік паўстання 1863 года, паслядоўны рэвалюцыянер-дэмакрат левага крыла, таленавіты палітык, публіцыст, паэт, адзін з самабытных прадстаўнікоў перадавой моладзі сярэдзіны XIX стагоддзя. Натуральна, людзі высокіх грамадзянскіх ідэалаў, такія, як Каліноўскі, Серакоўскі, Герцан, Дабралюбаў, Шаўчэнка і інш. належаць не толькі мінуламу, але і сучаснаму. Бо іх лёсы — вечная светапоглядная глеба для роздуму за сваім часам, быццём і сумленнем, у іх, як у фокусе, адлюстроўваецца складаная дыялектыка канкрэтнай эпохі.

Каліноўскі быў павешаны ў Вільні сонечным сакавіцкім ранкам 1864 года. Лукішскі пляц — месца пакарання героя. А дзе пахаваны дваццацішасцігадовы змагар — ніхто не ведае. Трагічная таямнічасць у гісторыі — узор злачыннай тактыкі генерал-губернатара М. Мураўёва. Гэта ён на рашэнні следчай камісіі, якая засудзіла Каліноўскага да расстрэлу, напісаў злева карандашом — «павесіць». І павесілі, расстралялі, пасадзілі ў турмы, выслалі ў Сібір сотні, тысячы людцаў. Мураўёўскія рэпрэсіі і экзекуцыі ў Беларусі сталі масавымі і відочнымі, што за ім у народнай памяці назаўсёды замацаваўся ганебны эпітэт «вешацель» (Мураўёў-вешацель). У Вільні і цяпер стаіць яго палац з белымі раскошнымі канюшнямі ў самым цэнтры старога горада. Мураўёў быў сапраўдным малым царком Віленшчыны, Ковеншчыны, Гродзеншчыны, Міншчыны, Магілёўшчыны, Віцебшчыны, г. з. усёй Беларусі і Літвы. Ён крышыў лёсы не толькі асобных людзей, крамольных вальнадумцаў, сваім дэспатызмам ён уплывае нават на сацыяльную геаграфію краю. Вось адзін факт з тых часоў, які акрэслены межамі ў сто гадоў: данеслі, што ў лясах тагачаснага Лідскага павета ў вёсцы Пакроўка згрупавалася мноства інсургентаў. Генерал сам вырашыў прыняць удзел у аперацыі. Конніца казакоў спраўна прачасала ўсё наваколле — ні аднаго мяцежніка, ні адной жывой душы ў вёсцы. Затое з паяўленнем генеральскай світы ўзняўся такі сабачы вэрлах, такое дзікае завыванне, што вывела генерала з цярпення: «Дзе

ж інсургенты, «гаспада»,— спытаў ён.— Тут што — сабачнік?» Пасля з вёскай стала наступнае: да паўстання яна мела назву Пакроўка, пазней — Сабакінцы і толькі праз сто гадоў — пры савецкай уладзе — па волі насельніцтва яна была пераіменавана ў Першамайск. Так, Пакроўка — Сабакінцы — Першамайск — гэта этапы суровай біяграфіі паселішча ў Шчучынскім раёне. Сабакінцы сёння можна прачытаць на старых картах і планах. Гэта ярка выражаная памятка гістарычнага анархізму.

На Гродзеншчыне ёсць шмат памятных мясцін, звязаных з дзейнасцю Каліноўскага і паўстаннем 1963 года. Некаторыя з іх прыгадаем нашаму чытачу.

«Коматаўская пераправа». Знаходзіцца каля вёскі Коматава, доўгай і ўтульнай, асабліва ў летні надвячорак, там дзе рака Котра ўпадае ў Нёман. Сюды рваліся калісьці на ўсход войскі Напаляона, шведаў, нямецкіх захопнікаў. Калі мець на ўвазе існаванне ваенных пераправ праз Нёман у мінулым нашай гісторыі, то належыць сказаць, што ў межах Гродна яны былі нязначныя. Стратэгічныя пераходы праз рачны рубеж ажыццяўляўся, як правіла, у Пальніцы і Гожы, у Коматаве і Перакопе, што каля вусця Шчары ў Мастоўскім раёне.

Але Коматаўская пераправа была, бадай, самай інтэнсіўнай. Пераадолеўшы Нёман у гэтым месцы, справа адкрывалася выйсце на скідзельскі тракт, злева праз Пескі і Капцёўку — на індурскі.

Левабярэжная вёсачка Пескі знішчана, засталіся толькі камяні ад падмуркаў. У час паўстання 1863 года ў Песках дзейнічаў партызанскі атрад, які быў накрыты казакамі і ўшчэнт разбіты. У суседніх Віцьках яшчэ жывуць успаміны аб падзеях тых далёкіх часоў. 73-гадовая Ганна Баранава ў 60-х гадах расказвала нашым краязнаўцам, што яна добра памятавала свайго дзеда Лаўрэнція Кроя, які служыў конюхам у пескага пана, што 500 казакоў пераправіліся вышэй Сіўкава праз Нёман, напалі на атрад і пасеклі шашкамі. Галава Лаўрэнція ўцалела выпадкова, дзякуючы кемлівасці і вынаходлівасці.

«Канюхоўскі роў». Віцькоўскія старажылы расказвалі нам, што на месцы сутычкі каліноўцаў з казакамі, асабліва ў вялізным рове (аўрагу) «кроў ручаямі лілася». Знаходзілі тут замардаваных людзей з адрэзанымі насамі, вушамі, жанчын і нават дзяцей, навокал шмат «валялася касцей». Кажуць, што нават цяпер туды боязна заходзіць. Роў глыбокі, з густой лясістай расліннасцё, з усіх бакоў прыкрыты ад вятроў, з крыніцай пасярэдзіне. Канюроўскі роў стаў зручным месцам для конніцы паўстанцаў, у кузні кавалі коней. У народзе ён так і завецца — Канюхоўскі роў». Сцвярджаюць таксама, што там пахаваны паўстанцы, маюцца курганы, два на месцы сутычкі, тры непадалёку ад Віцькоў, некалькі кургановых насыпаў мясцовыя жыхары адносяць да шведскага нашэсця.

«Урочышча Вешанка». На левабярэжжы Нёмана. Адкуль паходзіць такая назва? Што з ´явілася імпульсам для яе ўзнікнення? Хвоі, нямыя сведкі часу, якія бачыце на здымку, задуменна стаяць і сёння, каржакаватыя, адзінокія, сям-там тырчаць пні. Людзі высеклі лес, карысталіся ім для свае патрэбы па-рознаму. Але калі тычыцца справа этымалогіі Вешанкі, то абарыгены зямлі, не задумваючыся, адказваюць: «Тут у час «мецяжу» 1863-64 гг. вешалі рэвалюцыянераў». Дзівосны набытак чалавечай прыроды — ПАМЯЦЬ. Яна зберагае, ашчаджае, ахоўвае і памнажае нашу спадчыну. Гродзенскі паэт А. Цыхун у вершы «Памяці Кастуся Каліноўскага» вобразна яе падае так:

Шумяць і гамоняць адвечныя пушчы
Аб славе адважных паўстанцаў-сялян.
Магілы іх зараз хаваюцца ў гушчы,
Дзе дрэмле сасоннік і дзікі бур ´ян.

Калектыўная магіла 1863 года. Знаходзіцца ў Мінявіцкім лесе, што непадалёку ад Багатырэвічаў. Пахаваны ў ёй сялянскія і шляхецкія рэвалюцыянеры. Пісьменніца Э. Ажэшка выяўляла павышаную зацікаўленнасць да людзей і прыроды Мінявіцкай акругі. Мінявічы для яе сталі не толькі месцам адпачынку, але і кутком глыбокіх мараў і творчых натхненняў. Прыгадаем хоць бы два творы пісьменніцы — аповесць, якая мае лацінскую назву « : («Слава пераможаным») і раман «Над Нёманам». Галоўная ідэйная крыніца іх — паўстанне 1863—1964 гг. Нягледзячы на празмернае захапленне ідэяй класавага салідарызму, яна здолела рэальна адлюстраваць карціны жыцця людзей наднёманскага краю, дала крытыку арыстакратычнай бюракратыі, шляхецкім норавам, стала на абарону людзей, маладых, сільных, улюбёных у свой край і народ.

«Святое балота». На геаграфічнай карце яго не знойдзеш, але калі падацца ў азёрскі лясны масіў у кірунку Котры і Шкленска, то нага ступіць у той самы квадрат, але вока не ўбачыць, бо «Святое балота» асушана і ператворана ў торфараспрацоўку. Для тых, хто цікавіцца мінулым, карысна ведаць, што там былі разбіты і паланёны апошнія сілы паўстанцаў, захоплена грашовая каса. Само «Святое балота» — гэта непраходная дрыгва, сярод якой «уладкаваны» у форме сярпа сухі грудочак, на які мог трапіць толькі добры знаўца, і то па кладках. На ўзгорачку сухога лесу і былі схаваны рэшткі змагароў супраць царызму. Чаму яно названа «святое»? А не як-небудзь інакш, скажам, грэшным? Тлумачыцца гэта перш за ўсё рэгіянальнымі асаблівасцямі, якія вынікаюць з маралі, народнай этыкі, нейкай урачыста-балючай міласэрнасці да загінуўшых, узведзенай у ранг святой памяці.

Для большай паўнаты закранутай тэмы варта прыгадаць яшчэ адзін прыклад. Такіх ландшафтавых сховішчаў на Гродзеншчыне, змайстраваных самой прыродай, зафіксаваных нейкім чынам гістарычнымі падзеямі, усяго два.

Другое «сховішча» — у Ліпічанскай пушчы, у раёне Новай Руды, дзе ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны асталяваўся славуты партызанскі шпіталь. Траплялі туды толькі па кладках з завязанымі вачыма. Недаступны грудок быў тым месцам, якое выратавала жыццё не аднаму чалавеку з шматлікіх пакаленняў. Старасвецкія дубы, высачэзныя яліны, дзесяткі іншых пародаў дрэў ніколі не кранала рука чалавека — усё было як першабытная неруш. Шкада, што гэтыя запаведныя куточкі спустошыліся. Галоўная знішчальная сіла — крыважэрная піла леспрамгаснікаў і наступ меліяратараў, а бюракратычна-камандны апарат не збярог для нашчадкаў унікальных музеяў пад адкрытым небам.

«Плача асіна». З такой навіной хлапчукі-пастушкі прыбеглі да бацькоў, каб паведаміць пра неверагодную з ´яву, бачаную на ўласныя вочы: з асіны паліліся слёзы, калі падкурылі дупло. У агні золата расплавілася, і па дрэве застуменіліся празрыстыя слёзы. Перапалох пастушкоў разгадалі дарослыя з вёскі Гута — ў дупле асіны нечакана выявілася «залатая каса» паўстанцаў. Здарылася гэта ў 30-х гадах нашага стагоддзя ў Ліпічанскай пушчы ў так званым цэмахаўскім лесе. Сам Цэмах — пушчанскі пасяленец, меў сувязь з «мяцежнікамі».

Некалькі слоў пра Пушчу — вёску, гэта абагуленая назва раскіданых у дрымучым лесе адзінокіх хутароў, прытулак «беглых сялян», розных вальнадумцаў, у лёсе якіх наступіў разлад з існуючым дзяржаўным укладам. Пушча — цэнтр «беларускіх вольніцаў, такіх як Воля, Малая Воля, Вялікая Воля, Воля-Крупіцы (г. зн. крупіначка волі). Склаліся яны гістарычна ў самых недаступных месцах уздоўж Шчары, якая таксама ў народзе завецца вольнай ракой.

Нашы «вольніцы» — гэта якраз тыя «белыя плямы», якія належыць растлумачыць вучоным-гісторыкам, ды інакш, чым гэта рабілі прыхільнікі вульгарызатарскіх канцэпцый Абацадарскага. Згодна з іх трактоўкай, «беглыя сяляне» з нашых краёў уцякалі аж у «Запарожскую Сеч». Але ці так было на самай справе?

«Канфлікт на вуліцы Дамініканскай». Адбыўся каля двухпавярховага памяшкання Гродзенскай прагімназіі (Савецкая, 6) паміж Каліноўскім і агентам Варшаўскага жонду. Справа ў тым, што Варшаўскаму кіраўніцтву дужа не падабалася, што Каліноўскі імкнецца кіраваць паўстаннем на Беларусі і Літве незалежна ад яго, не падпарадкоўваючыся яго дыктату. Пачалася крытыка і пагрозы, яго сталі называць «самазванцам», «літоўскім сепаратыстам». Канфлікт скончыўся тым, што Каліноўскі загадаў выгнаць з Беларусі агентаў Варшаўскага камітэта, а Урублеўскі адмовіўся выконваць іх распараджэнні. З гэтага аднак нельга рабіць вывад, што яны не разумелі значэння стычнёвага польскага рэвалюцыйнага руху ў агульнай барацьбе супраць царызму.

«Падпольная канцылярыя» Гродзенскай паўстанцкай арганізацыі, як сведчаць архіўныя матэрыялы, была ўціснута ў лабірынты замкнёнага тыпу дворыка, размешчанага паміж сценаў паезуіцкага касцёла і двухпавярховага дома нумар 4 (цяпер «Салон мэблі»). Для канцылярыі быў абраны невялікі пакойчык на другім паверсе. Узначальваў яе малады чалавек, студэнт Кіеўскага універсітэта, які быў у блізкіх адносінах з Урублеўскім.

«Ліпавай алеі» ў Якушоўцы каля 150 гадоў. Пасаджана бацькам Кастуся. Сымон Сцяпанавіч быў двойчы жанаты і меў 17 дзяцей. Ад першай жонкі Рыбінскай было 12 дзяцей, ад другой, па прозвішчы Лазарэвіч,— 5. Дзяцінства Кастуся прайшло ў Мастаўлянах, юнацтва — у Якушоўцы. Бацька займаўся не толькі земляробствам, але і рамяством, меў 220 дзесяцін зямлі і «Фабрыку» на выраб ільняных сурвэтак, абрускаў, сталовай бялізны, задавальняў патрэбы сялян у валцы сукна. Майстэрні стаялі над рэчкай Калонкай (іншыя называюць яе Якушоўкай), тут вялізнымі хвоямі пачынаецца Белавежская пушча і забыты купецкі гасцінец, па якім ішлі караваны з Беластока на Ружаны, Кобрын і Брэст. Непадалёку стаяла карчма Лейбы.

Па даносе сышчыкаў, Кастусь мусіў трапіць у рукі жандароў менавіта ў Якушоўцы, яго сілуэт павінен быў з ´явіцца на маладой ліпавай алеі, якая ад лесу была на выразным відавоку. Царскі падпалкоўнік месяцамі не спускаў вока з хутара, але дарэмна. «Кастусь Каліноўскі», чулі мы ад старажылаў з Ліхасельцаў, былі людзьмі памяркоўнымі і спачувальнымі.

«Крамола ў Грандзічах». Здарылася неверагоднае: у вёсцы Грандзічы раптоўна з ´явілася нябачаная дагэтуль антыцарская пракламацыя, напісаная па-беларуску,— газета «Мужыцкая праўда». Такога яшчэ не было.

Толькі што абвясцілі «высачэзны» Маніфест. Ды як? Урачыста, нават пампезна, што цар дасць сялянам волю і землю. А тут — крамола, што маніфест «такі дурны, што чорт ведае да чаго ён падобны,— ніякай у ім няма

праўды». І дзе чытаюць «Мужыцкую праўду»? У бліжэйшай вёсцы, прама пад бокам дома Гродзенскага губернатара. Сапраўды, крамольная справа, роўная дзяржаўнаму перавароту.

А здарылася вось што. Тутэйшы парабак Мікалай Таўрэль, вяртаючыся з сахою дахаты, знайшоў экземпляр «Мужыцкай праўды», падпісанай псеўданімам Каліноўскага «Яська, гаспадар з-пад Вільні», каля статуі святога Іаана перад уваходам з боку Гародні. Па звычцы гаспадар ткнуў паперыну ў шчыліну сцяны якраз перад абразамі. Тэрмінова з ´явіўся чыноўнік з Гродна Лясота, учыніў вобыск, знайшоў памянёны экземпляр і пратаколам кваліфікаваў «гэтую справу» як палітычнае антыдзяржаўнае злачынства.

Якімі метадамі распаўсюджвалася «Мужыцкая праўда»? Рознымі. Але на адным варта затрымаць увагу. Гэта метад «рассейвання» газеты на жытніх палетках якраз перад жнівом, асабліва на Гродзеншчыне і Брэстчыне. У ліпені 1862 года брэсцкі земскі іспраўнік Маслаў рапартаваў губернатару ў Гродне: «Пяць экземпляраў былі знойдзены на палях вёсак: Бярозаўскі, Ясяноўскі, Падбужа і Радовіч». Было відаць у гэтым грамадскім руху штосьці нестандартнае, нават сімвалічнае, калі з першым снапом новага ўраджаю ў хату селяніна завітвала першая беларуская дэмакратычная нелегальная газета «Мужыцкая праўда» — малодшая па духу сястра, як кажуць многія даследчыкі, герцанаўскага «Колокола».

Такія, калі коратка, супярэчлівыя і неадназначныя вытокі гістарычных каранёў, звязаных з імем нацыянальнага героя — Кастуся Каліноўскага.

Марыя Сачок
(Гродна)

ПРА БАЦЬКУ МАКСІМА

Да 130-годдзя з дня нараджэння А. Я. Багдановіча

У гэтым годзе спаўняецца 130 год з дня нараджэння вядомага беларускага этнографа і фальклярыста, педагога і публіцыста, мовазнаўцы, бацькі Максіма Багдановіча.

Нарадзіўся Адам Ягоравіч Багдановіч 20 сакавіка 1862 г. у мястэчку Халопенічы Мінскай губерні. Сын былога прыгоннага селяніна, ён з маленства пазнаў нястачу, галечу і цяжкую працу. Працаваў падзёншчыкам у маёнтку, а затым падмайстэркам у розных майстэрнях Мінска. У вольныя ад працы хвіліны займаўся самаадукаваннем, чытаў многа кніг, вучыўся ў пачатковай школе.

У 1879 г. А. Я. Багдановіч паспяхова вытрымаў экзамены ў «сялянскі універсітэт» — Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Гады вучобы ў семінарыі былі гадамі напружанай працы над сабой, паглыблення ведаў і авалодання прагрэсіўнымі ідэямі.

Пасля сканчэння семінарыі Адам Ягоравіч настаўнічаў у Ігуменскім павеце, а затым быў загадчыкам гарадскога пачатковага вучылішча ў Мінску. Тут прымаў удзел у рэвалюцыйным руху мінскіх народавольцаў.

1892 год з ´явіўся этапным для А. Я. Багдановіча. Па стане здароўя ён вымушаны быў пакінуць педагагічную дзейнасць і, паступіўшы на службу ў сялянскі банк, пераехаў у горад Гродна. З гэтай пары ён пачаў інтэнсіўна займацца навуковай і літаратурнай дзейнасцю.

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна захоўваюцца дакументы пра гродзенскі перыяд жыцця А. Я. Багдановіча, агляд якіх мы маем намер зрабіць у гэтым артыкуле.

Умоўна гэтыя архіўныя крыніцы можна падзяліць на дзве групы: да першай адносяцца тыя, якія асвятляюць геаграфічнае і службовае становішча Адама Ягоравіча ў Гродне (дзе ён жыў, працаваў, займаўся грамадскай дзейнасцю), да другой — належаць творы і аўтографы Адама Ягоравіча.

«Памятныя кніжкі Гродзенскай Губерні» на 1892—1897 гг. сведчаць, што сям ´я Багдановічаў тры разы мяняла месцажыхарства ў Гродне: спачатку жылі на Новым Свеце ў доме Марушэўскага[1], затым на Новым Свеце ў доме Агульніка[2], а потым на вул. Палявой у доме Шміта[3]. З чым гэта было звязана? Магчыма, з тым, што расла сям ´я Багдановічаў. Як вядома, Адам Ягоравіч прыехаў у Гродна з жонкай Марыяй Апанасаўнай і двумя сынамі — Вадзімам і Максімам. У 1894 г. сям ´я Багдановічаў прыбавілася, нарадзіўся сын Лёва, затым дачка Ніна.

Калі адна з кватэраў, дзе жылі Багдановічы, вядома і адзначана мемарыяльнай дошкай[4], дык дзве другія трэба навукоўцам і краязнаўцам будзе яшчэ знайсці.

Працаваў Адам Ягоравіч Багдановіч у Гродзенскім аддзяленні сялянскага пазямельнага банку, якое мясцілася да 1895 г. на вул. Гарохавай у доме Рэнгарта[5], а затым на вул. Гараднічанскай у доме Ашкеназі[6].

«Указальнік асабістага складу ўрадавых і грамадскіх устаноў у Гродзенскай губерні» за 1894 г. дае характарыстыку А. Я. Багдановічу як дзяржаўнаму чыноўніку і таксама яго службоваму асяродку ў Гродзенскім аддзяленні сялянскага пазямельнага банку: «Старшыня, стацкі саветнік Пав. Міх. Дзікаў, кавалер арданоў Св. Ганны Св. Станіслава 3-й ступ., мае медалі: сярэбраную за уціхамірванне Венгрыі і Трансільвані і бронзавую ў памяць 1853—1856 гг., закончыў курс у быўшым Рышельёўскім ліцэі і Мікалаеўскую акадэмію генеральнага штаба, жанаты, на службе 49 год, на пасадзе з 1888 г.

Члены: па прызначэнню губернатара, Н. С. Пакроўскі, па запрашэнню: М. А. Казьмін, В. П. Брассе.

Бухгалтар, Пятро Елісеевіч Панчанка, жанаты, на службе 21 г., на пасадзе з 1890 г.— Памочнік яго, Адам Ягоравіч Багдановіч, закончыў курс Нясвіжскай наст. сем., на службе 7 гадоў, на пасадзе з 1892 г.»[7].

Як бачым з прыведзеных звестак, службовае асяроддзе А. Я. Багдановіча складалася з высокаадукаваных і спрактыкаваных спецыялістаў. Магчыма таму Гродзенскае аддзяленне сялянскага банку з такім параўнальна невялікім штатам паспяхова спраўлялася з пастаўленай задачай — «садзейнічаць развіццю прыватнай пазямельнай уласнасці сялян і утварэнню класу дробных уласнікаў»[8]. І толькі ў 1893 г. сяляне Гродзенскай губерні купілі праз сялянскі банк 4096 дзесяцінаў зямлі[9], што складала амаль палову ад усёй купленай сялянамі губерні ў гэтым годзе зямлі.

Гэта дзейнасць банка разам з дзейнасцю іншых дзяржаўных устаноў таго часу ў немалой ступені спрыялі таму, што эканамічнае становішча ў Гродзенскай губерні было на высокім узроўні.

Вось, што паведамлялася ў справаздачы гродзенскага губернатара за 1893 год: «... пры параўнальна нязначнай колькасці фабрык і заводаў у Гродзенскай губерні дабрабыт яе жыхароў грунтуецца пераважна на земляробстве. І хоць па колькасці сваёй глеба губерні, якая складаецца ў большасці з камення і пяску, не з яўляецца цалкам задавальняючай для паспяховага развіцця сельскай гаспадаркі, але пры спрыяльных кліматычных умовах і дастатковасці атмасферычных ападкаў яна ўзнагароджвае ў большасці выпадкаў працу зямляроба і зробленые выдаткі на яе ўгнаенне. Да такіх спрыяльных гадоў можа быць аднесены мінулы 1893 год... Хоць ураджай справаздачнага года быў некалькі ніжэйшы папярэдняга, але тым не менш ён цалкам забяспечыў харчовыя патрэбы насельніцтва і даў лішку зернавога хлеба і прадуктаў на суму звыш 2 1/2 мільёнаў рублёў»[10]. Калі б цяпер наш урад са сваімі чыноўнікамі і ўстановамі так актыўна дапамагалі сваім грамадзянам у іх эканамічнай дзейнасці, то не трэба было б бульбу закупляць у Польшчы, а зерне для жывёлы везці з Кітаю.

У архіве захоўваецца цікавая «Справа Гродзенскага аддзялення сялянскага пазямельнага банка пра пазыку сялянам Белавежскага 7 гаспадароў таварыства на куплю 18 дзес. зямлі ў Брэсцкім павеце Дзмітровіцкай воласці з маёнтка Грышчыцы ад землеўладальніка В. В. Бухавецкага». Пачата

сакавіка 18 дня 1893 г. Закончана сакавіка 10 дня 1898 г.[11]. У гэтай справе маецца аўтограф А. Я. Багдановіча як памочніка бухгалтара Гродзенскага аддзялення сялянскага банка.

Гаворка ў гэтай «Справе» ідзе пра тое, што 7 сялян-гаспадароў Дзмітровіцкай воласці Брэсцкага павета, адчуваючы недахоп зямлі, стварылі таварыства і вырашылі купіць 18 дзесяцін у памешчыка Бухавецкага. Для гэтага яны прасілі ў сялянскага банка пазыку на 900 рублёў на тэрмін 34,5 гады.

Адам Ягоравіч прыняў у справе брэсцкіх мужыкоў актыўны ўдзел. Яго подпіс стаіць разам з подпісам старшыні аддзялення банка П. Дзікавым на адносіне Гродзенскага аддзялення сялянскага пазямельнага банка да Дзмітровіцкага валаснога праўлення ад 30 лістапада 1894 г.,[12] у якой яны пісалі валасному праўленню: «... паклапаціцца пра хутчэйшую ліквідацыю забаронаў, лічачыхся на маёнтку Грышчыцы... Адзначаныя забароны з ´яўляюцца перашкодай да зацвярджэння купчай крэпасці на зямлю Белавежскага 7 гаспадароў таварыства»[13].

Вялікім аўтарытэтам карыстаўся А. Я. Багдановіч як грамадскі дзеяч, праявіўшы і на гэтай ніве нястомнасць энергіі і немалыя арганізатарскія здольнасці.

Па прыездзе ў Гродна Адам Ягоравіч быў выбраны членам праўлення публічнай бібліятэкі, якая размяшчалася на вул. Маставой у доме Маруга[14]. Сродкі гэтай першай у губерні народнай бібліятэкі, якія складаліся з «... членскіх узносаў, платы з падпісчыкаў і дабрачынных ахвяр грошай, кніжак і перыядычных выданняў ад розных рэдакцый і прыватных асоб, а з 1877 г. прыбаўкаю штогадовай субсідыі ў памеры 800 руб. ... » былі ўсе ж «не асабліва значнымі»[15]. І таму членам яе праўлення, у тым ліку асабіста Адаму Ягоравічу, прыходзілася затрачваць многа часу і энергіі, каб забяспечыць яе нармальную дзейнасць.

Адначасова з службовымі і грамадскімі абавязкамі, клопатамі пра сямʼю А. Багдановіча вядзе ў Гродна вялікую даследчую працу, распачатую яшчэ ў семінарскія гады, многа і настойліва займаецца беларускім фальклорам і этнаграфіяй, і гэта не выпадкова.

У другой палове мінулага стагоддзя, асабліва ў апошняй яго чвэрці, у літаратурных і навуковых колах Расійскай імперыі і за яе межамі ўзнікае незвычайны інтарэс да Беларусі, яе гісторыі і этнаграфіі. У гэтым адбілася магчыма, у першую чаргу тое, што паўстаннямі 1831 і асабліва 1863 гадоў Беларусь звярнула на сябе ўвагу рускай і польскай грамадскасці. Для нацыяналістычна настроеных колаў польскай інтэлігенцыі, што марылі пра Польшчу ў межах 1772 г., яна працягвала заставацца польскай правінцыяй, сілаю адабранаю Расіяй. Для афіцыйных урадавых колаў Расіі і вялікадзяржаўнай рускай інтэлігенцыі гэта была «Исконна руская тэрыторыя». Кожны з бакоў імкнуўся прывесці аргументы для пацвярджэння сваёй пазіцыі.

Даследаванні ў галіне этнаграфіі і фальклору ў тых канкрэтных гістарычных умовах набывалі для А. Я. Багдановіча выключна важнае грамадскае значэнне. Ён многа піша і друкуецца, як у мясцовым друку, так і ў акадэмічных выданнях, змяшчае артыкулы, рэцэнзіі, гістарычныя творы і пераклады. У 1894 г. выдаў спачатку часткамі ў «Гродзенскіх ведамасцях», а затым самастойным выданнем гістарычны нарыс «Пра паншчыну»[16].

На тытульным лісце гэтай кніжкі стаіць аўтограф А. Я. Багдановіча: «Многапаважанаму Яўстафію Філарэтавічу Арлоўскаму ад аўтара». Гэта — вядомаму гродзенскаму гісторыку дакастрычніцкага перыяду Арлоўскаму, свайму паплечніку па грамадскай дзейнасці.

У гэтым нарысе Адам Ягоравіч расказвае, якім ганебным і бесчалавечным было самаваольства ўсялякіх «прыганятых», якой бяспраўнай была асоба беларускага селяніна ў часы прыгоннага права.

Чаму аўтар звярнуўся да гэтай тэмы? Пра жудасныя карціны прыгоннага рабства і да Багдановіча было напісана ўжо нямала. Ці не таму, што, як піша аўтар «.. у некаторай частцы нашага грамадства, цяркулюе думка, што сяляне ледзь не шкадуюць пра падзенне прыгоннага права, пра знішчэнне «папячыцельнай улады памешчыка». Нічога не можа быць больш памылковым гэтай думкі. Праўда, зрэдку сустракаюцца «старога веку крэмні» — дварэцкія з прыгонных, войты, ціуны, эканомы і другія «халопы прымерныя», на якіх параўнальна лёгка адзываўся прыгонны гнёт, якія самыя прыгняталі другіх... Яны схільны бачыць у мінуўшым «склад ды лад», а ў новых умовах «адзін разврат». Але ці можна, не пярэчачы цвярозаму сэнсу, так шырока абагульняць гэтыя адзіныя, выключныя погляды, распаўсюджваць іх на ўсё сялянства і выдаваць іх за сапраўды народныя думкі»[17].

Разважанні аўтара актуальныя ў чымсьці і для нашага грамадства, якое не паспела яшчэ, як след, вызваліцца ад таталітарнага рабства, як ужо чуюцца галасы, што нібыта пры ім жыць было лепш і сытней.

Талент А. Я. Багдановіча, як даследчыка, з найбольш выразнай сілай праявіўся ў манаграфіі «Перажыткі старажытнага светласузірання ў беларусаў», выдадзенай у Гродне ў 1895 г. У гэтай працы былі падняты такія вострыя пытанні сацыяльнага жыцця беларускага народа, пададзены такі багаты фактычны матэрыял і зроблена такое глыбокае яго навуковае асвятленне, што яна набыла шырокі рэзананс, яе аўтар стаў вядомы далёка за межамі Беларусі, на яго пачалі ўскладваць вялікія надзеі буйныя вучоныя свету.

Аднак лёс далейшых навуковых даследаванняў А. Багдановіча быў трагічным. Асноўная яго праца — двухтомная манаграфія «Мова зямлі» і напісаны на яе тэарэтычнай аснове ў 30-я гаыд нашага стагоддзя «Этнічны склад народаў славянскіх і рускіх» у 2-х тамах — нягледзячы на абяцанні савецкіх чыноўнікаў, так і засталася ў рукапісах.

У 1896 г. А. Я. Багдановіч пераехаў на працу ў Ніжні Ноўгарад. Закончыўся гродзенскі перыяд яго жыцця, грамадскай і навуковай дзейнасці. Быў ён для Адама Ягоравіча і шчаслівым, і разам з тым трагічным. Трагічным — таму, што тут памёрла і засталася ляжаць у гродзенскай зямлі яго любая жонка. Шчаслівым — таму, што тут выходзілі яго кнігі, нараджаліся дзеці, у якіх ён, жывучы далёка ад роднай зямлі, выхаваў такую вялікую любоў да Бацькаўшчыны, да роднай мовы, да творчасці на беларускай мове, што адзін з яго сыноў — Максім — стаў вялікім нацыянальным паэтам Беларусі.

[1] Памятная книжка Гродненской губернии на 1892 г., Гродна, 1892. С. 232.

[2] Тамсама на 1896 г. С. 208.

[3] Тамсама на 1897 г. С. 239.

[4] Тэкст гэтай дошкі не адпавядае храналагічным фактам, бо на ёй напісана, што быццам бы там жыў Максім Багдановіч у 1892—1896 гг.

[5] Памятная книжка Гродненской губернии на 1896 г. Гродна, 1895. С. 60.

[6] Тамсама на 1897 г., Гродна, 1896. С. 67.

[7] Тамсама на 1894 г., Гродна, 1893. С. 39.

[8] Брокгауз Ф., Ефрон И. Энциклопедический словарь. Т. 16а. С. 728.

[9] ЦДГА Беларусі ў Гродне. Ф. І. Воп. 18. Спр. 221, А. 3.

[10] ЦДГА Беларусі ў Гродне. Ф. І. Воп. 18. Спр. 221. А. 1.

[11] ЦДГА Беларусі ў Гродне. Ф. 29. Воп. 1. Спр. 10.

[12] Тамсама. А. 43.

[13] Тамсама. А. 42.

[14] ЦДГА Беларусі ў Гродне. Ф. І. Воп. 9. Спр. 554. А. 262.

[15] Памятная книжка Гродненской губернии на 1894 г., Гродна, 1893. С. 30.

[16] Про панщину: Рассказ из белорусской жизни времён крепостного права А. Багдановіча. Гродна: Типография губернскго правления, 1894. С. 31.

[17] Про панщину. 1894 г. С. 3.

Яўген Мікула
(Мінск)

АРКАДЗЬ СМОЛІЧ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

У гісторыі Беларусі былі людзі, якія пакінулі вялікі след у нацыянальным руху, навукова-асветніцкай дзейнасці. Адной з такіх асоб з ´яўляецца Аркадзь Антонавіч Смоліч. У 20-я гады ён быў намеснікам дырэктара інстытута Беларускай культуры (Інбелкульта), галоўным рэдактарам выдавецтва Інбелкульту, адным з першых акадэмікаў АН БССР. Яму належыць шэраг навуковых прац, з якіх найбольш вядомай з ´яўляецца «Геаграфія Беларусі». Смоліч таксама аўтар такіх прац, як «Эканамічнае палажэнне Беларусі перад вайной», «Арганізацыя сялянскай гаспадаркі ў раёнах Цэнтральнай Беларусі», «Сялянства Заходняй Беларусі» і інш. На жаль, ужо ў пачатку 30-х гадоў вучоны быў беспадстаўна асуджаны, а ў канцы 30-х гадоў закатаваны.

Па волі лёсу дзейнасць А. А. Смоліча мела дачыненне да Гродзеншчыны, дзе ён жыў і працаваў у 1920 г. Чытачу было б цікава ведаць аб гэтай практычна невядомай старонцы яго жыцця, тым больш што лёс вучонага да нядаўняга часу замоўчваўся ў літаратуры па палітычных матывах.

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі мелі розны ўплыў на вялікае кола людзей. Уцекачы, пакінутыя хаты, забітыя людзі — ўсё гэта вынікі першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, розных акупацыяў.

Але людзі жылі, займаліся вырашэннем сваіх праблемаў, а некаторыя з іх нават працягвалі тварыць у гэтыя цяжкія часы. Такім чалавекам быў і А. А. Смоліч. У канцы 1917 — пачатку 1918 гг. (да нямецкай акупацыі) ён працаваў у Мінску земскім статыстыкам і намеснікам кіраўніка статыстычнага аддзелу Мінскага губернскага земства. Адсутнасць умоў для навуковай дзейнасці падчас акупацыі ў 1918 г. прымусілі яго пакінуць службу і пачаць спачатку працу ў кааперацыі, а потым заняцца выкладаннем геаграфіі на курсах беларусазнаўства і настаўніцкіх курсах у Мінску. Да гэтага часу цалкам вызначылася сфера навуковых інтарэсаў Смоліча. Марай яго жыцця стала жаданне напісаць вялікую навуковую працу «Геаграфія Беларусі». Але тагачасныя ўмовы Мінску такой магчымасці не стваралі. Тады ў 1920 г., ужо ў перыяд польскай акупацыі Смоліч разам з жонкай — Аляксандрай Ігнатаўнай (у дзявоцтве Каткоўская) і маленькай дачкой пераязджае ў Гродна. Старэйшага сына Максіма ён пакінуў з бацькамі жонкі ў Мінску[1]. Тут, у Заходняй Беларусі, праходзіла канчатковая апрацоўка і падрыхтоўка яго кнігі да друку.

Але палітыка ўмешвалася ў асабістае жыццё, перашкаджаючы навукоўцу ў яго працы. Ваенныя падзеі 1920 г.,, паход на Варшаву прымусілі палякаў адступіць за Віслу. У Гродна вайшлі аддзелы Чырвонай Арміі. Пасля гэтых падзей у горадзе сталі хутка ствараццa дзяржаўныя структуры новай улады.

Найбольш важнай з іх стаў Гродзенскі Ваенна-Рэвалюцыйны камітэт, на чале якога з ліпеня 1920 г. быў вядомы на Беларусі палітычны дзеяч Адам Славінскі (пазней нарком земляробства БССР).

Нягледзячы на шматлікія цяжкасці, унутры ВРК сталі стварацца розныя аддзелы. Адным з найбольш адказных быў зямельны аддзел. На працу ў яго ў жніўні 1920 г. быў запрошаны А. А. Смоліч. У аддзеле існаваў шэраг пададдзелаў: агульны, лясны, статыстычны. Смоліч кіраваў найбольш блізкім яму агранамічным пададдзелам. Жыццё патрабавала ад навукоўца неяк забяспечыць сям´ю. Таму ён і пайшоў на дзяржаўную службу, якая давала нейкі мінімум сродкаў для існавання. Тым больш, што гэтая служба пэўным чынам мела дачыненне да яго навуковых інтарэсаў.

Праца пачыналася ў цяжкіх умовах. Фактычна ў складзе пададдзелу былі толькі загадчык і перапісчыца — Ядвіга — Люцыя Валяр´янаўна Стафанская. Першыя дні працы былі аддадзены пошукам матэрыялаў і звестак аб Гродзенскім павеце. Потым складзены план арганізацыі пададдзела. Працу праводзілі па трох напрамках: кіраванне савецкімі гаспадаркамі, агранамічная дапамога і прапаганда, арганізацыя сельскагаспадарчай кааперацыі. У адпаведнасці з кірункамі працы ствараліся тры падобныя секцыі[2].

З 6 жніўня 1920 г. А. Смоліч стаў праводзіць набор спецыялістаў, якія былі патрэбны як інструктары савецкіх гаспадаркаў, інструктары па сельскагаспадарчых машынах і іншыя спецыялісты. Праблем было шмат: не хапала сродкаў для працы пададдзела, не было навуковых і даведачных матэрыялаў наконт павету, беднай была канцылярыя аддзелу.

Паступова пададдзел пачаў абрастаць людзьмі. Супрацоўнікамі Аркадзя Антонавіча сталі новы кіраўнік зямельнага аддзелу К. Шабянкоў, інструктар сельскагаспадарчых машын Сігізмунд Уладзіслававіч Будкевіч, інструктары па сельскай гаспадарцы Вацлаў Міхасевіч Шумкоўскі і Міхась Антонавіч Шумкоўскі і інш.[3]

Аб дзейнасці Смоліча ў гэты час няма амаль ніякіх дакументаў. Аўтару пашчасціла толькі адшукаць цыркуляр «Усім валземаддзелам Гродзенскага павету аб правядзенні ў 3-дзённы тэрмін уліку і мабілізацыі ўсіх коней і валоў, якія знаходзіліся ў воласці». Гэты дакумент разам са Смолічам падпісалі кіраўнік зямельнага аддзелу К. Шабянкоў і сакратар Астроўскі. Мабілізацыя, аб якой ідзе гаворка ў цыркуляры, праводзілася з мэтай апрацоўкі палёў пад азімыя пасевы. Як вынікае з дакументу, Смолічу ў тагачасных умовах прыходзілася карыстацца адміністрацыйнымі мерамі[4].

Акрамя працы ў пададдзеле Смоліч займаўся асветніцкай дзейнасцю ў горадзе: арганізацыяй агранамічных курсаў, чытанняў, пастаноўкай калектыўных доследаў, лектарскай працай. Апошняя была найбольш блізкая яму. Навуковец з´яўляўся афіцыйным лектарам на курсах падрыхтоўкі настаўнікаў для беларускіх школаў. Тэматыка яго лекцыяў была шматбаковая: «Аб камуне і арцелі», «Аб грамадскай апрацоўцы зямлі», «Аб сельскагаспадарчай кааперацыі» і інш. Таксама Смоліч чытаў лекцыі па эканамічнай геаграфіі на рабочых курсах разам з Аннай Мейхаловіч і ў т. зв. Народным універсітэце ў Гродне. Пэўную дапамогу аказаў А. А. Смоліч гарадской бібліятэце, працуючы складаючы спіс кнігаў па агранаміі[5].

Але галоўнаю мэтай яго навуковых інтарэсаў засталася канчатковая апрацоўка і выданне манаграфіі «Геаграфія Беларусі», працу над якой Смоліч пачаў у Менску, у хаце Кантаровіча ў 1918 г. Перапрацаванае выданне кнігі выйшла ў 1922 г. як падручнік і была прададзена выдаўцом Клёцкіным галоўным чынам для школаў БССР[6].

Знакаміты «цуд на Вісле» меў вынікам між іншым адыход Чырвонай Арміі з Гродна эвакуіраваўся ў Віцебск і апарат Гродзенскага ВРК. Смолічу з сям ёй не ўдалося выехаць, відаць, таму што ў гэты час захварэла дызентырыяй дачка. Пражыўшы яшчэ нейкі час у Гродне, Аркадзь Антонавіч разам з блізкімі пераязджае ў Вільню, дзе працуе тэхнічным кіраўніком Беларускага выдавецкага таварыства. У Беларусь ён вярнуўся толькі ў жніўні 1922 г., атрымаўшы дазвол уладаў на пераезд. Пачынаўся новы этап яго жыцця. Але гродзенскі вопыт спатрэбіўся навукоўцу ў яго новай, практычнай працы ў Наркамаце земляробства БССР.

[1] Архіў КДБ Беларусі, с. 20—951-с, т. 29, л. 384, 385.

[2] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, ф. 689, воп. 1, с. 52, л. 10, 11.

[3] Там жа, л. 87; с. 42, л. 82.

[4] Там жа, с. 42, л. 82.

[5] Там жа, с. 50, л. 3, 5, 21.

[6] Архіў КДБ Беларусі, с. 20—951-с, т. 29, л. 385—386.

КРЫНІЦЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

Табліца «ДЫНАМІКА КОЛЬКАСЦІ ЕЗУІТАЎ ГРОДЗЕНСКАЙ КАЛЕГІІ ЗА 1623/24—1773/74 гг.» складзена на падставе езуіцкіх каталогаў, якія захоўваюцца ў Рымскім архіве ордэна (Archivum Romanum Societatis jesu). Яны выдаваліся штогод па правінцыях і прызначаліся выключна для службовага карыстання кіраўніцтва «Ордэна Ісуса». Калі ў табліцы адсутнічаюць дадзеныя за асобныя гады, гэта значыць, што ў сілу якіх-небудзь сур´ёзных аб´ектыўных прычын каталогі не былі апублікаваны.

Умоўныя абазначэнні: А — айцец (ксендз), М — магістр, Б — брат, С — схаласты.

Гады	АА	ММ	ББ	СС	Усяго
1623/24	5	—	2	—	7
1624/25	—	—	—	—	—
1625/26	5	1	3	—	9
1626/27	7	2	3	—	12
1627/28	6	—	6	—	12
1628/29	6	1	5	—	12
1629/30	7	1	4	—	12
1630/31	6	2	4	—	12
1631/32	6	2	3	—	11
1632/33	6	2	5	—	13
1633/34	4	2	5	—	11
1634/35	6	2	6	—	14
1635/36	—	—	—	—	—
1636/37	8	—	6	—	14
1637/38	—	—	—	—	—
1638/39	6	3	6	—	15
1639/40	—	—	—	—	—
1640/41	—	—	—	—	—
1641/42	7	2	5	—	14
1642/43	8	2	6	—	16
1643/44	8	2	5	—	15
1644/45	10	2	—	—	12
1645/46	11	2	6	—	19
1646/47	9	1	6	—	16
1647/48	5	3	5	—	13
1648/49	8	2	7	—	17
1649/50	8	2	3	—	13
1650/51	—	—	—	—	—
1651/52	—	—	—	—	—
1652/53	—	—	—	—	—
1653/54	—	—	—	—	—
1654/55	11	2	8	—	21
1655/56	—	—	—	—	—
1656/57	—	—	—	—	—
1657/58	—	—	—	—	—

Гады	АА	ММ	ББ	СС	Усяго
1658/59	6	—	5	—	11
1659/60	5	—	4	—	9
1660/61	3	—	3	—	6
1661/62	7	1	2	—	10
1662/63	—	—	—	—	—
1663/64	11	—	1	—	12
1664/65	9	1	—	—	10
1665/66	8	2	3	—	13
1666/67	8	2	3	—	13
1667/68	9	1	2	—	12
1668/69	7	2	4	—	13
1669/70	6	2	4	—	12
1670/71	7	1	4	—	12
1671/72	8	3	5	—	16
1672/73	8	3	5	—	16
1673/74	8	4	6	—	18
1674/75	7	4	5	—	16
1675/76	6	4	6	—	16
1676/77	5	5	6	—	16
1677/78	5	5	6	—	16
1678/79	6	5	8	—	19
1679/80	7	4	7	—	18
1680/81	8	4	7	—	19
1681/82	10	3	9	—	22
1682/83	10	4	9	—	23
1683/84	10	4	8	—	22
1684/85	10	3	9	7	29
1685/86	9	3	8	—	20
1686/87	9	3	8	—	20
1687/88	7	5	11	—	23
1688/89	10	4	9	—	23
1689/90	11	3	8	—	22
1690/91	11	3	7	—	21
1691/92	11	3	7	—	21
1692/93	11	3	9	—	23
1693/94	12	3	9	—	24
1694/95	12	3	9	—	24
1695/96	11	3	8	—	22
1696/97	11	3	9	—	23
1697/98	12	3	9	—	24
1698/99	12	4	9	—	25
1699/1700	12	4	9	—	25
1700/1	15	3	10	—	28
1701/2	13	3	10	5	31

Гады	АА	ММ	ББ	СС	Усяго
1702/3	11	3	9	2	23
1703/4	13	4	8	—	25
1704/5	16	3	6	8	33
1705/6	13	4	7	—	24
1706/7	11	4	7	—	22
1707/8	16	3	6	5	30
1708/9	13	2	9	—	24
1709/10	15	3	9	6	33
1710/11	12	3	7	6	28
1711/12	10	3	6	6	25
1712/13	—	—	—	—	—
1713/14	10	3	8	5	26
1714/15	10	2	9	5	26
1715/16	11	3	8	6	28
1716/17	12	3	10	7	32
1717/18	11	3	9	6	29
1718/19	10	3	10	7	30
1719/20	9	3	12	7	31
1720/21	11	3	13	7	34
1721/22	13	3	13	6	35
1722/23	12	3	14	6	35
1723/24	13	3	11	6	33
1724/25	12	3	12	8	35
1725/26	12	5	12	8	37
1726/27	12	4	12	8	36
1727/28	12	3	13	8	36
1728/29	12	3	15	8	38
1729/30	12	4	14	8	38
1730/31	12	3	14	7	36
1731/32	11	3	15	8	37
1732/33	13	3	15	8	39
1733/34	13	4	16	6	39
1734/35	11	3	15	6	35
1735/36	12	2	13	6	33
1736/37	12	2	12	—	26
1737/38	13	2	11	5	31
1738/39	13	3	13	6	35
1739/40	14	4	13	6	37
1740/41	14	3	16	6	39
1741/42	12	3	14	7	36
1742/43	12	3	15	7	37
1743/44	12	1	12	—	25
1744/45	13	2	15	4	34
1745/46	11	3	15	5	34

Гады	АА	ММ	ББ	СС	Усяго
1746/47	13	5	10	5	33
1747/48	14	5	9	5	33
1748/49	17	5	7	6	35
1749/50	17	5	9	7	38
1750/51	22	3	11	6	41
1751/52	23	5	13	4	45
1752/53	22	4	12	4	42
1753/54	22	3	10	—	35
1754/55	21	5	9	—	35
1755/56	—	—	—	—	—
1756/57	23	4	6	—	33
1757/58	25	2	7	—	34
1758/59	—	—	—	—	—
1759/60	23	3	12	—	38
1760/61	—	—	—	—	—
1761/62	—	—	—	—	—
1762/63	—	—	—	—	—
1763/64	15	4	10	8	37
1764/65	—	—	—	—	—
1765/66	—	—	—	—	—
1766/67	16	4	12	6	38
1767/68	15	4	12	8	39
1768/69	18	6	10	9	43
1769/70	9	4	11	12	36
1770/71	12	3	10	12	37
1771/72	14	3	11	13	41
1772/73	15	2	9	11	37
1773/74	17	2	9	14	42

Табліцу склала і падрыхтавала да друку Блінова Тамара.

АСАБОВЫ СКЛАД ГРОДЗЕНСКАЙ ЕЗУІЦКАЙ КАЛЕГІІ У 1727/28—1730/31 гг.

Гродзенская калегія 1727/28

a. Юзаф Бімбак — рэктар калегіі з 3 красавіка 1725 г.
a. Казімір Багуцкі — міністр, прэфект касцёла і бурсы, прэфект дома, духоўны настаўнік
a. Антоні Трапянскі — прафесар рыторыкі.
a. Афанасі Керсніцкі — прэфект духоўны і вышэйшай школы, хатні духаўнік.
a. Казімір Ланг — прафесар логікі, духаўнік, сачыў за санітарным станам памяшканняў.
a. Уладзіслаў Каштэля — місіянер у Дэмброва.
a. Мацвей Каўнацкі — радны рэктара, духоўны настаўнік.
a. Пётр Скацкевіч — капелан двара.
a. Стэфан Гінтыла — прапаведнік, прэфект пачатковых класаў школы, духаўнік.
a. Стэфан Кастроўскі — духоўны настаўнік.

Магістры

a. Казімір Вежбіцкі — прафесар паэзіі.
a. Іаан Зуб — прафесар інфімы.
a. Пётр Трачкоўскі — прафесар сінтаксісу і граматыкі.

Схаласты па філасофіі

Андрэй Грабоўскі, Андрэй Ярашэвіч, Дамасій Мархоцкі, Іаан Хартман, Іаан Станішэўскі.

Браты

Антоні Багдановіч — сябра пракуратара далёкіх маёнткаў.
Францыск Срэбніцкі — хворы.
Якуб Руоф — прэфект па будаўніцтве і фабрыцы.
Ігнацы Хермілер — млынар і агароднік.
Іаан Карпіньскі — пракуратар далёкіх маёнткаў.
Мацвей Памезаньскі — сябра прэфекта бурсы.
Пётр Сірановіч — наглядае за хворымі.
Стэфан Бажыньскі — вартаўнік.
Тамаш Бялы — прэфект сям ′і, Панямоні.
Тамаш Грымскі — аптэкар.
Тамаш Медушэўскі — пракуратар блізкіх маёнткаў.

Мерацкая місія

а. Станіслаў Гінят — першы місіянер.
а. Станіслаў Азарыч — другі місіянер, прафесар школы.
Францішак Чыжэўскі — пракуратар дома.
1. (ARSI) — Lith 59. Dispositio personarum provinciae Litvanae Societatis jesu. Anni 1727 i annum 1728.

Гродзенская калегія ў 1728/29 гг.

А. Канстантын Каміньскі — рэктар з 4 мая 1728 г.
а. Станіслаў Гініят — міністр, прэфект касцёла, пракуратар дома, духоўны настаўнік.
а. Казімір Ланг — прафесар філасофіі, адказны за санітарны стан памяшканняў, духаўнік.
а. Францішак Пішчаньскі — прафесар рыторыкі.
а. Георг Вольскі — місіянер дворскі.
а. Ігнацы Хжаноўскі — духоўны айцец, суперыёр, хатні духаўнік.
а. Мацвей Каўнацкі — першы радца рэктара, духоўны настаўнік.
а. Стэфан Гінтыла — радца рэктара, прэфект ніжэйшых класаў і бурсы, духаўнік.

Магістры

м. Антоні Ленчэўскі — прафесар інфімы.
м. Іасафат Касцялкоўскі — прафесар паэзіі.
м. Пётр Трачкоўскі — прафесар сінтаксісу і граматыкі.
(Склад братоў амаль без змен).

Місія ў Дэмбраве

а. Уладзіслаў Каштэля — першы місіянер.
а. Стэфан Кастроўскі — другі місіянер.

Місія ў Мерычы

а. Валянцін Калачынскі — першы місіянер.
а. Францішак Даргевіч — другі місіянер.
Францішак Чыжэўскі — пракуратар дома і маёнтка.

Гродзенская калегія ў 1729/30 гг.

а. Канстанты Каміньскі — рэктар з 4 мая 1728 г.
а. Станіслаў Гініят — міністр, прэфект касцёла, пракуратар дома, духоўны настаўнік.
а. Адальберт Мазуркевіч — духоўны айцец, прэфект вышэйшых класаў школы, хатні прапаведнік, духаўнік.
а. Казімір Ланг — прафесар філасофіі, адказны за санітарны стан памяшканняў, духаўнік.

а. Францыск Калантай — радца рэктара, прэфект ніжэйшых класаў і бібліятэкі, духаўнік.
а. Георг Вольскі — місіянер у Дэмбраве.
а. Павел Стрыеньскі — прафесар этыкі, духоўны настаўнік.
а. Стэфан Кастроўскі — духоўны настаўнік.

Магістры

м. Якуб Петкевіч — прафесар сінтаксісу і граматыкі.
м. Юзаф Завіслоўскі — прафесар інфімы.
м. Пётр Трачкоўскі — прафесар паэзіі.

Місія ў Мерычы

а. Валянцін Калачынскі — першы місіянер.
а. Іаан Лукашэвіч.
м. Дамінік Мацылевіч — прафесар ніжэйшых класаў.
Казімір Чыжэўскі — пракуратар дома і маёнткаў.

Гродзенская калегія ў 1730/31 гг.

а. Станіслаў Каміньскі — рэктар з 4 мая 1728 г.
а. Станіслаў Гініят — міністр, прэфект касцёла і бурсы, пракуратар дома, духоўны настаўнік.
а. Антоні Чарнеўскі — хатні прапаведнік, экстраардынарны радца рэктара, духаўнік.
а. Казімір Ланг — духоўны айцец, прэфект вышэйшых класаў, духаўнік.
а. Францыск Дромлер — прафесар філасофіі, адказны за санітарны стан памяшканняў, духаўнік.
а. Георг Вольскі — місіянер дворскі.
а. Юзаф Ляўновіч — прафесар рыторыкі.
а. Уладзіслаў Кастроўскі — духоўны настаўнік.

Магістры

м. Андрэй Ярашэвіч — прафесар інфімы.
м. Дамалі Мархоцкі — прафесар паэзіі.
м. Юзаф Завілтоўскі — прафесар сінтаксісу і граматыкі.

Місія ў Мерычы

а. Валянцін Калачынскі — першы місіянер.
а. Іаан Шалоўскі — другі місіянер.
Антоні Прашынскі — пракуратар дома і маёнткаў.

Матэрыялы пераклала з латыні і падрыхтавала да друку Тамара Блінова.

ТЫТУНЁВАЯ ФАБРЫКА Ў ГРОДНЕ

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь у Гродне з ´яўляецца найбагацейшым сховішчам пісьмовых крыніц па гісторыі Гродзеншчыны. Значнае месца сярод іх займаюць дакументы, якія асвятляюць эканамічны стан губерні, развіццё прамысловасці. Напрыклад, архіўныя дакументы даюць магчымасць прасачыць гісторыю аднаго з буйных прамысловых прадпрыемстваў Беларусі — Гродзенскай тытунёвай фабрыкі. Яна была заснавана ў 60-х гадах 19 стагоддзя як невялікая майстэрня, якая ў 90-х гадах ператварылася ў буйную фабрыку. Архіўныя крыніцы даюць супярэчлівыя даты пра адчыненне яе.

17 ліпеня 1861 г. у Гродзенскім губернскім праўленні разбіралася прашэнне купца Абрама Гардона і Лейбы Шарашэўскага аб дазволе адчыніць у Гродне тытунёвую фабрыку. Лейба Шарашэўскі не меў купецкіх правоў, таму дазвол быў дадзены купцу Абраму Гардону. У рапарце гродзенскаму губернатару за 25 красавіка 1900 г. гродзенскі паліцмайстар называе 1859 г. датай адчынення фабрыкі, але ў ведамасцях яе ўладальнікаў за 1886 і 1892 гг. вызначаны 1862 г. У 60-х гадах прадпрыемства мясцілася ў памяшканні фабрычнай суполкі, у 70 г.— на Саборнай вуліцы, з 1878 г.— у памяшканні па вуліцы Маставой.

Фабрыка вырабляла курыльны і нюхальны тытунь, папяросы, цыгары, махорку. У 1867 г. было зроблена 200 цыгараў і 100 пудоў тытуню, абарот складаў ад 1.152 да 7.356 рублёў. У 1886 г. абарот фабрыкі быў ужо 460 тыс. рублёў, дзейнічалі 2 паравыя машыны. Сыравінай з ´яўляліся замежны тытунь, рускі тытунь вышэйшага гатунку, махорка. Збыт прадукцыі ажыццяўляўся па ўсёй дзяржаве і таксама за яе межы.

З 1907 г. тытунёвая фабрыка ператворана ў акцыянернае таварыства, гадавая прадукцыйнасць фабрыкі за гэты час перавышала 4 млн. рублёў.

Фабрыка Шарашэўскага была буйным прадпрыемствам і па колькасці рабочых, прычым пераважала жаночая праца, выкарыстоўвалася і дзіцячая праца. Напрыклад, у 1892 г. на фабрыцы працавалі 1.475 рабочых, з іх: 400 мужчынаў, 900 жанчынаў, 175 дзяцей. У 1900 г. з 1.442 рабочых працавала 1.114 жанчынаў. Пры фабрыцы існавала вучылішча для маленькіх дзяўчынак, у якім навучалі прафесіі будучых работніцаў. Меліся доктар і фельчар. Акты аглядаў фабрыкі старшым фабрычным інспектарам у 1885—1895 гг. сведчаць аб яе антысанітарным стане, адсутнасці вентыляцыі.

Прамысловы крызіс с пачатку 20 стагоддзя напаткаў таксама і фабрыку. Былі звольнены 64 рабочыя.

Прапанаваная падборка дакументаў ЦДГА ў Гродне дапаможа лепш пазнаць гісторыю свайго роднага краю.

Падрыхтавана дырэктарам архіва. Батраковай К. П.

1892 г.— Ведамасць аб стане тытунёвай фабрыкі купца І. Шарашэўскага.

Назва вырабаў

1. Назва вырабаў	Колькасць вырабаў лікамі ці вагою	На суму
Тытуню курыльнага	5950 пар.	84.000 р.
Цыгараў	12940000 шт.	78.000 р.
Папяросаў	167000000 шт.	235.000 р.
Махоркі і нюхальнага тытуню	76400 пуд.	230.000 р.
	Разам:	**627.000 р.**

2. Пра дзейную сілу на фабрыцы ці заводзе

	Лік	Колькі конскіх сілаў
Паравых машынаў	2	20
пры іх паравых лакамабіляў		
Вадзяных рухавікоў		
Ветраных		
Конных		

3. Пра майстроў

	Дарослыя		Малалетнія да 15 гадоў	
	мужч. полу	жан. полу	муж. полу	жан. полу
а) Сярэдняя колькасць рабочых у тым ліку	400	900	25	150
Хто працуе на фабрыцы ці заводзе				
Хто працуе ў іншым месцы	Усе працуюць толькі на фабрыцы			
б) Калі колькасць рабочых змяняецца па порах года, то ў якія месяцы бывае найбольшая і найменьшая іх лічба	Не змяняецца			
в) Ці жывуць рабочыя ў будынках фабрыкі альбо ў іншых месцах арцелямі	На фабрыцы не жывуць Арцеляў няма			
г) Памер зарабатнай платы (у дзень ці ў месяц)	Ад 5 руб. да 50 руб. у месяц			
д) Колькі рабочых гадзін у дзень	Для дарослых — 10 гадз. Для малалетніх — 8 гадз.			

4. Колькасць выканаўчых механізмаў і апаратаў (паводле роду вытворчасці: варацёнаў, станкоў, варштакоў, горнаў, вагранак, кубаў, чанаў, плаўных печаў і т. п.)	25 крышыльных станкоў, 29 ступ для таўчэння нюхальнага тытуню, 1 вальцоўка, 3 жорнаў і 2 паперарэзальныя машыны
5. Колькі на працягу года ідзе на вытворчасць матэрыялу, сырых і паўапрацаваных, менавіта якіх — рускага ці замежнага паходжання?	Замежнага тытуню — 750 пудоў Рускага тытуню вышэйшага гатунку — 16 000 пудоў Рускай махоркі і бакуну — 73 000 пудоў
6. Дзе збываюцца вырабы?	Па ўсёй Расіі
7. Колькі ідзе ў год паліва: дроў, вугалю ці торфу і на якую суму?	450 сажаняў дроў
8. У якіх будынках — мураваных ці драўляных	У мураваных
9. Вытворчасць ідзе круглы год, а калі не, то з якога і да якога месяца?	Круглы год
10. Асоба ці асобы (колькі іменна), загадчыкі вытворчасці ці рускія падданыя ці чужаземцы, атрымалі агульную ці тэхнічную адукацыю і дзе?	Рускія падданыя. Адукацыя хатняя.
11. Ці ёсць пры мануфактуры, фабрыцы ці заводзе вучылішча або навучальныя класы, бальніца, ашчадная каса і інш. установы? Калі ёсць, даць пра іх кароткія звесткі.	Ёсць вучылішча для 100 малалетніх дзяўчынак. Ашчадная каса, доктар, фельшар, а таксама даюць рабочым усе медыкаменты па 10 кап. з рэцэпта
12. Год заснавання фабрыкі ці завода	З 1862

Подпіс уладальніка фабрыкі ці завода, арандатара ці ўпраўленца.
Прыстаў 2 часці гор. Гродна (подпіс)
Уладальнік фабрыкі І. Л. Шарашэўскі

ЦДГА ў Гродне, ф. 14, оп. 1, спр. 401, л. 159. Арыгінал. Рукапіс.

6 кастрычніка 1895 г.— Ведамасць Гродзенскага паліцмайстра аб колькасці рабочых на тытунёвай фабрыцы І. Шарашэўскага

С П І С

фабрыкаў і заводаў у горадзе Гродна, на якіх працуе не менш як 100 чалавек

№№	Назва фабрыкі ці завода	Колькі рабочых					
		дарослых		малалетак		Усяго	
		муж.	жан.	муж.	жан.	муж.	жан
1.	Тытунёвая фабрыка купца Еселя Шарашэўскага па Маставой вуліцы	311	1085	47	119	358	1204
						1562	

Паліцмайстар (подпіс нечытэльна)
Сакратар (подпіс нечытэльна)

ЦДГА ў г. Гродна, ф. 9, воп. 1, спр. 1576, л. 34. Арыгінал. Рукапіс.

1872 г.— Ведамасць аб стане тытунёвай фабрыкі Л. Шарашэўскага і А. Гардона

Назва вырабаў і іх цана	Колькі станкоў	За 1872 г. выраблена		Пра фабрычных рабочых
		колькі вырабаў	на суму	
Тытунь, сігары і папяросы ад 4 руб. 80 кап. да 80 руб. пуд з бандэролямі		2500	30000	На заводзе, акрамя ручных станкоў і кола, ніякіх іншых машынаў няма. Майстравых 10 і рабочых 20 чалавек з яўрэяў.
На фабрыцы ёсць 3 ручныя станкі для рэзання тытуню і таўчэння яго, ёсць кола, якое рухаецца конскаю сілай	4			

Асобныя звесткі

Для вырабу сігараў і папяросаў табак ідзе з Расіі з-за мяжы. Вырабы ідуць на ўсю імперыю. Фабрыка месціцца ў казённым доме спадчыннікаў Беркі Ранеса пры Саборнаў вуліцы...

Прыказчык купцоў Гардон і Шарашэўскага Арон Левін

ЦДГА ў г. Гродна, ф. 1, воп. 23, спр. 165, л. 306. Арыгінал. Рукапіс.

Янка Трацяк
(Гродна)

ПАЛЕТКУ НАШАГА АРАТЫ...

У грамадскім і палітычным жыцці Заходняй Беларусі і міжваенны час добра ведалі імя аднаго з самых актыўных дзеячаў беларускага адраджэння, ксяндза-беларуса Вінцэнта Гадлеўскага.

Не было той улады на Беларусі з 1917 года па 1942 год, якая не мела б прэтэнзій да смелых нацыянальных патрабаванняў гэтага рупліўцы беларускае справы: ці гаворка ішла пра вяртанне роднай мовы ў касцёлы, ці пра духоўнае адраджэнне народу, ці пра дзяржаўную незалежнасць...

Судовы працэс над ім і турма (1926 г.) паказалі, што народ не толькі ведае свайго ксяндза-беларуса, але і любіць яго. Вось што пісалі пра гэтыя падзеі газеты таго часу:

«1-га марта ў Віленскім Акружным Судзе распачаўся разгляд справы беларускага нацыянальнага дзеяча Кс. Гадлеўскага. Старшынстваў на судзе судзьдзя Овсянко, сталы старшыня ўсіх даразных судоў, канчаючыхся пераважна сьмяротнымі прысудамі. Баранілі ксяндза Гадлеўскага адвакаты паслы Сьмяроўскі і Лібэрман, абодва прадстаўнікі польскае радыкальнае дэмакратыі. Суд адбываўся пры зачыненых дзьвярох. У салю суда быў дапушчаны як «муж даверыя» падсуднага пасол кс. Станкевіч. З другога боку як «муж даверыя» пракуратуры быў дапушчаны ведамы «доктар» Павлюкевіч, які і сядзеў разам з начальствам дэфэнзывы і агентамі палітычнае паліцыі.

Разам з кс. Гадлеўскім судзілі і грам. Рагача. Абодвух вінавацілі ў «антыпанствовай» агітацыі — на карысьць незалежнасьці Беларусі і за адарваньне Зах. Беларусі ад Польшчы.

Суд закончыўся 2-га сакавіка ў 2 гадзіны папал абвяшчэньнем прыгавору, якім кс. Гадлеўскі прызнаны вінаватым у падбураньні людзей у прыватных гутарках да паўстаньня, да адарваньня Зах. Беларусі ад Польшчы і стварэньне незалежнае Беларусі. Абвінавачваньне, якое паўтараецца бадай у ва ўсіх палітычных працэсах беларускіх нацыянальных дзеячоў... За гэта кс. Гадлеўскага засудзілі на два гады крэпасьці. Грам. Рагач судом апраўданы.

Мы не ведаем, на падставе якіх даных і доказаў суд прыйшоў да перакананьня аб «праступнасьці» нацыянальнае працы кс. Гадлеўскага, які, як каталіцкі ксёндз, хіба ж ня мог агітаваць за паўстаньне, бо гэта нязгодна з духам каталіцкае царквы. Нам ведама толькі тое, што кс. Гадлеўскі вёў рашучую ўпартую барацьбу за правы беларускае мовы ў каталіцкім касьцёле і гаварыў казаньні па-беларуску..

... У судовым гмаху — перад дзьвярыма суда сабралася каля другой гадзіны да сотні прадстаўнікоў беларускага грамадзянства і моладзі — з кветкамі, каб прывітаць кс. Гадлеўскага. Убачыўшы кветкі і зразумеўшы, у чым справа, паліцыя выгнала ўсіх на вуліцу. Але тут — на вуліцы і Лукішскім

пляцу — чакала ўжо ня сотня, а колькі — тысячная грамада народу, зложаная з работнікаў, мяшчан і інтэлігенцыі, якія, даведаўшыся аб судзе, пасьпяшылі выказаць свой спогад нацыянальнаму барацьбіту.

Пешая і конная паліцыя прабавала разагнаць народ, але дарэмна: ніхто не крануўся з мейсца — усе чакалі выхаду кс. Гадлеўскага.

Урэшце засуджаны паказаўся ў дзьвярох суда. Тут яму былі пададзены кветкі, і, як ён пайшоў па Сьв-Юраўскім праспэкце (вул. Адама Міцкевіча) уся гэная таўпа рушыла сьледам за ім. Гэтак сам сабой стварыўся дэмастрацыйны паход, як першая ў Вільні чыста беларуская нацыянальная маніфэстацыя.

Агенты палітычнае паліцыі кідаліся да кс. Гадлеўскага з лаянкай і толькі прысутнасьць некалькіх беларускіх паслоў перашкодзіла горшым зьдзекам над засуджаным.

Усе патугі конных і пешых паліцыянтаў спыніць паход нічога не далі. Маніфэстанты прыйшлі ў поўным парадку і супакою праз увесь праспэкт і разышліся толькі тады, калі кс. Гадлеўскі сеў на возьніка і паехаў да сябе.

Як відаць, у «чыста польскай» Вільні ёсьць-такі глыбокія беларускія корані, якія так буйна выбіваюцца наверх, ня гледзячы на ўсю казённую польскасьць нашае адвечнае сталіцы...»[1]

У сувязі з гэтымі падзеямі газета «Беларуская крыніца» друкуе верш «Крывавы букет» заходнебеларускага паэта Фр. Грышкевіча, у якім паэт асуджае тых, хто кінуў змагара за краты (Чаму тады пракляты сьвет Так дзікім стаў?.. Чаму ласкавы Тварэц ня скрыў цябе з вачэй Садыстаў злосных... тых людзей?..) і выказвае сваю салідарнасьць і падтрымку засуджанаму (Прымі мянеі... Ты — ж родны мой![1]. Палетку нашага араты!..)[2].

З пашанай сустракалі В. Гадлеўскага ў Вільні, калі ён вяртаўся з вастрогу. «...На вакзале спаткала кс. Гадлеўскага Віленскае беларускае грамадзянства... ксяндзы Беларусы, беларускія паслы і іншыя дзеячы... Калі кс. Гадлеўскі выйшаў з вагону, беларускія жанчыны абсыпалі яго краскамі, а адна маладая вучаніца падала букет роз»[3].

Пасля вастрогу перад В. Гадлеўскім паўстала складаная задача выбару паміж змагаром за ідэі незалежнае Беларусі і святаром. «Паважаны Кс. Рэдактар[1],— піша Гадлеўскі рэдактару «Хрысьціянскай Думкі»*.— Не адмоўце памясьціць у вашай газэце некалькі слоў. Загад І. Е. Віленскага Арцыбіскупа з дн. 10.12.28 г. аб маім выхадзе з БХрД.** я споўніў таго-ж самага дня.

Гэтае пісьмо пасылаю ў рэдакцыю на жаданьне І. Е. Арцыбіскупа.

З пашанаю кс. В. Гадлеўскі.

Вільня, 10.01.29 г.»[4]

Гэты вымушаны выхад з БХД па сутнасці нічога не змяніў у жыцці В. Гадлеўскага. Ён, як і раней, рабіў сваю вялікую справу, якой даўно было вырашана прысвяціць сваё жыццё. У гэты час ён плённа працуе над перакладам Бібліі (Стары і Новы Закон). У 1930 годзе выходзіць яго кніга «Сьвятая гісторыя Старога Закону», у друку з´яўляюцца артыкулы, якія сведчаць аб тым, што Гадлеўскі не адмовіўся ад беларускіх нацыянальных ідэй. Вось колькі слоў з рэферата «Разьвіцьцё беларускае незалежнае думкі ад аўтаноміі да незалежнасьці», які кс. В. Гадлеўскі чытаў 25 сакавіка 1930 года ў Вільні з нагоды ўгодкаў абвяшчэньня БНР:

---

* «Хрысьціянская Думка» (1927—1939), рэд. і выд. быў Адам Станкевіч.

** БХр.Д (БХД) — партыя Беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў.

«Ад незалежнасьці да сёньняшняга дня 12 гадоў. Ішлі мы да гэтуль дарогаю палітычных здабыткаў, будавалі дом сваёй дзяржаўнай незалежнасьці разам з усімі народамі. Аднак зьдзейсьніць гэтую незалежнасьць нам да гэтуль не ўдалося, а не ўдалося затым, што ў сваёй дзейнасьці беларусы арыентаваліся на чужую помач, выглядалі ратунку з усходу або з захаду, а забываліся аб тым, што сапраўдная незалежнасьць не даецца, а бярэцца.

На далейшым шляху трэба нам паглыбляць сваю культуру і на ёй, як на моцным фундаменце, будаваць дом сваёй прышлай незалежнасьці. Трэба ўглядацца, каб наша палітыка не апераджала нашай культуры, але ішла поруч з ёю.

Трэба зьвярнуць большую ўвагу на гаспадарчыя справы і на шляху будаваць сваё эканамічнае жыцьцё. Без эканамічнага жыцьця, асабліва без сваіх кооператываў, народ слабы і ня здольны да будаваньня сваёй дзяржаўнасьці.

Урэшце будзем будаваць на народнай сьвядомасьці і волі.

Калі пойдзем па гэтаму шляху, то так, як дайшлі да Незалежнасьці de jure, дойдзем і да Незалежнасьці de facto...»[5]

Як бачым, гэтыя слушныя заўвагі і сёння не страцілі сваёй актуальнасці.

Калі ў 20-ыя гады дзейнасць кс. Вінцэнта Гадлеўскага можна ахарактарызаваць як дзейнасць беларускага святара, рупліўцы вяртання роднай мовы ў святыні, то ў 30—40-ыя гады гэта вялікі нацыянальна-палітычны дзеяч з яскрава выражаным радыкальна-нацыянальным характарам.

У 1936 годзе па яго ініцыятыве пачынае выходзіць газета «Беларускі Фронт». У склад рэдакцыі ўваходзіць інж. Л. Дубейкаўскі, мгр. Шкалёнак, рэд-выд. Папуцэвіч і мгр. кс. Гадлеўскі. Калі азнаёміцца з артыкулам «Прычыны нашага часапісу», то няцяжка здагадацца, што газета «Беларусі Фронт» была рупарам ідэй В. Гадлеўскага і яго аднадумцаў.

«Галоўнай нашай мэтай ёсьць вырабляць і паддзяржваць незалежніцкую лінію пасярод беларускага народу і гуртаваць каля сябе тых Беларусаў, якія дзержацца гэтае лініі з тым, каб даць адпор усякім чужацкім уплывам і арыентацыям...

І так закідвалі ўплывы камуністычныя, польскія, літоўскія, нямецкія — паводле гэтых уплываў дзялілі Беларусаў і азначалі ня толькі іх арыентацыю, але грамадзкую ідэалёгію і палітычнае імкненьне...

Нашае змаганьне — гэта будзе змаганьне беларускай ідэі з чужымі ідэямі, незалежнай ідэі з залежнымі ідэямі, беларускага фронту з чужацкімі фронтамі...»[6]

З 1939 года рэдактарам і выдаўцом «Беларускага фронту» стаў кс. В. Гадлеўскі. За яго рэдактарствам асобныя нумары газеты неаднаразова канфіскоўваліся польскімі ўладамі, а на галоўнага рэдактара заводзіліся судовыя справы, але, нягледзячы на гэта, часопісь да канца заставалася вернай сваім мэтам.

З прыходам немцаў кс. Вінцэнт Гадлеўскі працуе ў Чырвоным Касцёле ў Менску і Галоўным школьным інспектарам. Той факт, што кіраўнічыя пасады пры нямецкай адміністрацыі займалі такія добра вядомыя дзеячы беларускага руху, як Вацлаў Іваноўскі, Францішак Кушаль, Стась і Янка Станкевічы, Вінцэнт Гадлеўскі і іншыя, гаворыць аб тым, што ў той складаны для Беларусі час існавала некалькі варыянтаў выратавання і будаўніцтва Беларусі. Наколькі гэтыя задумы і планы былі рэальнымі, мы можам меркаваць з пункту гледжання сённяшняга дня, а тады тым, хто марыў пра незалежную

Беларусь, было добра зразумелым па справах ва Усходняй Беларусі толькі адно, што пры камуністачнай уладзе Беларусь не толькі не адродзіцца, але і зусім загіне. Больш таго, многія сапраўдныя патрыёты сваёй Бацькаўшчыны, лёс якой, як і лёс беларускага народу, іх не мог не хваляваць, выказвалі асцярогу з той нагоды, што на гэтых пасадах могуць аказацца іншародцы, палякі альбо літоўцы, якія таксама імкнуліся да сваёй дзяржаўнасці пад пратэктарствам Нямеччыны. У такім выпадку і край, і народ мог бы трапіць пад такі прыгнёт, які інакш як інтэрнацыянальным не назавеш (немцы, палякі, расейцы, літоўцы) інакш кажучы, «чвартаванне», што пагражала б канчатковаму вымиранню беларускай нацыі як такой.

Дзейнасць кс. Вінцэнта Гадлеўскага ў гэты час мала вядомая. Апроч беларускай службы у касцёле ён як галоўны школьны інспектар праводзіць вялікую работу па адкрыцці беларускіх устаноў (касцёлаў, школ, клубаў), што, вядома, гаварыла пра актыўную прапагандысцкую дзейнасць Гадлеўскага па адраджэнню роднага краю, абуджэнню нацыянальнай свядомасці і распаўсюджванню незалежных нацыянальных ідэй. Прамовы яго перад народам, як і погляды застаюцца такімі ж беларуска-нацыянальнымі, гарачымі і шчырымі, поўнымі бязмернай любові да сваёй Радзімы Беларусь.

«Беларускі народ многа меў ворагаў, яны сядзелі ў воласці, у паліцыі, у школе, ва ўрадах, і нават у касьцёле. Не зважаючы на просьледы і перашкоды, беларускі народ трымаўся свайго. Беларуская стыхія трывала, і яна ператрывала тых, хто зьдзекваўся над ёю. Праўда, адвечныя ворагі Беларусі, палякі, ўсьцяж і цяпер праяўлялі сваю дзейнасьць. Яны стараліся прасьледаваць беларусаў нават пры нямецкай уладзе, але гэтаму цяпер прыходзіць канец. Беларускі народ прыступіў да будаўніцтва сваёй Бацькаўшчыны. І мы тут сабраныя клянёмся, што адбудуем Беларусь вольнай, шчасьлівай і багатай[1]! Браты і сёстры[1]! Клянёмся, што збудуем Беларусь[1]! Клянёмся[1]! Клянёмся[1]! Клянёмся[1]!— гучэў моцны адказ прысутных«[7]. (З выступлення кс. Вінцэнта Гадлеўскага, Галоўнага інспектара школ пры адчыненні Дому Беларускай Культуры ў Жодзішках, Вялейскай акругі).

Варта нагадаць, што калі ў Берліне (19.06.41 г.) стварыўся Беларускі нацыянальны Цэнтр, то ў склад яго кіраўніцтва ўвайшлі Мікола Шчорс, Мікола Шкялёнак, Вітаўт Тумаш, Вінцэнт Гадлеўскі і іншыя. Юра Туронак у брашуры «Беларуская праблема ў палітыцы лонданскага лагера. (Варшава. 1983) піша: «З арыентацыяй на супрацоўніцтва з Трэцім Рэйхам гэтыя дзеячы звязвалі свае надзеі на арганізацыю ўласных узброеных сіл, а ў выпадку перамогі над СССР — таксама стварэнне асобнай беларускай дзяржавы пад нямецкім пратэктарам»[8]. Але заўчасная і загадкавая смерць В. Гадлеўскага ставіць пад сумненні яго свядомую арыентацыю на супрацоўніцтва з Трэцім Рэйхам. «Глякоўскі, Малец, Рыбалтоўскі, Неманцэвіч, Сянкевіч, Галяс, Гадлеўскі, Аношка — усе свядомыя беларускія святары — загінулі ў гестапаўскіх зесценках...»[9]. А гэты спіс яшчэ можна доўжыць і доўжыць.

Якія былі прычыны гібелі? Чаму немцы зрабілі тое, што з вялікім задавальненнем маглі б зрабіць і бальшавікі, і варожа настроеныя палякі?.. Ці не замешана тут больш сур´ёзная і небяспечная для акупацыйных улад справа, чым «прысяга на вернасць Германіі, пра што нагадвае С. Берасцень[10]. За што, незадоўга да арышту, Вінцэнту Гадлеўскаму была аб´яўлена строгая вымова? Чаму трохі пазней было забаронена праводзіць службу, на якую заўсёды збіралася вялікая грамада людзей?..

Вось пра што з вялікім болем і сумам апавядаў Вінцэнт Гадлеўскі Язэпу Малецкаму пры апошняй сустрэчы: «Пару дзён таму я меў гутарку з немцамі, хіба апошнюю, і сказаў ім адкрыта, што Немцы абяцалі даць Беларусам перад вайной, а што далі ў ходзе вайны? Вы, казаў я, разьвязваючы самаахову, абяззброілі беларускі народ, мардуючы ваеннапалонных ды палячы вёскі, стварылі партызаншчыну. Мы вас віталі з кветкамі, як вызвольнікаў, а вы як нас патрактавалі? Цяпер я палітычны труп і не магу выступаць больш ад майго і вашага імя да беларускага народу![1] Яны ўскінулі мне, што мая дзейнасьць ідзе ў разрэз зь нямецкімі інтарэсамі на Ўсходзе. Рассталіся мы холадна, цяпер чакаю майго арышту.»[11]

Чакаць прыйшлося не доўга. Праз некалькі дзён пасля гэтага ён быў арыштаваны Менскім СД і вывезены ў Рыгу, дзе, па ўсёй верагоднасці, і быў замучаны. Было гэта альбо на зыходзе 1942 года, альбо напачатку 1943. Сёння, калі збываюцца мары Вінцэнта Гадлеўскага аб незалежнай Беларусі, нельга забываць тых, хто гэтай святой ідэі аддаў сваё жыццё. Людзі павінны помніць, людзі павінны ведаць кожнага, хто шукаў у смяротны для Бацькаўшчыны час выратавання свайму народу ад крывавэрных жорнаў фашызму і камунізму. Якой бы спрэчнай не была постаць Вінцэнта Гадлеўскага на палетку беларускага нацыянальнага адраджэння, ды толькі нельга згадзіцца з тым, што «кс. Вінцэнт Гадлеўскі быў вялікай ахвярай на нашым нацыянальным аўтары ня толькі як мучанік, але як і змагар вялікага стылю за вызваленьне беларускага народу. Таму тыя, на чыім сумленьні ёсьць хоць кропля крыві ў ягонай сьмерці, хай каюцца перад Богам і сваім народам. Благое часам можа пайсьці у забыцьцё, але гераічная пастава волата-мучаніка Вінцэнта Гадлеўскага будзе нам сьвяціць вечна»[12].

Хай Бог дае.

Больш падрабязна пра жыццё і дзейнасць Вінцэнта Гадлеўскага ад маленства і да зняволення (1926 г.) можна прачытаць у «Аўтабіяграфічным нарысе», які прапануецца чытачам.

[1] Беларуская ніва. 1926 г., № 19.
[2] Bielaruskaja Krynica. 1927 г., № 34.
[3] Bielaruskaja Krynica. 1928 г., № 40.
[4] Chryscijanskaja Dumka. 1929, № 1.
[5] Bielaruskaja Krynica. 1930 г., № 13.
[6] Беларускі фронт. 1936, № 1.
[7] Беларуская школа. 1942, № 4.
[8] З кнігі «Да 110-годдзя Вацлава Іваноўскага (1880—1943)». Менск, 1990. С. 36.
[9] Беларус. 1988, № 350.
[10] Літаратура і мастацтва. 1992, № 19.
[11] Язэп Малецкі. Пад знакам Пагоні. Таронта, 1972 г. с. 94.
[12] Тамсама.

З ЖЫЦЦЯ І ДЗЕЙНАСЦІ КС. В. ГАДЛЕЎСКАГА

Аўтабіяграфічны нарыс

На паўночным краю Белавежскай пушчы ў Ваўкавыскім павеце Поразаўскай (даўней Баярскай) воласці ляжыць вёска Шурычы. Ад Поразава 7 км, ад Свіслачы — 25 км. Вёска ўся каталіцкая, беларуская. З аднае стараны чарнее лес — гэта край вялікай і магутнай пушчы, дзе нядаўна яшчэ вадзіліся зубры, лосі і алені, там балоты і ўзгоркі з усялякімі краёвымі дрэвамі: ад сасны і ёлкі да грабу, буку і чачоту (крутая бяроза), а з другой — пасма ўзгоркаў, якія аддзяляюць вадастокі Нёману і Віслы. Адгэтуль пачынаецца Рося, якая ўпадае ў Нёман, і Нарва, якая разам з Бугам нясе свае воды праз Віслу ў Балтыку.

Вёска Шырычы — тыпова беларуская. Аднак носіць на сабе пячаць паўднёвых уплываў: хлявы і гумны не так збудаваны, як у Паўночнай Беларусі, крыты яны болей на спосаб украінскі, на ўсе чатыры бакі, без шчытоў. Дый выглядаюць вельмі арыгінальна. Гутарка ў Шурычах таксама немаець таго шырокага акання, якое спатыкаеш далей на поўнач, каля Ліды, Маладзечна і Дзісны. У нас кажуць: дзядзько, Ясько, бацько і г. д. Ёсць таксама саўсім адменныя словы як: судашаць (спатыкаць), устаўне (заўсёды) і шмат іншых. Мова Шурыч — гэта будзе тая мова, якую мы відзім у зборніку Федароўскага «Люд Беларускі».

У гэтай вёсцы ў годзе 1888, у месяцы лістападзе 16 дня я радзіўся. Бацька мой Ян Гадлеўскі, сын Габрыеля і Магдалены (з Гуштыноў), а матка Кацярына Дземянчук, дачка Міхала і Сюзанны. Сям ´я Гадлеўскіх жыла ў Шурычах спрадвеку; у Поразаўскім парахвіяльных актах спатыкаецца яна перад 1700 гадоў. Дзед Габрыеля меў паўвучастка зямлі, на яго трох сыноў выпадала па 6 часцей, дык мой бацька пайшоў вучыцца за сталяра. Матка мая была таксама родам з Шурыч. Радзіўся я ў курной хаце і — як наказваюць — цэлы год качаўся ў дыме, пакуль не вывелі коміна. Да двух гадоў быў у Шурычах, а потым бацькі нашы пераехалі ў Броўск пад Нарву, дзе бацька мой знайшоў работу ў ляснічага Левіцкага, добрага чалавека, даўнейшага рускага ліберала. З яго дзецьмі я гуляў — о гэта былі мае першыя таварышы, якіх помню. З Броўска, калі я меў 5 гадоў, бацькі мае пераехалі зноў у Шурычы, а потым у Поразава, дзе купілі сабе на адселіцы паміж Суботкай (ці не ад слова «Субач»?) і Навадворскай вул. дом, у якім бацька залажыў сталярню. Тут пачалі вучыць мяне грамаце і паслалі ў народную Паразоўскую школу. За дзве зімы я яе скончыў «першым вучнем», маючы дзесяць гадоў (1899). Бацька, відзячы здольнасці свайго сына, пастанавіў прадаць дом і город

і пераехаць у Варшаву, куды яго цягнулі ўспаміны даўнейшых часоў, дзе ён свайго часу здабыў сабе ў сталярскім цэху «грамату» на чалядніка (падмастерье). У Варшаве паступіў я ў гімназію, дзе прабыў да 1903 году і кончыў тры класы. Цяжка тут жылося. Бацька працаваў як мог, але не маючы добрага здароўя — надрываўся. Быў час, што не меў зусім работы. Працаваў у вялікай фабрыцы Горна, ставіўся таксама да работы і на меншых сталярных. Зарабляў сярэдня — па рублю на дзень. Аплаціць з гэтых шасці рублёў на тыдзень кватэру, купіць ежу і адзетку ды яшчэ вучыць сына ў гімназіі — было труднавата. Трэба было расходаць запас, які прывязлі ў Варшаву і пускаць грошы, выручаныя за дом. Але і запас скора канчаўся, а жыццё было шораз то труднейшае. Тады адзін са знаёмых выклікаў маіх бацькоў у Коўну. Матка хацела назад у Шурычы, але што там рабіць на тэй шостай часці[1]. Дык парышылі пераехаць у Коўну (восень 1902 г.). Аднак і ў Коўна не было лепш[1]. Тут нават не было большых сталярняў і фабрык, дык бацька залажыў сталярню на сябе і пачаў зарабляць на жыццё. Аднак работа была не заўсёды, дык часам у хату заглядала бяда. Трэба было відзець той клапатлівы сум бацькі, галаву сям ці, калі не было за што купіць найпатрэбнейшых рэчаў. Але палажэнне хутка паправілася, знайшліся добрыя людзі, знайшлася работа, мы аджылі. Але тыя трагічныя мінуты засталіся ў маёй памяці назаўсёды.

Як у Варшаве, так і ў Коўне, былі і светлыя гадзіны, поўныя радасных успамінаў. І так помню (з Варшавы), як з маткай выглядаў я бацькі, варочаўшагася з работы, жылі мы тады на Празе, займалі зальку з далёкім відам па вуліцы, добра тады жылося, бацька зарабляў нязгорш; бывала, выглядаю я, а матка пры мне, гаворачы, пазнаём, цешылася, калі ўжо бацька пакажацца ў далі, спаткаем... Сколькі тады было радасці і вяселля, а сколькі добрых слоў[1]. Бацька хоць змучаны працай і хадзьбой, аднак жа, быццам забываўся аб усім і далучаўся да агульнай радасці. Тая залька вось і цяпер здаецца мне ў вачах стаіць... Там жа я адхварэў на водру і запаленне лёгкіх. Вуліца тая звалася Стралецкая. А ў Коўне болей шэрае і «рэальнае» было жыццё, глыбейшых і прамаўляючых успамінаў адтуль я не вынес.

Калі палажэнне наша ў Коўне трохі паправілася, пачалі мае бацькі думаць аб тым, як бы ўцячы адтуль. Не спадзяваліся ведаць лепшай будучыні там. Але куды ўцякаць? Дзе шукаць лепшай долі? З нагаворам маткі бацька рашыў ехаць у Шурычы і вясною 1904 году мы туды выехалі. Ізноў я вярнуўся ў вёску, каб пазнаць яе жыццё.

Спачатку мы жылі разам з дзядзькамі, а пасля падзяліліся. Бацьку майму выпала шостая часць участка і трохі будынку. Устроіліся неяк. Я ўжо памагаў бацьку ў рабоце, бывала так, што каля хаты і гаспадаркі, а бацька на рабоце. Калі прайшла зіма, я сабраў нешта з 20 дзяцей і пачаў іх вучыць. Плацілі па рублю з дзіцяці. На другую зіму зноў сабраў дзяцей, але браў ужо даражэй і сабраў трохі грошай, каб паехаць і здаць экзамены з 4 класаў. Паехаў у Гародню і тут, падвучыўшы трохі зімой з 1905 па 1906 год, здаў экзамен вясною 1906 г.

Куды цяпер? Бацькі часта ўспаміналі мне, што яны рады былі б відзець мяне ў духоўным стане, але не прымушалі, пакідаючы маёй ахвоце і ўнутранаму пазванню. А гэтае пазванне якраз заклікала мяне пад духоўны сцяг... Не ведаю, скуль гэтае пазванне ўва мне знайшлося і якімі сіламі развівалася — можа маім ідэалістычным паглядам на свет, можа тым рамантызмам у душы, якім я быў абвеены ад пачатку майго сведамага думання і пачуцця, а можа пад уплывам вялікага імкненьня да здабыцця веды, асабліва

тэалогіі і філасофіі, якая, паводле майго тагачаснага погляду,— мелі даць адказ на ўсе загадкі чалавечага і ўсясветнага быцця?.. А гэтыя загадкі мяне пад той час найболей займалі. Кожную кніжку і кожную вестку я проста глытаў... Апроч гэтага, дзякуючы японскай вайне і наступаўшай за ёю рэвалюцыі, я моцна заінтэрасаваўся палітыкай і грамадскімі справамі. Як японская вайна дала мне пачатак палітычных пазнанняў, так расейская рэвалюцыя 1905—6 году ўвяла мяне ў лабірынт грамадскіх загадак. Маючы перад сабою і за сабою кароткае жыццё маіх блізкіх, і зноў жа, гледзячы на багатае жыццё варшаўскіх фабрыкантаў і вясковых двароў, я праймаўся нядоляй першых і шчасцем апошніх і стараючыся сваім малажавым розумам развязаць загадку няроўнасці людскага бытавання.

З такімі поглядамі я апынуўся восенню 1908 года ў Віленскай Духоўнай Семінарыі. Два гады (1906—1908) прабыў на вёсцы, вучачы дзяцей і здабываючы для сябе патрэбную веду, мовы, матэматыку, літаратуру. (Экзамены ў Семінарыю здаў у 1907 годзе, але год прымушаны быў чакаць кандыдатам).

У Семінарыі заняўся, апроч абавязковых прадметаў, філасофіяй, рэлігіяй і літаратурай.

Ужо ў Семінарыю прынёс з сабою беларускую нацыянальную свядомасць і зараз на першым курсе запісаўся Беларусам. Але нацыянальнае пытанне мяне тады не інтарэсавала. Болей мяне цікавілі філасофія, тэалогія; пры помачы якіх я стараўся развязаць загадкі пачатку, канца і мэты людскога і ўсясветнага бытавання, а таксама дайсці тых законаў, на якіх гэта бытаванне дзержыцца. Сіліўся таксама пазнаць падзеі людскога жыцця ў гісторыі і літаратуры і заахвочаны выкладаннем расейскай літаратуры Серабраковым, вельмі здатным прафесарам, заняўся вывучэннем расейскай, польскай і ўсясветнай літаратуры. На чацвёртым курсе гэтае вывучанне абхапіла і беларускую літаратуру, з якой творы Багушэвіча былі як бы пуцяводнай эвангеліяй маёй да лепшай дзейнасці.

Аднак у Семінарыі нацыянальная думка яшчэ ўва мне не паспела. Наспявала тады болей думка рэлігійная і філасафічная. Мае погляды сацыяльныя былі яшчэ цьмянымі, ведаў я толькі аб крыўдзе і гаротным жыцці селяніна і работніка, але яе ім памагчы ў гэтым — разьвязаць не сіліўся. Усе імкненні мае былі тады скіраваны да таго, каб для сябе здабыць веду, пазнанне жыцця і шчасця, але аб чалавецтве я мала помніў. Думалася мне, што, развязаўшы рэлігійныя і філасафічныя пытанні, я буду шчаслівы і гэтым шчасцем надзялю людзей... Трагічнай такога погляду на свет і жыццё — паводле цяперашняга майго разумення — быў педагагічны кірунак у Семінарыі, выключаючы ўсе грамадскія пазнанні, а ўрэшце і тое, што на той час не было ніводнага прафесара (апроч Серабракова), які б даў новыя думкі і заахвоціў бы сваім выкладаннем да здабывання веды ў гэтай галіне.

Не тое зусім было ў Акадэміі, куды мяне выслалі ў 1912 г. Там спаткаўся я з новымі поглядамі. Выкладанне (хоць у пачатковых нарысах) грамадскіх навукаў пабудзіла да паглыблення грамадскіх поглядаў. Там жа я спаткаўся не толькі з краёва-касцельнай думкай, якая панавала ў Віленскай Семінарыі, але з нацыянальным воблікам Палякаў з Польшчы этнаграфічнай, з Літвінамі ковенскімі і сейненскімі, а нават саратаўскімі Немцамі і Латышамі. Усе гэтыя народнасці неслі ясную, выпрацаваную даўгалетнім змаганнем з чужынцамі, нацыянальныя імкненні. Пад уплывам іхніх поглядаў пачынаюць крышталявацца і мае погляды. Уступае тады касцельна-краёвая «тутэйшасць»

з беларускаю афарбоўкаю па-яснейшаму чыста нацыянальнаму беларускаму пракананню. Прыглядаючыся да жыцця, я праканаўся, што ніхто з суседзяў не вывядзе беларускага народу з нядолі: ні буржуазія, ні сацыялісты, ні самыя нават левыя партыі з пасярод нашых суседзяў, а вывесці можа толькі сябе сам народ беларускі... Гэткім парадкам сацыяльнае пракананне прывяло мяне да нацыянальнага... Ужо за год гэтае пракананне настолькі паспела, што зажадала чыну. Задумаў я залажыць кружок і пачаў шукаць аднадумцаў. Падзяліўся сваімі думкамі з Цікотам і Хвецькам.

Тыя чэтай пахвалілі мой пачын. Звярнуўся я тады да нашых беларускіх «краёўцаў», да Пекарскага, Шырокага, а таксама да Францука і Жаўнеровіча, і ў рэзультаце 13 ці 20 кастрычніка 1913 году мы залажылі першы гурток беларускай студэнскай моладзі ў Петраградскай акадэміі. На старшыню выбралі Пекарскага (хочучы яго ўцягнуць да актыўнай работы), а на сакратара мяне. Ад гэтага часу пачаліся сходкі, дыскусіі, прэлекцыі, ад княгіні Радзівіл атрымалі 100 руб. на бібліятэку, дык залажылі бібліятэку беларусазнаўства, і беларуская работа ў акадэміі стала на моцны грунт. Калі на прышлы 1914 г. прыехалі ў акадэмію яшчэ Станкевіч, Шутовіч, Лупіновіч, Хоміч, Нуманцэвіч і Пятроўскі — гурток лічыў ўжо 11 сяброў (на 70 студэнтаў акадэміі), і работа развівалася. І хоць некаторыя пасля адышлі ад беларускай работы (Пекарскі, Шырокі, Францук), то ўсё ж такі з гэтага гуртка вышлі ідэолагі і барацьбіты сярмяжнага беларуска-касцёльнага і кадэцкага руху.

Наш кружок уваходзіць у зносіны са студэнтамі-Беларусамі Петраградскага універсітэту і робіць супольныя сабранні на кватэры памёршага ўжо кс. Фр. Будзькі. На гэтыя сабранні прыходзіць Тарашкевіч, Душэўскі і інш.

У акадэміі я не толькі скрысталезаваў свае нацыянальна-грамадскія погляды, але і вырабіў план далейшай працы. Дык калі назначылі мяне па аканчэнні Акадэміі. у 1916 годзе ў Менск, я ехаў туды як ведамы работнік не толькі па касцельнай, але таксама па роднай ніве.

У Менску было тады не многа дзеячаў. Даўнейшыя беларускія дзеячы былі або на фронце, або ў глыбіні Расіі. У Менску я застаў Левіцкага, Паўловіча, кс. Астрамовіча (А. Зязюля) і яшчэ некалькі дзеячоў. Пасля паказалі на менскім гарызонце Багдановіч, Смоліч, Заяц, Аляксюк, Земкевіч, так што новы 1917 год мы спатыкалі ўжо (на Захараўскай 18, дзе быў як бы зборны пункт) у даволі вялікай сямейцы. Гаварылі прамовы, укладалі планы, рыхтаваліся выдавецтва, рабілі складкі па падноснаму лісту — не спадзяючыся тых вялікіх падзей, якія адчынілі перад намі шырокі прастор для працы. (Тады гаварыў прамову і Багдановіч, каторы скора паехаў у Крым. Дэкламаваў Заяц з вялікім адчуццём).

Гэта было ў апошніх днях лютага і ў першых днях сакавіка, калі прышлі з Петраграду радасныя весткі аб рэвалюцыі. Менск заварушыўся. Беларусы страпянуліся разам з іншымі. Пачалася рэвалюцыйная гарачая работа. У сэрца ўступіла нейкая магутная сіла. Усюды закіпела як у катле. Народ пайшоў на вуліцу. Пачаліся маніфестацыі. Помню, у першай агульна-грамадзянскай маніфестацыі прынімалі ўчасце і Беларусы з транспарантамі, на якім была з аднаго боку надпіс: «Няхай жыве вольная Беларусь[1]», а з другога нешта болей інтэрнацыянальнае (пралетарыі злучайцеся ці нешта іншае). Пад транспарантам даволі вялікая грамада Беларусаў з Алексюком на чале, каторы стараўся выбіцца на чало беларускага руху. (Я глядзеў на маніфестацыю з касцёльнага катэдральнага вакна, што на хорах). Была выпушчана адозва да беларускага народу, у каторай пісалася, што ланцугі доўгалетняй нядолі ўжо

скінуты, настала воля і што беларускі народ павінен здабыць зямлю і волю. Чэсць рэдагавання гэтай першай адозвы да нашага народу выпала мне — і яна, пасля некаторых дробных папраўак, якія мы зрабілі ўжо разам са Смолічам, была надрукавана па-беларуску і расклеяна па ўсім горадзе, а нават разаслана па правінцыях. Першая публічная адозва на вуліцах Менска зрабіла вялікае ўражанне. Людзі чыталі яе і дзівіліся, што гэта за новы язык нейкі. Трэба ведаць, што тады Менск быў прыфрантавым горадам, дзе была цэлая маса ўсялякіх чыноўнікаў, зем, гусараў і іншых вайсковых арганізацыяў, дык выступленне Беларусаў было для іх як бы палкаю ў мурашнік. У расейскіх чарнасоценцаў закіпела ад злосці і трывогі. Ад іх не адставалі і польскія. Але Беларусы, збуджаныя магутным громам рэвалюцыі, не глядзелі на нейкую злосць, але аддаліся з цэлай энергіяй працы. Выдавалі адозвы, лістоўкі, збіралі сілы і, каб зарганізаваць гэтую сілу, назначылі на 24 і 25 сакавіка з ´езд беларускіх дзеячаў. На з ´езд прыехалі ўсе, хто толькі мог, не толькі з Беларусі, але і з Петраграду, Масквы і Кіева. Але і гэтыя сілы не былі вялікімі, нешта да 40 чалавек.

На з ´ездзе выбралі першы Беларускі Нацыянальны камітэт, на чале са Скірмунтам, які тады шчыра гарнуўся да беларускай работы. У гэты камітэт увайшоў і я. З ´езд выбраў таксама дэлегацыю з 7 чалавек да расейскага ўраду і даручыў гэтай дэлегацыі прадставіць шэфу тагачаснага ўраду князю Львову свае пажаданні ў беларускай справе, датычачыя школьніцтва, самаўрадаў і беларускай аўтаноміі. На чале ўсіх пажаданняў, ведама, стаяла «Зямля і воля». Да гэтай дэлегацыі належыў таксама і я. Князь Львоў адказаў на ўсе гэтыя пажаданні, што іх вырашыць можа толькі расейскі ўстаноўчы збор і прасіў пачакаць... пакуль ён збярэцца. Ён жа сваёй воляй нічога зрабіць не можа. З гэтым дэлегацыя вярнулася ў Менск.

Будучы ў Петраградзе, бел. дэлегацыя прабавала навязаць кантакт і супрацоўніцтва з Літвінамі, аднак тыя нашу прапазыцыю адкінулі, матывуючы свой адказ тым, што звязвацца з Беларусамі для Літоўцаў не карысна, бо літоўская справа не ёсць міжнароднай справай, а беларуская ў пачатках толькі ўнутранай расейскай. Прамоўцамі ад літоўскага камітэту былі найболей Шылінг і Пожэлло, а ад нас Скірмунт і Красоўскі.

Ад з ´езду дзеячоў пачынаецца ў беларускім руху, пад уплывам паглыблення рэвалюцыйных думак, вялікая дыферэнцыяцыя. На Скірмунта глядзяць як на абшарніка, фірма ягоная ставіць у падазрэнні, асабліва ў вачах расейскай чорнай сотні, увесь беларускі рух. Кажуць, што гэта панская і польская інтрыга. Разсяваюць пры гэтым па ўсёй Беларусі немагчымыя слухі. Дык левае крыло руху са Смолічам і Жылуновічам на чале пачынае адходзіць ад Нац. Камітэту, на месца каторага творыцца Рада Беларускіх арганізацый. Але і Рада скора ўступае яшчэ лявейшым кірункам, не прызнаючы ўжо ўсіх беларускіх арганізацыяў, а толькі лева-сацыялістаў. Смоліч і Жылуновіч склікаюць сялянскія з ´езды, на каторых выносіцца шораз то болей рэвалюцыйныя рэзалюцыі. На гэтыя з ´езды прыязджалі не толькі з Меншчыны, але нават з Віцебшчыны і Магілёўшчыны.

У гэтым часе 24—25 траўня 1917 г. я склікаў з ´езд беларускага духавенства. Прыехала больш 20 прадстаўнікоў нашага духавенства. На з ´ездзе абгаварыліся справы арганізацыйныя, выдавецкія, культурна-рэлігійныя, справа бел. казанняў. Чыталі рэфэраты: кс. Станкевіч «Беларускі рух і яго адносіны да жыцця рэлігійна-касцёльнага», кс. В. Гарасімовіч «Дзейнасць духавенства грамадска-эканамічная», Кс. Ф. Абрантовіч «Праца

асьветная», кс. Л. Хвецька «Праца выдавецкая» і я «Дзейнасць каталіцкага духавенства ў Беларусі — палітычна-народная».

Але пад той час, летам 1917 году, пачынаецца новы рух, які ўскалыхнуў сапраўды жыццём Беларусі і даў ёй нейкую рэальную сілу: гэта быў рух вайсковы. З ´езды ваякаў з розных франтоў адбываюцца тады ў Менску, Віцебску, Кіеве, Адэсе. Усюды выбіраюцца выканаўчыя камітэты і пасылаюцца дэлегаты ў Цэнтральную Вайсковую Раду, якая ўфармавалася ў Менску. І да гэтай Вайсковай Рады пераходзіць не толькі правадырства ў беларускім руху, але яна бадай з ´яўляецца прадстаўніцай усяго руху. Цывільныя адміністрацыі як бы тушуюцца перад вайсковымі, усе аглядаюцца на Вайсковую Раду.

Летам 1917 г. я гаварыў беларускую навуку падчас візытацыі Арц. Роппа ў Будславе, Касценевічах, Крывічах (дзе надта ж шчыра віталі роднае слова). І напаследак у Радашковічах, дзе Палякі пад павадырствам Хэлхоўскага зрабілі шум і крык у касцёле і ўрэшце ўстроілі эксодум. Супакоіў іх вышаўшы з касцёла Арц., а я навуку скончыў без перашкод. Маніфестуючых было да 30 чалавек, пераважна работнікаў і паліцыі, якія пад камандай Хэлхоўскага служылі ў «дарожнай камандзе»...

У той жа час я пачаў шырокую усведамляючую акцыю пасярод менскага каталіцкага грамадзянства. Пачаткі гэтай працы былі вельмі цяжкія. Трэба было развеяць усе эндэкія забабоны, якія моцна заселі ў галовах мяшчанства, трэба было ўсведаміць аб розніцы паміж рэлігіяй і народнасцю, трэба было змагацца з адной стараны з бураю рэвалюцыі, якая гудзела штораз то мацней, а з другой стараны — з польскім чарнасоценствам, якое пачало кідаць у мяне балотам і падрываць усялякімі спосабамі маё добрае імя ў веруючых масах.

Відзячы, што рэвалюцыя вырывае нават рэлігію з душаў людзей і разсявае розныя грамадска-рэлігійныя фальшы, я задумаўся над будучыняй чалавецтва і паставіў сабе пытанні: ці людзі будуць шчаслівы, калі перавернуць увесь грамадскі лад, адкідаючы рэлігію і ўласнасць, ці можа трэба пашукаць іншай дарогі? На гэтае пытанне я даў такі адказ: хрысціянская рэлігія апіраецца на найвышэйшым і на найпрыгажэйшым дару душы людской, а іменна: на любові. Любоў вечна. Як доўга будзе існаваць чалавецтва, так доўга будзе існаваць любоў, а разам з ёю і хрысціянства. Значыць, дальнейшае жыццё людское трэба абапёрці на хрысціянстве, каторае загадвае любіць Бога над усім, а бліжняга свайго як самаго сябе. Любові адкідаць не можна.

Але апроч гэтага трэба яшчэ імкнуцца да роўнасці. Бо не даволі пашыраць загад любові, трэба яшчэ ўхіліць усе прычыны да ненавісці. А такімі прычынамі ёсць няроўнасць у падзеле зямлі і багацце і няроўнасць пры карыстанні з грамадскіх правоў. Чаму адзін мае тысячы дзесяцін зямлі, а другі ніводнае, чаму адзін чалавек мае ўсе правы і прывілеі, а другі пазбаўлены гэтых правоў? Ставячы сабе гэтакія пытанні, я разглядаў па свеце і шукаў той партыі, якая адказала б мне на гэтыя пытанні. І мушу сказаць шчыра: я такой партыі не знайшоў. Калі адна партыя прызнавала хрысціянскую рэлігію, дык не прызнавала скасавання прывілеяў і хваліла грамадскую няроўнасць, калі другая партыя прызнавала права для падняволеных — дык не прызнавала хрысціянства. Знайшліся нават такія партыі, якія, касуючы дыктатуру буржуазіі, уводзілі дыктатуру пралетарыяту, які меў заняць месца ўступаўшай буржуазіі. Дык, гледзячы на ўсё гэтае, я дайшоў да вываду, што людзі не хочуць зносіць няроўнасці, а толькі імкнуцца да таго, каб самім заняць вышэйшае месца... Дзе ж праўда? — пытаўся я. Няўжо ж людзі не могуць зразумець таго, што кожны чалавек на свеце мае роўнае права да жыцця

і карыстання з прыродных дароў? Размышляючы над гэтым, я такім парадкам дайшоў да дэмакратызму, гэта значна да народаўладства, няхай кожны грамадзянін мае роўныя правы і роўныя абавязкі, няхай кожнаму грамадзяніну будзе дадзена роўная права ў кіраванні дзяржаваю, адкідаючы ўсялякую дыктатуру, ці то пралетарыяту, ці то буржуазіі, а гэту роўнасць трэба абапёрці не на сіле мяча або на страху перад бізуном, але на хрысціянскай міласці, якая павінна ўсяляць гэту людскую роўнасць. Вось такім парадкам я дайшоў да хрысціянска-дэмактарычнага погляду на жыццё і пачаў гэтыя мае погляды вясціць народу. Народ менскі ў большасці сваёй прыняў гэтую вестку і пайшоў за ёю... апроч толькі багачоў. Тыя заварушыліся, і пачаўся паход проці мяне.

Аднак не гледзячы на ўсе перашкоды, я пастанавіў заснаваць хрысц.-дэмакратычную партыю ў Менску. Было гэта летам 1917 г. Партыя была пабудавана спачатку на інтэрнацыянальных асновах. Туды маглі запісацца ўсе: і Палякі, і Беларусы, і Літвіны. Народ паваліў валам. Менскае працоўнае мяшчанства, а пераважна работніцкая беднота сотняю пісалася ў хр.-дэмакрацыю. Пачаліся лекцыі, сабранні, тэатральныя прадстаўленні, стварылася бюро працы, дзе безработныя маглі знайсці работу і г. д. Аднак польскі шавінізм гэтакае інтэрнацыянальнае арганізацыі ня мог перанесці. Пачалася сільная агітацыя, каб арганізацыю ахрысціць у «Польскі Звязак Хр.-Дэмакратычны». Карыстаючыся з маёй часовай нябытнасці ў Менску летам 1918 г. польскія павадыры зрабілі сваё: хр. дэмакрацыю назвалі польскай. Што было рабіць? Паддацца пад кіраўніцтва польскіх агітатараў, каторых падаслала да нас (яны потым даведаліся) польская эндэцыя, якая хоча верхаводзіць у каталіцкім жыцці? Не, на гэта не можна згадзіцца, і група Беларусаў пастанавіла заснаваць Бел. Хр. Дэмакрацыю. Гэта было 5 верасня 1918 года, перад самым маім выездам з Менску ў Нясвіж.

Хочучы паставіць арганізацыю на моцных нагах, пашырыць на правінцыю, я пачаў выдаваць у Менску «Крыніцу». Выдаў аднак толькі адзін нумар у лютым 1918 г. Прыказ немцаў парваў паштовыя зносіны з правінцыямі і гэтым самым перарваў выдавецтва.

Калі адбываліся закладзіны і падзеі нашай партыі, рэвалюцыя тым часам ішла вялікімі шагамі ўперад. Беларуская работа набірала шторaз большага размаху. У Менск збіраюцца ўсе усе беларускія сілы. Дык пастанаўляюць склікаць Агульны Беларускі З ´езд, як бы Беларускі Устаноўчы Збор, каб на ім выпрацаваць асноўны статут — як бы Канстытуцыю Беларусі. З ´езд быў скліканы 5. XII.17 г. і быў адчынены 7. XII, пры 2000 блізка дэлегатаў. Пасля доўгіх спрэчак і прапаноў дня 17 таго ж месяца была вынесена такая рэзалюцыя: З ´езд ухваляе на землях беларускіх рэспубліканскі строй і перадае ўладу ў рукі сялян і работнікаў. Гэта рэзалюцыя была неўспадобу бальшавікам, якія хацелі не рэспубліканскага, а савецкага строю і дыктатуры пралетарыяту і затым у ночы з 17 на 18 сьнежня ст.ст. акружылі гмах Рэспублікі (даўней «Дворянское собрание») войскам і кулямётамі, падкацілі пад дзверы два бранявікі і разагналі прыкладамі і штыкамі З ´езд. Гэта быў той вялікі гвалт са стараны бальшавікоў, што рэха аб ім пранялося па ўсёй Еўропе, і нават на мірнай канферэнцыі ў Брэсце нямецкі генерал Гофман выказаў гэта бальшавікам. Ад гэтага дня беларускі рух зыходзіць зноў у падполле і аб ´яўляецца бальшавікамі як контррэвалюцыйны.

У з ´ездзе афіцыяльнага ўдзелу я не прыймаў, тады якраз вялася проці мяне сільная агітацыя ў польскіх духоўных акругах, каб выслаць мяне ў Маскву. Аднак дзякуючы заступніцтву народу і спагаднасьці О ´Роўрк ´а,

якія тады быў вікарыем — генеральным у Менску, я астаўся і папера біскупа Цепляка мне даручана не была. На з ´ездзе я выступіў як лектар аб беларускай справе, аднак і тады польскія газеты зрабілі, гвалт, называючы мяне «Отец Гектор», «Дэмагог в сукні духовнай» і г. д.

Але не доўга бальшавікі цешыліся сваёю перавагай над Беларусамі. 20 (?) лютага немцы, не пагадзіўшыся ў Брэсце з бальшавікамі, рынуліся на ўсход і занялі Менск і большую часць Беларусі.

Пачалося новае жыццё. Беларусы спачатку думалі, што немцы памогуць будаваць Беларусь, але скора разачараваліся. Немцы зараз у першым тыдні свайго панавання акружылі войскам дом Бел. Войск Рады (быўшы губернатарскі), зрабілі рэвізію, забралі аружжа і дакументы, якія адносіліся да беларускага руху — і пайшлі сабе.

Рады не разганялі, сабранняў беларускіх не забаранялі, але і нічога не рабілі, каб памагчы Беларусам. Відзячы такія адносіны Немцаў і бальшавікоў, якія ўважалі Беларусь як бы нічыю краіну, Рада агульна-беларускага з ´езду, да якой перайшло кіраўніцтва беларускім рухам, сабраўшыся 24 сакавіка 1918 году (у гадаўшчыну з ´езду беларускіх дзеячаў) праз цэлую ноч дыскутавала палажэнне Беларусі і ўрэшце раніцой 25.III. таго ж месяца аб ´явіла Беларусь Незалежнай і Вольнай Рэспублікай. Пасля галасавання ўстае адзін з дзеячоў і, ўгледзеўшы праз вакно ўсходзячае сонца, прамовіў: «Першы раз усходзіць сонца над Незалежнай Беларусіяй. І сапраўды, гэта быў першы ўсход сонца над юрыдычна незалежнай нашай Бацькаўшчынай.

І хоць гэта незалежнасць да сённяшняга дня практычна не дзейнічала, то ўсё ж такі гэты дзень астаецца ў памяці Беларусаў вялікім народным святам. Беларусы рашылі абвясціць усяму свету, што наша Бацькаўшчына не ёсць нічым краем, што чужынцы, ходзячы па ёй, гвалцяць правы нашага народу да незалежнасці і што Беларусь мае ўсе правы, каб быць незалежнай і вольнай дзяржавай. Да гэтага часу Беларусы змагаліся толькі аўтаномна ў граніцах вялікай фэдэрацыйнай Расеі і гэтым давалі повад глядзець на сябе як на частку расейскай дзяржавы.

Тады ж побач з Беларускай Радай пачало тварыцца ў Менску гэтак званае Беларускае народнае прадстаўніцтва. Мэтай арганізацыі гэтага прадстаўніцтва было навязаць нейкія зносіны з нямецкімі акупантамі, якія не прызнавалі і не хацелі нават гаварыць з прадстаўнікамі Беларускай Рады. Прадстаўніцтва (на чале са Скірмунтам) сабрала каля сябе людзей паважнейшых, якіх немцы не маглі ўважаць за нейкіх крыкуноў і маладжавых палітыкаў як Мамонька, Грыб, Варонка і іншыя. Да прадстаўніцтва далучыўся і генерал Кандратовіч, будучы арганізатар беларускага войска. Дык прадстаўніцтву скора ўдаецца наладзіць сякія-такія зносіны з Немцамі. Адбудзілася надзея, што пры нямецкай помачы можна будзе адбудаваць Беларусь.

Беларуская Рада, апынуўшыся ў палажэнні без выхаду, запрапанавала злучэнне Рады з прадстаўніцтвам. Злучэнне наступала. З прадстаўніцтвам увайшоў у Раду і я. На першым зараз паседжанні (наскольк і помню) Рада выбрала беларускі ўрад на чале з сапраўдным яе прэм ´ерам. Аднак на другі дзень нямецкая обер-каманда ў Менску прыслала Скірмунту паперу, у якой пісалася, што няхай Скірмунт не забываецца, што ў краі нямецкая ўлада і што іншай улады быць не можа... Пасля разбраення Доўнар-Мусніцкага і яго трох польскіх карпусоў, такая пагроза заставіла прызадумацца. Што рабіць? Скірмунт, Савіцкі і Алякскюк падалі праект пасылкі тэлеграмы на імя Вільгельма. Паказвалі на Літву, на Украіну, якая атрымала дзяржаўнае жыццё

і этнаграфічную граніцу (з Холмшчынай) пры помачы Немцаў. Казалі, што пры бальшавіцкай і польскай захопнасці Беларусам не ўдасца збудаваць дзяржаўнага жыцця. Праект тэлеграмы большасцю галасоў прайшоў. Падпісалі яе Скірмунт, Лявіцкі, Лёсік, Земкевіч і Аляксюк. Змест тэлеграмы (больш-менш) быў такі: Бел. Рада пры помачы і ў саюзе з Немцамі спадзяецца адбудаваць дзяржаўнае жыццё Беларусі. Аднак на гэту тэлеграму адказу не было. Немцы не хацелі рабіць яшчэ адной дзяржаўнай фармацыі на ўсходзе Еўропы і, аддаючы Беларусь Расеі, мелі на ўвазе паміж Украінай і Літвой (праз Беларушчыну) стварыць супольныя і беспасярэдныя граніцы з Расеяй... На гэтай нямецкай калькуляцыі абапёрты былі ўжо папярэднія захады оберкаманды і маўклівасць Берліна ў Беларускай справе. (Здаецца, што і цяпер яшчэ Немцы стаяць на гэтым самым становішчы).

Але варочаюся да Хр. Дэмакрацыі. Пасля падзелу (а яшчэ і перад падзелам) я ведаў, што з Менску мяне вышлюць. Прыехаўшы ў жніўні 1918 году ў Менск біскуп Лазінскі паддаўся адразу пад уплывы эндэцыі і зараз жа аб ´явіў мне, што высылае ў Нясвіж. Пры гэтым забараняў мне займацца палітыкай і грамадскай справай. 8 верасня я ўжо быў у Нясвіжы. Калі адзін раз прыехаўшы ў Менск я, як сябра Рады, прыняў удзел у парадах і галасаванні, біскуп паклікаў мяне і ўрачыста заявіў: або ўстрымацца ад палітычнай дзейнасці, або пакінуць Менскую дыецэзію. Не маючы іншага выхаду, я выбраў першае.

У Нясвіжы, польска-шляхецкім месце, з старым Радзівілаўскім замкам, акружаным возерамі, валамі і равамі, я прабыў ад 1918 г. да 1921 г., значыць роўна тры гады. Назначаны туды я быў як вікары,— разам як прэфэкт польскай гімназіі і рэктар Бенедыктынскага касцёла. Гэтыя абавязкі адрывалі мяне ад якой-колечы грамадскай работы ды ўрэшце нада мною выспела палітычная суспенса біскупа Лазінскага. Аднак ужо ў 1919 годзе (пасля прыходу Палякаў) мяне выбіраюць нясвіжскія мяшчане ў Мейскую раду. Сябрам рады я быў аж да выезду з Нясвіжу. На гэты мой выбар трэба было спецыяльнага дазволу біскупа Лазінскага. Гэта была першая ўступа са стараны біскупа. Ад гэтага часу пачынаецца мая не толькі рэлігійная, звычайная, звязаная з маім становішчам праца, але і грамадская. У Радзе м. Нясвіжа заўсёды быў павадыром і кіраўніком усіх справаў. А справы ішлі даволі добра. Бюджэт ніколі не выказваў дэфіцыту, гэта пазваляла абярнуць лішні даход на грамадскія патрэбы, як утрыманне прытулку для дзяцей, падмогу для прыватных школаў, урэшце на закладзіны мейскай бібліятэкі. Быў старшынёй прыватнай і бібліятэчнай камісіі. Прытулак для дзяцей быў на маёй галаве.

У гімназіі пасярод моладзі павёў усведамляльную работу, і яна пачала ўжо пашырацца. Былі свядомыя Беларусы ў старшых класах, як Вінч, Рымашэўскі, Чаінскі, Сікорскі і шмат другіх. Дзе яны цяпер, і як яны чуюцца? Апроч польскіх прэлекцыяў чытаў таксама па-беларуску на тэмы гістарычныя і культурныя. Адзін раз было такое здарэнне. Калі пачаў ужо адну польскую лекцыю, нехта з пасярод слухачоў зажадаў, каб чытаць лекцыю па-беларуску. На пробу зрабіў я тады галасаванне. Дык за беларускую мову галасавала добрая палавіна... чытаць аднак па-беларуску не прыйшлося, бо абвесткі і паведамленні ўладаў былі аб польскай лекцыі. Гэта паказвае аднак, што найболей спольшчаныя нашыя мястэчкі і найбольш шляхецкія засценкі яшчэ не прапалі для Беларусі, трэба толькі працаўнікоў... Будучы ў Нясвіжы, я як вікатары тамашняй парафіі, даязджаў адпраўляць набажэнства ў вёску

Ушанка (што каля станцыі Гарадзея) і там пачаў гаварыць па-беларуску, дык біскуп Лазінскі загадаў зрабіць цэлае следства. Сялян вызывалі на дапрос, пісалі пратаколы, словам, зрабілі цэлую гісторыю. Перапужаныя сяляне прыходзілі да мяне пытацца, што будзе з гэтага, можа яны будуць вінаваты, што слухалі па-беларуску ў касцёле. «Няўжо ж не можна сказацца па нашаму? — пыталіся».

У Нясвіжы і наогул у Менску пад загадам біскупа Лазінскага мне ўжо рабілася цесна. Дык пакінуў Нясвіж і паехаў у Вільню. Тут ад біскупа Матулевіча атрымаў парафію Жодзішкі, куды прыбыў 1 верасня 1921 году. Едучы ў гэтую прыгожую мясціну, я і не думаў, што трэба будзе перажыць столькі змагання дзеля праўды. Стройныя Жодзішкі. Над Вяллёю, на высокім беразе размясцілася мястэчка, з белым мураваным касцёлам. Як глянеш у даль перад сабою за раку, усюды сінее лес — малады сасняк, з аднае стараны і з другой, і цудоўныя берагі Вяллі, якая сваім гібкім станам размясцілася на сваім спрадвечным ложы ў нашым краі.

Жодзішкі — беларуская мясціна. Тут чутна чыстая беларуская мова і беларуская абрадавая песня. У гэтай мясціне давялося мне працаваць і залажыць моцны вуглавы камень пад адраджаючуюся беларускую рэлігійную культуру. Пашырэнне духоўнага слова — гутаркі з сялянамі, спагаданне іхняму палажэнню прыхіліла сялян да маёй ідэі. Пачалі адчуваць нястачу роднага слова і ў рэлігійным жыцці. Дык дня 7 верасня 1924 году я пачаў гаварыць па-беларуску навуку. Народ прыняў з душою слова Божае ў роднай мове. Галасаванне дня 24. IV.1925 г. прайшло на карысць Беларусаў. Камісія зложаная з ксяндзоў-палякаў: Голака, Кудэрэйскага і Паўловіча прызнала 60 проц. Беларусаў і 40 проц. Палякаў. Рэзультат перапужаў уладу — дык 22. VI. т.г. быў я абвінавачаны з 129 ст., ч. 1, п. 1 і пасаджаны на Лукішкі. Па васьмі днях быў звольнены пад залог 1000 зл. За віну мне лічылі тады некаторыя звароты з майго казання, якое я гаварыў на 400-лецце беларускага друку 25. III.1925. Дзеля нястачы довадаў справу гэту скора спынілі. Аднак сваю няўдачу ўлады пастанавілі на мне спагнаць з працэнтам, дык абвінавацілі ўжо па 130 ст. ч. 1, п. 1 за пашырэнне быццам у прыватных гутарках рэвалюцыйных ідэяў, заклікаючых да адарвання Беларусі ад Польшчы, і дня 29 верасня таго ж 1925 г. следавацелям быў зноў арыштаваны і адпраўлены таксама, як і першы раз, пад эскортай аж трох паліцыянтаў (пры гэтым двух конных) у Лыптуны і на Лукішкі. Прасядзеў на гэты раз болей як два тыдні і быў выпушчаны па загаду міністра справядлівасці Жыхлінскага, калі варочаўся ў Жодзішкі, народ шчыраю душою вітаў мяне, а пасля першага звальнення ўстроіў нават урачыстае спатканне з прамовамі, кветкамі, песнямі. На другі раз я ўжо баяўся спаткання і прыехаў у Жодзішкі неспадзявана.

2 траўня 1926 году пачаў пяць у касцёле «святы Божа» па беларуску і таксама песні за працэсіяй. Перашкоды са стараны Палякаў не толькі не зламалі стойкасці, але яшчэ болей прыхінулі да свайго роднага.

Урэшце 23 сакавіка з ´явілася на плябаніі паліцыя і паказваючы судовы «акт выконавчы» загадала збірацца і ехаць у Макатоўскую турму — на двухгадовую адседку. Роўна а 12 гадзіне ночы з 23 па 24.III.1927 году я пакінуў Жодзішкі.

Галоўныя даты працэсу:
Акружны суд 1—2 сакавіка 1926 г.
Апеляцыйны 12 чэрвеня 1926 г.
Найвышэйшы 18 студзеня 1927 г.

(Аб Жодзішках асабліва слаўным плебісцыце і судзе абшырна не пішу, бо аб гэтым было ў «Б. Крыніцы і Пшэгл. Віл.»).

Р. S. Сваёй рэлігійнай дзейнасці я тут не датыкаю. Яна была заўсёды ў тым кірунку, каб паглыбіць рэлігійнае ўсведамленне ў масах, даць гэтым усведамленнем масам каталіцкае пазіцыі пазытыўнае праканане. Выступаючы з навукамі, я заўсёды гаварыў ад шчырага сэрца і свайго ўнутранага праканання. Шчырыя і праканаыя словы сцягвалі (асабліва ў Менскую катэдру) мноства народу. Касцёл быў заўсёды поўны. Мае пракананні перадаваліся іным, і я бачыў у вачах слухачоў маіх слёзы. Не стараўся я іх выціскаць, не кідаўся ніколі на розныя гістарычныя або тэатральныя штукі, гаварыў проста, і, здаецца, гэтая прастата найбольш трапляла да праканання.

Хачу прыпомніць слоў пару аб маім бацьку. Памёр ён у 1919 г. 18 студзеня, надломлены працавітым жыццём, маючы 56 г. ад роду. Быў гэта вясковы інтэлігент, добра граматны і ад прыроды адароны нейкай удумчывасцяй і ахвотай да разважанняў. Чалавек чыстай душы і справядлівага жыцця, быў моцна рэлігійным і начытаным у св. Пісанні. Знаў таксама гісторыю, розныя гістарычныя падзеі яго моцна цікавілі. Калі паўстаў беларускі рух, мой бацька прыльнуў да яго шчыраю душою і стараўся пашыраць. Бывала стане ў Поразаве перад касцёлам з «Беларусам» у руках і чытае, а каля яго цэлае грамада людзей. Слухаюць, дзівяцца з «простай» газеты, а бацька выказвае патрэбу беларускага друку. Калі я падрос, быў ён не столькі бацькам мне, сколькі прыяцелем і таварышам... Дзіўлюся я цяпер з ягонага педагагічнага такту і «зразумення маёй маладой душы».

Чэсць яго памяці.

Відзеўся з ім апошні раз перад Калядамі 1918 г. Быў на яго магіле апошні раз 16 верасня 1925 г., у той самы дзень, калі мяне збайкатавалі на паразоўскім фэсце пад павадырствам кс. Спэрскага. Адсунуты ад клебаніі, пайшоў на магілу бацькі, але і тут знайшлі мяне паліцыянты, бо быў я тады пад следствам і пад дазорам паліцыі.

[1] Bielaruskaja Krynica. 1927 г. № 13—15.

Матэрыялы аўтабіяграфічнага нарыса падрыхтаваў да друку Янка Трацяк.

ПРАТАКОЛ

Беларускаго Селянскаго Зьезду у Горадні

15—16 сьнежня 1918 г.

